ISSN 1641-6686

Правінцыя

3–4

3–4

3–4

Беласток 2002

На „Правінцыю” зрэагавалі... 2

словы пра **словы**

Аляксандар Максімюк, *Басовішча: выйсьце з анкляву* 4

Ноччу, зь лязом у рукаве 12

Алесь Аркуш, *Полацкія запісы* 19

Сяргей Шыдлоўскі, *Прастора гераічнага* 23

Правінцыйная сталіца 27

Рэцэнзіі, агляды... 30

словы

Вінцэсь Мудроў, *Багун* 38

Анжаліна Дабравольская 47

Ігар Сідарук, *Затачэнец* 49

Ігар Сідарук, *Чыкануты* 59

Макс Шчур 63

Адам Глёбус, *Далакопнік* 69

Юры Гумянюк, *Нататнік экстрэмала* 73

Сяргей Астравец, *Югаслаўскі варыянт* 75

Міра Лукша 81

Сяржук Сокалаў-Воюш, *Знак* 84

Сяржук Сокалаў-Воюш, *Канвой* 86

Васіль Дзівашэвіч 89

Сяргей Абламейка, *Канстатацыі* 92

Алесь Аркуш 94

Міхась Андрасюк, *Пан Носік* 95

Ярына Дашына 98

Сяргей Рублеўскі, *Дождж у Стакгольме* 100

Віктар Шалкевіч 103

словы за **словы**

Анджэй Бурса 106

Рафал Ваячак 112

Эдвард Стахура, *Лучок над ыпсылёнам* 116

Ежы Плютовіч 128

Патрык Мадыяно, *Віла Журба* 136

Эган Бонды, *Дзявочы дзёньнік* 162

На „Правінцыю” зрэагавалі беларускія літаратурныя колы. Сёньня нярэдка бывае, што часопісы й кнігі аглядаюцца-рэцэнзуюцца нячытанымі. Таму сярод водгукаў на першы нумар зьявілася нямала камічных галасоў. Але было пару выпадкаў, калі выказваньні пра наш часопіс падпіраліся салідным чытаньнем нумару. Гэта парадавала. Па-першае, з увагі на фармат і таўшчыню часопісу — ня так то й проста даецца гэткае чытаньне ў эпоху карцінак. Па-другое, бо даказвае, што яшчэ не зьвяліся людзі, для якіх часопіс — носьбіт культуры слова і моўнай нормы, а ня толькі „чысты праект”. Для такога кола адрасатаў была задуманая і робіцца „Правінцыя”.

Назоў часопісу спарадзіў супраціў. Ня надта каб моцны, але заўважны. Прычым, тым большы наглядаўся супраціў, чым меншае было веданьне зьмесьціва нумару. Беларусь — не правінцыя, сьцьвярджалі апанэнты, узьнік бы гэты часопіс у іншым месцы, дык зваўся б ён „Сталіцай”.

Узьнік бы. Але ня ўзьнік. Ды правінцыя — гэта ж толькі слова, назоў, імя, а не лёсавызначальны прысуд. Мы, у кожным выпадку, надалей прытрымліваемся думкі-перакананасьці, што сьвет лепш сузіраецца праз вакно свае правінцыйнасьці, чымся чужое сталічнасьці.

Што варта рабіць? Варта „на практыцы ажыцьцявіць” хаця б адзін пастулят узаемапазнаньня і ўзаемапаразуменьня, якіх у сфэры чыстай дэкляратыўнасьці шмат назьбіралася за апошнюю дэкаду XX стагодзьдзя. Сучасную беларускую літаратуру ў названы пэрыяд запрэзэнтавалі польскаму чытачу не катэдры, не філялёгіі, а менавіта тусоўка гэтага часопісу. Спадзявацца, што нешта ў гэтым пляне зьменіцца — хіба дарма; беларусаўтрамбоўныя ўстановы засяродзіліся на змаганьні з уласнай (не)пісьменнасьцю.

Асобай зусім невядомай беларускаму чытачу ў першым выпуску часопісу аказалася Галіна Пасьвятоўская, таму ў далейшым працягваем прэзэнтацыю кола „праклятых паэтаў” пэрыяду Народнай Польшчы, постацяў у польскай культуры з аднаго боку культавых, а з другога — абавязковых аўтараў для сярэдняга й вышэйшага ўзроўняў філялягічнай адукацыі ў нашай краіне. Побач іх прадстаўлены польскі сучасны паэт і жыхар Беластоку Ежы Плютовіч, вершы якога — паводле нас — акурат таго і вартыя, каб прапанаваць іх у атачэньні найвышэйшай лігі творцаў польскай культуры.

Апроч таго — даканчэньне распачатага ў першым выпуску ды пашыраная на рэцэнзіі порцыя публіцыстыкі. Ясная справа, пры выдавецкім цыкле „Правінцыі” рэцэнзаваць будзем няшмат — усяго выбраныя і ў нейкім сэнсе важныя нам творы. Затое — уважліва і абавязкова пасьля (пра)чытаньня.

Гэтым і запрашаю аматараў беларускага слова ў другое падарожжа па блізка двухстах вялікафарматных бачынах, а ўсіх ахвотных „хутка прачытаць не чытаючы” — у Інтэрнэт, дзе й надалей будзем публікаваць *highlights-streszczenia* на ангельскай і польскай мовах.

А. Максімюк

- На вокладцы: Міхал Косьць (даведка на 29 стар.), *Вячаслаў Корань („Уліс”) на Басовішчы 2002.*
- На тытульных лістах разьдзелаў: Міхал Косьць, *Басовішча 2001.*
- Апроч таго ідэнтыфікаваныя фатаграфіі й рэпрадукцыі ў нумары: архіў Алеся Аркуша (22), архіў Аліны й Мікалая Ваўранюкоў (72), архіў Галіны й Яна Максімюкоў (12, 14, 17-18, 68, 104), кніга *Deník dívky která hleda Egona Bondyho*, Bratislava 2001 (172), кніга *Лябірынты прывіднага замку,* Беласток 2000 (48), Тацяна Козік (20), Міхал Косьць (4, 6, 8-11, 62, 83, 97, 124, 149, 161, 167), Міраслава Лукша (99, 135), Аляксандар Максімюк (5 — старая сцэна), Пятро Савіцкі (5 — „З крыльлямі сьвіньня”), Лявон Тарасэвіч/ архіў газэты „Ніва” (7).

Правінцыя. *Літаратурна-Мастацкі Часопіс. № 3-4. Беласток 2002.*

Нумар падрыхтавалі: *Алесь Аркуш (Полацак, freelit@polotsk.unibel.by), Аляксандар Максімюк (Беласток, галоўны рэдактар, alik.maksymiuk@wp.pl), Ян Максімюк (Прага, maksymiukj@rferl.org), Сяргей Шупа (Вільня, стыль-рэдактар, shupa@kraj.org).*

Выдаецца Беларускім Саюзам у Рэчы Паспалітай.

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.

Адрас: *„Pravincyja”, c/o CEO Polska-Białoruś, ul. Lipowa 25/3, 15-424 Białystok, Poland.*

E-mail: *pravincyja@poczta.onet.pl* альбо *pravincyja@hotmail.com*

Internet: *http://pravincyja.republika.pl/* альбо *http://republika.pl/pravincyja/*

Друкарня: *Zakład Poligraficzny „Offset-Print”, ul. Broniewskiego 14, Białystok, tel. (+48 85) 651 28 86.*

словы пра **словы**

Аляксандар Максімюк

Басовішча: выйсьце з анкляву

Слова *Басовішча* ўпершыню прамовіў Алег Латышонак 2 сьнежня 1989 г. вечарам у Бельску-Падляскім. Дабівацца патэнту на яго аўтар ня стаў. І добра, бо слова атрымалася настолькі ўдалым, настолькі беларуска-кшталтным, што й павінна быць не прыватнай, а агульнабеларускай уласнасьцю. Афіцыйна слова мелася перакладацца на польскую мову як Basowisko (націск на „і"). Так прынамсі думалася сябрам Беларускага Аб'яднаньня Студэнтаў (БАС), якія ў палове ліпеня 1990 году арганізавалі першы Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі. Гэты пераклад, аднак, не прыняўся. Наогул прачуленыя на пункце сваёй польскасьці ды этнічнай і моўнай чысьціні беластоцкія палякі тут глынулі нашае беларускае *Басовішча* жыўцом. Яны і сталі так казаць, прычым пераважная бальшыня ставіць націск на „і". А паколькі ў польскай мове канчатак „-а" асацыюецца з множным лікам, палякі — камічна для беларуса — пытаюцца: *Калі адбудуцца (odbędą się) Басовішча?*

Для мяне нашая беластоцкая беларуская гісторыя падзялілася на пэрыяды *да* й *пасьля* ўзьнікненьня Фэстывалю Басовішча.

Такое музычнае мерапрыемства не змагла б прыдумаць ды арганізаваць ніякая іншая сябрына як толькі Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў у Польшчы. Тут неабходна адно растлумачэньне для нашых закерзонскіх суродзічаў. Калі пішу гэтыя словы, у вышэйшых вучэльнях майго роднага Беластоку — як і ў шмат якіх іншых гарадах Польшчы — вучацца беларусы (выхадцы, палітычныя эмігранты) з Рэспублікі Беларусь. Той жа БАС, Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў у Польшчы, пра які ідзе расповед, ня мае ніякага дачыненьня да студэнтаў зь Беларусі. Арганізацыю стварылі студэнты-беларусы, грамадзя-

Тут усё пачалося ў 1990 г.

„З крыльлямі сьвіньня" — сымбаль першага Басовішча

не Польшчы, у пачатку 1980-х гадоў, на першай хвалі пераменаў у краіне. БАС быў першай і адзінай незалежнай беларускай грамадзянскай ініцыятывай у пасьляваеннай Польшчы, якая здолела дабіцца юрыдычнага прызнаньня яшчэ ў эпоху сацыялізму — 29 лістапада 1988 году. Тое імкненьне да сваёй студэнцкай арганізацыі можна сёньня найагульней растлумачыць прагай маладога пакаленьня беларусаў выйсьці па-за ўстаноўлены дзяржавай рэглямант для дзейнасьці нацыянальных меншасьцяў. Той рэглямант зачыніў беларусаў у іх фальклёрным анкляве — бяз пунктаў сутыку з астатняй часткай грамадзтва. Быццам бы тыя беларусы ў Польшчы жылі, але фактычна іх як бы і не было. Я не сумняюся, што сярэднестатыстычнаму паляку ў той час беларус мог уяўляцца як істота з чацьвертага вымярэньня.

У час станаўленьня маладой польскай дэмакратыі, калі ўжо *было можна дзейнічаць* — пачатак 1990-х — узьнік яшчэ дзясятак беларускіх суполак у Польшчы, якія за наступнае дзесяцігодзьдзе прыклалі шмат высілку, каб скарэктаваць вобраз беларуса ў польскім грамадз-

Месца на фэстываль падыйшло, як трэба. Па-мясцоваму называецца яно Барык, што тлумачыцца паамэрыканску: Вудстак. Пагода, нібы па заказе: аксамітны летні вечар. Графічны сымбаль фэстывалю — выява сьвіньні з крыламі ў белым полі (лыч зь левага боку, трохі скосам на гледача). Калі асэнсаваць гэтыя рэчы агулам, то ў рэшце рэшт можна й выбачыць студэнтам, што яны назвалі сваё „Басовішча" пакамсамольску: Фэстываль Музыкі Беларускай Моладзі. Калі я быў спахапіўся і прапанаваў адзіную адпаведную назву — Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі, — было ўжо запозна: студэнты шпарнулі тысяч колькі афішаў з анонсам імпрэзы. Маладосьць, маладосьць...

Дзень першы, 13 ліпеня. Меўся быць канцэрт аўтарскай і бардаўскай песьні... Але ж барды не даехалі! Аднекуль нехта прынёс зьвестку, што менскія выканаўцы запыніліся ў Брэсьце і мітынгуюць. Так?! Значыць, на Гарадок ім напляваць?.. Тхнула духам узаемнага беларускага непаразуменьня... Праграму трэба было перайначваць. Я зразумеў, што ўсё ідзе звычайна, так як і належала спадзявацца. Прыехаў самаходам Пётр Скепка і паставіў на сцэне апаратуру. Мастацкі кіраўнік фэстывалю, Бася Кучынская, якая ўжо ад раньня хварэла ад хваляваньня, раптам апрaвілася і нанава зрэдагавала праграму. Учыніла мужнае намаганьне запанаваць над хаосам і празьмерным ростам арганізацыйнай энтрапіі або, як кажуць амэрыканскія беларусы, палагодзіла балаган.

На зьмярканьні хлынула ў Барык публіка. Ужо раней моладзь, якая прыехала сюды на тры дні, расставіла палаткі на пляцоўцы каля пагранічнай заставы. Мясцовыя прыйшлі пазьней, але таксама на добрыя гадзіны дзьве перад пачаткам імпрэзы, каб скаштаваць піва. Нейкі недабразычлівец „Басовішча" пусьціў плётку, што гарадоцкі войт забараніў продаж піва. Нібыта таму, што людзі купляюць міхалоўскае, а гарадоцкага напою ніхто не бярэ... Аксамітны летні вечар захмарыўся на момант сутыкненьнем драпежных капіталістычных інтарэсаў.

(...)

Фэлікс Аксёнцаў прачытаў сваім трагічным голасам кавалак пра чайкі, якія лёталі туды-сюды над галавою дублінскага Уліса — Леапольда Блюма. І на сцэну выйшаў менскі „Уліс"... Раптам зрабілася цесна ў Барыку. Пачалася нейкая фантасмагорыя пад гарадоцкім небам. Гэта „Бясовішча", акрэсьліў тое, што дзеялася на сцэне і сярод публікі, менскі пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Фактычна, гэтага нельга апісаць пяром. Агульнае шаленства. Публіка „завялася" зь першай песьні і трывала ў экстазе да апошняй. А хлопцы давалі жару, атручваючы юныя душы разбуральным, радыкальным, экстрэмісцкім, урбаністычным, старажытным рокам...

Трохі перадышкі, і на сцэну выйшла „Мроя". Трэба было не абыякой вытрымкі, каб разбавіць атруту „Уліса" і падсыпаць сваёй. Але „Мроі" гэта ўдалося. Хлопцы зайгралі канцэрт, як у гіпнатычным трансе. Мяне асабіста ашаламіў сваімі сцэнічнымі магчымасьцямі вакаліст і клявішнік гурту Лявон Вольскі, раз драпежны і напорысты, раз іранічна-лірычны і сарамяжлівы... „Мроя" поўнасьцю выявіла свае калясальныя магчымасьці і пасеяла ў душах беластоцкіх рок-фанаў зерне раздвоенасьці: „Уліс" ці „Мроя"?

Ян Максімюк, „Ніва", 12.08.1990



Лявон Вольскі („Н.Р.М.")

тве, даказаць і паказаць, што гэта не істоты зь іншага вымярэння. І ўсё ж не пакідае мяне думка, што выхад з анкляву не адбыўся...

Зьявілася болей беларускіх часопісаў і кніжак, пабольшала разнастайных фэстаў, але не адбылося істотнага пашырэньня публікі. Тое пашырэньне, не сакрэт, магло адбыцца толькі за кошт палякаў. Але выявілася, што беластоцкія палякі беларускага ня хочуць ні чытаць, ні слухаць, ні глядзець...

Ёсьць, аднак жа, адно-аднюсенькае выключэньне. Гэта Басовішча, Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі.

У лясным урочышчы Барык пад Гарадком на Беласточчыне ўжо другую дэкаду сустракаюцца маладыя палякі і беларусы, каб паслухаць канцэртаў рок-гуртоў, папіць піва, парасказваць анэкдоты, ці проста пашвэндацца бяз дай справы. Маладым палякам, там ва ўрочышчы Барык, Беларусь і беларусы — гэта краіна й народ, якія выдалі на сьвет „Уліса", „Мрою", „Мясцовы час", „Краму"... Гурты, дзеля якіх варта прыехаць з супрацьлеглага кутка Польшчы ды вытрымаць два-тры дні палявога-баявога жыцьця. Апошнімі гадамі на Басовішча запрашаюцца і польскія гурты зь першай лігі. І хаця гуртам тым ня трэба перасякаць ніякіх дзяржаўных межаў, каб патрапіць на гэты беларускі фэст, яны абавязкова завучваюць некалькі папулярных зваротаў па-бела-

На „Басовішчы" загучала сучасная музыка. Сучасная, бо створаная ў сучасны момант. Сучасная ў разуменьні сучаснай формы. Сучасная ў разуменьні сучасных праблемаў. Сучаснай была таксама публіка, якая ўспрымала гэтую музыку не як водгук далёкага дзяцінства, а як частку свайго сучаснага жыцьця.

Пра публіку можна агульна сказаць, што была яна маладая і бяз комплексаў. Ня мае значэньня, ці складала яе моладзь гарадзкая, ці вясковая, паколькі ўсе агулам прэзэнтавалі адзін тып пост-індустрыяльнай культуры. Усе яны зьявіліся на „Басовішчы" ў пошуках нейкай формы выяўленьня сваіх пачуцьцяў. Некаторыя зь іх штодзённа карыстаюцца польскай мовай, але толькі адзінкі, як думаю, адносяцца да сваёй нацыянальнай тоеснасьці абыякава.

Немалую частку публікі складалі госьці з БССР. Хаця відаць была розьніца ў паводзінах паміж імі і беластаччанамі, то ў агульнасьці выявілася аднолькавая форма ўспрыманьня рэчаіснасьці і маніфэставаньня жыцьцёвых паставаў. Каторы ўжо раз аказваецца, як слабой, у сэнсе культурастваральным, была камуністычная сыстэма.

Валянцін Сельвясюк, „Ніва", 19.08.1990

„Р. Ф. Брага" (Гарадок) — першы склад

руску, якія потым кідаюць у публіку са сцэны ў час канцэрту.

Незварушныя межы-муры ў польска-беларускіх дачыненьнях на Беласточчыне досыць лёгка абрынуліся ад дотыку поп-культуры.

Басовішча ў нашым беластоцкім мікракосмасе стала падзеяй настолькі незвычайнай, што адразу спарадзіла параўнаньне з фэстывалем Вудстак. Параўнаньне гэтае — залежна ад геаграфічных каардынат суразмоўцаў — выклікае іранічную ўсьмешку або эйфарыю. Ды ўсё ж яно ўсплывае ў Барыку ці ня кожны год. Падаецца аднак, што падабенстваў паміж гэтымі двума фэстывалямі значна менш, чым розьніцаў. Абодва фэстывалі разьдзяляе часавая прорва ў дзьве дэкады. Той фэстываль адбыўся, калі ЗША вялі вайну ў Віетнаме, ды мусіў стацца палітычным пратэстам супроць яе. У сацыяльным вымярэньні, амэрыканская моладзь адпрэчыла стыль жыцьця сваіх бацькоў, прадэманстравала нонканфармізм. Музычна, Вудстак стаў адбіткам сваёй эпохі, ці лепш сказаць — невялікага прамежку ў разьвіцьці поп- і рок-музыкі. Наш фэстываль упершыню прагучаў, калі бээсэсэраўская Беларусь і беларусы нясьмела пачыналі будзіцца да нацыянальнага жыцьця. Гэты нацыянальны чыньнік і здамінаваў усе іншыя. Нам трэба перш за ўсё стацца народам, а потым уладзім усё астатняе — гэткая дэклярацыя выказвалася гасьцямі зь Беларусі на ўсе лады. Паветра ў Гарадку ў палове ліпеня насычвалася нацы-

Суботні канцэрт, без удзелу чарады пачаткоўцаў, быў клясны. Нялёгкае заданьне мела гарадоцкая „Брага", выступаючы між „Крамай" і „Улісам". Калі зайграла „Крама", а яшчэ пазьней „Houk" з Варшавы, паднялося на ногі ўсё „Басовішча". А было на ім больш за тры тысячы людзей. У натоўпе сустракаліся жыхары самых далёкіх куткоў Беласточчыны. Мы чулі, што Орля і Мілейчыцы ў той час зусім апусьцелі з моладзі.

„Басовішча" гэта амаль адзіная рок-імпрэза, на якой нядрэнна гуляюць і старэйшыя. Цэлаю раднёй сядаюць на траве, расьсцілаюць абрус, дастаюць соленыя гуркі і... гуляй душа!

— Наша „Басовішча" ўжо амаль як Яроцін, — горда паўтаралі мясцовыя між кускамі вэнджанай каўбаскі.

Гарадок сьвяткаваў. Людзі спэцыяльна да фэстывалю рыхтаваліся, мылі вокны, рабілі большыя пакупкі, запрашалі гасьцей. Сьвяточную атмасфэру псавала толькі „мошка", якая выбірала з гародаў цыбулю.

— То ўжо такі звычай, — махнуў на гэта рукою дзядзька ў краме, шчасьлівы ад навалы кліентаў.

Мікалай Ваўранюк,
Ганна Кандрацюк, „Ніва", 30.07.1995

Выступае „Крама"

янальным духам і флюідам. Гэткім паветрам лёгка дыхалася і нам, беластоцкім беларусам.

У музычным вымярэньні, Басовішча — фэстываль моцна эклектычны. На ім дэманстраваліся ўсе музычныя жанры і... эпохі — ад старажытных народных напеваў праз бардаў, клясычны рок-н-рол і гард-рок да какафоніі нашага часу. Можна сказаць і так — Басовішча было спробай узяць магутны разгон і ў два канцэртныя ліпеньскія вечары кампэнсаваць усе прамінулыя дзесяцігодзьдзі няіснай беларускай поп-культуры.

„Уліса" мы тут пакахалі, што аж страх. Мала таго, да гэтай любові ў пачатку 90-х мы прымусілі і нашых супляменьнікаў у Беларусі. Калі ў першай палове 90-х у Гарадку выступалі „Мроя", „Крама", „Мясцовы час", то падсьвядома нешта нам казала, што ў музыцы той гучыць рэха папярэдніх дэкадаў, а вось калі выходзіў на сцэну „Уліс", дык зьяўлялася цьвёрдая ўпэўненасьць, што беларуская рок-музыка дагнала і мастацкі, і гістарычны час.

Дзяліць наш беластоцкі лёс на час *да* й *пасьля* ўзьнікненьня Басовішча мае свой сэнс. Ніводная іншая ініцыятыва не прымусіла палякаў прыйсьці, паглядзець, паслухаць, што робяць беларусы, і... схіліць галаву. Красамоўна сьведчыць аб гэтым прэзэнтацыя Басовішча

Не спадабалася манаполія бровару „Дайліды", хоць беластоцкае піва я, у прынцыпе, паважаю. Не спадабалася, бо мне наогул не падабаецца ніякая манаполія. І яшчэ таму, што над сцэнай, у месцы, дзе заўсёды вісеў надпіс „Басовішча", сёлета чамусьці красаваўся „Dojlidy". Надпіс зьнік, калі „Illusion" адмовіўся пад ім выступаць. Маўляў, мы не камэрцыя, (бо, вядома, 50 мільёнаў за канцэрт, гэта ж ніякая камэрцыя) што і крычалі са сцэны гэтыя рокеры, побач шмат якіх брыдкіх слоў.

Вось, якраз колькасьць вульгарызмаў, якія ўпалі са сцэны, таксама не спадабалася. Тры гады таму адзін непрыстойны выраз быў найбольшым скандалам у гміне на працягу некалькіх тыдняў, а гурт, дзякуючы яму, увайшоў у гісторыю „Басовішча". Сёлета словы, якія пачынаюцца на „х" і „п", лёталі між соснаў Барыку быццам райскія птушкі і ніякага ўражаньня не выклікалі.

Станоўчым выключэннем, на першы погляд брыдкага выразу, быў паўтораны некалькі разоў вокліч Крыстафора Сяськевіча: „pieprzyć iluzje"! Алюзія (выбачайце за калямбур) атрымалася аж надта выразная, а лідэр „Кардону" яшчэ раз пацьвердзіў, што інтэлігенцыяй б'е калегаў зь іншых гуртоў прынамсі ў некалькі разоў (як і здольнасьцю завязаць дыялёг з публікай).

Не спадабаліся п'яныя ўжо перад канцэртамі падлеткі.

Не падабаецца, што сярод публікі амаль зусім няма ўжо людзей зь Беларусі. А можа сапраўды — гэта Фэстываль Музыкі Маладой Беласточчыны „Dojlidy"?

Мікалай Ваўранюк, „Ніва", 28.07.1996

ў польскамоўнай беластоцкай прэсе. Пачалося з таго, што Басовішча ў мясцовай польскай прэсе ілюстравалася прыблізна такім здымкам: на лузе карова, у каровы ўзьняты хвост, з-пад хваста выцякае струмень мачы, пад фоткай супэрінтэлігентны подпіс, які зьвязвае яе зь беларускім рок-фэстывалем у Гарадку. Закончылася справа тым, што цяпер гэтыя ж самыя газэты трымаюць над Фэстывалем патранат ды называюць яго найвялікшым, адзіным, унікальным, etc., etc.

Сёньня дзеля ліквідацыі наступстваў Басовішча было б замала і пяці міністэрстваў, у той час як вынікі астатняй нашай актыўнасьці на Беласточчыне можна пасьпяхова нэўтралізаваць пры дапамозе аднаго грузавіка — арыштаваць тыражы ўсіх кніг, часопісаў і... *do widzenia*.

Басовішча для маладых беларусаў і палякаў — частка іх рэальнага, непазбыўнага сьвету. Лёсы маладых беларусаў і палякаў сутыкаюцца ў палове ліпеня ў Гарадку і перакрыжоўваюцца — у сутыкненьні гэтым няма ні каліва

На „Басовішчы", за сем гадоў фэстывалю, рознае было: перабоі з электрычным токам, затрымка дзесьці на мяжы музыкантаў зь Беларусі, дождж. Але такія крайне неспрыяльныя ўмовы як сёлета здарыліся ўпершыню. Спачатку прэзыдэнт Квасьнеўскі аб'явіў пятніцу 18 ліпеня днём агульнанацыянальнай жалобы па ахвярах паводкі на поўдні Польшчы. Імпрэзу давялося перакладаць на наступны дзень. Такім чынам, у суботу атрымаўся музычны маратон, ад дзясятай раніцы і праз усю ноч.

Нячаста (калі наогул) рок-канцэрты пачынаюцца перад поўднем. Сабраным у падгарадоцкім Барыку фанам, аднак, гэта мала перашкаджала. Адразу пайшлі пад сцэнай у шалёны танец-*pogo*, зь бязважкімі ўзьлётамі і балючымі, усё ж такі, падзеньнямі. І не паўстрымала іх нічога — ні стома, ні працяжны дождж, якога „Басовішча" яшчэ ня ведала.

Конкурсная частка, у якой выступіла адзінаццаць гуртоў зь Беласточчыны і Беларусі, прайшла пад захмараным, але яшчэ сухім небам. Затое, як пад вечар пачаў ісьці дождж, то не перастаў аж да нядзелі. *Drobnostka*, — пракамэнтавалі непагадзь хлопцы з Сямятыч і Белай-Падляскай, якія вярталіся з фэстывалю ў нядзелю вечарам, — *najważniejsze, że atmosfera była świetna*.

Відаць, сапраўды нешта ў атмасфэры „Басовішча" прыцягальнае ёсьць, што адчуваецца ня толькі такімі як я мастадонтамі, якія не прапусьцілі ніводнага фэстывалю. Доказам гэтаму хаця б гурты, якія ўзьніклі спэцыяльна дзеля таго, каб зайграць у Гарадку. Польскамоўная на штодзень моладзь складае беларускія песьні, бо ведае, што толькі з такімі тут выступіць. Некаторыя гурты тут жа разьлятаюцца, але іншыя з году ў год робяць прагрэс, вяртаюцца на „Басовішча", заваёўваюць узнагароды. Для некаторых беларушчына перастае быць адно атрыбутам канцэртаў, займае ўсё больш месца ў штодзённым жыцьці.

Мікалай Ваўранюк,
„Ніва", 27.07.1997



Юры Асеньнік („Zero-85", Беласток)

падвойнай маральнасьці, так характэрнай іншым плятформам узаемадачыненьняў. Грамадзка-палітычны эстаблішмэнт Польшчы — асабліва нашага ваяводзкага ўзроўню — у сваім палітычным мысьленьні ні крышачкі ня выйшаў па-за тыя рамкі, якія калісьці нацыянальным мяншыням намеціў і без малога 50 гадоў дапрацоўваў сацыялізм. Гэткая ўзаемная адкрытасьць маладых палякаў і беларусаў звычайна ня ўпісваецца ў іхную карціну. Дык да ўсяго сказанага трэба дадаць і тую акалічнасьць, што Басовішча спараджае таксама нямала супраціву сярод усіх тых, хто нацыянальныя меншасьці найахвотней запёр бы назад у фальклёрнае гета.

Пэўную частку публікі ў Гарадку — у апошнія гады яна ўсё павялічваецца — складае моладзь зь Беларусі. Успрыманьне Басовішча ёю моцна адрозніваецца ад нашага, беластоцкага. Закерзонская беларуская моладзь прыво-

Толькі пасьля канцэртаў, прыбраўшы сьмецьце і разьлічыўшыся з марненькай датацыі, сталі думаць, што далей. Алесь Карпюк купіў барана, мачыў яго дзень, апраўленага, у нейкім адмысловым адвары, а потым пяклі мы яго ўсю ноч, успамінаючы найлепшыя моманты найбольшага нашага пачыну. Ужо стала ясна, што „Басовішча" будзе працягвацца. Найвастрэйшыя спрэчкі разгортваліся вакол пытаньня, ці зможам мы яго арганізаваць кожны год, ці лепш рабіць яго радзей, але лепш.

Перамог энтузіязм ад першага посьпеху і так год за годам, бесьперапынна, прычакалі мы дзявятага Фэстывалю Музыкі Маладой Беларусі. Чаго толькі і не было за гэтыя гады на „Басовішчы"? Вырасла новае пакаленьне арганізатараў і слухачоў, узьнікалі і разьляталіся гурты. Лявон Тарасэвіч запраектаваў новую сцэну, якая дала размах фэстывалю (на жаль, збудаваць яе поўнасьцю — з дахам — не ўдаецца дагэтуль). На гэтай сцэне выступалі, каб пералічыць толькі найлепшых: „Мясцовы час", „Крама", „Новае Неба", „Палац", „Тарнада", польскія „Kasa Chorych", „Illusion", „BBK", „Proletaryat" і нашы зь Беласточчыны, „Кардон" і „Брага", якіх, пэўна, не было б, калі б не было „Басовішча".

У 1991 годзе, яшчэ са старой драўлянай сцэнкі Ян Максімюк крычаў публіцы: *Мы жывем па той і па гэты бок лініі Керзана, у чаканьні-спадзяваньні цуду ўваскрашэньня, уваскрашэньня народу да нармальнага жыцьця. Мы пяем і танцуем, пакуль што, спадзеючыся на цуд. Ён прыйдзе. І мы ўсе з вамі збудземся, заўтра, пасьлязаўтра, яшчэ ня зараз.*

Мы ўсё яшчэ не збыліся. І лепшага ў беларускай музыцы ад таго, што мы чулі на першым „Басовішчы", не зьявілася. Няма лепшага гурту за „Мрою" (хай сабе яна называецца „Н.Р.М."), няма лепшых інструмэнталістаў за Лявона Вольскага і Славу Кораня, няма лепшых бардаў за Касю Камоцкую, Алеся Камоцкага, Віктара Шалкевіча.

Мікалай Ваўранюк,
„Ніва", 19.07.1998

зіць з сабою на фэст у Гарадку палітычныя ідэі і атрыбутыку, у чым і няма нічога дзіўнага — *нам жа трэба перш за ўсё стацца народам...* Дзівацтва сытуацыі ў тым, што нашым палякам і праз мазгі ня пройдзе, што грамадзтва, у якім узгадаваўся такі гурт, як, скажам, „Н.Р.М.", усё яшчэ ня стала народам у сваёй сувэрэннай дзяржаве.

Басовішча дало нам, беластоцкім беларусам, шмат у інтэлектуальным сэнсе. Яно сталася мастом, па якім мы здолелі выйсьці бязь лішніх тлумачэньняў у шматлікія асяродзьдзі сваіх польскіх аднагодкаў і дзякуючы якому змаглі наладзіць культуралягічны дыялёг зь імі на роўных правах. Басовішча, праграмна не прэтэндуючы на нейкае выключнае месца ў беларускім культурастваральніцтве, усё-ткі займела яго — як выказьнік настрояў і памкненьняў Маладой Беларусі. Басовішча нікога й нічога ня збавіць. Але яно ёсьць доказам, што беларусам часамі ўдаецца своечасова дасьпець і пасьпець за часам, ухапіцца за яго вастрыё.

Што варта сказаць пра „Басовішча"? Арганізатарам яго ад пачатку зьяўляецца Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў у Польшчы. Фэстываль гэты — некамэрцыйная імпрэза, дафінансоўваецца яна Міністэрствам Культуры і Мастацтва, гарадоцкім самаўрадам ды шэрагам прыватных спонсараў. Што характэрнае для нашага тут жыцьця наогул — „Басовішча", як прынцып, не падтрымліваецца ваяводзкімі ўладамі, хаця зьяўляецца яно адзіным вялікім і міжнародным рок-мерапрыемствам на абшары сучаснага Падляскага ваяводзтва і можа служыць у якасьці неблагой яго візыткі. За дзесяць гадоў існаваньня адносіны ваяводзтва да „Басовішча" не пахіснуліся. У гэты час, аднак жа, адбылася падзея нашмат важнейшая за „непахіснасьць" ваяводзтва. Фэстываль канчаткова здабыў прыхільнасьць мясцовых мас-мэдыяў, у якіх знаходзіць цяпер і матэрыяльнага спонсара, і мэрытарычнага абаронцу. Нечага такога ў пачатках Фэстывалю не наглядалася. 9-8-7 гадоў таму арганізатары мусілі самі рупіцца пра г.зв. інфармацыйны шум вакол „Басовішча". У момант юбілею становішча цалкам вывярнулася — гэта мас-мэдыі знаходзяць у „Басовішчы" знакамітае месца для ўласнай прамоцыі ў рэгіёне. Вельмі важны гэта здабытак і... перамога. Жывем жа ў сьвеце, у якім, калі чаго не было ў СМІ, таго ўвогуле не было.

Аляксандар Максімюк,
„Ніва", 25.07.1999

Ноччу, зь лязом у рукаве

Я йшоў па вуліцы стамлёны ад згрызоты
І маладосьць мая як ноч з благімі снамі
Цьмяной заранкай на бэтонных тратуарах
Неразгадана й тайна гасла між дамамі
Анджэй Бурса, *Туга-пярсьцёнак*
(пераклад Хрысьціны Граматовіч)

Размова з Хрысьцінай Граматовіч зь Філадэлфіі, праведзеная адмыслова для „Правінцыі" Янам і Галінай Максімюкамі 29 красавіка, 4 і 5 траўня 2001 у Празе, у гасподах U Švejků, Bistro 57 і U Kocoura.

ЯН: *U Švejků* мы з Галінай былі раней толькі раз, месца вельмі файнае, турыстычнае. І тут пякуць добрае *koleno*. Калі мяне бярэ ахвота пайсьці на чэскае *калена*, мне адразу думаецца пра адну кнайпу непадалёк ад мэтро *Anděl*, я ня помню ейнае назвы, я нават ня ўпэўнены, ці яна ўвогуле мае нейкую назву, гэта будзе хвілін пятнаццаць адсюль пехатою. Тую кнайпу я знайшоў зусім выпадкова, калі прыехаў на *Anděl*, каб пабачыцца зь Юркам Станкевічам, сынам *таго* Янкі Станкевіча. Гэта было неяк год таму, мы мелі абмеркаваць выданьне *Belarusian Review* у Празе, і ён запрасіў мяне на кватэру, якую ён здымаў у той ваколіцы. З гэтай кватэрай атрымалася файная гісторыя, бо яны, тры браты Станкевічы і маці, жылі ў ёй падчас вайны, пасьля таго як Янка Станкевіч выправіў іх зь Менску. Мінула паўстагодзьдзя, браты Юрка і Вячка Станкевічы зноў апынуліся ў Празе і пайшлі паглядзець сваё даўняе жытло. Аказалася, урад рэпрыватызаваў цэлую камяніцу, гэта значыць, аддаў дом спадкаемцам уласьніка з дакамуністычнага часу. І вось Юрка і Вячка Станкевічы адшукалі цяперашняга ўласьніка ці, можа, уласьніцу, і сказалі, што хацелі б зноў наняць тую кватэру. Так бы мовіць, дзеля старых сэнтымэнтаў. І нанялі. Такія рэчы зусім магчымыя ў Празе, дзе дамы стаяць стагодзьдзямі, а людзі не развучыліся шанаваць прыватную ўласнасьць.

Ну, але пра тую кнайпу. Пасьля спатканьня зь Юркам Станкевічам я пастанавіў пашвэндацца па ваколіцы, бо быў там упершыню. І выпадкова натыкнуўся на гасподу, дзе моцна гаманілі. Уступіў, бо пры нагодзе мне захацелася выпіць піва...

ГАЛІНА: А такія выпадковыя нагоды Яну трапляюцца штодня...

ЯН: *Бэз пэрэсады*, як кажуць нашы людзі. Іншая справа, што ў старой Празе немагчыма прайсьці й сто мэтраў, каб не натыкнуцца на якую-небудзь гасподу або карчму. Але гэта была выпівальня не для турыстаў, а выключна для чэскага люду. Смурод там вісеў адпаведны таму, які йдзе ад шкарпэтак, калі чалавек праходзіць увесь дзень у фільцавых ботах і разбуецца пад вечар. Да таго было цёмна ад цыгарэтнага дыму. Зьесьці што-небудзь было немагчыма, дый там, здаецца, ніхто нічога ня еў. Я замовіў піва, а потым згледзеў у мэню, што ў іх даюць *věpřové koleno*. Мяне ўзяла такая ахвота на сьвініну з хрэнам, што мне стала ўсё роўна, дзе есьці. Але афіцыянтка сказа-

ла, што галёнка ўжо выйшла. Відаць, пабачыўшы маё вялікае расчараваньне, яна дадала, што, магчыма, *калена* маюць у кнайпе па другі бок скрыжаваньня. Інакш кажучы, яна зрабіла рэч нечуваную ў рэстаранным бізнэсе — рэкамэндавала мне канкурэнцыю. Я выпіў піва і перабраўся ў тую іншую кнайпу, упэўніўшыся адразу пры ўваходзе, што *калена* ў іх ёсьць. У чэскіх гасподах даюць наогул вялізныя порцыі, а ўжо *калена* — проста як для волатаў. Мала сказаць, што ім можна наесьціся ўволю... Ім можна вывесьці сябе са стану жыцьцёвай прыдатнасьці сама менш на суткі... Ну дык вось, я там прыблізна да такой ступені пазьдзекаваўся над сабою і, натуральна, паабяцаў сабе, што *never ever again*. Але калі празь нейкі час прыехаў да нас мой брат, Алік, я яго туды завёў. Яму там страх як спадабалася. Атмасфэра там так сама народная, як і ў той папярэдняй гасподзе, што я згадаў, але, на шчасьце, крыху больш разрэджаная. Ды ўсё-ткі мне падумалася, што вас туды не павяду, бо *pach* — (*зьвяртаючыся да Хрысьціны*) гэтак чэхі кажуць на *смурод* — мог бы не падысьці да вашага густу.

ГАЛІНА: Вялікі дзякуй.

ХРЫСЬЦІНА: І сёньня мы тут таксама выведзем сябе са стану жыцьцёвай прыдатнасьці?

ЯН: Няйначай. Чэская кухня даволі простая і смачная, але ўвадначас жахліва тлустая й нездаровая. Як беларуская. Агульна кажучы, калі б не існавала гарэлкі й піва, дык для гэтых двух народаў наўрад ці ўвогуле варта было б есьці.

ХРЫСЬЦІНА: Калі я першы раз апынулася ў Нью Ёрку — а было тое ў 1988 — то мяне вельмі ўразіла ўбогасьць амэрыканскай кухні ці, дакладней, таго, што можна зьесьці ў іхных забягалаўках *KFC* і *McDonald's*. На дарагія рэстараны я тады ня мела грошай, — як, зрэшты, і цяпер — а дзеля таго, каб пашукаць рэстаранаў з этнічнай кухняй, у мяне не было часу. Значыць, ласавалася тымі куранятка-мі і гамбургерамі. Спачатку нават было цікава, бо ў Польшчы нічога такога не было, але потым тая ежа мне вельмі абрыдла. Калі я першы раз вярнулася з Амэрыкі да мамы, то папрасіла, каб яна напякла як мага больш свойскага хлеба і каб штодня смажыла мне *картоплянікі*. І я так з тыдзень часу ела адзін хлеб з сольлю або й зусім бяз солі, і зьядала па пяць патэльняў картаплянікаў штодня, а мама глядзела на мяне, плакала і прыгаворвала: а дзіцятка ты маё, як яны ў Амэрыцы цябе замарылі! І казала, што зараз пойдзе і зарэжа мне курыцу, бо на адным хлебе і бульбе чалавек доўга не пацягне, а я ёй ніяк не магла растлумачыць, што на кураціну й глядзець не магу. А яшчэ я прасіла, каб яна зрабіла мне *холодніцю*, я яе піла проста *нагном*...

ГАЛІНА: Няма нічога лепшага за *холодніцю* са сьвежа нашчыканай цыбуляй і дробна нарэзаным агурочкам. А да таго яшчэ пакрышанае варанае яйка...

ХРЫСЬЦІНА: На сам успамін пяршыць у горле і вочы макрэюць...

ЯН: Незабыўны і непазбыўны смак дзяцінства. Ён мне наймацней зьвязваецца зь печанымі бычынымі яйцамі. У нас на гаспадарцы наогул штогод трэба было выпакладаць бычочка, каб лягчэй было яго гадаваць. Мяне тады на двор не пускалі, каб я ня бачыў гэтае апэрацыі. Але я добра помню, як бацька зранку вастрыў нож, паплёўваючы на асялок. Значыць, я сядзеў у хаце і калаціўся ад жаху, калі яны там на дварэ кастравалі няшчаснага бычочка. А потым дзед прыносіў дахаты два вялізныя бычыныя яйцы, і мы, ён і я, пяклі іх на патэльні у печцы або пад плітою, ставячы патэльню проста ў распаленае вугольле. Адно яйцо для яго і другое для мяне. Калі тыя яйцы лопаліся зь ляскам і зь іх выплывалі мільёны малюпасенькіх бычочкаў, гэта значыла, што ўжо можна было іх есьці...

ГАЛІНА: Я зараз званітую...

ЯН: *Hold on, soldier*, як кажа Роджэр Уотэрз. Нам трэба правесьці бліц-інтэрв'ю з Хрысьцінай у „Правінцыю" і растлумачыць людзям, асабліва беластоцкім, адкуль яна такая ўзялася. Ці ты можаш гэта даходліва растлумачыць, так бы мовіць, нашым чытачом? Вось жа калі я сказаў брату, што ён хадзіў з табою ў адну школу, ён спачатку ня мог гэтаму паверыць, а потым кажа — хоць ты забі мяне, ніяк ня ўспомню аніводнай Хрысьціны з Кленікаў.

ХРЫСЬЦІНА: Нічога дзіўнага, бо калі ён канчаў школу ў Кленіках, то я была, мабыць, толькі ў пятай клясе, а якую цікавасьць для хлопца ў восьмай клясе мае дзяўчо зь пятай?

Галіна й Ян Максімюкі, Хрысьціна Граматовіч

ЯН: Практычна ніякую — грудкі яшчэ няма, попка сухая, няма за што ўшчыпнуць і памацаць, цяжка сабе ўявіць больш недарэчнае стварэньне за пяцікласьніцу.

ХРЫСЬЦІНА: А я Аліка добра помню, прынамсі з выгляду, таксама як і Колю Ваўранюка. Я адразу іх пазнала на здымках.

ЯН: Яны, па-мойму, ня могуць зьмірыцца з фактам, што яшчэ нехта — акрамя іх — выйшаў з кленіцкай школы пісьменны ў беларускай мове.

ХРЫСЬЦІНА: Я б не сказала, што я была пісьменная ў беларускай мове пасьля кленіцкай школы. Чытаць кірыліцу я напэўна навучылася, але наўрад ці што-небудзь яшчэ. А пра літаратуру то й няма чаго казаць — Купала мне безнадзейна блытаўся з Коласам, іншых ня згадваючы. Нікому тая мова не была патрэбная, і ніхто да яе не прывязваў вялікага значэньня. Калі б не пані Хеня — палячка, якая вучыла хіміі ў Кленіках — то можа і я выпісалася б зь беларускай мовы. Але яна сказала, што так нельга, і што мусова трэба яе вывучаць.

ЯН: Алік мне калісьці казаў, што ён помніць такі эпізод з Кленікаў — пані Хеня задала ім нейкую ціхую працу на ўроку, а сама ўзялася падрабляць бацькоўскія подпісы на заяўках, каб беларускія дзеці ў польскай школе вывучалі беларускую мову ў наступным годзе. Самім бацькам — і дзецям, вядома ж — гэта было да лямпачкі, агульна кажучы. У гэтай сцэнцы больш жыцьцёвай праўды і трагізму, чымся ва ўсіх успамінах камсамольскіх пісьменьнікаў Заходняй Беларусі наконт таго, як нібыта над імі зьдзекаваліся паны-палякі і забаранялі роднай мовы. Калі ўжо наш мужык і хацеў вывучаць якую-небудзь родную мову акрамя польскай, дык была яна расейскай, бляха!

ХРЫСЬЦІНА: У мэдычным ліцэі ў Беластоку нас вучылі расейскай і ангельскай мовам. Веданьне ангельскай мне моцна прыдалося ў Амэрыцы. Я любіла ангельскую мову ў ліцэі і яна мне наогул сама ўваходзіла ў галаву. У Нью Ёрку, куды я патрапіла ў лістападзе 1988, гэта вельмі дапамагала знаходзіць працу.

ЯН: Чаго ты перабралася ў Амэрыку?

ХРЫСЬЦІНА: Непасрэдным імпульсам было тое, што я не здала экзамэнаў у Мэдычную Акадэмію ў Беластоку. Заваліла тэст па біялёгіі і праляцела. Значыць, мне трэба было альбо ісьці шукаць пасаду ў нейкім шпіта-

лі альбо...падавацца куды-небудзь далей. Знаёмая маёй сяброўкі зь ліцэю ўжо была ў Нью Ёрку і падмаўляла яе прыехаць туды. А тая падмовіла мяне, каб ёй было весялей альбо, дакладней кажучы, ня так страшна ехаць.

ЯН: І што ты там рабіла?

ХРЫСЬЦІНА: Усяго і не раскажаш. Спачатку, як і наогул усе іншыя полькі, працавала прыбіральшчыцай, па прыватных дамох і ў розных офісах. Заробкі былі мізэрныя, а праца страшна стамляла, асабліва калі табе трэба было прыбіраць у некалькіх пунктах гораду ў адзін дзень. Шмат маіх знаёмых працавала ў багатых жыдоўскіх сем'ях у Брукліне. Яны мелі найцяжэй, таму што жыдоўкі страшна прыдзіраліся, і калі ты пакінула нават найменшую плямку на талерцы аьбо на ўнітазе, то яны маглі і зусім не заплаціць. А скардзіцца не было каму — ну бо куды ты пойдзеш — заявіш у паліцыю, што цябе надулі, калі ты круглая нелегалка? Вось яны, жыдоўкі, пра гэта ведалі, і таму зьдзекаваліся над дзяўчынамі безь зялёнай карткі. Казалі, гэтак яны нібыта помсьцілі палякам за іхны антысэмітызм. Ну, калі ёсьць польскі антысэмітызм, то несумненна ёсьць і жыдоўскі антыпалянізм. Я, на шчасьце, усё гэта ведала толькі па чутках, таму што не давялося працаваць у амэрыканскіх жыдоў, прынамсі ў такіх, пра якіх было публічна вядома, што яны жыды. Да таго, я прыбірала толькі з самага пачатку свае „амэрыканскае кар'еры", бо потым стала няньчыць дзяцей. Праца наўрад ці была лягчэйшая, але наогул больш надзейная і доўгатэрміновая. Амэрыканцы мне нейк сталі давяраць, калі я пачала больш-менш свабодна размаўляць на іхнай мове, а да таго адносіны да мяне мяняліся ў лепшы бок, калі я ім казала, што ў Польшчы закончыла *nursing school*. Прафэсіяналка, інакш кажучы. Так што я пралюляла некалькі амэрыканскіх *babies* недзе да вясны 1992, калі дазналася, што выйграла зялёную картку на эміграцкай лятарэі для палякаў у 1991. Летам 1992 я паехала ў Польшчу, каб аформіць сваю зялёную картку як сьлед у амбасадзе і вярнуцца у Нью Ёрк зусім легальна. Тады я й наведала маму ў сваім родным Сапаве.

ГАЛІНА: І тату?

ХРЫСЬЦІНА: Тата памёр у 1983, ад інфаркту. У яго было слабое сэрца.

ЯН: У цябе ёсьць сястра або брат?

ХРЫСЬЦІНА: Брат, Лёня. Ён цяпер жыве зь сям'ёй ажно ў Вышкаве пад Варшавай, куды пераехаў за працай. Ён па спэцыяльнасьці электраманцёр. Разам зь ім жыве і мама, хоць яна і не хацела пакідаць Сапава. Але ўжо не магла працаваць адна на гаспадарцы. Так што мой мілы родны кут цяпер зарастае травой і лазой. І ніхто ўжо ім не цікавіцца.

ГАЛІНА: А ты ўжо лічыш сябе амэрыканкай?

ХРЫСЬЦІНА: Ну не. Я й сама дакладна ня ведаю, хто я. Калі перакладаю на беларускую мову, то часам адчуваю, што я, мабыць, беларуска. У шпіталі, праўдападобна, лічаць мяне амэрыканкай. Там мяне ведаюць як сястру *Christine*, у якой занадта складанае прозьвішча, каб яго навучыцца вымаўляць ці проста запамятаць. Але калі іду сабе па вуліцы ў Філадэлфіі, дык ніхто, мяне не выключаючы, ня ведае, хто я. Магчыма, я трохі і полька, і беларуска, і амэрыканка ўжо.

ЯН: А чаму ты пераехала зь Нью Ёрку ў Філадэлфію?

ХРЫСЬЦІНА: Я пераехала вясною 1994. Чатыры месяцы раней сталася нешта, што паўплывала на мой выбар. Я і яшчэ тры дзяўчыны з Польшчы наймалі кватэру ў паўднёвым Брукліне, непадалёк ад *Coney Island*. На працу кожная з нас мела вельмі далёка, і станцыя мэтро была далекавата, але чынш быў даволі нізкі, так што нам неяк тая сытуацыя адпавядала. Большасьць з нас вярталася дахаты вельмі позна, недзе пад поўнач, і было страшна ісьці апусьцелымі і змрочнымі вуліцамі. Аднаго разу Магда, адна з маіх сяброўак, вярнулася дадому з плачам і блізкая істэрыкі. Мы ледзь дабіліся ад яе прызнаньня, што здарылася. Аказалася, недзе пару блёкаў ад нас, у цёмным завулку, яе перапыніў нейкі ямаец ці іншы падонак з Караібаў, прыклаў ёй нож да шыі і прымусіў яе, каб яна яго мастурбавала. Мы таксама былі ў шоку, пачуўшы гэта, але нешта ж трэба было рабіць. На паліцыю мы не пайшлі, таму што Магда была нелегалка. Усе вырашылі як найхутчэй перабрацца жыць у іншае месца. Але ж на працу неяк трэба было тымчасам хадзіць. Я выцягнула са свае валізы скальпэль, які калісьці ўзяла на памятку зь беластоцкага „гіганта", калі мела там

школьную практыку, і потым прывезла з сабою ў Амэрыку. У левым рукаве свае блюзкі я прышыла дзьве тасемачкі, за якімі гэты скальпэль можна было лёгка схаваць і лёгка адтуль дастаць у патрэбе. І з гэтым лязом у рукаве я хадзіла некалькі месяцаў па Нью Ёрку з думкай, што калі той падонак мяне перапыніць недзе ў цёмным завулку, то я яму зраблю нечаканы чык. Спачатку было страшна, а потым я раптам зразумела, што я ўжо нічога не баюся і, наадварот, прагну таго спатканьня, каб адпомсьціць. Я пачала вяртацца дадому кружнымі шляхамі, каб як найдаўжэй быць на дварэ і строіць зь сябе лёгкую здабычу для гвалтаўніка. Неяк бліжэй да лета я адчула, што яшчэ трохі такога жыцьця, і я зьеду з глузду. А таму, каб застацца пры здаровым розуме, я ўзяла і зьехала ў Філадэлфію.

ГАЛІНА: Ну й гісторыя, як з галівудзкага трылера.

ЯН: Ты не спрабавала сустракацца з амэрыканскімі беларусамі?

ХРЫСЬЦІНА: Не, я нікога там ня ведала, і мяне ніхто ня ведаў. Калі я перабралася ў Філадэлфію і стала працаваць у апякунчым доме для старых, дык першым беларусам, які мне сустрэўся ў Амэрыцы, быў Міраслаў з Сакольшчыны. З гэтай сустрэчай выйшла файная гісторыя, таму што раней мы бачыліся два ці тры разы пры нейкіх нагодах у знаёмых з Польшчы, ну й, вядома, успрымалі сябе як палякаў. Але аднойчы я заглянула ў адну царкву ў Філадэлфіі, гэта была нейкая ўкраінская ці карпата-русінская царква, і там я выпадкова сустрэла Міраслава. Ну й тады мы высьветлілі, хто мы й адкуль. Ён добра гаварыў па-беларуску, хоць у школе гэтай мове не вучыўся. Празь яго я прыйшла ці, лепш сказаць, вярнулася да беларушчыны.

ГАЛІНА, ЯН: ???

ХРЫСЬЦІНА: Ён сказаў, што нядаўна быў у Польшчы і заглянуў у рэдакцыю „Нівы" ў Беластоку, дзе купіў некалькі нумароў газэты і трохі беларускіх кніжак, і прывёз іх з сабою ў Амэрыку. Пра „Ніву", вядома, я ведала са школы ў Кленіках. Некаторыя вучні — але ня я — выпісвалі яе, часам мы чыталі „Зорку" на ўроках. Мне неяк ніколі да майго філадэлфійскага часу не падумалася, што „Ніву" можна чытаць як нармальную газэту, па-за школьным кантэкстам урокаў беларускай мовы. А вось у Філадэлфіі я пазычыла два-тры нумары „Нівы" ад Міраслава і прачытала іх *od deski do deski*, уключна з „Зоркай" і „Ніўкай". І, так сказаць, шчодра паліла тыя старонкі гарачымі сьлязьмі і халодным потам. Я першы раз адчула, пасьля таго чытаньня „Нівы", што ёсьць, усё-ткі, такое месца на зямлі — Беласточчына — куды я прыналежу мацней, чымся да ўсіх іншых месцаў разам узятых, і што ў гэтым жыцьці я ўжо ніякага падобнага месца сабе не знайду. Гэта было для мяне вельмі моцнае, *істотнае* перажываньне. Аднак жа сапраўдны *about-face* чакаў мяне яшчэ наперадзе. Як сказаць па-беларуску *about-face*?

ЯН: Ня ведаю. Магчыма: зьмена твару...

ХРЫСЬЦІНА: Няблага. Але гэта была для мяне ня толькі зьмена твару, але і нечага больш патаемнага. Сярод тых беластоцкіх кніжак, што я пазычыла пачытаць ад Міраслава, была адна, якая называлася *Джэймс Джойс, Уліс*. Як бы тут сказаць — больш дзівоснай кніжкі я раней не чытала і ўжо, відаць, ніколі пасьля яе нічога такога не прачытаю. Спачатку было нават досыць сьмешна — кніжка нібыта напісаная па-беларуску, але нічога нельга ўцяміць. Я прачытала некалькі старонак, поўных нейкіх таямнічых фразаў, словаў і заклінаньняў, і кінула яе да д'ябла. Ды ўсё ж той *самавіты, пульхны Бык Маліган высунуўся зь лесьвічнага праходу* і залез мне ў душу як клешч, ад якога немагчыма было пазбавіцца. Мінуў нейкі час, і я зноў узяла тую кніжку і прачытала некалькі незразумелых старонак, якія, аднак, дзіка мяне інтрыгавалі. А потым ужо не магла далей стрываць, пайшла ў кнігарню і купіла *Уліса* па-ангельску. Цяпер я мела дзьве загадкі, таму што тыя фразы, якіх я не разумела па-беларуску, былі так сама незразумелыя па-ангельску. Мне спачатку падумалася, што вось менавіта ў тым і палягае сакрэт перакладу — каб напрыдумляць як мага больш незразумелых словаў і перакласьці імі ўсе цёмныя месцы арыгіналу. Аднак жа прынцып, паводле якога трэба было прыдумаць такое, а ня іншае слова, заставаўся мне няясны. Таму я прыйшла да высновы, — як мяркую, слушнай, — што ўсе тыя віннацёмныя і віннап'янныя словы усё ж маюць якоесьці ўцямнае значэньне, якое і я, і шмат хто іншы павінен прачытаць так сама — а калі яны мною не прачытваюцца, гэта зна-

чыць, што я проста нявучаная дурніца. Падвойна нявучаная дурніца — і ў ангельскай, і ў беларускай мовах. Наколькі беларускі *Улic* падсьцябнуў мяне да глыбейшага вывучэньня ангельскай мовы — сказаць цяжка. Магчыма, зь цягам часу я навучылася б яе і так. Ну а што тычыцца беларускай, дык тут справа бясспрэчная — бязь дзядзькі Яна Максімюка і ягонага *Улica* не было б ніякай Хрысьціны Граматовіч, а была б усяго „недарэчная кленіцкая пяціклясьніца" *Krystyna Gromotowicz* альбо філадэлфійская мэдсястра *Christine Gromotovich*. Мне не заставалася іншага выйсьця, як толькі чытаць *Улica* па кавалку і завучваць яго на памяць, спадзеючыся на тое, што некалі ў будучыні ўся гэтая музыка раптам стане мне зразумелай, і тады я змагу напісаць Яну Максімюку *e-mail* і папрасіць у яго кніжку з аўтографам.

ЯН: Дзякую за панэгірык, але гэта ў цябе людзі павінны цяпер прасіць аўтографаў...

ХРЫСЬЦІНА: Ты лічыш, што мае пераклады чагосьці вартыя?

ЯН: Я не лічу, я стопрацэнтна ўпэўнены.

ГАЛІНА: Я помню той дзень, калі Ян прыйшоў з працы і прынёс першыя твае пераклады, з Пасьвятоўскай. Ён адчыніў бутэльку віна і кажа: Я да гэтай пары думаў, што ў тых Кленіках апрача мужыцтва нічога іншага ніколі не заводзілася. Але вазьмі паслухай. І стаў чытаць Пасьвятоўскую па-беларуску. Гэта, кажа, паверыш ці не, пераклала дзеўка з Кленікаў, гэта значыць, з Сапава. Яна цяпер у Амэрыцы, але гэта ня мае ніякага значэньня. Яна наша, беластоцкая. І мы выпілі за тваё здароўе. Ян потым выпіваў за тваё здароўе яшчэ некалькі вечароў запар і ўсё чытаў мне твае пераклады. Пасьвятоўская — адна з маіх найбольш улюбёных паэтак, і я лічу, — калі мая хатняя думка тут можа мець нейкае літаратурнае значэньне, — што па-беларуску яна гучыць яшчэ больш сэксуальна, чымся па-польску.

ХРЫСЬЦІНА: *Thank you*.

ЯН: Разьвяжы яшчэ адзін вузел свайго лёсу і скажы „Правінцыі", як ты патрапіла на ўнівэрсытэцкія курсы *creative writing* у Амэрыцы. Я разумею, што для амэрыканцаў гэта нічога надзвычыйнага, там кожны, хто навучыўся пісаць, раней ці пазьней удзельнічае ў такіх курсах. Вось мой старэйшы сын, Ігар, ходзіць у амэрыканскую школу ў Празе, і *creative writing* у яго — адзін са школьных прадметаў, які ён можа сабе выбраць. Але ж для эмігранткі, якая паехала ў Амэ-

рыку дзеля грошай — курсы складаньня вершаў ня ёсьць зусім банальнай справай...

ХРЫСЬЦІНА: А што тут незвычайнае? Калі чалавек ужо сказаў А, то сказаць Б ня так і цяжка. Калі я ўжо стала завучваць *Уліса* на памяць, то наступны крок — курсы *creative writing* — быў проста непазьбежны. А кажучы сур'ёзна, мяне падмовіла адна студэнтка Пэнсылвэнскага Штатнага Ўнівэрсытэту, зь якой я пазнаёмілася падчас яе лекаваньня ў нашым шпіталі. Я ўжо тады была паздавала экзамэны на ліцэнзію мэдсястры і працавала ў гарадзкім шпіталі як *full-fledged nurse*. Тая студэнтка, Даен, нейк потым сустрэла мяне на вуліцы і мы пагаманілі ў кавярні і пасябравалі бліжэй. Аднойчы я ёй прачытала свой верш на ангельскай мове, які мне напісаўся, калі я працавала ў доме для пастарэлых і на начным дзяжурстве зубрыла падручнікі *nursing*, рыхтуючыся да дзяржаўнага экзамэну. Даен „павыцягвала" зь мяне і іншыя вершыкі, якія мне таксама тады напісаліся, а потым падмовіла запісацца на гадавыя курсы *creative writing*, якія вёў адзін зь яе прафэсараў. У прынцыпе, яны былі для студэнтаў унівэрсытэту, але там таксама было некалькі чалавек звонку, як я. Усё гэта мне абыйшлося ў 500 даляраў за год, уключна з публікацыяй калектыўнага зборнічка нашай групы, які называўся *Unmentionable Pleasures*. Заўважальнай зьявай амэрыканскага літаратурнага жыцьця ён ня стаўся, але й ніхто на гэта не разьлічваў. Падобных зборнічкаў, у падсумаваньне розных курсаў і варштатаў, у Амэрыцы выходзіць процьма, і ніхто сабе ня дурыць імі галаву.

ЯН: Ці ты магла б нам прачытаць нейкі свой верш?

ХРЫСЬЦІНА: Ды не, я ніводнага ўжо ня помню.

ГАЛІНА: Ну дык хаця б кавалак?

ХРЫСЬЦІНА: Калі кавалак, то добра. Я напісала яго ў часы свае працы ў доме для старых, куды амэрыканцы здаюць сваіх бацькоў, каб яны там паміралі. Там быў такі адзін старэча, называўся ён *Branko*, па паходжаньні, відаць, сэрб. Я ня помню, каб яго хто-небудзь калі-небудзь наведваў. У яго была цяжкая астма, і яго мучыла бяссоньніца. Ён часта прасіў мяне, калі я была на начным дзяжурстве, каб я прыйшла да яго і пасядзела зь ім у ягоным пакоі. Ён казаў, што яму хопіць таго, калі я буду толькі сядзець і маўчаць. Яму са мною, казаў ён, лягчэй дыхаць. Я сядзела зь ім, маўчала і зубрыла свае падручнікі. І напісала такі кавалак:

Whom do we speak to
when we are silent?
We surely do it
in our unknown way.
We surely do it
so one can feel by our side
in the darkness
an intimate friend breathing there
breathing deep in the net.

ЯН: *Excellent*. Тваё здароўе, Хрысьціна.

Алесь Аркуш

Полацкія запісы (2)

(старонкі зь дзёньніка)

19.06.1999. Учора ўвечары цягнікам Варшава — Санкт-Пецярбург вярнуўся дахаты з Казімежа-Дольнага, дзе ладзілася канфэрэнцыя-сустрэча рэдактараў культурніцкіх выданьняў з Польшчы, Беларусі, Украіны й Расеі. Зь Беларусі таксама ўдзельнічалі Акудовіч, Анціпенка, Бабкоў, Булгакаў, Дынько. Першы дзень, 14-га, пачаўся дакладам Акудовіча, разглядаліся зьявы „цэнтар" і „правінцыя" ў культуры, Акудовіч даводзіў, што нацыянальныя культурніцкія прасторы пры наяўнасьці сёньняшніх сучасных камунікацыйных сродкаў актыўна разбураюцца, на поўным сур'ёзе пераконваў, што Мірскі замак, Эгіпецкія піраміды і вежа Эйфэля цяпер знаходзяцца ад нас на адной адлегласьці. Празь дзень, 16-га, Ігар Бабкоў агучыў тэрмін „вайна культураў", які ўвёў у беларускі мысьліўны дыскурс Акудовіч сваім аднайменным эсэ. Бабкоў і Акудовіч сьцьвярджалі, што нацыянальныя культуры ўвесь час знаходзяцца паміж сабой у барацьбе, больш моцныя няспынна наступаюць, слабейшыя абараняюцца. „Мілітарысцкі" тэрмін беларусаў астатнія ўдзельнікі сустрэчы ня вельмі ўхвалілі, нават крытыкавалі за радыкалізм і катэгарычнасьць, маўляў, гэткае разуменьне стасункаў культураў будзе замінаць іх дыялёгу. У дыскусіі пра „лібэралізм" і „кансэрватызм" я выказаў думку, што гэтыя катэгорыі нельга супрацьпастаўляць і тым больш спрачацца адносна таго, што прагрэсіўнае, а што нэгатыўнае, бо ўсё ў сьвеце, у тым ліку і сацыяльныя і культурніцкія зьявы, імкнецца да раўнавагі, якую можна здабываць з дапамогаю дзьвюх супрацьлегласьцяў, гэтак сама, як працуюць вагары, такім чынам, „лібэралізм" і „кансэрватызм" — гэта не шляхі, а інструмэнт, якім карэктуецца шлях. Напачатку 90-х я змагаўся за лібэралізацыю беларускага літаратурнага працэсу, для мяне беларускі літаратурны масіў, напрацаваны за папярэднія 60-70 гадоў, быў адназначна кансэрватыўным. Напрыканцы 90-х корпус тэкстаў, створаны за савецкім часам, згубіў сваю кансэрватыўнасьць. Для мяне цяпер загадка: што сёньня зьяўляецца сапраўдным кансэрватызмам у беларускай літаратуры? Але я мушу шукаць здаровы кансэрватызм, каб мець магчымасьць здабываць раўнавагу.

25.06.1999. У БДУ на філфаку адбылася сустрэча зь перакладчыкам беларускае літаратуры на польскую мову Чаславам Сэнюхам, (ён перакладаў мае вершы, прозу і літаратуразнаўчыя артыкулы для ольштынскага часопісу „Borussia", № 15/1997). У траўні я гасьцяваў у ягонай варшаўскай хаце, падараваў гаспадару нашыя найноўшыя выданьні, гутарылі пра падзеі ў Беларусі. Спадара Сэнюха цікавілі незалежніцкія аспэкты, распытваў пра палітычныя навіны і мае прагнозы, бо мяркуе напісаць для правай „Польскай газэты", зь якой супрацоўнічае, шэраг футуралягічных матэрыялаў пра Беларусь: што будзе калі... Калі даведаўся, што я цікаўлюся гісторыяй мошчаў сьв. Андрэя Баболі, звазіў мяне на сваёй машыне ў санктуарыюм езуітаў, у якім цяпер захоўваюцца сьвятыя мошчы. Дарэчы, гэтыя мошчы з 1808 году, калі езуіты забралі іх зь Пінску, да 20-х гадоў нашага стагодзьдзя, калі камуністычныя вандалы рэквізавалі астанкі каталіцкага сьвятога на так званую гігіенічную выставу ў Маскву, захоўваліся ў Полацку. Затым Ватыкан дамогся перадачы мошчаў Каталіцкаму Касьцёлу, а ў 1939 годзе з Рыму мошчы былі перавезеныя ў Варшаву, дзе й захоўваюцца па сёньняшні дзень. (Цікава, што сьведкам гэтай урачыстай цырымоніі — прыбыцьця машчэй ў Варшаву, быў палачанін Сяргей Кажан, былы сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі, у якога я летась браў інтэрвію для „НН"; у 39-м годзе сп. Сяргей з Заходняй Беларусі быў прызваны ў польскае войска і ўдзельнічаў у забесьпячэньні парадку падчас цырымоніі.) Спадар Сэнюх спрабаваў наладзіць маю сустрэчу з пробашчам санктуарыюму, але той на кантакт не пайшоў. Напэўна, езуіты баяцца, што Полацак можа запатрабаваць вяртаньне мошчаў.

І вось новая сустрэча са сп. Сэнюхам. На гэты раз у Менску. Людзей сабралося няшмат. Арлоў, Славамір Адамовіч, Булгакаў, некалькі філёлягаў з БДУ (у тым ліку Мархель, Язэп Янушкевіч, Ірына Багдановіч). Я прыйшоў на сустрэчу з Тацянай і сынам Антонам, мы як-

Алесь Аркуш, Славамір Адамовіч, Часлаў Сэнюх і Уладзімер Арлоў

раз усе гэтым днём былі ў Менску. Сп. Сэнюх распавёў пра сваю працу над перакладам „Новай зямлі" Якуба Коласа, чытаў урыўкі з паэмы, адказваў на пытаньні. Нягледзячы на свой сталы век, сп. Чэслаў застаецца энэргічным, дасьціпным, камунікабэльным чалавекам, які, спадзяемся, яшчэ шмат зробіць карыснага дзеля Беларусі.

11.08.1999. Учора ў гасьцях былі Васючэнкі: Пятро, Ніна і Марыля. Пятро зь сямейнікамі прыехаў наведаць бацькоў. Вечар прагаманілі, узгадалі тэвээлаўскую імпрэзу ў Лепелі, парагаталі. Ніна разгледзела мае чарапкі, якія мы з Тацянай пазьбіралі паўзь Дзьвіну. Яе найбольш зацікавілі кавалачкі кафлі XVII ст., як яна іх ідэнтыфікавала, і аскепак керамічнага коніка-сьвісьцёлкі з гэтага ж часу. Цікава, што і ў тыя цяжкія, прагматычныя часы (трэба было найперш думаць, як выжыць, ацалець) людзі выраблялі ня толькі функцыянальныя рэчы, але й забаўкі, аздобу.

„Віцебскі кур'ер" надрукаваў мой артыкул пра патрэбу беларускага пантэону, у якім я даводжу, што самае прыдатнае месца дзеля стварэньня агульнабеларускага пантэону — Сафійскі сабор, які мог бы стаць сымбалем беларускага экумэнізму, яднаньня й сумоўя.

Валерка Булгакаў прыслаў абяцаную кнігу Лявона Юрэвіча „Жыцьцё пад агнём" пра Барыса Рагулю. Хачу напісаць рэцэнзію для „Калосься".

14.08.1999. На Дзьвіне сустрэлі Андрэя Глушкова. Выбраліся з Тацянай прагуляцца і ўбачылі яго за працай — вёў свае прыватныя археалягічныя дасьледаваньні. Андрэй паказаў знаходкі: бурацінка (манэта), завушніца ў выглядзе вялікага мэталёвага кальца, дробныя кавалачкі бранзалету. З дапамогаю рыдлёўкі ён паднімае пясок з дна ракі і прасейвае праз адмысловае сіта. Як прызнаўся Андрэй, гэтым разам не шанцуе. Мы з Тацянай прайшліся ўздоўж ракі з боку Экімані. На пяску пазьбіралі багата кавалкаў керамікі: аскепкі керамічнага посуду, кафлі. Гэтыя чарапкі Ніна Васючэнка ідэнтыфікавала пераважна XVI-XVII стагодзьдзямі. Найбольш кераміка сустракаецца па левым беразе ракі. Андрэй гэта тлумачыць тым, што ў Экімані знаходзілася слабада ганчароў, побач зь Дзьвіною стаялі печы для абпальваньня керамічных вырабаў. Запрасілі Андрэя да сябе ў госьці. Амаль дзьве гадзіны прагаманілі пра ягонае захапленьне. Расказаў, што сёлета знайшоў камень (пясчанік або ракушачнік), у якім сядзіць прастакутны кавалачак невядомага мэталу. Знаходка выклікала шэраг пытаньняў: па-першае, як гэты кавалачак патрапіў у камень? Калі натуральным чынам, дык адбылося гэта некалькі

мільёнаў гадоў таму. Па-другое, што гэта за мэтал? Бо ён непадобны ні на жалеза, ні на медзь, ні на чыгун, ні на бронзу. Мэтал вельмі цьвёрды — рысуе шкло, зусім някрануты іржою, толькі зьлёгку пакрыты патынай. Самародным мэталам ён таксама ня можа быць. Да ўсяго іншага шмат пытаньняў выклікае прастакутная форма мэталічнага кавалачка. Карацей, загадка суцэльная.

Зь серады (11-га) Вінцэсь Мудроў у Смаргоні, на радзіме жонкі. Штодзень тэлефануе. Цяжка яму без навінаў і размоваў пра літаратуру. У жніўні ў яго адпачынак, паведаміў, што будзе працягваць пісаць успаміны пра свае юначыя прыгоды.

30.08.1999. Пачаў зноў перачытваць тэксты, якія маюць дачыненьне да полацкай філіі „Маладняка". Асабліва мяне ўразіла апавяданьне Сымона Хурсіка „Адам Залес". Гэты празаік па сканчэньні Белпэдтэхнікуму ў 1925 годзе прыехаў настаўнічаць у Валынцы, гэтае мястэчка сёньня знаходзіцца ў Верхнядзьвінскім раёне. У гэтым жа годзе ў бібліятэчцы „Маладняка" выдаў сваю першую кнігу — зборнік апавяданьняў „Першы паўстанак". Пазьней пераехаў у Полацак, працаваў у „Чырвонай Полаччыне", уваходзіў у полацкую філію „Маладняка". Дарэчы, „Адам Залес" — адно зь першых апавяданьняў Хурсіка, так бы мовіць, яго дэбютная публікацыя (апавяданьне ўпершыню друкавалася ў „Савецкай Беларусі" ў 1924 г.). Вось цытата з твору: *Не! Чалавек яшчэ занадта жывёліна!.. Хоць я памыляюся: гэта ў наш час людзі адракліся ад усялякіх законаў, парадку і сталі падобнымі да зьвяр'я. Шкада гэтых бедных людзей — усіх шкада!.. Хоць многія з іх толькі шыбеніцы й вартыя. Але такіх шкадаваць не прыходзіцца, бо яны самі сябе шкадуюць; чорт з імі. Нехта, бадай, разумны, сказаў, што ўлада псуе людзей, і гэта праўда, клянуся сваім гонарам, што ўсё гэта праўда! Зірніце наўкол: без дысцыпліны — ні кроку. Эх, жалкія людзішкі!.. Крычыць, лямантуе за праўду, а сам, чуць дарваўся да чужога дабра, так і абажрэцца ім, сумленьне сваё за медны грош, за паперку нікчэмную прадасьць!..* Так спавядаўся перад героем апавяданьня выпадковы спадарожнік, які назваўся Адамам Залесам. Цікава, што сам герой апавяданьня, якога, напэўна, можна атаясамляць з аўтарам, не асудзіў погляды спадарожніка. Дзеля таго, каб „выратаваць" твор, Хурсік напрыканцы апавяданьня ўводзіць зусім недарэчны, ананімны юнацкі голас спадарожніка зь верхняй паліцы, які апошнімі словамі ганіць Адама Залеса за ягоныя „контррэвалюцыйныя" погляды. Магчыма, гэты юнак-камсамолец зьявіўся ў творы Хурсіка з дапамогаю рэдактара, сёньня ўжо немагчыма дазнацца праўды.

У мяне нарадзілася ідэя перавыдаць полацкіх маладнякоўцаў. Большасьць зь іх, да масавых рэпрэсіяў 30-х гадоў, так і не пасьпела выдаць свае кнігі: Г. Брэская, Я. Козік, В. Сянкевіч і інш. Кепска, што ў Полацку, ні ў Музэі Беларускага Кнігадрукаваньня, ні ў цэнтральнай бібліятэцы, ні ў мясцовым дзяржаўным архіве не захаваліся полацкія друкі 20-х гадоў — газэта „Чырвоная Полаччына", альманахі „Наддзьвіньне", „Росквіт", „Зарніцы". Адшукаць творы полацкіх маладнякоўцаў можна толькі ў Менску, або ў архівах Масквы і Пецярбургу.

21.09.1999. Прачытаў у ВБЭ артыкул пра Петруся Броўку. Ні слова пра тое, што прыканцы 20-х гадоў паэт нейкі час узначальваў полацкую філію „Маладняка", што ўваходзіў у „Літаратурна-мастацкую камуну", што разам з Шукайлам, Скрыганам, Шалаем ды іншымі „камунаўцамі" выдаваў часопіс „Росквіт". Не сумняюся, што аб „футурыстычных" гадах Броўкі не прачытаеш ні ў манаграфіях пра ягоную творчасьць, ні ў літаратуразнаўчых акадэмічных біяграфіях. На самой справе менавіта гэтыя гады зьяўляюцца самымі цікавымі старонкамі творчага жыцьця Броўкі, выкрасьліўшы іх, як памылкі маладосьці, ён пазбавіўся магчымасьці ўратаваць сваю творчую біяграфію. Толькі Скрыган у сваёй біяграфічнай аповесьці „Кругі" крыху распавёў пра тыя часы. Броўка, відавочна, лічыў іх кампрамэтуючымі і несур'ёзнымі. Гісторыя разьмеркавала інакш — кампрамэтуючымі сталіся ягоныя вершы пра партыю, Леніна й камунізм.

01.10.1999. Толькі нядаўна заўважыў „дробную" памылачку ў рэцэнзіі Галубовіча („ЛіМ", 23.08.1999) на мой зборнік „Выбранае". Памылачка схавалася ў цытаце майго вершу „Нонканфармізм". У „ЛіМе" чытаю:

Бо Д'ябла можна спакушаць
На ўзроўні цэнаў і пасадаў,
Улады, страўніка, акладаў —
І толькі гэтак кіраваць.

На самой справе гэтыя радкі гучаць крыху інакш (стар. 38):

Бо Д'ябал можа спакушаць
На ўзроўні цэнаў і пасадаў,
Улады, страўніка, акладаў —
І толькі гэтак кіраваць.

Наўрад ці памылачка закралася па недаглядзе карэктаркі, задужа вялікія сэнсавыя зьмены прынесла чаргаваньне гэтых дзьвюх літар.

25.11.1999. Учора ўвечары прыехаў да мяне ў Полацак Ігар Сідарук. Літаральна за дзень да ягонага прыезду дамовіўся з Андрэем Аляксандравым аб імпрэзе ў Полацкім Унівэрсытэце. Схадзілі зь Сідаруком ў Эўфрасіньнеўскі манастыр, у Спаскай царкве Ігар паставіў сьвечку. Гэтым жа днём прыехаў да сястры ў Наваполацак Уладзя Арлоў. Я прапанаваў Уладзю таксама паўдзельнічаць у імпрэзе. Атрымалася цудоўная вечарына. Сідарук чытаў новыя вершы і прозу. Асабліва прыхільна і эмацыйна публіка ўспрыняла апавяданьне „Скула", сьмехам сустракала ледзь ня кожны сказ. Уладзя чытаў запісы са сваіх кішэнных нататнікаў, падараваў унівэрсытэцкай бібліятэцы сваю новую кнігу „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі". Гэтая сустрэча сталася першай прэзэнтацыяй сёмага нумару „Калосься". Наступная адбудзецца 27-га.

Атрымаў па пошце ад Алега Дзярновіча кнігу Рыгора Клімовіча „Конец ГОРЛАГА", якая выйшла ў сэрыі „Архіў Найноўшай Гісторыі". Вельмі добрая і карысная кніга.

27.11.1999. З раніцы сустрэў на полацкім чыгуначным вакзале Чаропку і Сыса, якія прыехалі на прэзэнтацыю сёмага нумару „Калосься". Абодва былі добра „пад мухай". Сыс распавёў, што ўсю ноч правёў з маладымі лейтэнантамі, якія нападпітку лаяліся на ўладу і казалі пра патрэбу стварэньня сапраўднага беларускага войска. На памяць пра сябе яны падаравалі паэту попельніцу, зробленую з кулямётнай стужкі, а паэт прэзэнтаваў новым знаёмым газэту „ЛіМ" са сваімі вершамі. Чаропка, калі садзіўся ў вагон, папярэдзіў праваднiцу, што ноччу будзе весела, бо ў Полацак едзе сам Сыс. Але яна, напэўна, не ўяўляла, што будзе *так* весела. Вагон цэлую ноч гудзеў як вулей. Сысу пагражалі высадзіць яго ў Воршы, але да Воршы паэт займеў шмат хаўрусьнікаў (у тым ліку і маладых лэйтэнантаў), якія пазьбіраліся ў сысоўскі вагон з усяго саставу, і пасажыры, якія былі незадаволеныя гулямі паэта, мусілі зьмірыцца. Сыс адразу выказаў жаданьне пакаштаваць полацкага піва, я паабяцаў, што абавязкова пачастую ў хаце. Купілі зваротныя квіты і рушылі да мяне. Сыс прыняў душ і палекаваўся півам. Я меркаваў, што зраблю для гасьцей пешую экскурсію па Полацку, але пасьля сьнеданьня Чаропку ўклалі спаць, а мы з Тацянай і Сысом засталіся гутарыць на кухні. Сафійку Сыс убачыў толькі з акна аўтобуса, калі мы ўсе разам ехалі ў Наваполацак на прэзэнтацыю. Сыс уважліва ўглядаўся ў абрысы храма. Ці згадваў ён у гэтыя хвіліны свае радкі зь верша да Пімена Панчанкі? А верш той кончыцца наступным чынам:



Анатоль Сыс

бо пад небам Сафіі полацкай
на народных паэтаў моляцца.

У наваполацкай бібліятэцы да нас далучыўся Арлоў, які і пачаў вечарыну. Сыс сядзеў у зале сумны і маўклівы. Як пазьней высьветлілася, яго нудзіла язва страўніка. Калі Сысу далі слова, ён пачаў, безь ніякага ўступу і вітаньня, чытаць вершы, але неяк нягучна і нэрвова. Затым спыніўся на палове верша і скрушна прамовіў: „Чаму так плакаць хочацца?" Пайшоў сеў на ранейшае месца, але праз пару хвілінаў усё ж вярнуўся на імправізаваную эстраду. Чытаў ён вершы са зборніку „Пан Лес" (які з раніцы падараваў яму я, бо свайго ён даўно ўжо ня меў — усе раздарыў), з апошняга „ЛіМу" і з часопісу „Роднае слова" (10/1999). Гэта была ўжо цьмяная копія Сыса канца 80-х — варажбіта вершаванага слова, трыбуна.

Назад, у Полацак, нас завёз на сваім „уніяцкім" аўтобусіку Мікола Шарах. Разам зь менскімі гасьцямі да мяне паехаў і кампутаршчык ТВЛ Лявон Сас (Сыс адносна яго сказаў, што бачыць па вачох — Лявон добры чалавек; падпісаў яму сваю кнігу, побач з аўтографам занатаваў свой адрас — запрашаў у госьці). Да позьняга вечару сядзелі ў мяне на кухні. Гаманілі, узгадвалі нешта з ранейшых гадоў. Сыс

гаварыў зусім мала, жаліўся на страўнік, нават папрасіў вады з содай. Хоць і прапускаў кілішкі, але ўсё адно піў разам з усімі. Ноччу, а палове першай, я праводзіў Сыса і Чаропку на менскі цягнік.

15.12.1999. Прэзэнтацыя „Калосься" ў Калегіюме (14.12) прайшла ўдала. Людзі сабраліся розныя: ад бумбамлітаўцаў (Вішнёў, Сін, Баярын) да „фрагмэнтаўцаў" (Бабкоў, Акудовіч). Былі Арлоў, Баршчэўскі, Сыс, Адамовіч, Аксак, Кісьліцына, Сільнова, Сьлінко, Данільчык, ды іншыя (каго ведаю). Праўда, адсутнічалі „архэўцы", а „Нашу Ніву" прадстаўляў Мухін. І яшчэ адна неспадзяванка: „Калосьсе" мы прадстаўлялі ўтрох — я, Гумянюк і Чаропка. Не змаглі прыняць удзел у імпрэзе Кавалёў, Мудроў і Вашко. Дапамог Алесь Камоцкі — прыйшоў на прэзэнтацыю і выканаў некалькі сваіх песень. Вёў вечарыну я — расказаў пра віленскае „Калосьсе" 30-х гадоў, пра гісторыю стварэньня цяперашняга, пазнаёміў са зьместам сёмага нумару. Чаропка казаў пра свой раманец „Поўны керкешоз", Гумянюк чытаў вершы. Па сканчэньні вечарыны Анціпенка запрасіў у офіс Калегіюму. Адзначылі прэзэнтацыю. Бабкоў прапанаваў замовіць Акудовічу тэкст „Няма Расеі", усе горача падтрымалі, патэлефанавалі Акудовічу і па чарзе пачалі ўгаворваць спадара Валянціна. Затым нас з Тацянай запрасілі да сябе Арловы, на арлоўскай кухні прагаманілі некалькі гадзінаў да полацкага цягніка.

Сяргей Шыдлоўскі

Прастора гераічнага

Рака і мяжа — тыя палюсы, паміж якімі фармавалася полацкае грамадзтва XVII стагодзьдзя. Ваеннае памежжа — сьвет гераічна-эпічных кантрастаў і аксіялягічнай пэўнасьці, заснаванай на апазыцыі „свой — чужы", сьвет муроў. Рака — чыньнік падставовы — не дала гэтым мурам ператварыцца ў кітайскія. Дзьвіна ёсьць камунікацыяй, гандлем, асьветніцтвам — брамай у памежных мурах. Межы Полацак ніколі не любіў, адсоўваючы іх як найдалей за свае ваколіцы — гэта была экспансія гандляроў, дойлідаў, асьветнікаў і сьвятых. Горад на сотні кілямэтраў пасунуў мяжу на захад — і паўстала Беларусь. Чужая для Полацку ўсходняя мяжа ВКЛ і Масковіі падрывала эканамічныя сувязі і культурную місію краю, але не адмяніла іх.

Сваёй мэтафарай „жыцьцё пры дарозе", апавядаючы аб лёсах беларускага, Алесь Аркуш выявіў пласт нэгатыўных значэньняў транзытнай прасторы-пусткі. „Жыцьцё пры дарозе" — антыпод жыцьцю пры рацэ. Дарога арганізуе тэхнагенную прастрань, рака — прастору культуры. Полацак, які паўстае з брамы чыгуначнага вакзалу, і Полацак з набярэжнай — гэта розныя гарады. У першага лёс павятовай станцыі, другі — караблём-нэфам Сафіі чакае сустрэчнага ветру гісторыі.

Два Полацкі нітуюцца ў нашай сьвядомасьці. Той, што мы ведаем цяпер, — уласна горад, але нашыя продкі адрозьнівалі таксама і Полацак як край. Гэта ўся лясная прыдзьвінская роўнядзь з прадмесьцямі-фарпостамі, адлеглымі адзін ад аднога на сотні кілямэтраў. Менавіта палачанамі называлі жыхароў беларускага Падзьвіньня летапісныя крыніцы. Чым ёсьць тады сучасная Полаччына як ня ўсёй Беларусьсю ў ейных этнаграфічных межах. Пазбаўце палачанаў гэткага ўяўленьня, і Беларусь не далічыцца тысячы гадоў уласнай гісторыі. Сучасны Полацак — фундатар беларускага гістарычнага дыскурсу і донар для сталічнай адраджэнскай эліты. Але наўрад ці з гэтага свайго капіталу сымбаляў горад будзе мець адсоткі ранцье, гэтаксама як і Тураў, Заслаўе, Друцак... (Балазе, акрамя сымбалічнага капіталу ў Полацку ёсьць расейскі нафтаправод, наваполацкія хімічныя вытворчасьці ды ўнівэрсытэт — першапачаткова інстытут нафта-хімічнага профілю. Нафтавая рака дублюе раку прыродную.)

Гамагеннасьць прыдзьвінскага ляндшафту, ягоная „дзьвінацэнтрычнасьць" (крыніцы і ручаіны краю імкнуць да галоўнага рэчышча) — ёсьць тым эмацыйным чыньнікам, што нараджае ўсьведамленьне супольнага. Лучнасьць ляндшафту прадвызначае агульнасьць гістарычнага лёсу. Вандроўкі па крывіцкім чарналесьсі Ўсяслава Чарадзея, Яна Баршчэўскага і Язэпа Драздовіча прасякнутыя адчуваньнем свойскасьці. Гэта, мусіць, тое, што разумелі скан-

дынавы пад паняткам „мідгард" — унармаваная абжытая прастора, як родны двор дзяцінства, у акрэсе тыну якога знаходзілася столькі чароўнага, хвалюючага, але бясьпечнага.

Зь вежаў полацкіх бажніц можна ахапіць позіркам увесь край, а на берагах Нешчарды ў цішыні („шорах моўкнасьці" — Я. Юхнавец) праслухоўваецца праўда Паўночнай Беларусі. Полацкая ідэя не разьмінулася зь ляндшафтам і штодзённасьцю. Таму яна „нетранспартабэльная", вымкнуўшы за арэал родных краявідаў, палачане, як правіла, пазбываюцца актуальнай моцы, асьвечанай легітымуючым полацкім „капірайтам", каб пры жыцьці перамясьціцца ў каталёгі музэіфікатараў.

Тапаграфія папярэднічае гістарыяграфіі. Абмеры зямельных уладаньняў падчас рэформы каралевы Боны ўвыразьнілі абрысы літоўскай Сарматыі. З рэкагнасцыровак і памежных абмераў тэрыторый, захопленых кацярынінскімі генэраламі, паўставалі абрысы сучаснай Беларусі. Менавіта на падставе тапаграфічных даведак ўзьніклі першыя ўзоры айчыннай гістарыяграфіі — „Апісаньне Віцебскай губэрні" Пятра Катлоўскага, „Исторические сведения о примечательных местах Белоруссии" М. Без-Карніловіча ды іншыя. Пры ўсёй сваёй імпэрскай скіраванасьці яны ня страцілі навуковай каштоўнасьці — ляндшафт ня так падпадае фальшаваньню, як пісьмовыя крыніцы.

Пачынальнікі беларускага самапазнаньня М. Гарэцкі ды К. Вераніцын (аўтар паэмы „Тарас на Парнасе" з Гарадку) былі каморнікамі-землямерамі. Перад тым, як прамовіць сваю формулу беларушчыны, — яны выхадзілі яе пешшу. Вось і першы айчынны падручнік геаграфіі А. Смоліча заслугоўвае цяпер на пачэснае месца ў анталёгіі беларускай гісторыі ідэй.

Побач з традыцыяй-тэкстам заўжды прысутнічае традыцыя-ляндшафт, што ўплывае сваімі эканамічнымі і афэктыўнымі складнікамі на сацыяльна-палітычнае поле. Гэта канфлікт дзьвюх розных моваў, якія, гаворачы аб аднолькавых рэчах, ствараюць адрозныя рэальнасьці. Адраджэнская традыцыя, угрунтаваная на формулах сваіх сакральных тэкстаў, паходжаньне якіх узыходзіць да віленскіх краявідаў XIX ст., адмаўляе ў культуратворчай каштоўнасьці сучаснаму соцыякультурнаму ляндшафту. Усё б добра, але тарашкевіца не валодае дастатковай крэатыўнасьцю, каб спарадзіць з уласнай літары „абяцаную зямлю" — рэальнасьць альтэрнатыўную.

Полацак знаходзіцца ў тым шчасным пункце, дзе ляндшафт выходзіць на паверхню сэмантычнай уцямнасьці. Рака, лес, верасовыя пусткі, балаты, азёры, дарогі, камяністыя палі ангажуюцца тут гісторыяй, гарызанталь краявіду трансфармуецца ў вэртыкаль сылюэту бажніц. Гісторыя існуе ў полацкім пэйзажы як патэнцыя, як працяг ляндшафту ў сацыяльнае. Ляндшафт акумулюе ў сабе набор магчымых гістарычных падзеяў, якія „ўчытаныя" ў краявід (напрыклад, „палі баёў"), — паваротки дарогі нясуць у сабе патэнцыі гістарычных пэрыпэтый, а пагоркі, лагчыны, вазёры выконваюць мнэматычную функцыю. Вакол гэтых дамінантаў канцэнтруюцца легенды і паданьні. Традыцыйная сьвядомасьць схільная вымяраць гісторыю ў мерах прасторавай адлегласьці, — паміж швэдзкай інтэрвэнцыяй і вайной з французамі 1812 году ў прызвычаеным успрыманьні пралягаюць не стагодзьдзі, а кілямэтры, якія падзяляюць „швэдзкія могілкі" ад возера, дзе пахаваны „Напалеонаў скарб". Зьнікненьне летапісных крыніц не пазбаўляе нас памяці, бо ляндшафт, апасродкаваны тапанімікай, ёсьць падкладкай гістарычных падзеяў, што тут адбываліся ці адбудуцца.

Лес зьяўляецца тым топасам, які навочна дэманструе асаблівасьці прасторавых уяўленьняў традыцыйнай беларускай культуры. У ейным кодзе ён „сэмантычна маркіруе Поўнач і Верх", то бок „лес аказваецца максымальна прыцягнутым да сфэры сакральнага" (С. Санько). Для заходнеэўрапейскай традыцыі характэрнае хоць і дыфэрэнцыяванае ў залежнасьці ад сацыяльнага становішча і культурнага цэнзу, але збольшага насьцярожанае стаўленьне да лесу. Гэтая амплітуда вагаецца ад вобразу нетраў-пустэльні, поўных інфэрнальных сіл, у якіх выпрабоўвалі сваю веру клірыкі, і да лесу-вольніцы браканьераў-вілянаў. І для адных, і для другіх лес быў „універсумам чароўных і страхоткіх легендаў" (Ж. Ле Гоф). Заходнеэўрапейскія лясы поўняць звыродлівыя пачвары, калі ж знаёмісься зь беларускімі паданьнямі, складваецца ўражаньне, што самымі мацёрымі насельнікамі прыдзьвінскіх нетраў былі самі крывічы, князі якіх зьяўляліся ваўкалакамі. „Зачараваны сьвет" пратрываў у гэтым лясным краі як найдаўжэй. Выбар станоўчага ці адмоўнага знаку ў занаваньні тэрыторыі ў традыцыйным грамадзтве залежаў ад ступені ейнай абжытасьці, — для нашых продкаў лес быў не чужой прасторай: „І жыцьцё, і сьмерць

родняць чалавека зь лесам; лёс рэдзіць людзей, людзі рэдзяць лес" (Р. Барадулін).

Кніжнік Сімяон ня мог прайсьці паўз такі тэкст, якім зьяўляецца „кніга прыроды". „Кніга прыроды" — адна з „мэтафар Барока", адсюль і назва энцыкляпэдычнай працы С. Полацкага „Вертоград многоцветный". У тэкстах апошняга алівы, фігавыя дрэвы і вінаградныя лозы дамінуюць паводле колькасьці згадак над тубыльчымі крушынамі і соснамі. Пабожны паэт лепш арыентуецца ў тапаграфіі і батаніцы Эдэму, чымся роднай зямлі. Нетры ягонага „вертаграду" насяляюць ільвы, малпы ды іншыя вучоныя зьвяры, што валодаюць мастацтвам палымянай казані. Лес для С. Полацкага — сфэра язычніцкага, у адрозьненьне ад вертаграду, саду — канцэнтраванай мэтафары культуры, культуры ў ачышчанай ад больш позніх напластаваньняў форме — культуры як апрацоўкі зямлі, прыроды. Прыроднае, „калючае", як крушына ў творы паэта „Презрение достоинства и желание почета", — мусіць належыць агню — смалістаму цяпельцу, на якім смажацца свавольнікі „в темной пропасти, в огненном океане". Сад С. Полацкага — гэта дыдактычная катэгорыя, чужая пастаральным сэнтымэнтам. „Дзікі" аўтэнтычны ляндшафт, як і ягоныя насельнікі — нацыі, — яшчэ ня вынайдзеныя, гэтыя адкрыцьці будуць зробленыя праз колькі стагодзьдзяў.

Сьвет у творах Сімяона Полацкага — гэта кунсткамэра цудоўных праяваў і чалавечай марнасьці: Эгіпет, Мэмфіс, вежа Фарос, Эляда, слаўная Алімпам і стодам Зэўса, Калёс у Радосе, Эфэс і храм Дыяны, Маўзалей Артэмізія, Бабілён, Амфітэатар Рыму. Аддаючы даніну пашаны „Сямі цудам" мінуўшчыны, С. Полацкі не забываецца і на рэаліі новых часоў: „Христофор Колумб вокруг света обошел,/ От чудовищ морских мучений натерпелся", „Мудрый Америго, плывя по воде,/ Немало ужасов от морских животных/ Претерпел, пока достиг неизвестных стран" (С. Полоцкий, с. 108). У гэтых радках чуецца пракаветнае „за трыдзявятай зямлёй". „Чудовища морские", ад якіх „натерпелись" слаўны Калюмб ды мудры Амэрыга, выплылі ў творы С. Полацкага з глыбіняў архетыповага. У гэтай новай пераніцоўцы гісторыі пра Ёну і кіта капэрнікаўская карціна сьвету мірыцца праз эпічны расьпеў з царкоўнай дактрынай.

Геаграфія, як і гісторыя, доўгі час заставалася біблійнай дысцыплінаю. Гэта была геаграфія этычнага — канглямэрат памятных мясьцін грэхападзеньня і кантактаў з Боскім, аксіялёгія, што атрымала працяг у тапаграфію, дзе ўсход і захад, поўдзень і поўнач, поле і лес, левае і правае маюць свае эквіваленты на шкале дабра і зла. Вандроўка Калюмба ў „паўднёвыя краіны" асацыявалася для носьбітаў сярэднявечнай вучонасьці зь біблійнай сымболікай, а традыцыйная сьвядомасьць, у сваю чаргу, упісвала ў калюмбаву вандроўку свае пракаветныя знакі. Поўдзень — прадоньне і адначасна страчаны Эдэм, хвалюючая амбівалентнасьць, як пакінуты недзе на поўдні паўночны полацкі край.

Геапалітычныя арыентацыі Полацку традыцыйна ляжалі ў плашчыні „Поўнач-Поўдзень". Гэта ня толькі шлях „з вараг у грэкі", што нітаваў у Полацку Скандынавію зь Бізантыяй, але таксама і пасярэдніцкая роля паміж Вялікім Ноўгарадам і Кіевам, аб чым сьведчаць архітэктурныя помнікі і знаходкі археолягаў. Альгердаў шлях, паводле народных паданьняў, арыентаваны менавіта з поўдню на поўнач, што адпавядае ня столькі тапаграфічнай, колькі міта-паэтычнай праўдзе. У беларускай традыцыйнай мадэлі сьвету зьвязка „Поўнач-Поўдзень" мае каштоўнасныя нагрузкі, зьвязаныя з апазыцыямі „верх-дол", „сакральнае-інфэрнальнае", дзе Поўнач адпаведна верх, а дол — Поўдзень (С. Санько).

Калі „Поўнач-Поўдзень" былі для Полацку кірункам эканамічнага развою і культурных кантактаў, то геапалітычная вось „Захад-Усход" стала спадарожніцай войнаў і разбораў, вытокі якіх ляжалі далёка ад мясцовых інтарэсаў. Да распрацоўкі міталягемы Ўсходу дачыніўся і С. Полацкі. „Океан восточной власти ти годует/ А юж западны тобе ся готует./ Слонцу Восток, Запад ровне подлегают,/ Даст Бог тебе, слонце, вси царем узнают" (С. Полоцкий, с. 38) — дэклямуе паэт, ці то сьцьвярджаючы, ці то прадракаючы пурпуровы ўсход маскоўскай вялікадзяржаўнасьці. Як і многія вобразы й ідэалягемы, міт Усходу распрацоўваецца С. Полацкім з дапамогай антычных узораў глёрыфікацыі. Маскоўскага цара паэт прыпадабняе Аляксандру Македонскаму.

Уяўленьні пра ляндшафт — люстра суб'ектыўнасьці эпохі, ейнага грамадзкага краявіду. Зь якога пункту сацыяльнага бачыўся С. Полацкаму ягоны Вертаград? Поле сацыяльнага як „гістарычна ўтвораная прастора", ёсьць вытворным ад прасторы прыроднай і адначасова месцам, дзе фармуюцца прасторавыя ўяўленьні і спосабы трансфармаваньня ляндшафту

(П.Бурдзьё). Разглядаючы погляды С. Полацкага на сацыяльнае, мы сутыкаемся зь ідэалягічным пасылам, у якім мала месца неадрэфлексаванай інэрцыі традыцыі. Сімяон Полацкі, выхаванец Кіева-Магілянскай Калегіі і Віленскай Езуіцкай Акадэміі, тагачасных асяродкаў усходнеэўрапейскай гуманістычнай думкі, ідэю чалавечай дабрароднасьці вырашае ў рэчышчы рэнэсанснай канцэпцыі чалавека. Засноўваючыся на рэлігійным пастуляце стварэньня чалавека паводле вобразу Божага, рэнэсансная ідэалёгія дэкляравала свабоду чалавечай волі і роўнасьць кожнага чалавека ў Богу. Гэтую ідэю мы знаходзім і ў творах С. Полацкага. Паэт сьцьвярджае: „Все мы по образу Божьему, все мы — адамиты". Кожны нараджаецца роўным і годным, але, маючы свабоду маральнага выбару, чалавек можа згубіць падставу гэтай годнасьці — вобраз Бога ў душы. Шляхціц — гэта перадусім той, хто патрапіў захаваць повязь з боскім першаўзорам. Адсюль выснова С. Полацкага: „Кто богат достоинствами, по праву может быть наречен/ Дворянином, хоть бы был рожден от простецов неизвестных./ А кмет і дворянин без достоинств — холоп, хотя рожден от благородных" (С. Полоцкий, с. 91). Факт нараджэньня ад дабрароднага продка ня можа даваць перавагі на вагах шляхецкай годнасьці: „всякая кровь портится і невечна". Вайсковая шляхецкая служба разглядаецца паэтам не як прывілей, а як адно са шматлікіх рамёстваў.

Пэўную пазыцыю займае С. Полацкі і ў дачыненьні да багацьця: „Богатства три некия имут вещи в себе,/ яже не попущают вселится в небе". Адзіным памысным спосабам прымяненьня грошай, на думку паэта-манаха, зьяўляецца дабрачыннасьць. Сьвецкая ўлада таксама ня робіць ейных уладальнікаў дабраароднымі: „Рад отказаться, порой откупиться/ От больших чинов, кто не дурак", — прыдворны паэта, мусіць, ведаў, пра што пісаў.

Фармулюючы сацыяльны ідэал, С. Полацкі дэклярує яго адкрытым для памкненьняў любога чалавека, незалежна ад паходжаньня, наяўнасьці чыну ці маёмасьці. У асяродзьдзі рамесьнікаў, беднаты і клірыкаў С. Полацкі бачыць апірышча боскім і царскім справам. Галоўны цэнз: верная служба царкве і манарху, што мае на ўвазе індывідуальную дабрароднасьць і працу-служэньне, працу як служэньне. У тропы антыквізуючай сьвецкай модзе, С. Полацкі, каб сьцьвердзіць дабрароднасьць працы агулам і рамесьніцкай працы ў прыватнасьці, выводзіць ейную генэзу ад антычных багоў: „Сметливая Арахна пряжу придумала,/ Чтоб наготу нашу удобно укрыть./ Также і ткачей всякими изделиями/ Благодаря ее изобретению мы облагодетельствованы" (С. Полоцкий, с. 132). Прыёмам вывядзеньня радавых генэалёгій з антычнай гісторыі карысталіся і шляхецкія ідэолягі. Гэта была агульнаэўрапейская стратэгія глёрыфікацыі (згадайма францускі прыдворны культ Геркулеса Гальскага ці айчынную мітагістарычную вынаходку, дзякуючы якой валадары ВКЛ выводзілі свой радавод ад рымскага патрыцыя Палямона). Ідэал С. Полацкага — гэта своеасаблівае шляхецтва без гербоў, генэалёгій і радавых замкаў. Рыцарам сутаны ды прастолу і бачыў сябе С. Полацкі: „мечь ё азъ, подражая Христу Госпаду, отъ устъ моихъ испущаю, не человеки убивающій, но злобы ихъ, і лукавства ихъ посещающій, сухія ветви от древа отрезающій... Мечь духовный, на духовныя извлекаю, і секу нещадно ихъ злобы".

С. Полацкі, зразумела, ня быў утрапёным дысыдэнтам і аддаваў належнае і традыцыйнай канцэпцыі трохчастковага функцыйнага падзелу грамадзтва на сьвятароў, вояў і земляробаў: „Блюди свое сословие: молитва Симу/ Дана, плуг — Хаму, а меч — Иафету" (С. Полоцкий, с. 108), але само грамадзтва, сучаснае паэту, зламала гэтую дэклярацыйную статыку акурат у той ступені, якая і дазваляла сыну купца рабіць кар'еру клірыка і дзяржаўнага дзеяча. „Паэтычныя вольнасьці" С. Полацкага былі санкцыянаваныя часам. Эксцэсы шляхецкіх вольнасьцяў змушалі многіх палітычных мысьляроў Рэчы Паспалітай знаходзіць ідэальныя грамадзкія ўзоры ў самых нечаканых месцах, у асяродзьдзі іншых сацыяльных клясаў і нават іншаверцаў. Шукаць падтрымку „палітыцы велічы" ў бюргерскім асяродку вымагалі і агульнаэўрапейскія палітычныя тэндэнцыі. Падобная задача патрабавала перафармуляваньня сацыяльнага ідэалу, падпарадкаваньня яго новым палітычным рэаліям. С. Полацкі сваім паходжаньнем і выхаваньнем быў да гэтага падрыхтаваны.

Існуе сапраўдны інстытут полацкіх стратаў і нязьдзейсьненых праектаў. Гэта вельмі аптымістычны інстытут — ён дэманструе памер тутэйшых патэнцый і амбіцый. „Страты" — неабходная драпіроўка гістарычнай дыскрэтнасьці, без падобнага маскаваньня гамагеннасьць традыцыі не была б відавочная. Тое, што мы не патрапілі яўна залічыць у свае набыткі, мож-

на правесьці па графе „свайго страчанага". З расьцярушаных і непрачытаных архіваў, з раскіданых камянёў бажніц прарастае сучасная беларуская самасьвядомасьць, пачатак якой далі археалягічныя і археаграфічныя вышукі. Накіраваўшыся колькі дзесяцігодзьдзяў таму на пошукі полацкага крыжа Эўфрасіньні, мы ў працэсе гэтых росшукаў набылі беларускую незалежнасьць, выяўляючы большую рупнасьць хутчэй у вяртаньні крыжа, чымсьці дзяржаўнасьці. (Сюжэт для айчыннага У. Эка — беларуская прэзыдэнцкая дзяржава як ускосны прадукт, пабочнае адгалінаваньне тысячагадовай гісторыі з крыжом Эўфрасіньні.)

Полацкі лябірынт — ці ня самая амбітная крывіцкая „страта", бо яна галіцца на ляндшафт, прэтэндуе на асаблівыя дачыненьні з прасторава-часавым кантынуўмам (згадайма „Лябірынты" В. Ластоўскага). Але гэтая міталягема няпоўная — хтанічная прырода лябірынту-сутарэньня вымагае наяўнасьці свайго салярнага спадарожніка. І ён, гэты крывіцкі Эдэм, існуе. У адрозьненьне ад Лябірынту, адносна тапаграфіі і месцазнаходжаньня Саду ёсьць больш пэўныя зьвесткі. Ян Баршчэўскі, напрыклад, лякалізуе ягонае месцазнаходжаньне ў экіманскіх уладаньнях паноў Белі-ковічаў. Урэшце, „Вертаград" С. Полацкага можна ўважаць ягоным віртуальным філіялам, заўжды гатовым разгарнуцца на прасторы айчыннага гуманітарнага дыскурсу.

Асьветніцтва, на думку Пітэра Бэрка, ёсьць атрыбутам паўночна-лясного экатыпу культуры. На Полаччыне і за Эўфрасіньняй, і ў часы С. Полацкага ладную частку году людзі праводзілі ў памяшканьнях пры сьвятле лучыны, што стымулявала фантазію і цікавасьць да кнігі. Па сутнасьці, пра тое самае пісаў і Ян Баршчэўскі ў „Нарысе паўночнае Беларусі", гаворачы пра „фантазію і мелянхалічны дух" беларусаў. Мяжа надала гэтаму сьвету мітаў і легенд гістарычнае вымярэньне, а рака ўлучыла яго ў сусьветны кантэкст.

Літаратура:

1. *История ментальностей, историческая антропология*, Российский государственный гуманитарный университет, Москва 1996.
2. Ж. Ле Гофф, *Цивилизация средневекового Запада*, Москва 1992.
3. С. Полоцкий, *Вирши. Сост., подготовка текстов, вступ. ст. и комм. В. К. Былинина, Л. У. Звонаревой*, Мінск 1990.
4. С. Санько, *Некаторыя падставовыя прасторавыя і часавыя структуры ў беларускім фальклёры*, „Крыўя", Мінск 1998, № 1 (3), с. 3-37.

Правінцыйная сталіца

Наваградак — першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, часовая рэзыдэнцыя галавы праваслаўнай царквы, а затым — уніяцкай. Горад Адама Міцкевіча. Сёньня гэта звычайны савецкі райцэнтар, палепшаны вонкава адно дзякуючы нядаўнім 200-м угодкам усё таго самага вялікага польскага паэта. Як жывецца ў такім горадзе літаратару? Пагатоў, калі гэта жанчына, прычым не паэтка, а празаік, што па-за сталіцай сустракаецца вельмі рэдка. Гэтая пісьменьніца — ТАІСА СУПРАНОВІЧ. Яна расказвае, як і пра што піша, як яе ўспрымаюць чытачы, увогуле яе землякі-наваградцы.

Таіса СУПРАНОВІЧ: Я зусім не разумею, як можна пісаць прозу ў велькім горадзе. Там гэтая мітусьня, там транспарт, які я не ўспрымаю. Мне здаецца, што каб пісаць прозу, трэба хадзіць усюды пешшу, трэба думаць, трэба аналізаваць усіх, хто табе сустракаецца, позіркі кожнага. А як мне жывецца? Справа ў тым, што я ж пачала пісаць у 40 гадоў. І тут малы такі горад, і мяне ўсе ведалі. І, так здавалася, была нармальная, нармальная жанчына, як абывацель думае. А тут раптам у 40 гадоў раз, як мой сын кажа, — перамкнула, і пачала нешта пісаць. А яшчэ мне саслужыў, сам таго ня ведаючы, ня вельмі добрую службу Генрых Далідовіч. Ён прыехаў сюды, прачытаў маю першую „Радуніцу", тут сабралася многа народу, і ён кажа: „У вас вот ёсьць пісьменьніца" — і мне такія панэгірыкі. Што напісала „Радуніцу", на вельмі высокім прафэсійным узроўні, гэта першае было маё апавяданьне. І ўсе на мяне глядзяць як быццам нешта са мной здарылася, што мяне трэба лячыць. І я потым паўгода хадзіла, як каля слупа ганьбы.

Ну, а потым выйшла „Радуніца", усе пачыталі „Радуніцу". І так неяк здарылася, што Далідовіч мне адразу прапанаваў, што выйдзе мая кніжка. Я зусім не пішу там зьявы прыроды, не пішу лірычныя адступленьні, а пішу толькі пра ўзаемаадносіны мужчыны і жан-

чыны. Пішу на беларускай мове. Калі тут бяруцца кніжкі на рускай мове, яны чытаюцца, вельмі цікава ўсім пра гэтыя ўзаемаадносіны. Але як гэта напісаць на беларускай мове, каб чыталі? Я тады так вырашыла для сябе: калі мяне будуць чытаць палякі, беларусы, рускія і іншыя, калі чалавек прыйдзе стомлены з работы дадому, калі возьме маю кніжку і ён зь ёю не засьне да дзьвюх гадзінаў ночы, вось толькі ў такім разе я адчую сябе на сваім месцы, што пачала пісаць у 40 гадоў. І на самай справе выйшла мая кніжка, і вот Наваградак, маленькі горад, станоўчыя якія моманты. Як Федарэнка гаварыў, вось выйшла яго кніжка і — як камень у ваду, ніякага водгуку, нідзе ніхто слова не сказаў. То тут зусім па-іншаму. Пачалі людзі мне званіць, падзяку выказваць. Кніжкі мае купляюць, прыносяць, каб я іх падпісвала. Я падпісвала і ў Англію, дарэчы, і недзе ў Сібір. Я зразумела, што я карысную справу раблю, я на беларускай мове пачала пісаць вось такія рэчы.

Я так стараюся пісаць, каб мая мова была жывая, каб у мяне не было такога, як недзе я чытала. Жанчына не ўспрымае беларускую мову — ані, тым ня менш яна ў гасьцях за сталом гаворыць, што я яе ненавіджу, але яна гаворыць на беларускай мове. Як гэта так можна?

Сяргей АСТРАЎЦОЎ: Гэта зьява вядомая.

Т. СУПРАНОВІЧ: Я стараюся так: калі гэта полька, Ванда, яна гаворыць — „мамуся", гэта яе слова, яна ня можа сказаць „мама". Ці, напрыклад, „тата", яна ня можа. Яна „татусь" гаворыць. Ці я напісала апавяданьне „Камні ў нырцы", я рускую мову ўклала ў вусны доктара, гэта вельмі адмоўная фігура. Ну ніяк ня мог ён на беларускай мове гаварыць, таму што беларуская мова цяпер, я так лічу, што мова інтэлігентаў, часьцей гуманітарыяў. А ў той жа вёсцы яна ўжо зьнікае. Я веру, што беларуская мова ўзродзіцца, яна будзе існаваць, але толькі пойдзе ад інтэлігентаў, зьверху, бо зьнізу яна ўжо пайсьці ня можа. Бабуля ўжо гаворыць са сваімі ўнукамі толькі па-руску, пераходзіць на іхнюю мову. Мы езьдзім у вёску, начуем, падвозім заўсёды кагосьці з маіх аднаклясьнікаў. Я зь імі гавару па-беларуску, яны мне адказваюць толькі па-руску... Але людзі часта імкнуцца да беларускай мовы. Вось завуч вучылішча нашага. Рускі чалавек, прыежджы, ён другі раз перачытаў маю кніжку. Ходзячы, пытаючы ў біблятэкара, што азначае тое ці другое слова. Гэта вельмі, я лічу для сябе, для пісьменьніцы, вельмі станоўчы момант.

С. АСТРАЎЦОЎ: Вы спачатку сказалі, што людзі, як я зразумеў, адмоўна ўспрынялі, што вось — што гэта ёй уздумалася пісаць? Пасьля гэтага Вы самі сабе супярэчыце, кажаце, што людзі цікавяцца, усё ж такі чытаюць, і для іх цікава і важна, што ў іхнім горадзе не было пісьменьніка і вось цяпер ёсьць.

Т. СУПРАНОВІЧ: Гэта я ўжо пасьля таго зразумела, як мая кніжка выйшла. Многія ўспрынялі мяне добра і падтрымліваюць, і жадаюць здароўя, нават просяць: дайце ў рукапісах прачытаць. Кніжка выйшла, і Далідовіч напісаў звароты, каб кніжку маглі набыць на раён. Але прыйшло многа кніг, і гэтыя кніжкі праляжалі тры месяцы і ніхто не падумаў іх выкупляць. І ня выкупілі іх. Іх потым раскуплялі людзі, штосьці я забрала сама. І колькі людзі ні пытаюцца, звоняць: Ці ёсьць у бібліятэках кніжка Таісы Супрановіч?

С. АСТРАЎЦОЎ: Там пра ўлады нічога няма, я думаю. Гэта ўжо рэўнасьць такая ці што?

Т. СУПРАНОВІЧ: Там толькі пра адносіны мужчыны і жанчыны. Ёсьць мае разважаньні наконт сёньняшняга жыцьця. Ня выкупілі кніжку. Хай. У нас няма такой пісьменьніцы Таісы Супрановіч, — адказваюць. Таму што я працую ў бібліятэцы дзіцячай. Адзін чыноўнік гаварыў: „Кто она? Она проста заведующая какой-то маленькой библиотеки".

С. АСТРАЎЦОЎ: Я так разумею: Вы ня ўдзельнічаеце ў рухах, партыях. Адносіны да Вас зьмяніліся пасьля таго, як выйшла кніжка?

Т. СУПРАНОВІЧ: Як выйшла мая „Радуніца", тут была такая ўжо кампанія арганізавана, што проста ніхто не паверыць, але ж гэта было, гэта ўсе ведаюць. Выклікалі з Горадні праверку, трэсьлі тут, правяралі бібліятэку, калацілі, кожную кнігу перабіралі. Як гэта так, чалавек асьмеліўся. Як пісьменьнікі прыедуць зь Менску — гэта нармальна. У сваёй Айчыне прарокаў не бывае.

С. АСТРАЎЦОЎ: А што, Вы паказалі норавы гарадзкія адмоўныя, ці хтосьці сябе пазнаў?

Т. СУПРАНОВІЧ: Не, гэта было б дробязна. Я ўсіх сваіх герояў люблю. Далідовіч на прэзэнтацыі гаварыў, што адчуваецца: яна нават адмоўнага героя ў сваім творы любіць. Ва ўсякім разе, я ў сваіх творах нікога, здаецца, не пакрыўдзіла. Гэта зьбіральныя вобразы. Я не хачу з кагосьці сьпісваць, гэта так не ўпрыгожвае аўтара.

С. АСТРАЎЦОЎ: Але ва ўсякім разе, людзі пазнаюць, што гэта іх горад? Ці цікавасьць да Вас, што Вы пісьменьніца, якая жыве ў горадзе? Ці яны ў творах пазнаюць горад?

Т. СУПРАНОВІЧ: Горад не пазнаецца. Толькі ў апошняй аповесьці „Матчын зарук", выйдзе мая новая кніжка ў першым квартале 2002 году, якая таксама так называецца. Толькі там можна пазнаць, што гэта пра Наваградак пішацца. Там героі існуюць у гэтым горадзе. А так, я проста лічу... Вось у беларускай літаратуры вельмі многа цяпер гістарычнай літаратуры. А як паглядзіш: тут сэрыялы ідуць, тут кніжкі пра любоў усюды. У нас, у беларусаў, як усё роўна той любові няма. То чалавек у бочку залез, то ў студню залез, ня хоча вылазіць, то ў стог. Беларусаў усё робяць нейкімі. Працівагаз надзеў, хрэн церучы, і ўсе там спалохаліся. Разумееце, беларуса паказваюць, як быццам ён ня дружыць з галавой. А на самай справе беларусы, я лічу, што ў нас усё як у людзей. І тыя ж страсьці ракавыя, і ўсё. І не паказаць гэта... А беларуская мова генэтычна жыве ва ўсіх. Хай на рускай размаўляюць. На беларускай мове чытаюць, на беларускай, прыйдуць да мяне, стараюцца размаўляць і плачуць над той беларускай мовай, тыя страсьці чытаючы. А сам горад, я не раблю такога акцэнту, каб я апісвала той горад, у якім я жыву. Мне здаецца, што калі гэта любоў, калі гэта страсьць, то яна і тут, у Полацку, і ў Віцебску адна.

С. АСТРАЎЦОЎ: А гістарычныя раманы пра Наваградак пішуцца ў сталіцы. Можна ўспомніць і Кастуся Тарасава, і Вольгу Іпатаву, і Генрыха Далідовіча.

Т. СУПРАНОВІЧ: Яны пішуцца ў сталіцы. Вы знаеце што, гэтыя творы і гэтыя раманы, канешне, патрэбны. Але справа ў тым, што гэта такая інтэлектуальная літаратура для вузкага кола чытачоў. Таму што трэба падрыхтаванасьць, тут трэба знаць тое XIII ці XIV стагодзьдзе. А тое, што Ванда мая ня хоча ўспрымаць свайго мужа і ідзе як на катаргу да яго ў пасьцель, такое чытаньне падыходзіць для кожнага. Хай гэта не заўжды блізка, але знаёма.

С. АСТРАЎЦОЎ: А ўсё ж такі больш жанчыны чытаюць, каго больш цікавіць Вашая проза?

Т. СУПРАНОВІЧ: Знаеце, вось Данута Бічэль-Загнетава кажа: Таіса піша жаночыя раманы. А на самай справе, колькі мяне чытае мужчын... І мне здаецца, проста для мужчын вельмі і вельмі актуальна ўся гэтая душэўнасьць. Не актуальная нават, а блізкая. Лірызм душы, нават часам гэта бліжэй ім, чым жанчынам. Бо жанчына цяпер, такое жыцьцё, што яна можа троху жорсткая становіцца. Бо такое жыцьцё сёньня.

МІХАЛ КОСЬЦЬ — нарадзіўся ў 1965 г. у Беластоку. Вывучаў польскую філялёгію ў Філіі Варшаўскага Ўнівэрсытэту ў Беластоку. Адзінаццаць гадоў працуе як фотарэпартэр; цяпер у газэце „Кур'ер Паранны" ў Беластоку. Яго здымкі ілюструюць гэты нумар „Правінцыі" на старонках 3-4, 6, 8-11, 37, 62, 83, 97, 105, 124, 149, 161, 167.

Код беларускі

„Annus Albaruthenicus" (2000), „Annus Albaruthenicus" (2001), „Annus Albaruthenicus" (2002), Villa Sokrates, Krynki.



Беларусы — нацыя індывідуалістаў. Беларусы ня могуць нічога ладнага рабіць калгасам. Калі ворагі ці абставіны змушаюць іх да нейкага згуртаваньня, аб'яднаньня, задзіночаньня, хаўрусу — выходзіць абы-што. Калгасы сыпіваюцца і дэгенэруюць. Партыі ледзь ліпяць і хутчэй імітуюць існаваньне. Рэдакцыі сварацца. Газэты не жывуць больш за 10-15 гадоў. БНРы і БНФы расколваюцца напалам і клянуюцца, спараджаючы БЦРы і КХПы, нуду і фрустрацыю.

Аднак, як ні парадаксальна — Беларусь жыве. У чым сакрэт? Сутнасьць гэтай загадкавай зьявы найлепей схопленая адчайна-трагічным выслоўем: „ДЛЯ беларусаў можна нешта рабіць, а ЗЬ беларусамі — не". Цімала беларусаў, у горкай роспачы ад спробаў тварыць [беларускую нацыю, палітыку, культуру] ў тым або іншым хаўрусе з братамі па розуме, сыходзілі далей ад гоману — каб нікога ня бачыць і каб ніхто не замінаў — і працавалі на карысьць тых самых, іншых.

Пераспрабаваўшы за 90-я гады розныя формы беларускай сацыялізацыі ў палітыцы і ў творчасьці, Сакрат Яновіч абраў за лепшае зашыцца ў свой белавескі Патмос і пашукаць новых сэнсаў і формаў. Вынікам стаўся бадай што самы дзівосны і дзівацкі, варты зьдзіўленьня і захапленьня, фэерычны і фантасмагарычны, поўны загадак літаратурна-выдавецкі праект.

Правакуе ўжо сам ягоны назоў — „Annus Albaruthenicus". Гэта — нібы выпрабаваньне патэнцыйнага чытача на сур'ёзнасьць, на здольнасьць стрымацца ад непазьбежных эратычных/скаталягічных асацыяцыяў. Ну ды халера зь імі, несур'ёзнымі — *honni soit*, як той казаў, *qui mal y pense*. Што ні кажы, а лацінскія назовы на беларускіх вокладках не было відаць даўнавата. (Загадкай аднак застаецца — адкуль *-а-* у слове Albaruthenicus...)

Зьместавы каркас „Беларускага Году" складаюць матэрыялы штогадовых сымпозіюмаў — трыялёгаў, якія адбываюцца ў Крынках пад эгідай Stowarzyszenia (Згуртаваньня? Таварыства? Задзіночаньня? — ні ў водным з трох нумароў я не знайшоў беларускага варыянту) Villa Sokrates. Шкада, што ў пэрыёдыку няма аглядаў і паведамленьняў пра самі гэтыя трыялёгі — хто быў, як яно было, што казалі, што пілі, што ня трапіла на старонкі „АА". Кулюары — найцікавейшая частка любога сэмінару. Хочацца духу, рэфлексіі, сакратычнага бляску. І — здымкаў, подыху аўтэнтыкі... (Зноў загадка з антычнай філялёгіі — што азначае *трыя-* у слове „трыялёг"?)

Што да чысьціні эўражанру — дык пры старанным пераглядзе ў пэрыёдыку можна пазнаходзіць і амэрыканцаў, і натуралізаваных расейцаў. Дык можа й ня варта замыкацца на Эўропе — паняцьці расплывістым і штучным? Нашто зачыняць дзьверы перад неэўрапейцамі? А Беларусьсю і беларускай культурай цікавяцца ня толькі ў ЗША і Канадзе, але і ў Японіі, Індыі, Ізраілі дый ці мала дзе яшчэ.

Дый у Эўропе варта пашыраць абсягі — з далучэньнем Польшчы і Літвы да Эўразьвязу беларусы інстытуцыянальна стануць эўрапейскім народам — адным зь недабітых вартаўнікоў эўрапейскіх ускраінаў. Дагэтуль мы спрабавалі — і цалкам апраўдана — зьвярнуць на сябе ўвагу „вялікіх" эўрапейцаў — ангельцаў, немцаў, французаў. У трох выпусках „Беларускага Году" ўсе акулы беларусазнаўства з гэтых народаў фактычна сказалі ўсё што можна было на сёньня сказаць. Дык ці не настаў час зьвярнуць на сябе ўвагу *Другой* (ці можа нават *Трэцяй*) Эўропы?

Урэшце настала пара задаць галоўнае пытаньне — на каго разьлічаны „Год Беларускі"? Шматмоўнасьць выданьня нібыта падказвае просты адказ — тым, хто ведае ўсе гэтыя мовы або хоць

нейкія зь іх, найперш — замежным сябрам беларускае культуры. „Ня столькі для беларусаў, колькі менавіта для тых, хто цікавіцца [беларускай літаратурай]" — абвяшчаецца ў Слове Рэдактара, якім распачынаецца першы нумар. Варта аднак пагартаць усе тыя шматмоўнасьці, каб моцна занепакоіцца. Калі ў *аўтарскіх* тэкстах англамоўных, нямецкамоўных, франкамоўных гасьцей „Году" ўсё ў парадку за выняткам дробных карэктарскіх недаглядаў, дык перакладзеныя на розныя мовы тэксты беларускіх удзельнікаў лепш бы не траплялі на вочы тым, „хто цікавіцца", бо, баюся, адразу цікавіцца перастануць. Прычым калі англамоўныя тэксты, напісаныя на лёгка-пазнавальнай EEE (East European English), якую яшчэ можна разглядаць як наш тутэйшы рэгіянальны дыялект глябальнай ангельшчыны, дык „францускія" тэксты маскоўскіх аўтараў „Году" наагул не паддаюцца лінгвістычнай ідэнтыфікацыі. Прынамсі звычайны француз — без глыбокага веданьня сынтаксу, стылістыкі і фразэалёгіі расейскай мовы — іх наўрад ці зразумее. Магчыма, гэтыя творы былі вынікам тэставаньня нейкай прылады для аўтаматычнага перакладу.

Таму адказ на пастаўленае пытаньне будзе парадаксальны. „Annus Albaruthenicus" разьлічаны перадусім на беларусаў і прытым на тых, хто не абцяжараны веданьнем замежных моваў. Каб захапленьне эўрапейскасьцю і фэерычнасьцю выданьня не прымеркла ад сутыкненьня зь непісьменнасьцю або проста несумленнасьцю некаторых аўтараў/перакладчыкаў/рэдактараў/карэктараў.

Будзем лічыць, што трох выпускаў „Году Беларускага" было дастаткова для стварэньня пэўнай інтэлектуальнай аўры, зацікаўленьня і захапленьня сярод тых, хто *ня бачыць*. Настала пара задаволіць незадаволеных. Зьлезьці з Парнаса і прышукаць сабе паплечнікаў-рэдактараў, якія дапамогуць узьняць бліскучую ідэю на належны ёй узровень. Узровень варты Сакрата ды нашай фантастычнай Правінцыі.

Сяргей ШУПА
Вільня — Прага

У заблукалішчах кантэкстаў

Ігар Бабкоў, *Адам Клакоцкі і ягоныя цені*, Менск 2001.

Пасьля выхаду кніжкі Ігара Бабкова „Адам Клакоцкі і ягоныя цені" беларусаў можна павіншаваць — нарэшце і мы прычакалі першага постмадэрнісцкага раману ў нашай мове, хоць нам не пашчасьціла займець ніводнага мадэрнісцкага.

Было спадзяваньне на нешта такое — „постмадэрнісцкае" — з самага пачатку 90-х, калі наша прыгожае пісьменства паціху вымкнулася з асатанела-задушэўнага сэміялягічнага прыгону старэйшага брата і спрабавала пакрыёма прынюхвацца да паведаў зь іншых кірункаў. Бабкоў быў кандыдатам нумар адзін у постмадэрнісцкія аўтары, бо пісаў ён дастаткова складана і няўцямна, — пра што засьведчыў ягоны першы паэтычны томік *Solus Rex* (1992), — і ў такой трывожлівай манеры, якая намякала на нейкія глыбінна-страшныя віры пад цёмнай паверхняй мовы. *І глыбінёю жахлівай пужае забытая мова*, сьцьвярджаў Бабкоў, і мы ахвотна зь ім пагаджаліся, бо й самі ўжо былі трохі замачыўшы ногі ў каламутных струмянёх, што плылі наўзбоч ці насуперак адмэліяраванай канавы беларускае сацрэалістычнае пісьменнасьці.

У дадатак, характарам Бабкоў ня надта каб пасаваў да кантэксту пост-бээсэсэраўскага асьветніцкага ўздыму сярод так званай сьвядомай інтэлігенцыі, якая аптымістычна ўзялася прывучваць народ да ягонай новай, сувэрэннай долі. Бабкоў ёсьць тыпам самазаглыбленага самотніка, якога лёгка ўявіце над келіхам віна за кавярняным столікам або ў нешматлюднай спрэчцы недзе на мастакоўскім падстрэшшы, але ніяк не паставіце на купалаўскім сьвяце паэзіі ў Вязынцы, каб ён прачытаў свой верш пра шостага патрыярха паўднёвакітайскай школы зэн-будызму дзядзьком і цёткам з навакольных калгасаў. *Народ памёр*, сказаў аднойчы Бабкоў, што, акрамя ўсіх іншых сэнсаў, мела і той утылітарны: больш толку будзе, калі заняцца адукацыяй ня мёртвых мазгоў, а тых, што нараджаюцца і хочуць жыць. Увесь ланцужок ініцыятываў і заняткаў Бабкова ў мінулым дзесяцігодзьдзі — Цэнтар Эўрофорум, часопіс „Фрагмэнты", Беларускі Калегіюм — быў прысьвечаны якраз такому „антынароднаму" памкненьню стварыць у Беларусі з нуля „постмадэрнісцкую тусоўку", якая займела б схільнасьць да сузіраньня як нацыянальнага лёсу так і штодзённага, датыкальнага досьведу перш за ўсё ў мэтафізычнай пэрспэктыве. (Гэтая пэрспэктыва ўдакладнялася зь цягам часу і называлася па-рознаму: „эўрапейская", „цэнтральна-эўрапейская", „посткаляніяльная".) Прынагодным вынікам гэтага памкненьня сталася стварэньне кола чытачоў, якому можна было прапанаваць такія тэксты

як „Матар'ялы да жыцьцяпісу Адама Клакоцкага".

Мушу адразу заўважыць, [што] менавіта прабелы, — між словамі, між аповедамі, і нават між літарамі — мусяць быць прачытаныя найбольш уважліва, бо менавіта прабелы, недагаворанае, *і даюць у гэтай кнізе сапраўдны ключ да разуменьня цэльнасьці ўсяго тэксту,* — перасьцерагае нехта Францішак Эн. у нечым накшталт літаратуразнаўчага камэнтару да кніжачкі (якая суправаджаецца таксама дзьвюма ўводнымі зацемкамі і двума эпіграфамі ды, як і належала спадзявацца ад стваральніка „Фрагмэнтаў", мае скрайне фрагмэнтарную структуру). З аднаго боку, аўтаіранічныя камэнтары належаць да тыповага набору постмадэрнісцкага наратыву, у якім чытачу часьцяком прапануецца ўсумніцца ў існаваньні як аўтаномнага аўтара так і аўтаномнага тэксту. Бабкоў — то бок, ягоны неаўтаномны *alter ego*, Францішак Эн. — прапануе ўсумніцца ва ўсім наогул, называючы сваю/ягоную кніжачку „дзесяцьцю мэдытацыямі з нагоды неіснаваньня сьвету". З другога боку, вышэй працытаваная перасьцярога нагадвае лішні раз, што мы маем дачыненьне з тэкстам, які не вычэрпваецца, так бы мовіць, толькі сваёй тэкстуальнасьцю, а праграмна скіроўвае свае сэміялягічныя пасылы ў абшары кантэкстаў, што застаюцца ў *прабелах* і абавязкова патрабуюць да-прачытаньня ў іншых тэкстах.

Гісторыя пад назвай „Магдачка" знакаміта ілюструе гэткую „эканомію пісьма", дзе згаданым адсутнасьцям тэксту і прагалам наканавана выконваюць самую актыўную ролю. На паверхні — усё даволі проста. Наратар распавядае, як яму ўдалося высьветліць таямніцу аднаго здарэньня зь ягонага дзяцінства, калі ён, жывучы ў бабулі на хутары, аднойчы вечарам убачыў, як зь неба падае мёртвая парашутыстка. Пакуль дайсьці да прасьвятленьня, ягонае жыцьцё праходзіць праз фазы дысідэнцтва (наратару выдаюць паэтычны томік *Арфэй у пекле* за мяжою), нармалізацыі (наратара саджаюць у савецкую вар'ятню) і стабілізацыі (наратар працаўладкоўваецца як архіварыюс). Прасьвятленьне адбываецца ў „забытым правінцыйным гарадку ў штаце Нью Джэрсі" ўжо ў нашу эпоху, калі стала магчыма пабачыцца з „тымі зь Нью Джэрсі".

Калі каму трэба, „Магдачку" можна ўспрымаць у кантэксьце ідэалягічнай спрэчкі з савецкай „шпіёнскай тэмай", якая ў беларускім пісьменстве ня надта каб выкаласілася асобным ад савецкага загончыкам, ды ўсё ж заўважна прысутнічае, прыкладам, у архетыпных „Палескіх рабінзонах". Канкрэтна бабкоўскі „парашутысцкі матыў" раней закранаўся ў такіх выданьнях як „Па воўчых сьцежках" (па-беларуску) і „Квадрат Б-52" (па-расейску). Асабліва ўражвае ў іх, што кадэбэшным прапагандыстам так і не ўдалося ўцямна растлумачыць, якую ж гэта страшную выведніцкую мэту мелі тыя парашутысты, скінутыя ў беларускія лясы і хмызы. Міжвольная выснова з такіх публікацый — цээрушнікам конча трэба было дазнацца, колькі насамрэч кароваў і падсьвінкаў гадуецца ў беларускіх калгасах — гучыць даволі непераканаўча, каб не сказаць — абсурдна.

Нічога ўцямнага таксама не вынікае з кніжкі *The Very Best Men* (Simon & Schuster, 1995) журналіста *Newsweek*'а Івэна Томаса (Evan Thomas), якому ў пачатку 1990-х ЦРУ дазволіла ўпершыню пагартаць папкі сваіх сакрэтных апэрацый з пачатку 1950-х. Маўляў, ЦРУ высылала парашутыстаў (ня толькі ў Беларусь, але і ў Прыбалтыку ды на Ўкраіну) дзеля таго, каб выйсьці на сувязь і скаардынаваць дзеяньні антысавецкага збройнага супраціву ў памянёных падсавецкіх краёх. Выйсьці на істотную сувязь (і ўстанавіць, ці ўвогуле існаваў нейкі супраціў) не ўдалося, а ўсе тыя разьведвальныя групы былі даволі хутка пералоўленыя і ліквідаваныя савецкімі МУС і КДБ (у значнай ступені дзякуючы інфармацыі ад савецкага супэрагента ў брытанскай разьведцы Кіма Філбі). У гісторыі ЦРУ і Халоднай Вайны акцыя з парашутыстамі засталася як мілітарна экстравагантны і зусім неістотны эпізод. У пачатку свае дзейнасьці ЦРУ мела шалёныя грошы і ідэі, але ні на грош досьведу ў савецкіх справах.

Самым няясным і адначасова цікавым падаецца пытаньне матывацыі тых маладых людзей, ваенных уцекачоў ад саветаў, якія добраахвотна пагадзіліся прайсьці неабходнае навучаньне і вярнуцца *туды* на парашутах. У „Вяртаньні нацыяналіста" (Менск, 1997) Аляксандар Лукашук фармулюе гэтую матывацыю — у адносінах да Янкі Філістовіча ў прыватнасьці і да ўсіх іншых беларускіх парашутыстаў у агульнасьці — з гледзішча „беларускага нацыянальнага фундамэнталізму": у беларусаў ёсьць свая айчына, асобная ад савецкай, і зь верай у сэнс змаганьня за яе вярнуўся на парашуце „нацыяналіст". Ягоная ахвяра, цьвердзіць Лукашук, не была дарэмнай.

Бабкоў у „Магдачцы" пакідае палітычна-ідэалягічны вузел „парашутысцкай праблемы" па-за кадрам — хоць ён, натуральна, актыўна прысутнічае ў пастуляваных *прабелах* — і пераносіць дыскурс зь ідэалягічнага вымярэньня ў псыхалягічна-эстэтычнае. *Мы ўсе тут шукаем чагосьці іншага, завем адзін аднаго забытымі мёртвымі імёнамі, якія ўсё яшчэ жывуць у нас* — гэта зь дзёньніка Магдачкі, калі яна была *там*, на Захадзе, і адчайна нечага шукала, таксама ў абдымках шэрагу мужчын. На нейкі час, па волі аўтаномнага наратара І. Бабкова, Магдачка стае каханкай нямецка-моўнага жыдоўскага паэта Паўля Цэляна, які, як і яна, таксама быў вымушаны пакінуць сваю радзіму. Ён, дарэчы, не спрабаваў вярнуцца. Але, таксама як і гераіня Бабкова, выбраў скачок у цямрэчу.

У нас, беларусаў, наўрад ці ёсьць агульная радзіма, кажа Бабкоў. Хутчэй за ўсё, некаторыя з нас носяць асобную, прыватную радзіму ў сваім сэрцы. Затое ў нас было агульнае пекла, па якім бадзёра маршыравалі піянеры. У тое пекла аднойчы ўпала зь неба мёртвая Эўрыдыка — у гэтай

„вывернутай" антычнай мэтафары Бабкоў спрабуе перадаць павеў таемнага фаталізму, які ўсе „беларускія праекты" мінулых і цяперашніх часоў закінуў на паліцы Архіву Клакоцкага. Герой і наратар апавяданьня, які намагаўся стаць Арфэем, пасьля пяцьдзясяткі даўмеўся, што *[тое] ўтульнае пекла, з сваімі аўтобусамі і тралейбусамі, піянерамі і палкоўнікамі, з словамі, якія нешта значылі, і кнігамі, якія былі напісаныя крывёю, — усё гэта засталося толькі ў маёй памяці*. Не йснуе нешта такое як агульная памяць і агульнае выратаваньне.

„Магдачка" — выдатная гісторыя, вартая таго, каб уключыць яе ў канон беларускага апавяданьня. Я спэцыяльна запыніўся на гэтай гісторыі, таму што іншыя знакамітыя рэчы ў кніжцы Бабкова — прыкладам, „Менская опэра", „Матар'ялы да жыцьцяпісу Адама Клакоцкага", „Стары сябра з Захаду" — былі вядомыя беларускаму (і польскаму) чытачу значна раней, у часопісных варыянтах. Як той казаў, яны ўжо ўдастоіліся належнай увагі і ацэнкі.

Аматараў інтэлектуальных гульняў і блуканьняў па іншых кантэкстах эўрапейскай культуры і гісторыі, магчыма, не падвядуць і астатнія фабуляцыі Бабкова ў ягонай дэбютнай кніжцы прозы. Мяне асабіста крыху расчаравалі „Кафэ У Топія" і „За фіранкамі", дзе аўтар празь меру патурае сваёй схільнасьці „інтэлектуалізаваць" сваіх герояў, так і не знаходзячы тае шчымлівае ноткі, якая гучыць у „Магдачцы". Але, як кажуць, кожнаму сваё. Закончу гэты тэкст без папрокаў, аптымістычна: *casus* Бабкова ў беларускай літаратуры пацьвярджае значна агульнейшую ісьціну, якая кажа, што не абавязкова трэба пісаць, каб стацца важным пісьменьнікам. Часам дзеля гэтага хапае ўмела расставіць прабелы.

Ян МАКСІМЮК, Прага

Бежанства, якое вяртае

Бежанства 1915 года, Праграмная рада тыднёвіка „Ніва", Беласток 2000.

Дзяцінства запісвае словы наймацней. Мама. Дом. Птушка. Кветка. Сонца. Запісаныя ў дзяцінстве словы прымаюць канкрэтны, несьціральны сталымі гадамі кшталт і вобраз. Кветка — хаатычна рассыпаныя рамонкі на выгане. Птушка — верабей, што прыляцеў ад сьнежных садоў і цікуе ў цёплую бездань вакна.

Слова *бежанства* атаясамліваецца мне з бабусяй Верай, і чамусьці засела яно ў маёй памяці клятчастымі радзюжкамі, сшытымі ў агромнае радно, распасьцёртае на драўляных каблуках над фурманкай-жалязьняком. Такі малюнак запаў у дзіцячую сьвядомасць маёй бабусі, яна воляй-няволяй перахоўвала яго і пеставала, каб паўстагодзьдзем пазьней, мабыць, таксама міжвольна, перадаць яго мне. Таму слова *бежанства* адно зь нешматлікіх, якія беспамылкова ідэнтыфікую, калі зазіраю ў сваю самую першую сьвядомасьць.

Запісаныя ў дзяцінстве словы звычайнеюць у маладосьці. Там яны — будзённыя дні. Бо маладосьці, па зразумелых і вартых апраўданьня прычынах, усюды як рукой падаць. Усюды, ды не ў будні. Будні ідуць пад сукно, у магічнае *заўтра*. І мабыць толькі зараз я займеў час схіліцца над рамонкам. Пералічыць белыя пялёсткі. Упіцца араматам летняга дня. І толькі зараз, калі гартаю энцыкляпэдыю, зьдзіўляюся, што мой свойскі верабей паводле лацінскай тэрміналёгіі — *Passer domesticus*. А затым, з разгубленасьцю ўглядаюся ў велізарную карту Расейскай Імпэрыі і нават збольшага ня ўмею назваць месца, дзе спачывае мая прабабка Дарыя. На сорак другім годзе жыцьця, на шляху між Войнаўкай і Царыцынам, пайшла ў зямлю так цьвёрдую ды камяністую, што прадзед Цімафей прымушаны быў разьбіваць яе кіркай. Ведаю яшчэ, што на гэтай зямлі не было ніякіх дрэваў, і мая народжаная ў Белавескай Пушчы прабабка спачывае між камянёў, загорнутая адно ў клятчастую радзюжку. Ніякая кніжка маёй хатняй бібліятэкі не называе гэтае месца. І ніякая энцыкляпэдыя не называе імя васьмігадовага хлопчыка, брата маёй бабусі, які назаўсёды застаўся на невядомым мне чыгуначным прыпынку, у пшанічнай у той час Украіне. І яшчэ шмат якія імёны.... Імя невядомага бацюшкі, які дзесяцігадовую Верку, якую з-за накінутага бальшавікамі голаду аддалі на выхаванне ў мясцовую мусульманскую сям'ю, амаль сілай вярнуў у хрысьціянства. Дзе тое было? Зманлівае слова *заўтра*. Здаецца, з дня ў дзень шлях не даўжэйшы за дваццаць чатыры гадзіны. На жаль, адно здаецца, бо па праўдзе бывае і так, што заўтра не здараецца ніколі. Зразумеў я тое не ў шаснаццаць і ня ў дваццаць гадоў, нават ня ў маі дзевяноста трэцяга, калі памірала бабка Вера. Тады яшчэ сноўдаліся ў памяці, хаатычныя бо хаатычныя, але ўсё ж жывыя — назвы, імёны, фрагмэнты абразкоў, прыхваткам падабраныя зь яе аповедаў. Штодзённых, таму й здавалася — нікуды ім ня дзецца. Сноўдаліся ды разыходзіліся

кожнае ў свой бок. А ў 2001, калі гартаў *Бежанства*, спахапіўся на думцы, што мітычнае *заўтра*, на якое я ўсё адкладаў сьпісаньне бабусіных успамінаў, так і ня здарылася. І зараз паглыбляюся ў кніжку. Шукаю знаёмыя сьляды.

Усе зварухнуліся ў бежанства. Рашыў і бацька паехаць. Прыспасобіў фурманку для дарогі. Над калёсамі з драбінамі буду паставіў ды палатном прыкрыў, каб ад дажджу і сонца схавацца... — гэта ўспамінае жыхар Сухавольцаў Раман Багроўскі, але я бачу прадзеда Цімафея, як у сваёй Войнаўцы разгортвае над фурманкай клятчастае радно. А далей:

Бацька запрог каня, загрузіў фурманку харчамі, мукой, збожжам, пасьцельлю і вопраткай, прывязаў да воза дзьве каровы і паклікаў усіх дахаты. Там спачатку ўсе памаліліся, затым бацька пасьвяціў хату і халодныя пабудовы — голас Канстанціна Масальскага з Подварак, але ці ня тое ж сказала б і мая бабка Вера пра апошнія ў 1915 жнівеньскія дні? А пра сам шлях у бяздонную Расею распавяла б іначай, як жыхар суседніх Войнаўцы Гайкоў, Аляксей Лук'янюк?

Жывёлу і забудову на волю лёсу пакінулі. На фурманках прыехалі ў Баранавічы. Там пакінулі коні з калёсамі. Разам зь іншымі бежанцамі пагрузіліся ў таварныя вагоны і падаліся ў глыб Расеі. Памятаю, што спыніліся ў Перадзелцы. Мясцовасьць раскінута была, быццам на хутары падзелена...

Праўда, тут пэўна назвалася б нейкае іншае месца, недалёкае ад Царыцына, якое запамяталася Ціхану Трахімюку з Кленікаў:

Лесу там і дрэў няма — роўны стэп раскінуўся на сотні кілямэтраў кругом. На хутары не было ніводнага дрэўца, ні кусьціка, толькі стаялі вялікія скірды пачарнелай ад доўгага стаяньня салюмы. (...) Людзі вельмі ласкавыя, багатыя і гасьцінныя. Нас сустрэлі так, як добрая маці сустракае пасьля доўгай разлукі сваіх дзяцей.

І так вось, пасьля доўгай разлукі сустракаю сваіх продкаў, іду іх сьледам. Сьледам, які позна, ці ня пяць хвілінаў да поўначы (пасьля якой дарма ўжо спадзявацца на заўтрашні дзень), усё-такі пасьпеў хтосьці запісаць.

Міхась АНДРАСЮК, Гайнаўка

Цяжка паверыць — апошнія вершы?

Леанід Галубовіч, *Апошнія вершы Леаніда Галубовіча*, Бібліятэка часопіса „Калосьсе", Полацак 2000.

Вядомы беларускі паэт Леанід Галубовіч вось ужо колькі гадоў заяўляе, што кінуў пісаць вершы. І сапраўды, цяпер у айчынным друку нячаста можна напаткаць ягоныя паэтычныя радкі. Затое апошнім часам ён пасьпяхова практыкуецца ў іншым, але далёка ня новым для яго амплюа — у галіне крытыкі і публіцыстыкі. Напрыклад, у газэце „Наша Свабода" вёў літаратурную рубрыку. У 1998 годзе выйшла ягоная кніга „Зацемкі зь левай кішэні", у якую ўвайшлі так званыя назіраньні з натуры зь філязофскім абагульненьнем, партрэтныя замалёўкі і г.д.

І вось яшчэ адна акцыя неардынарнага „традыцыяналіста". Таварыства Вольных Літаратараў выпусьціла „Апошнія вершы Леаніда Галубовіча". Адмыслова да пяцідзесяцігодзьдзя, якое паэт адзначыў летась у жніўні! Кніга выдадзеная элітарным накладам 150 асобнікаў на ахвяраваньне прадпрымальніка з Гайнаўкі Аляксандра Палескага.

У зборніку, як і чакалася, Галубовіч паўстае перад чытачом як чульлівы лірык, філігранны майстар слова і заўзяты патрыёт малой радзімы, які ня можа пагадзіцца на гвалтоўныя сацыяльна-палітычныя перамены ў нашай краіне. Свае вершы ён прысьвячае аднавяскоўцам, бацькам, былым аднаклясьнікам (якія трагічна загінулі), жонцы, дачцы, калегам-літаратарам, нават палітвязьням А. Шыдлоўскаму і В. Лабковічу... Адчуваецца, як лірычны герой Галубовіча ўвесь час пакутуе ад успамінаў, асацыяцый ды ўласных перажываньняў:

Як цяжка жыць нашчадкам, калі продкі
У спадчыну пакінулі прыгон...
Дзяды мае, бацькі, дзядзькі і цёткі,
Прыміце нізкі рабскі мой паклон.
Рахманыя, пакорныя нямыя,
Вачыма праглядзеўшы дол руды...
Ніхто вас ад зямлі ўжо не адыме —
З яе ўзышлі і сыдзеце туды...

У кнізе пераважае мінорны настрой. Дастаткова перачытаць вершы „На могілках", „Пакінуты цень" ці „Ноч у бацькоўскім ложку". Але ёсьць у Галубовіча і вершы пра каханьне, у якіх Эрас паўстае ва ўсёй сваёй першабытнай красе:

Я ўвайду ў прыцягальны твой неруш —
Цёмна-страшна-глухое нутро, —
Нібы ў нетры лясныя, дзе звяру
Невядома ні зло, ні дабро...
(...)
Гэтак томіць таемнае шчасце!
Так, як тоіць прырода сама
Ў чалавеку жывёльныя жарсці,
Без якіх чалавека няма...

Прычым каханьне ў Галубовіча ня ўмоўна-паэтычнае, а вельмі рэальнае. Чытаеш і візуальна ўяўляеш усю карціну падзеяў. Ажно самому хочацца кінуцца ў эратычнае адхланьне.

... ложак рассцелены — белым-белы,
і ты сваім залатым целам,
бы месяц — з воблака, сыходзіш прочкі
з апалай долу начной сарочкі...
святлом аслеплены, я ступаю,
табе насустрач, бо й ты — сляпая...
І ўжо не ложак, а жарсці ложа...
О, больш, чым можаш, Ты даў нам,
Божа...

Зрэшты, лірычны герой Галубовіча не пазбаўлены і самаіроніі, нават калі яму хочацца кахацца ў экстрэмальных умовах:

... Я б у Афрыку паехаў,
Там — бананы і какосы...
Во, была б душы пацеха!
Пагальцаў бы голы-босы...
Загарэў бы да чарноцця,
І ў пяску зварыўшы яйкі,
Не хаваўся б за лахмоцце
Ад пагляду негрыцянкі.

Нешта ня верыцца, што вершы, зьмешчаныя ў гэтай цудоўнай кнізе, сапраўды для паэта Леаніда Галубовіча апошнія. У пяцьдзясят гадоў жыцьцё яш-

чэ не канчаецца. Гэта якраз самы зэніт мужчынскае сталасьці і саліднасьці. Тым больш у многіх вершах паэт выглядае напалову маладзейшым, чым ёсьць на самой справе. Таму і пішуцца такія вершы, як „Сон”:

... На развіхуранай пасцелі,
Дзе сон, бы снег, глухі і лёгкі —
Мы над зямлёй з табой ляцелі,
Падушкі сцяўшы, як аблокі...
І неставала сіл прачнуцца,
І плоць спакусна песціў д'ябал —
І не магла ты мне вярнуцца
Дзяўчынай, жонкай, маці... бабай...
На райскім воблачным атласе —
Без слоў, без слёз і без жадання —
Ты ўпершыню мне пачалася
З рабра і боскага дыхання...

Юры ГУМЯНЮК, Горадня

„Поруч з дажджом” — „Нашэсьце поўні”

Юрка Голуб, *Поруч з даждом. Вершы*, „Беларускі кнігазбор”, Менск 2001.

Міхась Скобла, *Нашэсьце Поўні. Вершы*, „Беларускі кнігазбор”, Менск 2001.

Абедзьве кнігі вершаў двух землякоў з Зэльвеншчыны выйшлі сёлета ў менскім выдавецтве „Беларускі кнігазбор”, вядомым найперш выпускам сэрыі тамоў айчыннай клясыкі. Адметна й тое, што дапамогу ў выданьні зборнікаў аказала не дзяржава, а шчыры беларус і прадпрымальнік Валянцін Дубатоўка.

Аўтараў лучыць ня толькі маленькая радзіма, любоў да яе ды імкненьне часьцяком вяртацца ў родныя пэнаты, але й рух чалавечай душы ў атачэньні самых розных зямных праяваў і здарэньняў. Лучыць іх таксама глыбокая мэтафарычнасьць і пошук новых вобразаў, жаданьне знайсьці ў звычайным і будзённым незвычайнае, у якім схаваны глыбінны сэнс. Лучаць іх кроплі дажджу і круглы экран загадкавае поўні:

І з наднямонскіх крэўных круч
Здалёк чутно пад шары пошапт
Як хрусне поўня, бы сургуч
За шклом апостальскае пошты.

(Юрка Голуб, „Над Нёманам пад небам”)

Каб заспаны пачухаўся лес,
ажыла ніцавокая ноч,
з вышыні — мае свой інтарэс —
пані Поўня глядзіць аднавоч.

(Міхась Скобла, „Нашэсьце Поўні”)

Цікава й тое, што кнігі абодвух паэтаў падзелены на тры часткі, і ў пачатку кожнай — малюнкі вядомых мастакоў. Зборнік „Поруч з даждом” аздоблены творамі Міколы Лук'янава, а „Нашэсьце Поўні” — графікай Рыгора Сітніцы. Што тычыцца саміх разьдзелаў, дык у Юркі Голуба ёсьць цэлы разьдзел трыялетаў, а ў Міхася Скоблы — сатырычных вершаў, зь якіх найбольш уражвае

Насьледаванне Мандальштаму

Мы жывем, а пад намі краіны
няма,
тут за мову — пагарда, за вершы —
турма.
Тут аўчаркі на пляцах, у кратах вакно,
нашых словаў адчайных за крок
не чутно.
А дзе шэптам і вымавяць слоўца —
там прыпомняць сіпатага шклоўца.
Яго лыяна — нібы шаманскі тамтам,
ён паўсюль, дзе ні глянь: тут і там,
тут і там.
Ён у сьпёку — на поле, на лыжы —
ў мароз,
дзікім воласам скрозь, нібы шчэцьцю,
зарос.

Кіне кліч — і пачнецца сяўба ці гульба,
замірае усё — як зірне з-пад ілба...
І над целам раздзетай айчыны
уздымае ён вус прусачыны.
А вакол яго — злодзей, бандыт і махляр,
ён плюе ім у твар, а яны: — Слаўся, цар!
А вакол яго — невук, халуй —
не падходзь,
ён віе зь іх аброць, а яны: — Ваша бродзь!
І пляце за указам указ, варажэй —
б'е пад дых, у пахвіну, каму і ніжэй.
І ня можа прывыкнуць ніяк беларус:
што ні выступ — саюз, што ні
выпад — укус,
і сьцякае атрутная сьліна
па шырокіх грудзях славяніна.

Юры ГУМЯНЮК, Горадня

Падставы паветалізму

Алесь Аркуш, *Выпрабаваньне развоем*, Полацак 2000.

Эўрарамантызм — нязводная жарсьць беларускай інтэлігенцыі. Блакітнымі балотамі Беларусь глядзіць на захад. Канфрантуючыя айчынныя плыні — палітычныя ды эстэтычныя — толькі адценьні гэтай вялікай і чыстай прыязьні — збольшага непадзеленай, а таму траўмуючай. Рэгіяналам у гэтым сэнсе пашчасьціла. Узглядам крызы 1996-1997 гадоў, стагнацыйных для культуры, Таварыства Вольных Літаратараў (ТВЛ) згарнула свае сталічныя праекты, каб засяродзіцца на стварэньні рэгіянальнага культурнага кантэксту, інтэграванага ў агульнаэўрапейскую сытуацыю. Як выявілася, Эўропа рэгіёнаў — значна больш дасяжная для Беларусі рэальнасьць, чымся Эўропа нацый. „Мы набліжалі гэта сьвята як маглі”. У выніку, каб салідарызавацца сёньня з падставамі эўрапейскага паветалізму, зусім ня трэба пакідаць Малінаўку — на паліцах сяброў ужо зьявілася новая кніга А. Аркуша „Выпрабаваньне развоем”, паветалізм зь першых рук.

У адным з анонсаў зьмест згаданай кнігі быў вызначаны як „падкрэсьленая апазыцыйнасьць да сталіцы”. Пазыцыя аўтара „Выпрабаваньня развоем” сапраўды жорсткая, але адкрытая для

абмеркаваньня. Беларускамоўны Мінск страчвае сёньня якасныя падставы, каб лічыцца мэтраполіяй беларушчыны, і гэта ня можа не хваляваць рэгіёны. Рэгіяналы змагаюцца зь Мінскам за Менск. Што да рэгіяналізацыі ў выкананьні ТВЛ, то яна ніколі не была нігілістычнай барацьбой дзеля барацьбы, спробай паўстаць новым Цэнтрам ці ізалявацца ў зямляцкім кляне. Рэгіяналізацыя, разгорнутая ў тэвээлаўскім праекце, зьяўляецца руйнаваньнем Правінцыі.

Падчас свайго нядаўняга наведваньня Полацку філёзаф і паэт Ігар Бабкоў сфармуляваў праблему рэгіяналаў як непрыняцьце Цэнтрам іхнай спробы рэфлексіі. Хочацца ўдакладніць — з пэўнай часіны гэта ня ёсьць праблемай рэгіяналаў, аб чым засьведчыла выйсьце кнігі Алеся Аркуша, якая знаходзіць свайго чытача бяз санкцыі сталічных пасярэднікаў. Хутчэй рэгіёны легітымуюць сёньня сталіцу — ускосна, праз „прызнаньне" апошняй рэгіянальных праектаў. Толькі „легітымуючы", станоўча вырашаючы імкненьне рэгіяналаў да самарэалізацыі, Цэнтар легітымуецца сам у сваёй другаснай функцыі „легітыматара". Найменш патрэбна гэта самім рэгіёнам, якія ўсьвядомілі, што Цэнтар ня ёсьць нейкай назаўжды вызначанай ідэалёгіяй, інстытуцыяй, выдаўцом, рэдактарам ці крытыкам. Сапраўдны Цэнтар у нас саміх. Для легітымацыі голасу дастаткова жаданьня прамаўляць. Што й сьцьвердзіла сваім прыкладам ТВЛ. І цяпер ужо новыя сталічныя асяродкі, каб легітымавацца самім, „легітымуюць" ТВЛ. А рэгіяналы не выпрошваюць сёньня кавалак Цэнтру, яны арандуюць яго, каб трансьляваць свае ідэі. Сталіца — гэта ранцье, што жыве з працэнтаў ад актыўнасьці рэгіёнаў.

Для ўсьведамленьня гэтай сытуацыі шмат зрабіў менавіта Алесь Аркуш, дзякуючы сваім праектам і публікацыям. Ключавое слова „развой" у назьве ягонай новай кнігі выяўляе сутнасьць зацікаўленьняў лідэра ТВЛ, якія

выходзяць за межы пэўных жанраў ды эстэтычных ідэй. Алеся Аркуша цікавіць менавіта развой, жывая плынь літаратуры, ейны рух — літаратурны працэс. Нават запарваньне гарбаты ў выкананьні аўтара „Выпрабаваньня развоем" стаецца літаратурным працэсам. Магчыма, бэлетрызацыя жыцьця замінае напісаньню самой бэлетрыстыкі, але калі напішуць аматары — Аркуш выдасьць, арганізуе рэцэнзію, падрыхтуе прэзэнтацыю й маленькую заварушку — літпрацэс, адным словам.

Што незвычайна для беларускага літаратара, Алесь Аркуш забывае адмоўныя водгукі на сваю творчасьць хутчэй, чымся самі аўтары падобных рэцэнзіяў. Магчыма, гэта дае яму права спадзявацца на падобную ж рэакцыю з боку іншых — ужо ў адказ на яго ўласныя саркастычныя рэплікі, кшталту „ЛіМаўскага" артыкулу „Ці ўлічыць вопыт „Тутэйшых" найноўшая генэрацыя?" Досьвед Алеся Аркуша сапраўды заслугоўвае вывучэньня. Не сакрэт, што пераважна па перакладах творчасьці сяброў ТВЛ замежны чытач мае ўяўленьне аб новай беларускай літаратуры. Тэвээлаўцы здолелі патрапіць у збытковую інфармацыйную прастору Забужжа. Іншае пытаньне — якім коштам гэта дасягаецца. Магчыма, коштам перавагі эмацыйнага, фактурнага пачатку над рэфлексіяй, як уважае Валянцін Акудовіч, магчыма — засільлем жанру „чарнавікоў", рэплікаў на палёх. Алімпійскі прынцып „не перамагаць, а ўдзельнічаць" робіцца актуальным і для літаратуры. Да творчага фінішу, як у аўтагонках, пераможцам прыходзіць той, хто элемэнтарна даходзіць да гэтага фінішу. Прамежкавы вынік робіцца вызначальным, бо як ніколі сучасныя літаратары разьлічваюць на Вечнасьць, а ў апошняй па самім вызначэньні ня можа існаваць канцовай асады. Той, хто выходзіць рэгулярна на прамежкавыя фінішы, у сукупнасьці будзе першы. Ужо можна меркаваць — Алесь Аркуш ёсьць першым вольным літаратарам XXI стагодзьдзя. Покуль іншыя зьбіраюцца бегчы, ён нясьпешна ідзе. Аркуш дойдзе.

ТВЛ застаецца ўзорам пасьпяховай культурнай прамоцыі й па сёньня. У чым сакрэт гэтай пасьпяховасьці? Магчыма, у тым, што „нонканфармізм" для Алеся Аркуша й ТВЛ быў ня проста рэклямным слоганам. Артыкулы „Спроба маніхвэсту", „Выпрабаваньне развоем", „Шлях да вольнай літаратуры" — паўставалі на палёх ужо зьдзейсьненых праектаў. Алесь Аркуш рэалізаваўся як ідэоляг беларускай альтэрнатыўнай літаратуры рэтраспэктыўна — камэнтарамі да ягоных тэкстаў служаць зьдзейсьненыя праекты. Удзельнічаючы ў кожнай большменш істотнай літаратурнай дыскусіі апошняга дзесяцігодзьдзя, аўтар „Выпрабаваньня развоем" стаўся пасьлядоўным выразьнікам рацыі рэгіёнаў. Што да апошняй кнігі, то яна зьяўляецца пазнавальным, але камплімэнтарным партрэтам прамінулага дзесяцігодзьдзя — засвоіўшы ілюзіі пакаленьня „самазанятых інтэлектуалаў", аўтар кнігі пазьбегнуў іхных расчараваньняў. Але наўрад ці нейкі сучасны аўтар можа прэтэндаваць на вычарпальнае выяўленьне „новай культурнай сытуацыі" — кожная чарговая кніга ставіць сваю кропку ў шматкроп'е эпохі...

Сяргей ШЫДЛОЎСКІ
Наваполацак

СЛОВЫ

Вінцэсь Мудроў

Багун

Пад'ехаўшы да крамы, Багун нацягнуў лейцы, з разважлівай павольнасьцю зьлез з калёсаў. Тут, пад ліпамі, дзе звычайна шыхтом стаялі ровары і ківалі кудлатымі галовамі сялянскія коні, было пуста, і гэтая пустэча рабіла навакольны сьвет яшчэ больш няўтульным і шэрым.

Крамныя дзьверы былі сьцярожка — на два пальцы — прачыненыя, і на іх вісеў абвіслы плякат з выяваю жаўнера й разгоністым надпісам „Do broni!" Жаўнер зяпаў квадратным ротам, крывіў гняўлівы твар, і Багун, узяўшыся за клямку, хвіліну ўражана глядзеў на плякат, тузаў сьсівелы вус і пераступіў парог пасьля пакутлівага ўздыху.

Густы помрак прымусіў зьмежыць павекі.

— Sklep nieczynny, — гукнула з помраку крамнічыха Двойра, але тут жа сумелася і зьнікла за дзьвярыма.

Дзесьці ў крамных нетрах зарыпелі масьніцы, штосьці суцішна грукнула і пачулася незадаволенае мармытаньне. Звычайна Рувім — гаспадар крамы — вомігам вылятаў да наведнікаў, цяпер жа давялося чакаць, і Багун, каб заняць рукі, разгарнуў „Русское Слово" — пажоўклую газэту, што ляжала на прылаўку. Чытаць у прыцемку, аднак, не выпадала, дый газэта была старая — за 20 ліпеня, і наведнік, наваліўшыся грудзінай на прылавак, пазяхнуў і стаў безуважна глядзець на вялізнага чорнага ката, які сядзеў ля дзьвярэй і зацята аблізваўся. Кот, відаць, улез у сьмятану, бо вусы і канцы вушэй былі перапэцканыя ў нешта белае.

Крама, у якую ўбіўся Багун, месьцілася на ўскраіне мястэчка; яшчэ пару гадоў таму яе мала хто наведваў. Але Рувім — гандляр увішны: усталяваў радыёпрыймач фірмы „Тэлефункэн", выпісаў з Рыгі расейскіх, а зь Вільні польскіх газэт, і крама неўзабаве ператварылася ў своеасаблівы местачковы клюб, у якім дзень да ночы таўкліся людзі. Прыходзілі нават цыганы з Зарэчча, і ня столькі, каб разжыцца бутэлькай газы ці іржавым селядцом, а каб паслухаць радыё ды ўведаць апошнія навіны. І хоць прыймач па-ранейшаму стаяў у куце, а на паліцах яшчэ ляжаў сякі-такі тавар, народу ў краме не было, і гэта наводзіла на думку, што справы дрэнь і немец ня сёньня, дык заўтра будзе пад Варшавай.

За сьценкай ізноў зарыпелі масьніцы.

— Ах, ду біст а-зэ паскудняк! — гойкнула крамнічыха Двойра, і Багун пудліва адскочыў ад прылаўка.

Крамнічыха выбегла з бакоўкі, паспрабавала хвастануць ката ручніком, але той сіганўў на парог і зьнік у дзьвярной пройме.

— Зьвядзе са сьвету, чортаў кот, — паведаміла Двойра, сказала яшчэ штосьці па-свойму, і ў гэты момант з бакоўкі выйшаў, трымаючыся за бокі, сам гаспадар.

— Нырн-кранк, — выдыхнуў Рувім у адказ на запытальны пагляд наведніка, скрывіўся, згадваючы — як гэта будзе па-тутэйшаму, але наведнік і так зразумеў, што гаворка ішла пра ныркі.

Хвароба вымагала хвіліны маўчаньня. Багун памаўчаў, спачувальна насупіў бровы, а потым, прасьвятлеўшы з твару, кіўнуў у бок прыймача: — Ну, што там кажуць?

— Нічога ня кажуць. Паліцыянты плёмбу наляпілі і лямпы выкруцілі. Каб Гляйвіц ня слухалі.

Такая навіна ўразіла наведніка. „Міцька Барзевіч таксама, відаць, Гляйвіца слухаў — таму і патрапіў у вязьніцу", — падумаў Багун, хацеў запытацца — дзе ідуць баі, але змаўчаў, адно перасмыкнуў шчаціністым падбародзьдзем.

— Мыдла шукаеш, ці запалак?

— Газай хацеў разжыцца, — уздыхнуў наведнік, — цямнее рана, лямпу да самай ночы палім...

Уваходныя дзьверы рыпнулі, і ў сьветлым атворы ўзьнікла кудлатая кашэчая галава.

— За газай нават у Глыбокае езьдзілі — няма ні кроплі, — крамнік ляпнуў далоняй па сьцягне, ушчуваючы ката, але той прайшоў міма, не павёўшы вокам. — Магу даць бутэльку... з апошніх запасаў. Але не за грошы. Вязі тры курыцы.

З крамы Багун выйшаў, праклінаючы Рувіма і ягоную гандлярскую нацыю. Дзе гэта было, каб за пляшку паганай газы прасілі аж тры курыцы! Багун уявіў, як гадаваныя ім хахлаткі б'юцца пад хазанскім нажом, здрыгануўся ўсім целам і замлелымі ад хваляваньня пальцамі стаў адвязваць лейцы ад плота. Злосьці дадавала і тое, што крамнік, на пытаньне: „Як справы на фронце?" — тарганўў плечуком і ці-

ха прамямліў: „Ня ведаю". І гэта ён, галоўны местачковы прайдзісьвет, ня ведае — дзе цяпер немцы?

Доўгая вуліца, забудаваная гэбрайскімі камяніцамі, выглядала панурай і пустэльнай. Давялося нават палічыць на пальцах — ці не субота сёньня і зірнуць на вокны, выглядаючы вогнікі шабасовых сьвечак. Але сёньня была серада, і ў шыбах адбіваліся цёмныя лужыны, сьпічакі местачковага касьцёлу ды асьлізлае верасьнёўскае неба.

Гарбацярня пана Бурша была на замку, а на мокрым ганку сядзеў ды пускаў мыдляныя бурбалкі Буршаў сын Рышка. Сыну таму ішоў чатырнаццаты год, але ён ня ўмеў ні пісаць, ні чытаць, дзень пры дні сноўдаў вакол гарбацярні, альбо, як цяпер, пускаў бурбалкі праз тонкую чараціну.

Размаўляць з дурнілам ня надта пасавала, але Багун, азірнуўшыся, нацягнуў павады.

— Рышка, чаму гарбацярня зачыненая?

Дурніла не адгукнуўся, працягваў дзьмуць у чараціну і толькі калі бурбалка лопнула, наставіў на Бадуна бялёсыя вочы.

— Dlaczego zamknięte? — запытаўся Багун папольску.

Рышка перасмыкнуў плячыма, блазнавата пасьміхнуўся, і калі Бадун цокнуў языком і калёсы скрануліся зь месца, крыкнуў: — Пянёндзы ляснуліся, таму і замкнента.

Колы, пракаціўшыся па мяккім пяску, замалацілі па бруку, і душу апанавала глухая трывога. „Як гэта — ляснуліся? — падумаў Багун, падганяючы каня, — а што ж будзе зь ягонымі грашамі, якія ён крывавым мазалём зарабляў і якія цяпер ляжалі, спавітыя ў рагожку, на дне каванага куфра? Сем тысяч злотых новымі паперкамі! За іх яшчэ ўчора можна было набыць паравоз, а сёньня, выходзіць, пан Бурш ня дасьць і шклянку гарбаты?"

Багуну стала горача. Ён сьцягнуў з галавы башлык, расшпіліў бурнос і тут жа ўвабраў галаву ў плечы, аглушаны бязладным птушыным граем: вароніная грамада ўзьнялася над касьцельнымі вежамі, завісла на імгненьне ў паветры і, калі брынклівы звон бомкнуў другім разам, з адчайным лямантам падалася ў бок Зарэчча.

„Можа там што пачую?" — падумаў Багун, пазіраючы на рухавую птушыную хмарку, і праз хвіліну скіраваў каня на Касьцельную вуліцу.

На цьвінтары, як заўсёды, сядзелі жабракі, а крыху зводдаль, ля збуцьвелага крыжа, пастаўленага некалі з нагоды прыезду нейкага дастойніка, стаялі дзьве мнішкі і штосьці распавядалі дзьвюм местачковым цётухнам.

— Bombardują strasznie, — паляцела да вушэй кароткая фраза, Багун наструніў слых, але ў касьцёле зайграў арган і заглушыў жаночыя галасы.

У атвор разнасьцежаных дзьвярэй ён увайшоў баязьліва, сьцярожка, уражаны тым — як зыбаецца падлога і як дрыжыць паветра ад цяжкіх уздыхаў аргану. Яму, праваслаўнаму чалавеку, ня надта ёмка было ўбівацца ў касьцёл, да таго ж і апранаха ягоная не пасавала такой мясьціне — на Багуну быў зацухмолены, пацяжэлы ад дажджу бурнос. Але ён увайшоў, таропка — каб ніхто ня бачыў — перахрысьціўся па-праваслаўнаму, і сьціпла стаў ля сьцяны.

Народу ў бажніцы было шмат, і сярод вернікаў пракідваліся зялёныя мундуры памежнікаў. Адзін з памежнікаў, стрыжаны на лысага капрал, кленчыў непадалёку, і Багун, зыркнуўшы на стрыжаную галаву, вырашыў дачакацца канца набажэнства ды распытаць капрала — як ідуць справы на фронце і хто там каго бамбардуе.

Неўзабаве арган аціх, аціхлі і кабеты, якія дрогкімі галасамі падпявалі аргану, і на амбоне абудзіўся раскоцісты мужчынскі голас: — Bóg czuwa nad Polską!

Словы казані залуналі пад скляпеньнямі, пераблыталіся з гулкім рэхам і разабраць можна было толькі асобныя фразы.

— Siła wiary Narodu ujawniła się w całej potędze podczas wojny obecnej... Dziś, kiedy grad pocisków niemieckich mierzy w ciała żołnierskie, grad modlitw płynie od ich żon i matek... — некалькі цётак нечакана голасна залямантавалі, і ксёндз зрабіў паўзу.

— Gdy naprzeciw naszych lotników wylecą chmary wrogich samolotów, by strącać naszych w imię pychy szatańskiej, to nasi wylecą na swych stalowych ptakach z Chrystusem w sercu. Czyż nie jest jasne — komu przypadnie zwycięstwo? — пачуўшы слова „звыценство", вернікі гамузам пераражгналіся, Багун таксама перахрысьціўся і ў тую ж хвілю стрэўся вачыма з капралам. Капрал, як падалося, паглядаў на яго зь нянавісьцю. „Заўважыў, што я праваслаўны", — улякнута падумаў Багун і ціхенька, сьпінай наперад, падаўся да выхаду. Памежнікі ўсе скрозь былі „рдзэннымі" палякамі і ня надта любілі тутэйшых. А цяперашнім часам дык наагул маглі зьвезьці куды-небудзь, як таго Міцьку Барзевіча.

Багун жвава, амаль подбегам, прамінуў цьвінтар, ускочыў на калёсы, голасна гойкнуў: — Н-но, пыха шатаньска! — і вароніна грамада, абуджаная такім воклікам, бязладна загарлала на высокіх таполях.

Лазунок — малады буланы конь — усю дарогу мерна пырхаў, шапятліва абмахваўся хвастом, і гэтыя зыкі ўрэшце змарылі Багуна; ён нацягнуў на вочы башлык, зьмежыў павекі. І ўраз калёсы паехалі неяк бокам, жоўтае іржышча, на якое ён дагэтуль глядзеў, ператварылася ў штосьці невыразна-шэрае, і чорны Рувімаў кот, скочыўшы на тую шарызну, пабег, капытлівым пошчакам скаланаючы наваколь. У тое самае імгненьне сон зьляцеў з павекаў і рука машынальна пацягнула лейцу, даючы дарогу стрэчным вершнікам. Вершнікаў было пяцёра, яны гналі коней наўскач, і Багун, зірнуўшы на дарогу, бязгучна прашаптаў: — Памежнікі.

Вайскоўцы праляцелі міма, дыхнуўшы пахам конскага поту, адэкалёну і новай, яшчэ не абношанай скуры. Ехалі яны, відаць, далёка, бо да сёдлаў былі прытарочаныя брызэнтавыя торбы, бляшаныя скрынкі, а адзін вершнік трымаў на конскім карку фанэрны куфар.

— Bóg czuwa nad Polską! — крыкнуў Багун усьлед вершнікам, і адзін зь іх — той, што вёз фанэрны куфар — азірнуўся і махнуў рукою.

Далей, аж да самай Мандрыкінай паваротакі Багун спаў, а калі калёсы рэзка павярнулі і Лазунок, адчуўшы тупкі бальшак, паехаў жвавей, ачуўся і ўгледзеў знаёмую постаць: па бальшаку, у бок вёскі, шыбаваў Міцька Барзевіч. Два тыдні таму Міцьку як палітычна ненадзейнага забрала паліцыя, і старая Барзячыха сплакала ўсе вочы.

— Міцька, халера ясна! Жывы!

— Жывы-ы, — адгукнуўся хлопец, спрытна сеўшы на калёсы, — староста загадаў усіх адпусьціць. Ім цяпер не да нас.

Міцька налёг сьпінай на Багуноў плячук, зморана перавёў дых.

— Ну, як там... што чуваць? — запытаўся Багун, падганяючы Лазунка.

Хлопец ізноў уздыхнуў.

— Немец ад ранку над Глыбокім лётаў.

— І што — зьбілі?

— Саб'еш яго... Пастралялі з карабінаў ды плюнулі... Высока...

Міцька кашлянуў, дастаў з кішэні пачак гродзенскай „Мэвы".

— Давай, дзядзька, засмалім. Староста выдаў... у якасьці кампэнсацыі.

Пару хвілінаў ехалі моўчкі, глытаючы пяршывы дым, і Міцька пасьля чарговай зацяжкі запытаўся:

— Ня ведаеце, дзядзька — прыймач ці забралі? — Міцькавы самаробны прыймач паліцыянты мусілі рэквізаваць, але Барзячыха ўсчала гвалт, і тыя махнулі рукой — адно абгарнулі слухаўкі паперай ды паставілі плёмбу.

— На шафе ляжыць, — выдыхнуў Багун і тыцнуў хлопца ў бок, просячы прыпаліць загаслую цыгарэту.

Міцькава хата стаяла наводшыбе, на невысокім пагорку, падпёршы асьлізлае неба высокаю страхою. Пасярэдзіне страха ладна абсела, і хата нагадвала кітайскую фанзу.

„Няма гаспадара", — падумаў Багун, а згадаўшы Пархвена — Міцькавага бацьку — неўпрыкмет перахрысьціўся. Дзесяць гадоў таму Пархвен выправіўся на заробкі ў Канаду, назад не вярнуўся, і цяпер стаўленая ім хата гібела без гаспадарскага дагляду. Міцька ж гаспадаркай не займаўся: дзень да ночы слухаў самаробны прыймач, судзіўся з уладамі, кожнага месяцу прывозіў аднекуль кучу газэт ды ўлётак і аднойчы нават прасіў яго, Багуна, завезьці тое дабро ў Глыбокае. Газэты ён узяў, але да Глыбокага не давёз: прыкупіў у Рувіма падшыўку „Русского Слова" за 1938 год ды абклеіў імі хату.

На падворку суседзкай Бартулёвай хаты — Бартуль быў зацяты паляўнічы і трымаў у сябе двух выжлаў — пачуўся сабачы брэх. Сабакі лена брахнулі, потым скавытнулі, і скавытаньне тое зьлілося са здушаным жаночым лямантам:

— А сыночак ты мой!.. А дзе ж ты столькі дзянёчкаў бы-ыў...

Старая Барзячыха — расхлістаная, з узьбітай на вочы хусткай — бегла насустрач, і Міцька незадаволена перакрывіўся.

— У павятовага старосты... на пагасьцінах затрымаўся, — прабубнеў хлопец, скочыў з калёсаў і кіўком галавы запрасіў Багуна зайсьці ў хату.

Схапіўшы са стала кавалак булкі, Міцька, на хаду жуючы, пашнарыў рукой па версе шафы, дастаў адтуль укручаны ў прамасьленую паперу прыймач, зь няўцямнай лаянкай сарваў плёмбу. І пакуль ён насоўваў на вушы круглявыя слухаўкі ды круціў ручку настройкі,

у хату ўваліліся яшчэ два чалавекі: сусед Бартуль ды Міцькаў сябар Казік Хамёнак.

— Ну, як там? — гукнуў ад парогу Хамёнак, і Багун, патрабуючы цішыні, патрэс узьнятым пальцам.

Прыймач, па ўсім бачна, маўчаў, і Міцька, крутнуўшы ручку да ўпору, зьняў слухаўкі, скрануў дрыготкім пальцам нейкі правадок, і слухаўкі азваліся зумклівым маршам.

— Менск, — выдыхнуў Міцька, прыціснуў да вуха слухаўку і праз хвілю, наструніўшыся, прашаптаў: — Варшава...

Усе выцягнулі шыі, спрабуючы дачуцца — што кажа Варшава, але апроч трэску ды зумканьня нічога не пачулі.

— Хто каго б'е? — запытаўся змарнелы ад чаканьня Хамёнак, і цяпер ужо Міцьку давялося трэсьці ўзьнятым пальцам і наструнена лыпаць вачыма, слухаючы голас Варшавы.

— Стэфан Стажыньскі выступае. Прэзыдэнт места, — прашаптаў, нарэшце, Міцька і, пасьля паўзы, дадаў: — Място столечне і твердза Модлін багатэрскі вальчаць.

— Дай паслухаць! — гукнуў Хамёнак, тузануў Міцьку за рукаво, і той, вылаяўшыся парасейску, перадаў слухаўкі сябру.

— Пілі, гулялі, баб пярдолілі. Нас, камуністаў, са сьвету зжывалі. А цяпер во як выйшла: даў немец, дык толькі шмацьцё паляцела, — Міцька нэрвовым крокам прайшоўся па хаце.

На момат запанавала ціша, якую глухой кашлянінай парушыў стары Бартуль.

— А па мне ўсё адно — што немцы, што палякі, — Бартуль ізноў кашлянуў, потым чхнуў і таропка перахрысьціўся на абраз. — Швабы прыйдуць, дык чаму добраму навучаць. Я ў Прусах два разы быў. Жывуць так, як нам і ня сьнілася.

— Есьці хадзі! — крыкнула з кухні Барзячыха, — ашалеў ужо з тым радзівам, — і Міцька, як і ня чуючы матчынага вокліку, задуменна прашаптаў: — Чаму ж маўчыць нямецкі пралетарыят?

Ноччу ён доўга ня мог заснуць: круціўся на ложку, два разы хадзіў на вядро, парываўся нават лезьці ў куфар — пералічваць грошы, ды жонка Наста незадаволена замармытала спрасонку, і Багун сьцішыўся, а праз хвілю і засоп упоравень зь лёгкім жончыным дыханьнем. Сонная замарач панурыла яго ў свае апраметныя лёхі, і дзесьці на самым дне той апрамеціцы сьпеўна і водгуліста азваўся местачковы ксёндз: „Bóg czuwa nad Polską..."

Ён прачнуўся зьнянацку — нібыта Наста піхнула ў бок — і адразу ж — краем вока — угледзеў у незавешаным фіранкамі вакне кволую палымніцу. Гарэла далёка, ці не на самой мяжы, і нейкія дзіўныя, падобныя да ціўканьня кропляў зыкі нараджаліся і гасьлі ў цемрыве трывожнай ночы. „Стражніца гарыць!" — крыкнулі на падворку, і Багун ліхаманкавым рухам намацаў свае нагавіцы.

Скочучы на адной назе, ён ніяк ня мог патрапіць другой нагой у калошу, і Наста, прыхапіўшыся, улякнута заенчыла:

— Што... што здарылася?

— Немцы стражніцу падпалілі!

— Якую стражніцу? — перапыталася Наста, а ўцяміўшы — пра што гаворка, ужо спакойным голасам запытала: — Ну і куды ты сабраўся?

„А і сапраўды — куды папруся проці ночы? Яшчэ прыстрэляць", — падумаў Багун, прыпаў да ваконнай шыбы і яшчэ праз хвілю, зяхнуўшы на поўную губу, падбіўся пад жончын бок.

З хаты ён выкуліўся як толькі разьвіднела, рушыў па бязьлюднай вуліцы і на падворку Бартулёвай хаты ўбачыў гаспадара — стары Бартуль, штохвілі азіраючыся, здымаў з калёсаў непадатнае кола.

— Што, бусьлянку будзеш ладзіць? — пажартаваў Багун, і сусед, чарговым разам азірнуўшыся, працадзіў: — Разьбіраю... каб не рэквізавалі.

— Хто?

Бартуль крэкнуў, катнуў кола ў бок пуні.

— Саветы йдуць. Ці то ня бачыш?

Па бальшаку, раз-пораз губляючыся сярод кустоў, паўзло штосьці па-вужачынаму даўгое й па-мышынаму шэрае, і Багун, расшпіліўшы верхні гузік касавароткі, выцер даланёй упрэлы лоб.

З усяе вёскі, калі не лічыць дзятвы, сустракаць саветы выйшла чалавек дваццаць — мужчыны стаялі ля самога гасьцінца, а жанчыны крыху зводдаль, ля сажалкі. Такой парой на сажалцы было поўна гусей, аднак сёньня іх, відаць, ня выпусьцілі з хлявоў і на люстраной вадзе завіхаліся, выставіўшы ўгору азадкі, дзьве дзікія качкі.

— Едуць на Бартулёвых конях, — гукнуў нехта зь вясковых падшыванцаў, і качкі, нібыта спрабуючы пераканацца ў справядлівасьці такіх слоў, вытыркнулі з вады свае круглявыя галовы.

На піліпаўку Бартуль хадзіў у пушчу палявaць на ваўкоў, дзеля прынады набываў у ме-

стачковых цыганоў лядачага каня, і вяскоўцы, пабачыўшы якога нядошлага каняку, кожнага разу згадвалі піліпаўскае паляваньне.

Коні, што цягнулі гаўбіцы ды гарматы, былі зусім нядошлыя — з запалымі сьцёгнамі, з хрыбцінамі-піламі. Да пары ім былі і ездавыя — суворыя, апраненыя ў нейкія цёмна-сінія ватоўкі — яны махалі сырамятнымі пугамі, суцішна мацюкаліся і не зьвярталі ўвагі на людзей, што стаялі на ўзбочыне.

Багун убіўся ў натоўп, парукаўся з Казікам Хамёнкам; у гэты момант адна з кабыл, сагнуўшыся склюдам, упала на пярэднія ногі, і Казік, не сьцярпеўшы, крыкнуў ездавому:

— Чаму кабылу ня корміш?

Ездавы нават не павярнуў галавы, а тым часам нейкі бальшавік — відаць, камандзір, бо быў апранены ў даўгакрысы шынэль, скіраваў на Казіка сваю кудлатую „манголку". Хамёнак скочыў у бок, прыхаваўся за людзкімі сьпінамі і больш ужо не падаваў голасу.

Хвілін пятнаццаць усе стаялі, як мыла каўтнуўшы, і невядома — колькі б яшчэ так стаялі, калі б не пачулі зрывісты жаночы воклік: ад крайняй хаты, трымаючы ў руках самаробны чырвоны сьцяг, бег Міцька Барзевіч, а сьледам за ім, спатыкаючыся на калдобінах, ляцела старая Барзячыха. Міцька падбег да бальшака, махнуў чырвоным сьцягам, нема закрычаў:

— Да здравствует Коминтерн!

Гэтым разам ездавыя пудліва сьцепануліся, зірнулі на Міцьку і, нібыта па камандзе, махнулі сырамятнымі пугамі.

— Божачкі, а навошта ж мне такое горайка! А каб яна спрахла, гэтая паліціка... — залямантавала старая Барзячыха, паваліласяў прыдарожную канаву; жанкі, што стаялі ля сажалкі, дакорліва хітнулі галовамі, а Бартуліха, перахрысьціўшыся, голасна выдыхнула:

— Даў Бог сыночка — з пастарунку не вылазіць...

... Ідучы да хаты, Багун з Хамёнкам чухалі патыліцы, штохвілі ўздыхалі.

— І як яно ўсё будзе? — прамармытаў Багун, на хаду прыпальваючы цыгарку.

— Ды неяк будзе, — Хамёнак таксама чыркнуў запалкай, — палякі панавалі, цяпер саветы запануюць. Прыйдуць кітайцы — мы і пад імі ўжывемся, жаб будзем жэрці ды па-кітайску балаболіць.

— Яно так, — пагадзіўся Багун і пудка азірнуўся: на сажалцы залапаталі крылы, качкі ўзьняліся ў паветра і паляцелі ў той бок, дзе дагарала, курэла шызым дымам памежная стражніца.

Два дні Багун не выходзіў з хаты — баяўся, што саветы мабілізуюць у войска ці забяруць на якую працу — і таму, ці не ўпершыню ў жыцьці, уважліва слухаў Насту, якая бегала да суседзяў па навіны.

— У Хадоры гусак прапаў, — гукала жонка ад парогу і, сьцішыўшы голас, апавядала, што саветы сталі табарам ля Курылёвай крыніцы і выкапалі рукамі бульбу на асадніцкім полі.

У вёску бальшавікі не заходзілі, у войска нікога не мабілізоўвалі, і на трэці дзень Багун, асьмялеўшы, выкуліўся з хаты, удыхнуў п'янкога паветра, але назад ня выдыхнуў: пад яблыняй сноўдаў чалавек у сіняй ватоўцы і піхаў за пазуху расяныя падалкі. Рабіў ён гэта неяк зладзеявата, штохвілі азіраючыся, а таму адразу ж заўважыў гаспадара.

— Попить не найдётся? — пралепятаў чалавек, вінавата ацёр далоні, і Багун, спатыкнуўшыся аб ганак, вынес гладыш яшчэ неастылага малака.

Чалавек падхапіў гладыш, паднёс да вуснаў, але потым, схамянуўшыся, вярнуў гаспадару:
— А ну, отпей.

Ня ведаючы, навошта гэта трэба, Багун змачыў у малацэ вусны і госьць, пераняўшы гладыш, стаў прагна піць; пры гэтым натапыраныя вушы ягоныя варушыліся і выцьвілая пілётка зьяжджала на пераносьсе.

— Молоко где берёте? — запытаўся госьць, агораўшы гладышку.

— Як дзе? — не зразумеў гаспадар, — кароў трымаем...

— Коровы, поди, панские?

Багун, падумаўшы, кіўнуў галавой, расчыніў уваходныя дзьверы.

— Заходзьце, таварышок, паглядзіце — як мы жывем.

Таварышок, азірнуўшыся, вужом прасьлізнуў у хату.

— С панами, отец, покончено. Так и скажи деревенским, — госьць стрымана кашлянуў, абцягнуў крысьсё ватоўкі і, прыгледзеўшы ля печы вялізны саган, выхапіў адтуль вараную бульбіну.

— Зачем столько картошки варите?

— Сьвіньням даем, — паведаміў гаспадар.

— Свиней... кормите картошкой?! — выбухнуў госьць і сьпехам, амаль незаўважна для вока, піхнуў пару бульбін за пазуху.

„Дык сьвіньні ж таксама панскія", — хацеў было выдыхнуць Багун, ды прыкусіў язык і, ня ведаючы — чым пачаставаць госьця, выставіў на стол міску зь мёдам.

— Во... пакаштуйце нашага мядку. Ліпец. З уласнае пасекі.

— Меня, между прочим, Афанасием зовут, — прамовіў госьць, выцягнуў з халявы брызэнтавых ботаў літую алавянную лыжку і спраўна распалавініў мядовую лусту.

Мёд быў не адагнаны, таму гаспадар паставіў перад госьцем невялічкі сподак — выплёўваць вузьзе, але ён не спатрэбіўся: госьць глытаў мёд разам з васкавінай. Глынуўшы пару лыжак, Афанасій нечакана папярхнуўся і ўтаропіўся ў сьценку. „Прусака ўбачыў, ці што?" — Багун правёў рукой па абклеенай газэтамі сьценцы, але ніякага прусака не намацаў.

— Погоди-ка, — буркнуў Афанасі, і твар ягоны кранула лёгкая ружавізна: госьць чытаў прыклееную да сьценкі газэту — акурат у тым месцы, дзе яна была дарэшты зацёртая плечукамі.

Багун выцягнуў шыю, прымружыўся і прачытаў назву артыкула, які зацікавіў Афанасія: „Суд над Бухариным".

Прачытаўшы артыкулы, якія былі на ўзроўні носа, Афанасі споўз на падлогу, стаў чытаць газэты, што былі наклееныя дагары нагамі — пры гэтым ён увесь час керхаў ды шморгаў носам, бо слодыч, відаць, патрапіла ў нюхалку, — потым узьлез на прыслон і добрую гадзіну вадзіў носам па сьценцы, нарэшце скочыў на падлогу і, страсянуўшы расчаперанай пяцярнёй, што азначала: я яшчэ зайду, пужлівым крокам рушыў да парога.

— Шапачку ж вазьміце, — гукнуў гаспадар, і госьць, падаўшыся назад, выхапіў з гаспадарскіх рук зьлінялую пілётку.

На наступны дзень Афанасі зноў завітаў у хату, але ўжо не адзін, а з двума таварышамі: адзін зь іх быў сьветлавалосы і даўгалыгі, а другі —маленькі ды чарнявы. Госьці ўвайшлі ў хату на цырлах, як бы крадучыся, і надта напужалі Насту. Наста якраз разьлівала сырадой у гарлачы і, пабачыўшы чырвонаармейцаў, выпусьціла з рук даёнку.

— Не волнуйтесь, гражданка, мы на минутку, — суцішна выдыхнуў тады Афанасі і махнуў рукой сябрукам, якія таўкліся ля парога.

Госьці цэлую гадзіну сноўдалі ўздоўж сьцен, чыталі газэты і загаманілі толькі аднойчы, калі чарнявы маладзён тыцнуў пальцам у сьценку і абурана прамармытаў:

— Ну это уже они брешут...

— Брешут, конечно, — кіўнуў галавой Афанасі і, зыркнуўшы на Багуна, па-змоўніцку ціха шапятнуў: — Ты, отец, никому не говори, что мы тут у тебя были...

Калі госьці — гэтак жа на цырлах — падаліся ўпрочкі, Багун прачытаў нататку, якая абурыла чарнявага маладзёна, і зацёр яе сьлінявым пальцам. У нататцы паведамлялася, што бацька-Сталін, якога расейскія бальшавікі называюць „геніем навачаснай эпохі", насамрэч быў выгнаны, як недарэка, з духовай сэмінарыі і з тае пары нідзе не вучыўся. „Заўтра ж паеду да Рувіма, набуду шпалеры", — апанаваны такой думкай, Багун пашкроб падбародзьдзе і стаў маракаваць — колькі хахлатак трэ' будзе аддаць за шпалерны скрутак.

Назаўтра, аднак, ён нікуды не паехаў, бо назаўтра была субота, а ў нядзелю, ад самае раніцы, у хату ўваліўся Казік Хамёнак і задыхана паведаміў:

— Бальшавікі... ля цэрквы... мітынг ладзяць... Загадалі ўсім зьявіцца.

Што там будзе, на тым мітынгу, ніхто толкам ня ведаў. Бартуліха, якая прыбегла сьледам за Хамёнкам, параіла ўзяць на мітынг мяхі, бо бальшавікі, нібыта, будуць раздаваць дармовую груцу; Барзячыха, заляцеўшы ў двор, паведаміла, што будзе фэст і кожнаму дадуць па трактары, а Тэкля Сілівончык — вядомая на ўсю акругу балаболка, — прабягаючы міма, нашаптала Насьце, што бальшавікі падчас мітынгу падпаляць царкву і прымусяць маліцца на партрэт нейкага вусача, які ўжо стаіць ля царкоўнай брамы. Наста хоць і не давала веры Тэкліным плёткам, аднак пачала хрысьціцца ды прымусіла Багуна лезьці на хату: паглядзець — ці стаіць ля царкоўных брамаў партрэціна.

Схапіўшыся рукой за вільчак, Багун доўга ўглядаўся ў ранішнюю смугу, потым зьлез долу і толькі тады паведаміў знэрваванай жонцы:

— Брахня...

— А царква ці адчынена? — пралепятала жонка.

— Адчынена, — буркнуў Багун і, аблаяўшы Тэклю, дадаў: — Каб гэтай шалахвосткі больш у двары не было.

Убіўшыся ў хату, ён доўга напраўляў на раміні золінгенаўскую брытву — падарунак фэльдфэбэля, што быў у іх на пастоі ў германскую вайну, — потым шчыгульна ўзьбіў пену, мазануў памазком па шыі і замёр, прыслухоўваючыся да гуду машыны пад вокнамі. Машына пад'ехала да весьніц, рэзка загамава-

ла і з кодабу скочылі, узьняўшы над галовамі даўжэзныя вінтоўкі, два чырвонаармейцы.

— Хамзин — у входа! Бамбиза — за мной! — гукнулі знадворку і яшчэ празь імгненьне ў хату ўваліўся вайсковец з рэвальвэрам у руцэ. Вайсковец зірнуў на гаспадара, потым падыйшоў да сьцяны і, узьняўшы рэвальвэрнай руляй брылёк на фуражцы, стаў чытаць газэціну. Чытаў доўга, хвілін дзесяць, якія Багуну здаліся цэлай гадзінай, нарэшце пакасіўся на жаўнера, што стаяў на парозе, і глуха запытаўся:

— Откуда литература?

Багун стаяў ні жывы, ні ўмерлы і адразу нават не зразумеў — да каго зьвярнуўся вайсковец — да яго, ці да жаўнера.

— Газеты, говорю, где взяли? — гракнуў вайсковец, і Багун зь перапуду лізнуў памазок.

— Тыя, што ў сянях — Барзевіч даў... — прастагнаў Багун, не пазнаўшы ўласнага голасу.

— А эти?

— У Рувіма купіў...

Толькі цяпер вайсковец піхнуў рэвальвер у кабуру і Багун стоена аддзьмуўся.

— Что за Рувим? Как фамилия? — вайсковец выцягнуў з кішэні маленькую кніжачку, зьбіраючыся, як бачна, штосьці запісваць.

— А хто яго ведае... Рувім ды Рувім... — прамовіў Багун акрыялым голасам. — Крама ў яго ў мястэчку. Ля касьцёла.

— Крама это что — магазин? — ускінуў брыво вайсковец і Багун борздка страсянуў намыленым падбародзьдзем.

— А кто такой Борзевич?

— Гэта наш, зь вёскі... Ён... гэта сама... камуніст. Сядзеў пры паляках.

— Коммунист, говоришь, — прамармытаў госьць, штосьці чыркнуў у кніжцы і, нібыта схамянуўшыся, выгукнуў: — Бамбиза! Содрать со стены газеты и сжечь во дворе!

Жаўнер, што стаяў ля парога, ускінуў на плячо вінтоўку, гракнуў: — Слушаюсь, товарищ батальонный комиссар! — і, скочыўшы на табурэт, убіў штых у столь, ды так хвацка, што са столі пасыпалася парахня, а Наста — яна хавалася пад ложкам — войкнула і перахрысьцілася аж дванаццаць разоў запар.

Багун ішоў на ватных нагах, пужліва азіраўся, а калі, абмінуўшы збуцьвелую Тэкліну хату, выйшаў да царквы, дык і зусім абамлеў: ля брамаў і сапраўды стаяла, прымацаваная да кодаба грузавіка, вялізная партрэціна. Партрэціна гайдалася ад ветру, адтапыраныя сталінскія вусы і жорсткія вусны пры гэтым злавесна варушыліся, і стваралася ўражанне, што правадыр зьбіраецца праглынуць батальённага камісара, які стаяў на кодабе і штосьці палка прамаўляў натоўпу. Порсткі ветрык шумеў у згалелых таполях, і да вушэй далятали толькі асобныя сказы.

—... Долгие десятилетия рабочие и крестьяне Западной Белоруссии стонали под игом помещиков и капиталистов... Но и в самые страшные дни белопольской оккупации они знали, что есть Москва, есть Рабоче-Крестьянская Красная Армия, есть Великий Сталин, который придёт им на помощь... И вот она, эта помощь пришла! Несокрушимой лавой двинулась вперёд советская конница, измученную польскими панами землю сотрясли могучие танки, а в небо взмыли славные сталинские соколы... — пачуўшы пра сокалаў, Багун зірнуў на неба — ад курацапаў апошнім часам не было паратунку, — і, усхваляваны, палез у кішэнь па цыгарэты.

Батальённы камісар прамаўляў цэлую гадзіну, нават зьлёгку асіп, нарэшце, дзясятым разам згадаўшы Вялікага Сталіна і шчасьлівае жыцьцё ў савецкіх калгасах, ляпнуў сам сабе ў ладкі і, паправіўшы брызэнтавую папругу на шынялі, запытаўся:

— Какие, товарищи, будут вопросы?

Грамада маўчала, камісар паўтарыў пытаньне, і неўзабаве напятую цішыню працяў зычны Міцькаў голас:

— Товарищ комиссар, а где сейчас находится Троцкий?

Пытаньне, як бачна, зьбянтэжыла камісара. Ён ізноў — цяпер ужо дрогкімі рукамі — паправіў папругу, тарганўў даланёю, маўляў — зараз скажу, а потым, трэцім разам паправіўшы папругу, здушана выдыхнуў:

— Митинг считаю закрытым.

... Багун падыходзіў ужо да хаты, калі за сьпінай з плаксівай натугай загула машына. Сэрца Багунова ёкнула, ён застыў на месцы, чакаючы, што грузавік спыніцца і камісар забярэ яго з сабой, але машына, дзякаваць Богу, праехала міма, і Багун на радасьцях крыкнуў чырвонаармейцам, якія сядзелі ў кодабе:

— Слава савецкім калхозам! — і адзін з чырвонаармейцаў — той, што сядзеў ля борта — крутнуў пальцам ля скроні.

Ціхім халаднаватым ранкам — акурат за тры дні да пакроваў — Багун ехаў у мястэчка. Зямля тае раніцы ўзялася шэраньню, калюжыны прыхапіла лядком; Лазунок увесь час задаво-

лена пырхаў, шапацеў хвастом і парываўся ісьці дробнай рысьсю.

Дарога да мястэчка няблізкая — поўных шэсьць вёрст. Тут можна і падрамаць, і зацягнуць наўголасу якую-небудзь тужлівую песьню. Гэтым разам, аднак, кляваць носам не давялося: у вялікай скрыні валтузіліся восем курэй — лямант стаяў на ўсю акругу — і Багун штоpазу біў даланёю па скрыні і здушана прамаўляў:

— Ды сьціхніце вы, недарэкі...

Куры на момант суціхалі, але праз хвілю ізноў пачыналі зацята квахтаць ды біць крыламі.

Зрэшты, курыны лямант дрымоце не перашкода — іншым разам Багун налёг бы плячом на скрыню ды зьмежыў павекі, але цяпер душа была не на месцы і сьвярбліва варушылася пад дыхніцай. Багуну раз-пораз здавалася, што там, наперадзе, гула машына і тады ён саскокваў з возу і шыбаваў поруч з канём, з-пад рукі пазіраючы то на бальшак, то на сьпічастыя вежы местачковага касьцёла. „Каб зноў на якога чорта ня ўзьбіцца", — думаў ён такімі хвілямі, памінаў камісара нядобрым словам і, плюнуўшы пад ногі, ізноў усьсядаў на калёсы.

Як на добры лад, дык хвалявацца не было падставы: ну паклеіў ён сьцены эміграцкімі газэтамі. Але ж ці гэта правіна? Асадніка Арэхву арыштавалі, дык у таго шаблю знайшлі, якую Пілсудзкі падараваў. Пана Бурша забралі — той стрэльбу ня здаў. Палясоўшчык Агіньскі, казалі, Сталіна лаяў — таму й сядзіць цяпер у віры на калы. А што ён, Багун?! Яму ж, як таму бацюшку — любая ўлада ад Бога.

Так ён супакойваў сябе, чухаў канцом пугі пад дыхніцай — як раз там сьвярбела душа — і з уздыхам прамаўляў фразу, якая ад нядаўняй пары прыліпла да вуснаў:

— І як яно ўсё будзе?

На ўезьдзе ў мястэчка, праваруч ад дарогі, стаяў вялізны брудна-шэры намёт, каля якога завіхаліся некалькі чырвонаармейцаў. Адзін зь іх калоў дровы, другі разьдзімаў агонь пад казаном, а трэці сядзеў на ўзбочыне і пераабуваўся, спавіваючы нагу ў шэрую анучу. Рабіў ён гэта надта спрытна, Багун нават паўстрымаў каня, пазіраючы на такое пераабуваньне, і ў той жа міг сумеўся. На ўзбочыне сядзеў той самы чарнявы маладзён, што прыходзіў чытаць газэты. Маладзён нацягнуў на пятку чаравік, узьняў вочы і борздка падхапіўся на ногі.

— Здрастуйця, — пралепятаў Багун, але той, да каго ён зьвяртаўся, як бы і не пачуў; маладзён абабіў калашыньне, тупнуў нагою, спраўджваючы — ці добра трымаецца накручаная на лытку ануча, нетаропка пайшоў да агню.

— А дзе Апанасій? — выгукнуў Багун у сьпіну маладзёну, і той, не павярнуўшы галавы, прамовіў: — Проезжай, отец... Здесь военный об'ект.

Багун хвастануў каня, і калёсы, працяўшы навакольле грукатам колаў і роспачным кудах-каньнем, заскакалі па бруку. „Ботаў няма, а нос верне... кацап нямыты", — у Багуна ад абурэньня нават затрэсьліся рукі. Каб утаймаваць дрыготку, ён хвастануў Лазунка другім разам і ў гарачцы не заўважыў, як праехаў краму, і стрымаў каня ўжо ля самай гарбацярні.

„Чаго гэта я?" — аддзьмуўся Багун, выцер халодны пот зь ілба і агледзеўся. Першае, што кінулася ў вочы — новая шыльда над уваходам у гарбацярню. Багун колькі разоў прачытаў па складох мудрагелістае слова — „Агитпункт", — але так і не дапяў да ягонага сэнсу. Крыху вышэй, пад самай страхою, вісеў кавалак чырвонай крамніны з надпісам „Все на выборы!", а да самой страхі быў прыбіты партрэт нейкага савецкага генэрала, упрыгожанага з двух бакоў чырвонымі сьцяжкамі.

— Клім Варашылаў, — гукнулі за сьпінай.

Багун азірнуўся, з насьцярожлівай усьмешкай таргануў падбародзьдзем: пасярод вулкі стаяў мурзаты Рышка і калупаўся ў носе. „Глянь ты... дурыла, а генэрала ведае", — падзівіўся Багун. Яму карцела запытацца — дзе цяпер бацька: у пастарунку, ці, можа, завезьлі ў Глыбокае? — але, падумаўшы, вырашыў не трывожыць хлапечае сэрца.

— А што за выбары такія? — запытаўся Багун усё з той жа насьцярожлівай усьмешкай і атрымаў адказ: — У Народны сход.

„Што за сход такі? Трэба будзе спытаць у Рувіма", — з гэтай думкай Багун падыйшоў да калёсаў, пашнарыў рукамі пад скрыняй і выцягнуў адтуль дарэшты разьлютаванага пеўня.

— На, аддасі маці, — паведаміў, ратуючыся ад бойкіх крылаў, Багун і калі хлопец падхапіў пеўня, вясёлым голасам запытаў: — Чаму бурбалкі не пускаеш?

— Mydło skończyło się, — гукнуў Рышка папольску, сказаў яшчэ нешта, але голас ягоны заглушыла шалёнае лапатаньне крылаў.

Згадаўшы ў думках гаспадара гарбацярні, Багун даў калёсам разгону, удыхнуў пругкага паветра, а ўгледзеўшы на дзьвярох Рувімавай крамы вялізны замок ды наклееную на дзьвярныя ліштвы паперку, нацягнуў лейцы. Паперка бялела на ржавых ліштвах, трымцела адным канцом на ветры і поўніла душу гнятлівым непа-

коем. Багун зьлез з калёсаў, крадком падыйшоў да дзьвярэй, і ў гэты міг штосьці мяккае і рухавае кранулася нагі. Чорны Рувімаў кот прыязна завуркатаў, налёг пысаю на халяву, і Багун, разглядаючы сінюю пляму пячаткі, якой была пазначана паперка, прашаптаў:

— Дрэнь справы, паскудняк...

Ён ня скончыў фразы, бо з-за рогу будыніны выплыла, блядая як сьмерць, крамнічыха Двойра.

— Забрали, забрали сегодня ночью... За чьто?!

Жаночы лямант перацяў дыханьне. Багун задам рушыў ад дзьвярэй, наступіў на кашэчы хвост, пудліва падскочыў і кулём паваліўся на калёсы.

Ён гнаў каня, не разьбіраючы дарогі, і толькі ўехаўшы ў таполевыя прысады, што шумелі за касьцёлам, кінуў павады, кульнуўся на сьпіну і ўтаропіў пагляд у смужыстае, па-восеньску бляклае неба. Яму падалося раптам, што цела стала бязважкім і пачало падымацца да туманістых аблокаў; Багун заплюшчыў вочы, прашаптаў два радкі малітвы, і гэта дапамагло: угрэты лоб казытнуў халодны ветрык, цела набыло вагу, а ў галаве ізноў замітусіліся бязладныя думкі: „Ну добра, забралі пана Бурша... дык той служыў у Дзянікіна. Але за што ўзялі Рувіма? Ці не за тыя чортавы газэты? Не давядзі сьвет — і па мяне прыедуць".

Хваравітая млосьць адступіла, і слых напоўніўся пошумам ветру, конскім пырханьнем, курыным сакатаньнем і нейкімі дзіўнымі зыкамі. Стваралася ўражаньне, што недзе непадалёку ці то сьмяяліся, ці то здушана плакалі. Багун колькі разоў падымаў галаву, глядзеў наўкола, пакуль не зразумеў: усхліпвалі на другім баку каменнага мура, што атачаў касьцёл. Хвілін пяць Багун ляжаў нерухома, але потым цікавасьць узяла сваё. Ён пад'ехаў да мура, узьлез на скрыню і ўбачыў са сьпіны местачковага ксяндза. Ксёндз стаяў, насунуўшыся лобам на стаўбур старой таполі, і абцягнутыя сутанаю плечы здрыгваліся ад горкага плачу.

Багун сьцярожка, каб не нарабіць зьвягі, зьлез са скрыні, гэтак жа сьцярожка абабіў нагавіцы, і на душы было адчуваньне, што пабачыў ён штосьці прыкрае і дарэшты сарамотнае.

Гэта адчуваньне — гнятлівага сораму — аніяк не мінала. І адвячоркам, паганяючы Лазунка, Багун штохвілі кратаў гарачыя шчокі, зачаравана паглядаў на агністы далягляд, і адно пытаньне не давала спакою: чаму плакаў ксёндз?

Палымніца таго вечару шугала на паўнеба. Ля самага далягляду яна была перамяшаная з чорнымі хмарамі, крыху вышэй, над цёмнымі сьпічакамі хвояў, залівала неба гарачай пунсовасьцю, і здавалася, гэта яна, палымніца, кранаецца сваім агнём няголеных шчок.

— ... Саветы, відаць, пакрыўдзілі, — уголас, каб пазбыцца дакучлівых думак, прамовіў Багун і на Мандрыкавай паваротцы зьлёгку падагнаў каня. Лазунок, аднак, хутчэй не пайшоў: прысеў на заднія ногі, чуйна зварухнуў барвянымі вушамі.

„Ці не ваўкі зьявіліся?" — Багун нацягнуў павады і ў той жа міг з палёгкаю аддзьмуўся. Наперадзе, на тле барвянай палымніцы, варушыліся нечыя постаці і гучна рыпелі колы.

„Хто гэта выправіўся... проці ночы?" — падумаў, змагаючыся з позехам, Багун і яшчэ падумаў, што дарма так напужаўся саветаў. „Бяз дай прычыны нікога не бяруць. Той жа пан Бурш служыў у Дзянікіна, Рувіма таксама схапілі за цападлы ня проста так — была нагода... А чаму яму хвалявацца, у касьцельных прысадах хавацца, калі за ім няма ніякай правіны?" Падумаўшы так, Багун з палёгкаю ўздыхнуў і зьехаў на ўзьмежак дарогі.

Сустрэчныя калёсы зацята рыпелі, і Багун ужо ўдыхнуў паветра, каб гукнуць: — Чаму колы ня змазаў? — ды нечакана прыкусіў язык. На калёсах сядзелі трое, яшчэ двое ішлі поруч, зь вінтоўкамі за плячыма. Душа Багунова абамлела: на калёсах, са зьвязанымі за сьпінай рукамі, сядзеў Міцька Барзевіч.

— Міця... — прашаптаў Багун, калі калёсы праяжджалі міма.

Міцька прыхапіўся, зірнуў кудысьці ўбок і зноўку зьвесіў галаву.

Калёсы праехалі мэтраў дзесяць і спыніліся.

— Эй, гражданин, как ваша фамилия?! — крыкнуў той, што сядзеў поруч зь Міцькам, і вайскоўцы скінулі з плячэй вінтоўкі.

Насьцярожлівую цішыню парушыла кляцаньне затвору.

— Дзядзька Багун... ратуйцеся! — Міцька хацеў крыкнуць яшчэ нешта, але, атрымаўшы ладнага кухталя, кульнуўся на бок.

Здаецца, ён і не паганяў Лазунка, ды конь стаў на дыбкі, ірвануў штосілы і пайшоў наўскач, задзёршы да неба кудлатую галаву.

— Стой! Стой, б-блядь! — гукалі за сьпінай.

Фанэрная скрыня перакулілася, куры зь лямантам узьняліся ў паветра, адна зь іх узьбілася на карак, а яшчэ праз імгненьне карак працяў пякучы боль.

— Багародзіца Дзеўна радуйся... — прахрыпеў Багун, адрыгнуў крывёю, і бязвольная рука, павіснуўшы долу, аж да самай вёскі малявала на пяску хвалісты пасак.

Анжаліна Дабравольская

* * *

На дошцы сусьвету
душы-фігуры
белыя
чорныя

усё
роўна
Любоў
пераможа

* * *

... Мы не ад сьмерці канаем —
нас забівае жыцьцё.
Сьмерць —
адно прымае
і бласлаўляе.

* * *

На падваконьні
мёртвы матыль
спрабуе крыло.
Хіба
заклею акно.

* * *

Скіну
пялёсткі,
каханьне,
мары,
жыцьцё...
Што застанецца
кволай сьцяблінцы-духу?
.....

* * *

Вусны растулі свае
і выпі
ясны боль бярозавай галінкі.
Толькі,
прыпыніўшыся хвіліну,
проста
„дзякуй"
не забудзь сказаць.

* * *

Між намі лёс —
нібы пясок праз пальцы,
жыцьцё цячэ,
ня ведае супыну.

Няхай сляза,
што засталася сыну,
зазьзяе яснай кропляю
бурштыну —
і ўсё складзецца,
літасна і шчасна.

* * *

... Не шукаць спачуваньня,
Адлятаючы ў вырай.
Спадзяваньне ня песьціць
На зьнямоглых людзей.
Дай мне, Госпадзе, сілы
Дачакацца прадвесьня,
Зноўку выпрастаць крылы
Чыстых мар і надзей.

Дай мне, Госпадзе, моцы
Стаць каханай і вернай,

Незямны Твой дарунак
Пранясьці праз жыцьцё.
На аголеных струнах
Тонкіх жылаў і нэрваў
Трапяткою мэлёдыяй
Ажывіць забыцьцё.

... На руках чалавечых
Птушанё засынае,
Сьніцца птаху малому
Неба зорнага сінь.
Да апошняй Сустрэчы
Я прысуд Твой прымаю.
... Гоіць стомлены вечар
Лісьце горкіх асін.

* * *

Да ранку — дарую крыўды.
Мой вораг —
ці станеш сябрам?
Няхай самота закрые
цябе ад бедаў-навалаў.

Да ранку —
змайструю крылы,
сябе агалю да пёрка —
хай возьме іх той, хто мілы,
і верыць у мяне,
дзіцёнак.

І так,
бяз крыўдаў і крылаў,
акрыўшыся толькі скурай, —
пайду па зямлю астылай —
у сьвет ранішні,
заўтрашні,
с у д н ы .

АНЖАЛІНА ДАБРАВОЛЬСКАЯ — нарадзілася ў Менску. Скончыла Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт. Працавала навуковым супрацоўнікам у Музэі Народнай Архітэктуры і Побыту (Менск), у Доме-Музэі Максіма Багдановіча (Горадня), у праваслаўнай газэце „Гродзенскія епархіяльныя ведамасьці". Вершы друкавала ў беларускіх газэтах і часопісах, калектыўных зборніках *Квадра*, *Дзень паэзіі*. Выдала паэтычны зборнік *Пазамежнасьць* (1994).

Ігар Сідарук

Затачэнец

Апавястушка-фантасмагорыйка

I

І не было, не было ў Грынькі каханьня.

* * *

Э, не, калі вы адразу падумалі, што гэты Грынька зь ёмкім прозьвішчам Скрыпень — нейкі местачковы дундук, што сядзіць невылазна ў хаце ды абыходзіць асобаў жаночага полу яшчэ здалёк, дык вельмі, шаноўныя, вы памыляецеся. Таму як у Грыні нашага ўсё з дакладнасьцю наадварот: ад гэтых самых дзяўчатак-кабетачак няма яму ані роздыху, ані праходу.

А быў Грынь да сямнаццаці год, можна сказаць, што й звычайным хлопцам, які нарадзіўся ў непрыкметным мястэчку Крачынску. Тут скончыў школку, тут штолета чавіў зь сябручкамі ментузоў у амаль перасохлай сажалцы, тут зьбіраўся пайсьці, як і бацька, у мэханізаваную аўтакалёну, каб зарабляць сабе, значыць, на пражыцьцё якога рубля-рубельчыка.

Ды толькі тым самым летам, калі школьныя кніжкі былі закінутыя на прапахлае вашчынаю й пылам гарышча, здарылася трагічная непрадбачнасьць. Старэйшы Дрон Скрыпень быў пераеханы да верхняе паловы цела цяжэзным бульдозэрам, якім кіраваў надзіва цьвярозы ў той дзень апошні местачковы алькаголік Пархом Дрындушка. У нечалавечых пакутах Дрон аддаў Богу канцы, нават недавезены да местачковае амбуляторыі. Ягоная жонка Аўдота, як толькі даведалася пра тую страшэннасьць, закусіла скрыўленым ротам хустачку ды аб'ехала на вільготную зямлю ля калодзежа, зь якога толькі-толькі чэрпала сьвежае вадзіцы, каб зварыць свайму Дрону смачную поліўку-гарахавіцу. Вёдры бразнулася, куры шуганулі россыпам, ражок белае хустачкі навечна застаўся закусаным у скрыўленым роце Скрыпеніхі...

Яшчэ толкам ня скончыліся паховіны, яшчэ й не былі падабраныя рэшты памінальнае куцьці, як местачковая ўдавічка Сонька Марцылецкая лёганька так пад стальцом паклала Грыню сваю руку на самае што ні на ёсьць мужчынскае месьцейка ды счавіла яго ў сваёй удавічнай спачувальнасьці. І, як ні сіліўся Грынька адпавядаць жалобе моманту, як ні спрабаваў сьцярпець такое-гэткае, як нават ні біў, роспачны, пяткаю па Соньчыным басаножку, ён кончыў. От так, проста — за жалобным сталом, у прысутнасьці спахмурнелае радні, у юначыя свае трохі нават засраныя порткі.

Пасьля таго, як бацькі былі перададзеныя на вечны спачын сырой зямлі, сам хлапак вельмі занурыўся духам. Але і тут сьвет павярнуўся да яго ўсьмешлівым тварам. У васобе начальніка местачковае пошты Міхала Канапацкага, які аформіў юначыну паштальёнам-разносчыкам, паклаў грошай паводле штатнасьці ды нават выдзеліў хоць і стараваты, аднак па ўсіх стацьцях спраўны ровар.

І Грынька запрацаваў, сумленна зарабляючы свой штодзённы сірочы, ды затое ні ў кога не пазычаны хлеб.

А ў той вечар, як адбылося пахаваньне бацькоў, хлопец, выплаканы дашчэнту, успомніў раптам суцяшальна-сакрушальнае дакрананьне Соньчынае бядовае ручкі, ценем пасоўгаўся па апусьцелых пакоях і вымкнуў-такі з задушнае хаты ў зорную ціхую ноч...

Сонька яго чакала. На стале — сіні абрусік у белыя рамонкі, крывава-барвяністая бутэлька вішнёўкі, празрыстыя скрылёчкі накупное крамнае кілбаскі. І — сама, сама Марцылецкая. Яркая, накудзераная, дзе трэба расшпіленая, дзе ня трэба заманная, гэткая ўся сьцярвотна-ўсьмешлівая, амаль што парнаграфічнае дзіва з глянца-вокладнага часопісу, што неяк Грынь яшчэ падшыванцам трымаў у сваіх упацелых дрыготкіх руках, зачыніўшыся ў школьнай прыбіральні.

— Праходзь, коцік? — нацэліла разрыўнагранатныя грудзі свае на абмерлага коціка Сонька. — Садзіся, — паляпала яна далонечкаю блізка-блізенька каля сябе. — Пі, еш. І не сумуй ты так, зайчанятка маё даўгавухае, — пакратала яна двума пальчыкамі вуха хлапчыны, які ад кратаньня гэткага зноў ледзь ня кончыў.

— Я таго... Нармальныя ў мяне вушы, — толькі й здолеў адказаць юнак, прападаючы назаўжды спаміж палымных грудзей Марцылецкае.

І ўміг апусьцела пляшачка, пакацілася колцамі ў страўнікі пакупная кілбаска, каўзуном аб'ехаў на падлогу сіні абрус у белыя рамонкі...

Нібы нейкае чараўніцтва наслала на яго Марцылецкая. Нібы дурнап'яныя восы на штучны мёд, ляцелі, западалі, кідаліся на яго з таго часу жанчыны. Праўда, і сам ані не мінаў хоць бы якую такі-трохі гладкую кралечку. Калі сказаць проста, дзеўкі вешаліся на яго, бы кілбасныя колцы на друк.

Ну дык у чым справа? А справа якраз была ў тым, што хоць Грынька з жанчынамі зыходзіўся-стыкаваўся, што тыя вагонныя буфэры, ды ніводная зь іх за гэтыя імкліва-мінулыя тры гады ну нават і блізка не кранула, не разьвярэдзіла хлапечае сэрца. Іншым часам і сам не хацеў аніякіх дзевак, аніякага бабства, але ж!.. Асабліва шалеў-западаў на жанчынку Грынь, калі тая была, так бы мовіць, чужая. Гэта значыць, замужняя ці хоць бы хадзяшчая зь якімнебудзь халастым кавалерам.

Некалькі разоў мужыкі раганосныя яго падпільноўвалі ды люта білі. Апошняя кабета, да якой нахабна залез куды трэба, мела самага раўнюшчага мужыка на ўсё мястэчка. І гэты раўнівец, відаць, з такімі ж падманнымі хаўрусьнікамі, зноў Грыньку злавіў. Не, твар яны Скрыпеню не псавалі. Проста моцна прывязалі ногі да роварнае рамы, каб ён, значыць, ня мог дастаць імі понажаў, рукі мёртва прыкруцілі да руля дый з пагорачка крута-абрыўнага ўніз штурханулі.

І ляцеў Грынька ўніз што тая страла.

А калі з тыдзень ці болей вылежаўся-выкачаўся ў хаце, калі нарэшце аддзер ад шчок усе плястыры ды раскруціў навязкі, калі глянуў у люстэрка — дык у вачах таго люта-зьбітага чалавека, які глядзеў на яго, убачыў адзінае й няўмольнае: далей так жыць нельга!

* * *

— Можна?.. — пашкробся хлопец і не пачуў адказу.

Ужо хацеў павяртаць назад, як раптам дзьверы, жудлавата рыпнуўшы, расчыніліся... Патыхнула калючым, сьцюдзёным ветрам, валасы на галаве варухнуліся, але зноў накаціла млявая цішыня й звычайная тэмпэратурнасьць.

— Можна, можна.

Грыня, ужо стоячы пасярод цеснае віталенкі, раптам пабачыў перад сабою такую да бясконцасьці юную й такую да галавакружнасьці вабнюшчую дзяўчыну, што ў яго захапіла дых.

— Добры вечар... у хату вам. Вы прабачце, што пазнавата так. А... дзе цётка Дрыпа? Мне б да яе... жалацельна...

— Ужо ноч, а ня вечар, — усьміхнулася, гледзячы проста ў вочы позьняму госьцю, дзівосная незнаёміца.

— Тады прабачце... Калі няма... цёткі, значыць. — Хацеў павярнуцца, каб узяцца за клямку, і ня мог, ня мог!

— А яе, відаць, і ня будзе, — варухнула адзіным пальчыкам дзяўчына, і Скрыпень міжволі зрабіў крок да яе. — Стой! Не варушыся, — раптам узьняла руку ўверх, і хлопца працяла электратокам сонечная аголенасьць акуратнавойстрага лакаточка.

— Ды хто ты такая, каб я стаяў тут і не варушыўся? — урэшце наважыўся асьмялець.

— Скажу, — хітнула галавою. А потым узьнялася з-за стала, падыйшла да яго блізка-блізка. — Я — Крыста. Бабы Дрыпы ўнучка.

— А дзе ж...

— Ціха, — прыклала палец свой прахалодны да абсушаных вуснаў ягоных. — Няма яе. І ўжо ня будзе ніколі.

— А... — зноў хацеў раскрыць рот Грынь, але толькі націснула мацней пальцам на вусны яму, толькі шырэй зрабіліся зрэнкі ейныя, у якіх задрыжэла, замітусілася хлапечае адлюстраваньне... — Ціха, маўчы. Я, Грынечка, усё ведаю. Нават ведаю, як цябе ўратаваць, і што для гэтага зрабіць трэба. Ці чаго не рабіць, — раптам досыць злосна хіхікнула Крыста.

Але нічога такога, зусім счараваны ёю, ён не заўважыў.

І адразу зварухнулася рэзка пад нагамі дзяўчыны масьціна, і тая пераставіла нагу, мацней прыціскаючы па-здрадніцку зарыпелую дошку. Зноў анічога не пачуў і не пабачыў Грыня.

— Ідзі адсюль! — раптам накрыла прывабны твар страшэнна-чорная хмарыстасьць.

— Не! — дзівячыся сваёй сьмеласьці, матлянуў чубам Грынь. — Не гані...

І зноў ён адчуў, што ня можа быць надта блізка, адразу тлуміць, засмоктвае нейкае галавакружнае віраваньне: дый сама дзяўчына з косамі сваімі золата-вадаспаднымі як бы зь ціхаю радасьцю цягнецца да яго, але й спрабуе зьнішчыць бязжальна гэтую самую радасьць...

— Але... Плата. Ведаеш, якая будзе плата?

— Я ж сказаў, — мкнуўся выплысьці вонкі Грысь. — Не хачу. Не хачу так мучыцца, як цяпер. Хіба гэта жыцьцё? — раптам грукнуў па сьцяне кулаком. Крыста падыйшла ўсутыч, амаль грудзі ў грудзі. І зьбялеў, счэз сухою травою ён (першы раз за сваё жыцьцё перад дзяўчынаю!..). А яна ціха ўзяла за руку, пасадзіла

на лаву і спакойна прымасьцілася за сталом насупраць. Маўчала, як бы нешта яе трымала, як бы чакала нечага...

І чакаў у маўклівасьці Грысь.

— Тыдзень. Адзін тыдзень табе спатрэбіцца, каб пазбавіцца ад пакутаў сваіх, — адставіла ўрэшце кулачок ад падбародзьдзя, зірканула на пакуль нерухомую скрываўленую масьціну... — На працягу тыдня ты, Грынька, павінен утрымацца ад спакусы трох розных жанчынаў. Выдзюжыш, вытрымаеш — будзеш шчасьлівы. У такім шчасьці, у якім сам захочаш!.. — Падлога пад ім раптам затрэслася, зарыпела, нібы ўсе дошкі са скрыгатам разыйшліся, каб выпусьціць на волю нешта дзікае, жахліва-нялюдзкае. Яна ўзьнялася з-за стала, стромка вымкнулася. — Калі ж ня вытрымаеш, не ўстаіш — страціш сэрца сваё, мой коцік.

— Як?.. — кранула падпашкі агідная скуражэрнасьць.

— Прыляціць чорны крумкач, а дакладней, чорная крумкачыха, дзяўбяне тры разы ў грудзі, і назаўсёды выдзярэ тваё вялікае гарачае сэрца!

— А... А табе што я вінен?..

Крыста зайшла за Грысеву сьпіну, паклала руку яму на плячук, нібы хацела зьняць зь яго нерухомасьць.

— Вось гэтае самае сэрца й вінен, — ціха рагатнула раптам. Потым зарагатала гучней, а яшчэ праз хвілю старая халабудзіна так і трэслася ад маладога, скрутна-усёпрацінальнага рогату.

Грыня бег адтуль прэч, ледзь ня падаючы, але й бразнуўся разы два ці тры ў каламутную гразь, ускокваў, гарачкава шыбаваў далей, напрасткі, чорт ведама цераз што; гальлё рвала яму апранахі, па шчоках бараздавалі струменьчыкі поту, а ўваччу так і стаяла гэтае юначае, эфэмэрна-пранізьлівае стварэньне, разрывала вушы шрапнэль ейнага вядзьмарскага, лічы, нечалавечага рогату.

* * *

Ноч зрабілася яшчэ цямнейшаю.

На падлозе, расплёўшы золатавалосьсе сваё, у атачэньні трынаццаці палымна-жарых сьвечак, сядзела аголеная Крысьціна. Перад ёю кружляў, усё болей набіраючы абароты, сіні сподак, а пасярод стаяла аддзеленая ад тулава галава бабы Дрыпы.

Дзяўчына нешта хутка мармытала, роз-пораз моцна абхоплівала далонямі свае пругкія дзявочыя грудзі, любаярлівы стогн працінаў пустэчную напружнасьць халабуды.

— Крыста... — галава раптам рэзка расплюшчыла вочы.

— Чаго хочаш? — адвяла рукі ад грудзей, злосна зірканула ў раскрыўлены Дрыпаў рот.

— На нядобрае хочаш зьвярнуць, Крыста. Толькі... і яго загубіш, і сама прападзеш!

Ведзьміна ўнучка з замілаваньнем прыклалася пстрычкаю да носу бабці, усьміхнулася:

— Вой, не прападу! А й прападу, калі тут застануся, — набегла раптам шэрая хмурына. — Гамон тут, правал, магіла...

— Прыгажосьць сваю страціш, дурніца!..

— А навошта мне ў бізнэсе прыгажосьць?

— А каханьне? — надта ж голасна вымкнула гэткае слоўка са шчарбіннага рота Дрыпы. — Яго пад падлогаю, як мяне, не схаваеш...

— Ізыдзі! Ізыдзі! Ізыдзі! — аж узьвілася маладая вядзьмарка. У пакойчыку завіхурыла, закурэла, па столі й сьценах прабеглі тры страшныя расколіны. Амаль згаслыя сьвечкі ўспыхнулі зыркім полымем і назаўсёды згасьлі яшчэ да таго, як Дрыпіна галава таксама трэснула на тры часткі. Яны імкліва ператварыліся ў шызы дым, які скразьняком навечна ўцягнула ў страшныя тыя расколіны.

* * *

Грынька ня піў і ня еў, ён ледзь круціў понажы свайго ровара, развозячы пошту, ды няспынна думаў.

Добра, думаў, калі вытрывае, калі сьцерпіць, дацягне. Калі тыдзень нават галавы не паверне ў бок праклятушчых гэтых кабетак. А як не?.. Хіба не даваў ён раней такое зарукі?

І тут ясна ўявіў аблічча Крыстусі. Прыцягальнае, прыварожнае, нават страшнае непраўдзівай сваёй прыгажосьцю. Штосьці рабілася зь ім, калі ўсплывала аблічча гэтае, тады ціха шаленствавaў Грынь ды нават сабе баяўся ў тым прызнацца.

Пакуль, аднак, вырашыў пакінуць усё як ёсьць. Бач ты, чорная крумкачыха сэрца выдзяўбе! Дый каханьне... Да гэтага часу без каханьня жыў і далей пражыве. Так што... Наперад, Грынька! Круці-вярці свой роварны понажны мэханізм, пакуль круцяць ногі!..

Наступным днём хвацкі паштальённы маладзён з ранейшым імпэтам укачаўся ў знаёмую справу.

Толькі ён заладаваў таўшчэзны пачак газэтаў у сваю фірмацкую сумку і ужо хацеў скіравацца знаёмым развозьніцкім маршрутам, як побач спынілася люксусовае мэрсэдэсаўскае аўто. Шкло на дзьверцах кіроўцы маруд-

на аб'ехала ўніз. Адтуль паказалася галава напамаджанае ды напарфумленае дзівоты. Дзівота, вуркочучы, запыталася, як праехаць у цэнтар мястэчка... А ўжо праз чвэртку гадзіны люксусовае аўто, бы тая гуляшчая шкодная котка, хавалася ў гушчэзных хмызох на беразе местачковае ручаіны, а за танаваным шклом гарачкава-зрынна зьдзяйсьнялася больш шчыльнае знаёмства нашага простага лістаношы й тае самае напарфумленае дзівоты...

А яшчэ праз гадзінку Грынь з жахам даведаўся, што гэтае самае знаёмства адбылося ў яго з жонкаю новага начальніка крачынскае міліцыі Якава Збарамірскага і што цяпер яму можа быць ужо поўны капец з дубадралам. Пра тое яму давёў вулічны сусед Зьмітр Карніец, добры сябрук, які зусім выпадкова прасачыў ад пачатку й да канца чарговае Грынева авантурства.

„Цікай! Чуеш?! — Карніец так перажываў за сябра, нібы ня той, а ён сам толькі што зьвёў заманным шляхам у блуд напамаджаную сьцярвотную міліцыянціху. — Хтосьці ўжо данёс. А ў яго пісталет! Во такая руля?..” — паказаў, страляючы палахлівымі вачыма па бакох ды расстаўляючы рукі, Зьміцер, якая насамрэч руля ў начальніцкага пісталета.

— Пісталет? — перапытаў Грынь і адчуў сярод кішак найгнюсьнейшую халадэчу.

— Ну! І ён ужо бегае па мястэчку ды крычыць, што стрэліць табе проста ў лоб, калі ўбачыць!..

— Сам бегае? — ня мог прыдумаць больш дурнейшага запытаньня Грынька.

— Ага, сам! — матлянуў галавою Зьміцер. — Зь міліцэйскім нарадам! Так што цікай! Цікай, Грыня, пакуль ня позна!..

— А куды я ўцяку? — зьбялеў белай крэйдай той.

— Куды, куды... — Карніец пашкроб шчэць на падбародзьдзі. Ды хоць у падлесак! Там лесьнічоўка дзядзькава. Ніхто ня ведае! Адседзісься.

— А як знойдуць?

— Ня знойдуць. Ніводная божая душа ня ведае. Там маскіроўка такая, што — ого!..

— Ну й што я там сядзець буду? Калі кажаш... што проста ў лоб...

— А!.. — Карніец зноў матлянуў галавою. — Думаеш, ты першы? Я тут ад знаюшчых людзей чуў, што Якаў ейны, у чарговы раз абрагацены, толькі тыдзень кіпіць ды зброяй размахваючы, па вулках шаленствуе. А потым — усё... адпускае яго. Можа, яшчэ й калі чарачку разам уздрымболіце.

— Тыдзень?.. — не зусім адпаведна моманту, нечакана павесялеў Грынь. — Слухай!.. Тут усё так сыйшлося, што... і праўда — трэба трохі адседзецца.

— Ну!.. А я пра што!

—Давай на раму!

— Куды?!.

— На раму! — блажануў раптам Грынь. — Сам кажаш... зь пісталетам! А дзе я сам знайду лесьнічоўку тваю?

Карніец, разоў зь дзесяць блякнуўшы, умасьціўся на раму. Грынь адштурхнуўся нагою ад прапыленае сьцяжыны. Капітальна перагружаны ровар марудна паехаў. Фірмацкая паштальёнская сумка бязжальна пляскала па Грысевым баку, поўная яшчэ сьвежых газэтаў. Газэтаў, якім ніколі ня выпадзе быць разьвезенымі па адрасатах.

II

Лесьнічоўка й напраўду месьцілася надзвычай удала. Проста заснулае сярод густых елак ды двух узгоркаў медзьведзяня, а ня складзены справаю чалавечых рук маленькі драўляны дамочак.

— Ну, як? — запытаў Зьмітр у Скрыпеня. калі яны трапілі ўсярэдзіну.

Апошні абвёў паглядам зьмесьціва лесьнічоўкі. Усё кругом ладна прыгнана, акуратна раскладзена, да месца падвешана.

— Хо!.. — гыгыкнуў нарэшце Грынь, крыху абалдзелы. — Як у казцы! — Потым, аднак, успомніў, з-за чаго распачалася ўся гэтая куламесь. —Ладна, Зьміцер. Пакуль што дзякаваць. Ты мне ўсё роўна... як душа родная.

— Ай?.. — Карніец па-звыцку матлянуў галавою, запалошна азірнуўся. — Сядзі пакуль! Аддыхвайся... — і раптам падскочыў: — Слухай! Тут у дзядзькі — радыёперадатчык! І цілівізар... маленькі.

Карніец памкнуўся да шафкі, рашуча рассунуў бляшанкі й крупы, адкінуў старую газэціну. За ёю напраўду аказаліся рацыя даваеннага ўзору і пераносны тэлевізійны прыймач „Рэкорд-5”, які сілкаваўся ад батарэек і меў унутраную антэну.

— Ого! І што — спраўнае?

— А то! Як працуе, я табе пакажу.

— І з кім мне... на сувязь выходзіць?

— А хоць са мною, — рагатнуў Зьміцер. — У мяне такі ж... пад ложкам у спальні. Толькі як пагаворыш, вось тут крутані, а тут націсьні — каб батарэйкі ня селі. Усёк?

— Ну, здаецца...

— Тады твае пазыўныя — Яздраб, а мае — Хахатуха. Усё, пайшоў я. Трымайся!

Карніец моцна паціснуў сябру руку, і дзьверы за ім ціха зачыніліся. Болей у той дзень Грынь ня чуў анічога, акрамя насьцярожанае цішы ельніку.

* * *

У аўторак, яшчэ й толкам не разьвіднела, Грынька прачнуўся, упацелы. Усю ноч даймалі нейкія кашмары. А можа, у лесьнічоўцы было проста задушна... Узьняўся з паходнае раскладанкі, згатаваў сабе несамавіты, затое ладны сьняданак ды пачаў наталяцца адзінотаю і гультайствам.

Наталяўся да тае пары, пакуль яму капітальна не прысьпічыла. Але ўсё, на што трапляла вока, для малых, але пільных патрэбаў падыходзіла мала. Як на зло, у лесьнічоўцы не было хоць бы якога старога пакарабачанага вядзерца, хоць бы якое пустое пляшачкі. Ужо нават хацеў не зважаць на гонар ды прымасьціцца ля форткі, але з жахам заўважыў, што адзінае вакенца мела суцэльную шыбу.

Злосна сплюнуў. І тут успомніў пра плястычку з бурштынным алеем, што стаяла ў шафцы. Хоць якое начыньне, ды яшчэ цэлы літар! Праўда, гэты літар трэба спачатку некуды тэрмінова ліквідаваць, а куды?.. Зазьвінела ўвушшу: часу на вырашэньне падобных праблемаў болей не заставалася.

Амаль упрысядку неяк дабег да шафкі, выхапіў адтуль поліэтэрную літроўку, скруціў белы корак і, ужо дробна падскокваючы на адным месцы, разьліў усё сонечна-глейкае зьмесьціва ў некалькі гліняных кубкаў. А потым урэшце давяршыў да канца задуманае і раптоўна адчуў невыказнае шчасьцейка... Праходзіць час, і любы жывы арганізм, гэтая расчыненая наросхрыст сыстэма, няўмольна патрабуе свайго. Паветра, пітва, харчаваньня, выраду прэч адпрацаваных прадуктаў. Таму, у давяршэньне да прымусова-добраахвотнага затачэнства, Грынь вырашыў яшчэ й галадаваць.

Дастаў тэлевізарык, пакруціў туд-сюд ручкі настройкі і тупа ўтаропіўся ў экран, на якім штурмбанфюрэр Шцірліц у каторы раз складваў вожыка з доўгіх запалак, седзячы без мундуру ў змрочнай гестапаўскай камэры.

* * *

Так прайшоў другі дзень. За ім на лесьнічоўку апусьцілася ноч, у якую нічога не сьнілася.

А нараніцу, яшчэ толкам не засьцяліў раскладанку, хтосьці ціха пашкробся ў дзьверы.

Грыня ціха адкінуў коўдру. Хацеў асьцярожненька вызірнуць у вакно. І ўжо зрушыўся зь месца, аднак спыніўся. А што, калі там міліцэйскі начальнік Збарамірскі са страшным сваім пісталетам?!

Крадком ступаючы, каб не зарыпелі масьціны, на дыбачках падыйшоў да дзьвярэй. Замёр у спадзеве, што ніякіх грукаў болей ня будзе. Што той, каго так раптоўна выперла на лесьнічоўку, пайшоў, пачакаўшы, далей. Што, урэшце, гэты пракляты грук можа проста яму прымроіўся...

Ага, хвігу вам!

Грук-грук-грук!

Ах ты, чорт, ды правальвай, урэшце рэшт! Ня бачыш — няма тут нікога дома!

Грук-грук-грук!

Ну, няясна, ці што?!.

Грук-грук-грук!

От, бляха, ну каму што за дзела, што я тут сяджу?!

Грук-грук-грук!

— Хто?.. — хрыпла выдыхнуў ён.

— Я, — раптам пачулася пераліўная мілагучнасьць. — Мяне Зьміцер паслаў. Я сястра яго. Вам пад'есьці прынесла.

„Якая сястра? Якое пад'есьці?! Тут прыпасаў — зажрацца можна!"

— Ня ведаю я ніякага Карнійца! — панікаваў Грынь. — У Зьмітра й сястры няма!..

— А я яму ня родная.

Зрабілася горача. Раптоўна засмыліла ў грудзёх. Зноў, хоць ты плач, хацелася ў прыбіральню.

— Ключ у мяне. Мне Зьміцер даў. Толькі сказаў, каб не адчыняла, пакуль ня будзе ад вас на тое дазволу.

— Ведаеце, таго... — ня мог даць сабе рады Грынь. — Пакіньце ўсё на парозе. Ды йдзіце. Ідзіце...

— Вой, я б пакінула. А як хто ўбачыць?.. Навошта вам увага залішняя?..

— Дык забірайце! І скажыце Зьмітру, каб болей нічога не перадаваў. Галадаю я!..

— Галадаць ня трэба...

Ого, застагнала! Ці яму з усёй гэтай ростыргі падалося?

— Што з вамі?

— Нага... Падвярнула...

„А, чорт! Ды каб табе іх ушчэнт павыкручвала!"

Але не. Жанчына ўсё ж. Маленькая, відаць, худзенькая... Ножкі прыгожанькія стаміліся. А тут лес кругом. Каленачкі точаныя... Хоць

ня лес — пералесак, ды мала што. Яшчэ які зьвер насустрач — бяда, аднак!.. Можа, і тварам — нічога...

„Калі й пушчу — толькі на тры хвіліны. Па гадзіньніку засяку. Нават глядзець, дзе стаіць, ня буду. Дый самому — на двор... трэба! вой, трэба!..”

І Грыня з’адчаіўся:

— Ну, добра! Адчыняйце. Але толькі з умоваю! — пасьпеў галёкнуць ён яшчэ, як ключ скрыгатнуў у замку. — Вы заходзіце, пакідаеце ўсё на стале й адпачываеце роўна тры хвіліны, а я ў гэты час пакуль звонку пабуду!...

— Маглі б і долей дазволіць, — закрыўдзіўся галасок. — Усё ж лесам ісьці. Ня надта далікатны вы, бачу...

— Добра, пяць. Нават дзесяць!

Дакладна ў тое імгненьне, калі дзьверы марудна расчыніліся і разам зь яркім слупам сьвятла наважылася ўвайсьці гэтая стомленая й адначасна як бы пакрыўджаная незнаёміца, ён, нават не паздароўкаўшыся, куляй выскачыў вонкі й шыбануў пад самую густую елачку, як мага далей ад парога.

„Божа, толькі б яна ўжо пайшла!..” — думаў Скрыпень, вяртаючыся.

Незнаёмка, аднак, сядзела на раскладанцы, адкінуўшы рукі назад, і весела пасьміхалася. У руцэ яна трымала адзін з тых самых кубкаў, у якія ён выліваў алей, і на ўсю лесьнічоўку расьцякаліся пахі... шампаністага віна найшыкоўнейшага гатунку. Ён ня здолеў стрываць, падняў свае няшчасныя вочы...

— Божа ты мой! — і адразу забыў, што толькі дзесяць хвілінаў дазволіў пабыць і што нават зьбіраўся па гадзіньніку адлічваць тыя хвіліны. — Ох, ішлі б вы адсюль...

— А калі не?.. — выпрастаўшы руку, спапяляла яго паглядам. — Хіба ты не чакаў? — і ўжо зрывала, халодзячы сваімі танклявымі пальцамі грудзь, кашулю зь яго незнаёмка.

І перакулілася сторч раскладанка, памкнула некуды ў Космас столь, запішчэў сам па сабе партатыўны радыёперадатчык.

Ён адразу пачаў назаляць, зьвязваць скрушаную сьвядомасьць зь нечым зямным, няўмольным і простым. Гэтае простае мела, на дзіва, старэча-хрыпучы голас, які вельмі нагадваў голас бабы Дрыпы і які нешта спрабаваў падказаць-давесьці ўзятаму ў гэтакі скрушны абарот Грыню... А кабета, шалеючы, ужо дабіралася прагным ротам да мужчынскіх ягоных патаемнасьцяў, і зусім караценечкае імгненьне аддзяляла ад канчальна абрынутага бяспамяцтва.

— Божа мой? Божа ты мілы мой!.. — мармытнуў у бясьсільлі Грынь і тройчы пераражагнаўся. І раптам вярнулася на месца столь, нікуды болей не кулялася раскладанка, узарвалася й замаўчала рацыя. А з кабетаю зрабілася страшнае.

— А-а! Што ты зрабіў, дурны ёлупень?! — енкам нечалавечым заверашчала яна. І ўжо страшнаю коткаю засыкала, кінулася на яго, пагрозна расстаўляючы лапы. Атрутным болем апякло шчаку Грыні.

А істота ўсьміхнулася жахлівай усьмешкаю Крысты ды вымкнула прэч, пакінуўшы назаўсёды на ягоным распаласаваным твары доўгі крывавісты сьлед.

* * *

Ён ня ведаў, колькі праляжаў непрытомны. Гадзіну? Дзьве? Мо, суткі?.. Варухнуўся, глянуў на ручны гадзіньнік. Той стаяў. Які сёньня дзень? Серада? Пятніца?.. І тая жанчына, зь якою... Так, спакойна. Чорны крумкач яшчэ не ляціць. Грудзь цэлая. Сэрца на месцы. Значыць...Чарговы сон? Асьцярожна дакрануўся рукою да шчакі. Крывавістая засохласьць, што сьцягнула скуру, сьведчыла аб адваротным...

Раптоўна запішчэў радыёперадатчык.

Радыёперадатчык?.. Ён жа, здаецца, узарваўся. Ну, так! Дакладна памятаў і той глухі выбух, і той атрутны белаваты дым, які паваліў потым. Ніякая штучка пасьля такога ўзрушаньня працаваць ужо ня зможа ніяк.

Перадатчык, аднак, пішчэў. Настойліва й тонка.

— Прыём, прыём!

— Я — Хахатуха, прыём!

— Я — Яздраб, прыём!

— Грыня! Як ты там?

Гэта сапраўды быў Карніец. І гэты чалавек яму дазарэзу быў патрэбны.

—Я-та нармальна, прыём!

— Чую цябе добра, Яздраб, прыём!

— А калі чуеш, дык адкажы: што за лярвоту ты сюды да мяне пасылаў? Я ж прасіў!..

— Што?.. Якую лярвоту? Пра што ты?!.

— А то ня ведаеш! Ключа даў, харчамі наладаваў да макаўкі!.. Тут гэтых прыпасаў — як на палярнай станцыі!.. Не было ж такое дамовы!

—Ты што?! Зьдзічэў у адзіноце ці што?

— Ці што!.. Яна сказала, сястра твая!

— Якая сястра?!

— Няродная. Хахатуха, прыём, прыём!

— Ну ты, Грынька, дакладна ўжо там паехаў. Яздраб, прыём!

— Адкуль тады ключ у яе?

— Ды той ключ, якім цябе зачыніў, і цяпер у мяне. Во, у руках трымаю! І нікому яго не даваў!

— Значыць, другі ёсьць.

— Другі толькі ў дзядзькі. А ён на курсах лясьніцкіх. У Менску!.. Яшчэ тыдні з два будзе!

— Бляха, насланьнё нейкае... — мармытнуў Грынь. Усё ж ня надта верыў свайму трохі мітрэнговаму сябручку. — Ладна! — нечакана прыняў рашэньне. — Бяры гэты самы ключ і дуй да мяне.

— Навошта?..

— Мне аддасі. Так спакайней будзе.

— А... А хто ж цябе тады на замок зачыніць?

— Ня трэба мяне зачыняць! Я й так зачынены буду. А ключа ты мне ў шчылінку пад дзьвярыма прасунеш? Як час надыйдзе — я табе прасуну назад. І каб да самага панядзелка не паказваўся мне тут і блізка? І каб ані не агукаўся на мае пазыўныя. Хоць буду выклікаць цябе да зьнямогі, ясна?

— Ясна.

— Дарэчы, які сёньня дзень?..

— Чацьвер. Ты што — дні ўжо згубіў?.. Прыём!

— Тут згубіш!.. Усё, Хахатуха, адбой!

— Адбой, Яздраб, адбой! Ладна, чакай. Хутка буду.

Грынька ўздыхнуў з палёгкаю, як толькі заціснуў ключа ў крыху вільготнай ад незразумелага хваляваньня далоні. Усё! Разьвярнуўся тварам на пакой і...

Пасярод стала, пяшчотна вуркочучы, сядзела белая, як першы некрануты сьнег, галубка. Хацеў закрычаць, але толькі заплюшчыў вочы. А калі зноў расплюшчыў, дык закрычаць захацелася яшчэ болей: таму што вуркатала галубка, ужо седзячы на плячы чарговае незнаёміцы.

— Я — гэта я. Ты ня бойся, — яна ўзьняла на яго свае вочы. Вы калі-небудзь бачылі вока голуба, павялічанае ў сто разоў? Калі не, дык мушу сказаць дакладна, што яшчэ мала чаго вы бачылі ў сваім надзвычай цудоўным жыцьці. А Грынька пабачыў. І ледзь не забыўся на ўсё астатняе, што ён хацеў сказаць і спытацца ў той... *„Якая скрозь сьцены, ей-Богу, прайшла ці што?!.”*

— Можаш зваць мяне Ганнаю, — ейны голас сярод тысячы быў самым адметным, самым дзіўна-звонкім, пералівістым і незвычайным.

— Я... Як ты сюды патрапіла?

— Што ж сюды патрапляць, калі ўсё адчынена?

Ён марудна, нібы баючыся пабачыць за сьпінаю нейкае дзіва ці, можа, пачвару, павярнуў голаў. Божа мой мілы!.. Дзьверы стаялі расчыненыя наросхрыст, і вецер валацужным сабакам няпрошна-нахабна шчаміўся ў лесьнічоўку.

Толькі, як трымаецца з апошніх сілаў хіжы шчупак перад тым, як кінуцца на злом галавы на бліскучую ды сьмертазабойчую трайчатку, так трымаўся, каб не зрабіць чарговае глупства, Грыня. Нічога лепшага ён не прыдумаў, як раптам ухапіцца за праверaны і, як манілася яму, досыць дзейсны сродак. Ён склаў у трусачку пальцы правай рукі, тройчы перажагнаўся.

І...

І нічога не адбылося.

— Ну што ты, Грынечка, што ты?.. — толькі сьветла-гаркава ўсьміхнулася ледзь улоўнаю ўсьмешкай.

— Што табе трэба? — павільготнела ўрэшце ў роце.

— Я — анёліца твая й ахоўніца. І пакуль белая галубка з табою — анічога ня бойся, Грынька. Таму што нічога з табою тады ня здарыцца.

— Адкуль мне ведаць пра гэта?..

— А ты паглядзі, у самога сябе спытайся. Ты пайшоў на пакуты, вырашаючы нічога ня есьці? А сокі елі жывот твой. А зараз прыслухайся: у тваім жываце цёпла, і бясконцая сытнасьць у целе?..

Зьдзіўлены, адчуў, што зь ім робіцца ўсё гэтак, як прамаўляе Ганна.

— Ты зьнемагаў, ня ведаючы, як стрымаць сваё маленькае чалавечае ды слабое? Дык адчуй: тваё цела лёгкае, без пакутаў?..

І зноў дзіўнае пачуцьцё апанавала яго. Болей ня трэба было... шукаць... ціснуцца... разьліваць па куточках алей... Раптам адчуў, што так пражыве тыдзень, месяц і болей... Ён некуды ўзьлятаў, расьцякаўся ў прасторы, і цела ягонае пачынала жыць зусім па іншых, зусім не зямных законах.

Ды пульсаваў яшчэ супраціў, упарта не паддаваўся гэтай прастрэльнай няіснасьці. Рука зноў міжволі памкнулася да зьбялелага твару.

— Ня трэба жагнацца, — спыніла яго нават ня дотыкам, а толькі паглядам. — Я сама кладу на людзей знаменьні. — Галубка раптам лёгка ўзьнялася з пляча жанчыны, пераляцела й апусьцілася яму на плячук. — Ты адзначаны, Грыня. — Здавалася, іхныя вусны разьдзяляла адлегласьць памерам меней за самую тонкую рыбарскую лёску.

І зноў прападаў, зноў плыў у чароўную ноч; сьвяціліся бакенамі ў той ночы ўсе самыя лепшыя жанчыны, якіх калі-небудзь уведаў, і ня самыя лепшыя — таксама сьвяціліся; а сам тра-

ціў магчымасьць сказаць хоць бы слова, і сьпявалі анёлы недзе ў вышынях, прамаўляючы радасна-сьветла ягонае, Грынева, імя; не, гэта былі не анёлы — анёліцы ўзносілі яго ўсё вышэй, а паперадзе іх стромкі паказвала шлях *яна — ягоная Ганна*.

— Не! — раптам выкрыкнуў і сам зьдзівіўся, што яшчэ знаходзіць сілы для нейкага супраціву. — Не! Пакінь мяне, прападзі! Не хачу я ніякіх анёлаў, ніякіх галубак, я проста хачу моўчкі даседзець адзін у гэтым лесе!..

— Ты хочаш даседзець? Ты хочаш адмовіцца ад Боскага знаку?!. — І ляцеў у чарнотна-правальны калодзеж Грыня. І не было болей ні літасьці, ні ратаваньня.

Не было... да таго раптоўнага мігу, калі з правалу чорнага неба мэтэарытам не абрынуўся ўніз шуляк, не прабіў у лесьнічоўцы столь і крыжаватаю дзюбаю не працяў навылёт галубку. Россыпам пырснула белае пер'е. Склаў крылы й шуляк, бразнуўся побач з галубкаю, выпускаючы на волю птушыную душу са свайго моцнага й вольнага цела... Адно ягонае вока нерухома ўтаропілася ў Грыньку. Вока апаноўвала павольная мутнасьць, і раптам падалося, што на яго зь ціхім дакорам глядзіць натомленае бязладным жыцьцём усёведнае й правальнае вока пракаветнае бабы Дрыпы.

Высокую, стромкую постаць Ганны скруціла клюкой-сукаваткаю, рукі павяло назад, а ніжняя сківіца цяжкаю цэглаю падалася наперад. З рота вымкнулі крывыя зубы, а доўгія валасы, што яшчэ хвілю таму пеніліся некранутым чыстым сьнегам, вокамгненна зрабіліся пасмамі бруднай мокрай саломы. Босыя ступні парэпаліся, трэснулі, ужо белая косьць тырчэла на адной назе вонкі. Крыкі, стогны й шалёнае скавытаньне не спыняліся ні на хвіліну.

Раптам пачвара, гідотна гікнуўшы, кінулася на Грыню й упілася яму ў бок сваімі крывымі, поўнымі атрутнага гною зубамі. І адразу адскочыла прэч, сплёўваючы ў траву яшчэ гарачы кавалак скуры.

Задохся, сьмяртэльна зьбялеў у зьнямозе хлопец.

Адна з чорных віхураў, што напаўзалі, што ўжо слаліся пад нагамі, схапіла, абкруціла вужакаю пачварную гнюснасьць, адарвала ад зямлі і, узьняўшы над полем, памчала, панесла прэч, невядома куды, назаўсёды.

І зноў стаяў Грынь пасярод маленькае, зачыненае звонку, лесьнічоўкі. Стаяў адзін; ніякіх сьлядоў, ніякіх табе мёртвых птушак не было на падлозе. Толькі гнойны смурод працінаў усё навокал. Толькі рабрысты, коўзкі ад поту ключ быў да болю заціснуты ў далоні. Толькі страшная, немагчыма-як-глянуць рана крывавіла на бачыне.

І гэткае ж, як і рана, разадрана-крывавае сонца правальвалася за пагорак у начную раптоўную бездань.

* * *

Ён ляжаў, ускалмачаны, на краёчку ўзбуранае раскладанкі й чакаў самага горшага.

Раскладанка цяпер была зрушаная зь месца, прысунутая да дзьвярэй. Але спачатку Грынь, як мог, прыцягнуў да парога ўсе табурэткі, шафкі, склаў барыкаду, для вернасьці падклаў па нізах палянякамі, шчыльна завесіў шыбу анучамі і ў бясьсільлі занурыўся ў пакамечаныя прасьціны.

Ноч брудным мядзьведжым чэравам навалілася на лесьнічоўку. Цішу раз-пораз успорвалі нейкія жахлівыя гукі; здавалася, хтосьці ціха, стараючыся ня трэскаць суччам, падкрадваецца да вакна, спрабуе зазірнуць і, ня могучы, толькі пагрозна сапе або дзярэ па сьцяне кіпцюрамі...

І невыносна шчымела, ненажэрным чарвідлам вярэдзіла рана.

Тры навюткія, яшчэ запакаваныя пачкі патронаў для стрэльбы ды гэткі ж новы пакунак прэзэрватываў „Made in France" з клубнічным араматызатарам ляжалі ў паходнай аптэчцы, якую ён выцягнуў недзе зь нізу барыкаднае грувашчэчы. „Ня можа быць! — утаропіўся ў гэты пакунак. — Ня можа быць, каб у Зьмітракова дзядзькі, гэнага слыннага палясоўшчыка, — і ляжалі ў аптэчцы толькі адныя прэзэрватывы!.." А дзе ж ёд, бінт, абязбольвальныя пігулкі?!.

(Толькі адкуль было яму ведаць, што зусім не на сэмінар, не на лесьніковы сымпозіюм у Менск зьехаў слынны сваяк Карнійца, а літаральна за тры дні да таго праклятага панядзелка, у які застаўбурыўся сюды Грыня, дзядзька Зьмітра, нешта здурэўшы на шостым дзясятку сваіх гадоў, прывёў у лесьнічоўку сваіх дваіх сябрукоў, яны прыхапілі столькі ж скрыняў гарэлкі, да гарэлкі абавязковым дадаткам мусілі быць чамусьці аж цэлыя чатыры шалавы, якія, ясная рэч, на зьлёце запальна-шалёнае ночы не падзялілі мужчынаў, мужчыны пакрыўдзіліся адзін на аднаго і ў п'янотным шаленстве пахапаліся за свае паляўнічыя стрэльбы, вынікам чаго й стала прастрэленая рука дзядзькі, а таксама спустошаная аптэчка й тэрміновая шпіталізацыя параненага.)

„Гангрэна! Будзе гангрэна!.. — нежартоўна адчаяваў хлопец. — Калі ўжо пайшло... Калі яна засьлюніла сюды атруту...”

Раптам у баку закруціла так, што ўзарвалася сэрца. Не знаходзячы сабе месца ад болю, хлопец толькі й здолеў, што падняцца ды зноў прымасьціцца асьцярожна азадкам на раскладанку, утаропіць нерухомы пагляд у шэры, пусты экран „Рэкорда-5”, які месьціўся пасярод барыкады.

Ён глядзеў на экран, і толькі адну ліхаманіла думку: дзе ж і як знайсьці паратунку? Можа, зьвязацца з Карнійцам па рацыі, каб той выклікаў хуткую дапамогу?.. Ці няхай прыйдзе сам і прынясе што трэба?.. Ага, прыйдзе. Я ж сам загадаў, каб не адказваў на мае пазыўныя. А ён малаток — ані не азавецца. Трэба хуткую будзе самому... выклікаць... у цёмны лес... на маю барыкаду... дзе сплываю, паранены, чорнай крывёю... І жанчыны... ды пайшлі вы!.. туды, дзе пакручастыя сьцежкі-дарожкі... і лятучая лесьнічоўка з францускім прэзэрватывам... дзе ходзяць мядзьведзі ў цырульню, каб пукнуць паляўнічаму ў дубальтоўку... О, агеньчык! Агеньчычак!.. Неабдымнае полымя вядзьмарскага вогнішча?.. І пасярод — Крыста...

Раптам успыхнуў тэлеэкран, разьліваючы навокал блакітнасьць. З блакітнасьці выплыла абаяльнае аблічча вірлавокай вядучай і вуркотным голасам перадало, што зараз па настойлівай просьбе Грыгорыя Скрыпеня яму будзе аказана неадкладная мэдычная дапамога. І не пасьпеў нават паварухнуцца, як тая вядучая закруцілася на месцы віхураю, каляровым шмацьцём па бакох паляцела адзеньне, да яе, ужо аголенай, з шыкам-дымам падкаціў Грынеў ровар, ад яго засталося раптоўна адно мэрсэдэснае кола, якое плавілася, якое гарэла; толькі асядлала яна яго, пакаціла проста на Грыню; і луналі доўгімі зьмяістымі языкамі ў паветры косы, бразгалі на прыцэўках мэталёвыя бранзалеткі, і тырчма набрынялыя грудзі цэлілі ў тую кропку, дзе ўжо насьпявала няўмольнасьць іхнай сустрэчы. Вось усьміхнулася яна расшкамутаным ротам і, прабіўшы колам экран, упэўнена ўехала ў цішу начной лесьнічоўкі.

— Што, галубок? Клікаў мяне? Чакаў? Лічыў да сустрэчы хвіліны?..

Грынь, задохлы амаль ушчэнт ад уеднай смуроднасьці паленай гумы, спрабаваў раскрыць рот і... ня мог.

— Клікаў, аднак, прызнайся! — падкаціла бліжэй маладая вядзьмарка. — Што, кацянятка, баліць? Смыліць-вярэдзіць рана?.. Ну, то я, мой харошы, зараз!..

І ўжо хацела саскочыць з кола, каб, пэўне ж, заняцца вядзьмарскім сваім лекаваньнем, як раптам знайшоў усё ж Грыня сілы:

— Не падыходзь! — крыкнуў, адпаўзаючы задам па раскладанцы.

— Чаму? — рагатала, на яго наяжджаючы.

— Таму! — адпоўз, зноў закрыўся рукамі. — Ідзі!.. Едзь адсюль!

— А як не паеду? — круг на коле вакол, і яшчэ адзін круг, і яшчэ, і яшчэ!!.

— Ну навошта?.. — от і ўсё, што мог адказаць на гэткае мільгаценьне.

— Рану?.. Рану залекаваць, дурань?

І зноў новы круг, агменісты самазапал разрыўнага рогату, і — спачуваньне? — ну, так, як на дзіва, у рогаце гэтым яму чуўся цэлы акіян невымернага спачуваньня.

— Ня трэба! Ня трэба мне ніякага лекаваньня! — і сам не заўважаў, як падпадаў паступова пад чароўны рытм, пад гэтае няспынна-вядзьмарыстае кружляньне, пад гэтае вар’яцкае мільгаценьне.

— Гэта сьмерць! Проста сьмерць, ясна?..

— Ясна! Няхай!..

— Ты хочаш?

— Э-э!..

— Няўжо? Хіба хочаш?..

— О, Крыста!..

— Што? Што, мой коцік?

— Я ніякі ня коцік! Я ня твой, ня твой!..

Яна саскочыла з кола, прысела насупраць, паклала халодны, тонкі, элеганцкі свой палец яму на лоб:

— Ты проста ня ведаеш, што такое сьмерць, дурань? Яшчэ два тыдні таму ты сьпяваў? Ты круціў свае колы й хацеў быць, хацеў мець! Проста хацеў кожную дзеўку, кабету, бабішчу! А цяпер — што з табою, Грыня? Ці ты паміраеш?..

— Не! — матлянуў галавою. — Хлусьня! Няпраўда!

— Няпраўда?.. Што ты зараз падскочыш і пойдзеш скакаць — вось няпраўда. Няпраўда й тое, што ты мяне не баісься й можаш спакойна глядзець мне ў вочы! Як няпраўда, што ў гэтых вачох ты ня бачыш такога, з-за чаго табе проста хочацца плакаць, не! проста рыдаць, як маленечкаму немаўляці, што ня ведае, дурное, свайго шчасьця!..

— Божа! — выкрыкнуў, спрабуючы спаймаць-ухапіць, здаецца, такі просты й адначасна такі правальны сэнс апошніх словаў Крыстулі. — Божа, пра якое шчасьце гаворыш?

— А, ты ўспомніў пра Бога! — ужо не аголенаю, ужо ў строгіх манаскіх строях стаяла Крыста. У цэнтры аўтакола, прыстаўленага да сьцяны, сьвяціўся твар Багародзіцы, на руках якой мілотна скруціўся маленькі чалавечы шкілецік. — А дзе быў гэты Бог, калі тая сьцярвотка шкамутала па-зьверску твой бок?

— Хіба ня ты?.. Учора, раней... Тут, усё — гэта?..

— Дурненькі мой Грынь... — пяшчотна. — Калі я — то навошта?..

— Каб сэрца... — нечакана зьляцела зь ягоных вуснаў.

— І што мне рабіць з тваім сэрцам?

— Я... Я ня знаю! Дый што, я ня бачу?! Ці ў мяне павылазіла?.. У мяне ж так ніколі!.. ні з кім! Можа, таму я сюды й зашыўся!

Ужо не манашка, ужо мэдычная сястра ў спакусна-кароткім, атрутна-зялёным халаціку, і, здаецца, раздвоены язычок аблізвае блішчаста-памадныя губкі.

— А я не хачу! Не хачу!!! — размазваў соплі, глыкаў сьлёзы й цер бруд па шчаках Скрыпень.

— Чаго ты ня хочаш, коцік?

Ужо скальпэль у ейных руках, ужо нехта нябачны цярэбіць бруднымі пальцамі рану, прыстаўляе гарачую тупую нажоўку й пілуе, пілуе і пілуе, і сыпле на рану соль, і застаецца там бруднае пілаваньне, і мёртвыя тканкі жаруць цела ўсё вышэй і вышэй...

— Не хачу, не!.. — паўтараў увесь мокры, увесь у румзах бедны коцік, чый страшны, падраны бок не пакідаў ані надзеі на выратаваньне.

Толькі Грыньку хацелася жыць.

Жыць, пажыць! Яшчэ хоць трошкі... Пагрэцца, парадавацца... Пасьмяяцца?.. Хіба можа быць нешта лепшае за просты сьмех супраць сонца? За птушыныя гулі-гулі ў перавернутай нябёснай калюзе? За малочную крынку, поўную сіняга, перадкаляднага, нібы несапраўднага сьнегу?.. За крок басанож па калючай траве зь немаўляткам на вашых руках, нават калі немаўлятачка тое чужое?.. Нават калі вы й ня ведаеце, і знаць ня знаеце, што там наперадзе: крутая амэрыканская горка вадаспадна-абрыннага шчасьця ці іклы вядзьмаркі, што хутка ўзарвуцца, хутка запалымнеюць уласнаю вашай крывёю?..

І — і Грынька хітнуў галавою.

І прыйшло наканаванае.

Прыйшло з задаволеным сьмехам Крыстулі, зь ейным прастрэльным, прапальным паглядам, з празрыста-зялёным халатком, які, сьлізгануўшы па целе, адляцеў, лёгкі, бязважкі, некуды далёка, прэч, у неспазнаную ім краіну...

Можа, мроілася толькі гэтакае гарачкаваму хлапцу, а можа, ва ўсім вінаваты быў тэлевізар, які раптам пачаў трансьляваць замежныя порнаканалы. І ў кожным быў Грыня галоўным героем, а галоўнаю гераіняю было такое гідоцтва, такое брыдняцтва, такая плюздрачная, аблезлая, пашароханая істота, што нават самы апошні здырбач вельмі падумаў бы перад тым, як на яе ўскочыць...

Ці так было, ці ня гэтак — хто вам, урэшце, цяпер скажа? Дакладна вядома адно: зарасла, зацягнулася, зрабілася раўнютка-гладкаю страшная рана, і нават маленькае драпіны не засталося на тым месцы. І адразу прыйшла палёгка.

Толькі ня слухалася яго цела. Зноў разьбівалася, разьляталася ўшчэнт на часткі. І ўжо ня з рогатам, а ўжо з зачаўленым екатаньнем падхоплівала й жанглявала імі залатакосая шэльма; а Грыня бачыў проста перад сабою, на чорна-вугольным стале, свае поўныя шчасьлівае беспрытульнасьці вочы, кожнае паасобку, і ў кожнае было бязжальна ўчаўлена па ярай васковай сьвечцы: зьбягалі кроплі воску яму ў шырокія зрэнкі, выпальваючы іх навечна; як навечна, глыбей, без шкадобы й без вынятку заглыбляўся ягоны мужчынскі пачатак у манкое, вільготнае, срабрыста-расістае, зьлёгку ўздыбленае, старажытна-пячорнае ўлоньне.

І спазнаў ён яе.

Спазнаў ушчэнт, ад пачатку й да канца, да такога кашмарнага, вярэдзістага адчаю, што калі б той чорны крумкач прыляцеў выдзерці яму сэрца, ён бы сам цалаваў яго ў чорную дзюбу, сам бы грудзь разьдзіраў перад ім са шчасьлівым, радасным сьмехам...

А калі прыйшло наталеньне, раптам выбухнула дробнымі пырскамі шыба, і рэальны, вялізны й тлусты крумкач, а дакладней, як вам вядома, крумкачыха камянюкаю цэлка захрасла паміж скабаў Грыні. Ён пасьпеў яшчэ ўбачыць самы шчасьлівы, самы вар'ятна-ўдзячны мудры пагляд, і ці не найпрыгажэйшы твар, які раптам ператварыўся ў такое, ад чаго разрываюцца вочы, і болей ня бачыў нічога...

* * *

Зьмітра Карнійца нібы падкінула й трэснула палянякаю ў лоб. Запішчэў, бы дурны, радыёперадатчык.

— Алё, алё! Яздраб? Прыём!.. Я — Хахатуха, прыём!

Ніхто не адгукаўся на пазыўныя.

— Хто выходзіць на сувязь? У мяне — дрэнная чутнасьць!

У этэры толькі трашчала, пікала, дрымбаньдзела.

Зьмітра абхапіла дрэннае прадчуваньне. Пішчэў, агідна пішчэў, не перастаючы, перадатчык. Хацелася бэцнуць па ім, каб замоўкнуў ужо назаўсёды. Так, урэшце, Зьміцер і зрабіў. А потым, паслаўшы ўсіх у Бога й душу маць, апрануў, што трапіла, ды падскокам пашыбаваў у падлесак.

І тое, што ён там убачыў...

Што кінулася яму праз разьбітую шыбу...

Такое было ў зьвярына-жаночым абліччы, што мамкі мае вы мілыя!.. І ня вытрываў Зьміцер, калі ўгледзеў тую пачвару, што стаяла пасярод лесьнічоўкі й трымала ў руках сьвежавыдзертае з грудзі, яшчэ дымнае сэрца Грыні, коратка ўскрыкнуў і бохнуўся назаўжды мертвым пад зялёны палогі пагорак.

І рагатала пачвара. Рагатала, але ня весела і зусім не шчасьліва — так рагоча, ня ведаючы, што трэба плакаць, маленечкае дзіцянятка, якое раптоўна заблукала ў густым пералеску.

Кароткі эпілёг

Што сталася потым? Ды звычайнае: Крыста зьехала, як і хацела, у Амэрыку. Добра ўладкавалася: перш-наперш, вярнула сабе прыгажосьць, ужыўшы для гэтага такую магію, такія сродкі, якія ніколі ня сьніла-ня ведала нават ейная ўсёведная пракаветная бабця Дрыпа. А потым адкрыла прыват-кантору „Месяцовы экстаз" ды з дапамогаю прычароўнага зельля, настоенага на Грыневым сэрцы, косіць шалёныя бабкі, круціць-дурыць галовы тым западзістым на ўсё магічна-бздурнае амэрыканцам.

Праўда, нейкі патомны беларус-эмігрант, прыехаўшы неяк у Крачынск, распавядаў зусім іншае. Ён расказваў пра агідна-брыдотную дэяўчыну, якая з год таму зьявілася ў іхным асяродку, спачатку хацела распачаць нейкую вядзьмарскую справу, толькі ў яе нічога з таго не пайшло. Усе грошы, што былі, яна хутка праела, на ўлік яе эміграцкія службы, як дазналіся, што ведзьма, паставіць адмовіліся, і цяпер яна поўзае па ўсіх сьметніцах у пошуках скажурак-аб'едкаў ды аддаецца п'яным матросам за адзіную шкляначку віскі. І што завуць яе ці то Карутаю, ці то Юршулай...

А яшчэ распавядалі такое. Нібы і прыгажосьць сваю Крыста страціла, і ў Амэрыку насамрэч зьехала. Толькі Грынева сэрца ані ў чым там не дапамагло, і мусіла вярнуцца назад. Вярнуцца, каб прыходзіць у снах да гуляшчых мужыкоў і бязжальна вырываць у іх сэрцы — гэтак помсьціць яна за нешта, а за што — ужо й сама ня ведае...

Чыкануты

Карацей, пісьменьнік Тодар Валяшонак здурэў. Здурэў ня тое што трохі, а як мае быць і канкрэтна. Спачатку гэта нікім не заўважалася: ну, ці мала чаго чалавек нейкі ўнуры ходзіць ды сам сабе нешта пад нос мармыча. Можа, новы вершык уголас прагаворвае або сюжэтныя складанасьці чарговае пакручастае аповесьці вырашае. На тое й натура творчая, каб не такім як усе быць. Дый паглядзіце вакол: хто ў наш час часьцяком чаго-небудзь сабе пад нос не мармыча?.. Але, калі Тодар Валяшонак пачаў ужо канкрэтна пральны парашок з зубною пастай блытаць, казаць, што ўсе словы перастаў адчуваць і што змарнаваў усё сваё ранейшае жыцьцё на нейкае лухтэрнае паскудзтва, а таксама пра нейкія дрыжыкі, якія гарачымі струмянямі па ягонай сьпіне прабягаюць, тут ужо ўсе й зразумелі: Валяшонку гамон.

— А можа, усё ж не гамон? — аніяк не магла зьмірыцца са змрочнаю рэчаіснасьцю жонка Валяшонка Верка, якая сядзела над ляжашчым ужо пятыя суткі мужам і з жахам глядзела ў запалыя ягоныя вочы ды на тое, як нейкія чэрці так-такі проста калоцяць Тодара.

— Гамон, Верка, гамон, — плямкаў асьмяглымі вуснамі той, калі вынырваў з чарноньця сваёй несьвядомасьці ў сьветлую аблачыну добрае памяці, ды ўсё гладзіў і гладзіў, як пракляты, танклява-дрыготкую руку Верачкі. — Пакінь мяне, забудзь, і бяжы, хоць куды бяжы! — Аднак у тую ж хвілю ён моцна сьціскаў і ўжо вываротваў ейную руку да болю. — А, не! Застанься! Як жа так, ды што гэта робіцца?!. Верка, Верачка! А-а-хы-ж!.. — як правіла, заканчваў невыносна-зацятым стогнам Тодар і правальваўся зноў у чарноцьце.

Ня могучы болей глядзець на такія нялюдзкія пакуты, Верачка пачала ўпарта думаць, чым жа ратаваць-лекаваць крыху (а можа, і ўшчэнт, але жонкам заўсёды здаецца, што крыху...) збрындзелага з розуму мужа.

Першае, што прыйшло ёй у голаў, гэта везьці Валяшонка да бабак. Але, паразважаўшы далей і болей, Верка гэткі варыянт адкінула, паколькі тыя бабці, якіх яна ведала, болей дурылі галовы, чым лекавалі, а грошы бралі за гэта — ого! Другім варыянтам паўсталі адмысловыя мэдычныя абазнанцы. Ім Верачка давярала ўсё ж крыху болей. І тут Верачцы пашанцавала. Ейная сяброўка Люда Мальчэўская якраз нядаўна на такога натрапіла ў сваёй пральні, дзе афармляла заказ аднаму з усіх бакоў годнаму мужчынчыку, які зь ня меньшаю годнасьцю падарыў ёй гарачкава-дзікаваты пагляд і адмысловую візытоўку. Дазнаўшыся пра гора-горкае Валяшонкаў, Мальчэўская перадарыла візытоўку Верачцы ды заўважыла:

— Спэцыяліст — вышэйшае клясы! Я спрабавала... — аднак, што менавіта паспрабавала са спэцыялістам вышэйшае клясы Мальчэўская, яна ўдакладняць ня стала. Так што ўкруціць твайму Валяшонку мазгі ўміг, пабачыш!

І вось спэцыяліст вышэйшае клясы псыхіятар Рудольф Майсеевіч Кацарупа, нібы выратавальны джын, паўстаў перад ложкам зьнясіленага на розум Валяшонка ўкручваць таму мазгі. Змрочна-ацэньваюча зірканўўшы на Верку, ён ня надта ветліва выпер яе з пакойчыка, дадаўшы:

— Канфідэнцыйнасьць, шаноўная, канфідэнцыйнасьць! Першая нашая ўмова. А потым, калі што захоча, ён і сам вам раскажа.

— А што?.. — не дала веры сьвяцілу псыхіятрыі Верачка.

— Ёсьць сумненьні? То, мо, до відзэня, пекна пані? — пакрыўдзіўся на гэткае бязьвер'е круглаваты Кацарупа, відаць, ад крыўды зьехаўшы на пальшчызну. Ён зноў зірканўў на Верку, і было ў гэтым паглядзе нешта непамыснае...

— А не, няхай. Працуйце. Толькі ж... — ускінула свае ўмольна-зялёныя вочы на Кацарупу Верачка.

— А гэта ўжо даверце мне як спэцыялісту, шаноўная. Ваш выпадак у параўнаньні... — не знайшоўшы, з чым параўнаць прыкры выпадак Валяшонкаў, Рудольф Майсеевіч раптам сплюнуў з прыцмокам: — Цьфу, лухта!

Верачка выйшла, дзьверы прычыніліся. За імі запанавалі ціша ды разьмернае мармытанне Рудольфа Майсеевіча. Іншым разам, праўда, гэтае мармытаньне разрывалася проста жахліва-душаразьдзіральнымі воклічамі Тодара, і тады Верачцы так і карцела ўварвацца ў пакой і выперці гэтага зіркастага Кацарупу зь іхняе хаты прэч... Але карценьне гэтае яна ўсё ж змагла перамагчы-перасіліць, і, забіўшыся напружанаю коткай у фатэль, яна пачала чакаць вынікаў Кацарупавых намаганьняў па вяртаньні інтэлектуальна-разумовае дзейнасьці свайго бядашчага мужа-пісьменьніка ў нармалёвае рэчышча.

І вось нарэшце... Дзьверы спаленкі з бразгатам расчыніліся, і адтуль проста ўвесь задаволены выкаціўся Рудольф Майсеевіч. Вочы яго гарэлі, вусы тапырыліся:

— Псыха-эмацыйная траўма, псыха-эмацыйная траўма нечуванае сілы, вось што магу сказаць! Але ўсё нармалёва, заўтра ваш Тодар падымецца і будзе пісаць-стракатаць, як аўтамат Калашнікава. Ну, а наконт ганарарчыку... Праз Мальчэўскую, усё праз Мальчэўскую, — усьмешліва выскаліў зубы псыхіятрычны абазнанец і нейкім атрутным воблакам (менавіта так падалося Верачцы) проста выпарыўся з панурага жытла Валяшонкаў.

Заўтра, аднак, Тодар не падняўся і блізка. Наадварот, яму зрабілася яшчэ горай. Ён ірваў, камячыў і чавіўся прасьцінамі, ён паласаваў сабе кіпцямі скуру й рачыўся на сьцяну, пакідаючы на ёй глыбока-крывавыя пісягі. А яшчэ ён крычаў, Божачкі, як ён крычаў! Ужо суседзі з-пад нізу запалошна грукалі ў столь, ужо Верачка выплакала ўсе насоўкі, а на парозе тупалі строга-мундурыстыя міліцыянты, але хіба гэта магло спыніць запалошна-зьвярыстыя Валяшонкавы крыкі?..

* * *

Ніхто ня ведае, што рабіла Верачка ў наступныя дні і ночы. Адны кажуць, што бачылі яе тады ў атачэньні страшных, сьпітых старычак, што цягаюцца па вакзалах і выглядаюць абгаджана і сыфілітычна. Другія — што прападала яна днямі ў бібліятэцы, абклаўшыся таўшчэзна-пашэрхлымі таміскамі, поўнымі ўсялякае сакральнае знакавасьці ды пакручастае кабалістычнасьці. Яшчэ нехта — што неяк паехалі мужчыначкі на рыбоўе з начлежкаю, ды абсалютна выпадкова заўважылі Верачку ў лесе, і сядзела яна пад скручанай сухастоінай, якая крывавіла безупынна, і тою крывёю расьцірала яна свае голыя клубы... Карацей, гэтага сапраўды ніхто ня ведае і ня ўведае ўжо ніколі.

Дакладна вядома, што неяк пад раніцу яна ціха ўвайшла ў пакой мужа. І над ім спынілася, і зрэнкі свае над ягоным пераносьсем зьвяла...

Нешта засыкала, штосьці забразгала, нехта мітусьлівы загрукацеў дзюбаю ў шыбіну.

І Тодар — Тодар, які да гэтага акуратна зьбіраў нябачных маленькіх чарвячкоў на прасьціне, раптам прыўстаў на ложку, падняў голаў, выпрастаўся й загаварыў. Загавараў ірвана, абы як, але так, як гаворыць усё ж нармальны, а ня скошаны на чарапок чалавек.

— Гэта ты?.. А я... Гэта даўно ўжо пачалося, даўно... Даўно зразумеў, што ўсё... Конча! Ніякі я не... А так — паперапажыральнік! Сьветакапціцель... Дый калі я працаваў? Калі радок выводзіў? Ай! Лянота! Потым!.. Лепей кніжачку пачытаць, крыжаваначкі, па сяброх... Ну й — дакрыжаваўся! І вось — сяду, асадку ў рукі, а яно — тпру, ні зь месца!.. І зноў — потым, потым! Не бывае потым, гэта ж дурню ясна! Дурню — ня мне... Чарвячкоў — хочаш? — працягнуў пустую далонь Верцы Тодар і на момант сьцішыўся.

Верка адмоўна хітнула галавою, працягваючы неадрыўна глядзець у ягонае пераносьсе. Хтосьці зноў загрукатаў у шыбіну. З-пад ложка пацягнула шыза-атрутным дымам, і ў Тодара запяршыла ў горле.

— А ты... Хоць у банку... Грошы, людзі... А я... Што я табе... Абуза, клопат, — моцна расьціраў шыю ён, ледзь не прабіваючы яе пальцамі. Нават лямпачкі... Суседа клікаў. І ўсё! Куды працаваць? Чаго працаваць?.. То ж узвыю, ясна! Толькі ўяўленьнем дайду — і ўсё, клініла! І заклініла... Выйшаў неяк пад вечар, дождж, хмары чорныя, па твары сячэ, па душы сячэ, і ў ёй — бы ў гразі па горла нейкі мядзьведзь барухаецца, гляджу: рэчка, вада, такая сінюшнасьць, такая бязжальнасьць, а дождж хвошча, хвошча, хвошча, хвошча!.. Ну й... Што пакідаць?.. што губляць?.. Цябе толькі шкада стала, што з дурнем, усё жыцьцё, маладыя свае гады найлепшыя!.. Карацей... А, а! Ну не жары ты іх, не жары! — раптам зароў Тодар, і Верачка міжволі ўздрыгнула. Але цяпер, калі яна ведала нешта такое, чаго й блізка ня ведалі, скажам, усё тыя ж псыхічна-тэрапэўтычныя адмыслоўцы, крыкі гэныя яе ня надта палохалі. Таму, хоць і ў гарачкавасьці, але Тодар працягваў:

— А потым... ужо на беразе... я... і мяне... ва ўсё, што можна! Восем чалавек!.. І адзін таўсмаценькі, кругленькі — той стаяў, усё глядзеў, галоўны іхні, ён ня лез, ён, ён . А-а-а! — зноў закрычаў Тодар і зноў сьцішыўся. — А побач з гэтым таўсматым — нейкая дзяўчына, таксама глядзела, зіркаста ўсьміхалася, відаць, ужо ведала, што потым... мяне зь ёю... прымусяць, хоць і ня схочаш... ды яна сама, усё сама, да самага апошняга разьюшэнства!

Тут ужо Верачка ледзь вытрывала, ледзь не сарвалася на... Ды не сарвалася, утрымалася, бо ёй трэба было ўведаць да самусенькага канца ўсю горкую праўду пра свайго няшчаснага Тодара.

— Гэта ўсё? Га, гэта яшчэ ня ўсё! Я ж падпісаў, я ж прадаў цябе ні за што гэтаму таўсматуну — у падзяку за ўратаваньне!.. Езуіты! Падлы нярэзаныя! Ну, як тут было ня кінуцца зноў, ці лязом, ці галавою — аб камень!.. Ага, га-га-га!.. Ён, гэты круглы, толькі правёў рукою, і — усё!.. Блакіроўка! Я ж спрабаваў, потым, але варта было хоць бы... Так сьціскала, вось тут, у гэтым самым праклятым месцы, якім... Што не хацелася нават і думаць! І я жыў, жыў побач з табою і ведаў, што ты... А яны кантралявалі, тэлефанілі, нагадвалі... А я ўсё адцягваў, абяцаў, выкручваўся, пра розныя хваробы твае выдумляў ды пра іншую ўсялякую трасцу! Толькі нядаўна тая самая зіркастая маладзіца... Яна нарадзіла! О, каго яна нарадзіла! Гэта жахоцьце, жахоцьце, гэта такое выродзтва, якога не бывае ў чалавечай прыродзе! І я падлічыў! Дзевяць месяцаў!.. Дзевяць месяцаў з таго самага дня! А я ж быў таксама з табою!.. Увесь гэты час!.. І прыйшоў гэты таўсмацік! І стаяў, вось тут, днямі, над ложкам, і спакойна гэтак нагадваў усё, што было на тым беразе, і што прыйшоў ён сюды па абяцаную плату! А-а, прыбяры ж іх адсюль, пачаві, колькі можна?! Яны белыя, белыя, тлустыя й пукатыя, як колы ў мясным казане мандаліншчыка!..

Тодар разьмерана й тупа стаў біцца патыліцаю аб сьцяну.

Пад вогкія гахі Верачка раптам адчула, як нешта жывое варухнулася ў ейным жываце, прабіваючы таўсматаю поўсьцю каляплодны пухір ды перакручваючыся з тонка-пульсуючай пупавінаю. Рэзкі боль расколінаю прабег праз кішэчнік, і, бы падкошаная, Верачка з крыкам апусьцілася на калені. Раптам скура на ейным жываце пачала пушыцца, уздувацца; нейкае жахлівае ўздуцьцё, нібы шырокі мэталёвы шар, пракацілася ад похвы да самага страўніка й тузанулася рэзка наперад, бязьлітасна разрываючы тканкі скуры, нібы марлевыя павязкі. Сукенка на жываце набрыняла

крывёю ды гнойнаю склізьзю, і скрозь яе на паверхню прабілася барадаўчата-мокрае шчупальца. Верачку, якая ўжо сама ня чула свайго страшэннага крыку, званітавала.

І ў той самы момант на парозе кватэры зьявіўся ўсьмешлівы кругляшок Рудольф Майсеевіч Кацарупа. Ён раскрыў рот, і зь ягонай пашчы патыхнула невыносным яечным тхлом:

— Я прыйшоў за сваім! — азьвярылася гэтая пашча. Вочы ані званага на гэты раз прыхадня бліснулі й адразу ператварыліся ва ўчаўленае ў твар пэнснэ з брудна-зялёнымі шкельцамі.

Яшчэ часьцей, яшчэ болей загакаў у сьцяну галавой Валяшонак.

Кіпцюрыстая рука Кацарупы пацягнулася да Верчынай шыі. Яна, як магла, седзячы, задам, паспрабавала адпаўзаць ад гэтай страшнай рукі. Але тая выцягвалася, укручвалася ў паветра, ёй насустрач мкнулася шчупальца той гідоты, што нараджалася... Раптам рэзка клацнулі іклы ўжо ваўчынападобнага Рудольфа Майсеевіча, і правальная расколіна ўзарвала падлогу кватэры.

І прапалі яны ў чарноцьці расколіны... Прапалі, каб болей ужо не зьяўляцца ды не трывожыць нічым і ніколі псыхічна разьвярэджаную душу Тодара Валяшонка.

А той раптам спакойна спыніў сваё гаканьне, спакойна падняўся з ложка ды накіраваўся за пісьмовы стол.

„Карацей, пісьменьнік Тодар Валяшонак здурэў...” — роўна вывела ягоная рука першы радок на паперы.

Ён усьміхнуўся нечаму свайму, патаемнаму, і толькі сярніста-вадародзісты пах яшчэ крыху нагадваў, яшчэ крыху вярэдзіў...

Кобрынь, чэрвень 2000

Макс Шчур

Трыстан і Ізольда

Л. М.

Сьцізорык-матыль гадзіньніка
цікуе
цацка ў дзіцячых пальцах
з аднаго на другі па руцэ
перабягае інсэкта
ратуецца
варушыць вусамі ў шклянцы

Тым часам зьнікае сонца
магчыма ўжо назаўсёды

Прыйсьці са спазьненьнем
Сцэна

Засяродзьцеся на заслоне
гатычным паркане
аргане
не
Чырвоным моры
бруіцца мур пісуара
Разыдзіцеся Хвалі

Дырыжор з хварасьцінай што лічыць сэкунды
да старту
ў яме братэрскай магіле аркестру
скончыліся прыколы
вушы
напагатове
чорныя матылі пасядалі на месцы
арбалеты скрыпак
напятая сьмерцю арфа
кантрабасы фаготы клярнэты віялянчэлі
заплечныя стрэльбы варты
аркебузы трамбонаў
тарчы мядзяных талерак
сьляпы дзіцячы бінокаль
бонгаў ці там літаўраў
засада
зважай

За мной
рыцары хрысьціянства
старая гвардыя

дадаізм
дадэкафонія

Мэню Інструкцыя Лібрэта
ўсё напісанае вэрлібрам
празаічная паэзія
вершаваная проза
тэкст спаўзае быццам
абрус са стала
тэкстыль
тэкст
стыль
fucks
туалетны папірус

Трыстан ён жа
Дон Жуан ён жа
Фігаро ён жа
Дзед Піхто ён жа
тоўсты
гаворыць старая спадарыня
апошняя хто бачыў у труне Каруза
тоўсты як гніда
гаворыць яна з асалодай
мружыцца быццам снайпэр

у аптычны прыцэл мікраскопа
які яна трымае нібыта чэлес
Фарынэлі

Вялізарная лямпіна
мэдуза пад стольлю
сьмяротны нумар

Голас лупіць далёка
быццам вада са шлянгу
тлустым струменем
вельмі прыгожа
змывае накрэмзанае на пяску
які сэнс так крычаць
калі зразумець усё роўна нельга

што хацеў гэты Вагнэр

у антракце пасьпець напіцца
будзе другі пэрыяд
Зноў поўны буфэт знаёмых
Дайце мне калі ласка сто грамаў
напою сьмерці
Дзякую
Якая смачная ў іх гарэлка
Якая прыгожая дзяўчынка
Адно што вар'яцкія кошты
рыфма магла б быць „пошты"
адылі верш
ён белы
папера чорная
попел
Не
трэба вяртацца ў залю
нешта мяне пацягнула
на прыгожае
Мабыць
бармэн пераблытаў напоі

лепей ужо Кармэн
чатыры дзеі
але
чатыры гадзіны гэта
Зьдзек
гэта ў звышчалавечых сілах
блёкбастэр
Нічога ж такога
не адбылося
й не адбудзецца
Ведаеце чым скончыцца?
Будзе ўвесь час вось такая
разумная рамантычная
музыка
крытыка практычнага розуму
потым яго заб'юць
Ізольда абдыме цела
пакуль яшчэ цёплае
цела каханага
ў якім пачуцьце яшчэ не астыла
яна яшчэ не разумее
што абдымаецца зь мерцьвяком
потым цяпло неўзабаве
сыдзе
нібыта вада ў пясок
і больш ніколі ня вернецца
Трыстан да сваёй Ізольды

Кастрычніцкай рэвалюцыі

Лета ў рабочым мікрараёне,
невыдумленчым, як танная мэбля,
цуд вокамгненны цясьлярскага гэбля:
заўтра ня будзе — пасьпеем за сёньня

ўсё пераж ыць, перанесьці, перасправаваць, пераняць, перайначыць.
Джала ў пчалы мае тонкую значнасьць
ейнага тонкага *ego. Per aspera*

да прыймача, што заўжды пагражае
здрадай, вайной, пераменай надвор'я:
моўчкі старэюць абліччы суворыя
з выразам клопату аб неўраджаі.

Лівень, адзін на ўсіх душ пасьля працы,
моцны й гарачы, разгвэдзаў брыдоту.
Чым заляпіць зяпу дранаму боту,
што немым крыкам крычыць — галадранцы?

Перад вачыма — пяскі Каракумаў,
фата маргана грабнога каналу
й іншага берагу зьнікне памалу.
З поўдня фальклёрны даносіцца кумаў

голас прапіты — там іхная вёска.
З захаду пустка. Памежнае места.
Ноч ад усходу ўпаўзае з-пад моста
быццам чума альбо кепская зьвестка.

Сонца сыходзіць былым чэмпіёнам
зь лесьвіцы ў неба, блакітнай будовы,
дзе мой мясьціўся кароткачасовы
дом да таго, як я стаўся шпіёнам—

там быў прахону сьмярдзючы калодзеж,
без асьвятленьня, даволі няўтульны
катом гуляць у дарослыя гульні
(быў яшчэ дах, а інакш не было дзе ж),

быў тэлевізар, было піяніна,
тысячы кніжак для ўсіх і нікога,
ўласны пакойчык — нічога такога,
што б замінала жыцьцю сем'яніна,

толькі што неперарыўнасьць прасьцягу:
мост, паварот, цэнтар горада, плошча
Леніна, вежа вакзалу, раскоша
сесьці ў цягнік і паехаць у Прагу.

* * *

О горад, поўны вар'ятаў
дзе ноч не затрымліваецца надоўга
бо ёй як і нам няма дзе
й няма калі, няма месца й часу
таму спаць уначы няма сэнсу
ды ніхто ніколі й ня сьпіць
усе толькі скардзяцца на бяссоньніцу
адзін аднаму на вуліцах
і з гадамі іхныя жыцьці
ператвараюцца ў сон
дзе яны сустракаюць адзін аднога
й скардзяцца на бяссоньніцу
напэўна не падазраючы
што пераказваюць сон

Заўсёды адзін і той самы

Сон папярэдняга дня
сонца якому боязна выйсьці
бо шлях ягоны занадта доўгі
заўсёды перад ім як на далоні
мапа
розум узьняў чалавека над самім сабою
зямля ў руцэ невядомага астранаўта
важыць як пух
нічога ня важыць
хай зямля яму будзе пухам
там дзе далечыня
ператвараецца ў даўніну
ў даніну часу
каторую рана ці позна
заплоціць кожны

Сонца на вастраносым боціку
Папялушкі ў сонечнай джонцы
лыжачкай падносіцца да вуснаў
поўнай сунічнага соку
ўздымаецца з самага прадоньня
зь нечалавечаю воляй
быццам друкар на працу
быццам сьвятар на службу
быццам Хрыстос Васкрэсе

Я павінен гэта вытрымліваць
кожны дзень
гэта бесчалавеча
напісаў калісьці Кортасар

Матляецца пад шатляндзкай
спадніцай звана мужчынскі
Чэлес
туды сюды туды сюды
ў Стакгольме чатыры гадзіны
раніцы

ўгару па дубовай лесьвіцы
ўгару па службовай лесьвіцы
ўгару па шрубовай лесьвіцы
сьпяшаецца
капітан каб убачыць сыгнал
у далёкім вакне
сьляпучы выбух першага стрэлу
сонечнай батарэі
багіні Аўроры
гэта
канец
прабоіна
мы ўсе патонем у бездані
блакітнага неба

начныя атракцыёны
яшчэ ня згасьлі
варочаюцца несапраўдна
радары рэклямаў

будынкі
фарбуюцца крывёй
асьцярожна бы з пульвэрызатара
струменевага прынтэра
толькі з усходняга боку

ажурная проціпаветраная
абарона ракетападобных
вежаў паралізаваная
паведамляе радыё

п'яныя нягледзячы на манаполію
караскаюцца па схілах
нібыта параненыя па палубе
рыгаюць
зямля ўстае на дыбкі
перакуляецца й трапляе
ў вір
у каркавік
сьпіралепадобнай гісторыі
які ўваходзіць у цьвёрды
камень вечнасьці лёгка
нібы Рамэа ў Джульету
Дамоў імкнуся схавацца
на трэцім паверсе
ў пакоі з высокай стольлю
якой я ніколі не дакрануся
на якой дваровы ліхтар
паказваў усю ноч дыяфільмы
з майго маленства
нямыя чорнабелыя нерухомыя
пра закратаванае бэлькамі
балкону крывое вакно
туды пад бабуліну коўдру
залезьці нібы пад скуру
йголка альбо хвароба
глядзець на драўляныя дошкі
з выпаленымі татуіроўкамі
мадоны зь дзіцём на сьценах
абклееных белай паперай
быццам яны там вісяць
шчытамі высока родных
герояў маленства
ў баявым чатырохкутным парадку
ўздоўж сьценаў пакою навокал ложку

Між тым у непрадказальным небе
па-над паняволеным местам
згортваюцца аблокі
нібы ад вагню пэргамэнт
хаваючы нейкую сваю таямніцу
як маці хавае дзіцятка

Адвечная вайна колераў
Пунсовай і Белай ружы
безвынікова скончылася
горад згарэў і вылюднеў
толькі дождж
адзіны хто зжаліўся
па-над ім
пайшоў лякаваць стрэхі
марыць тратуары
зьлізваць марскую соль
з твару Карла Дванаццатага
няшчаснага караля
аднога са слабых розумам
моцных не ад гэтага сьвету
што рушыць вайсковым крокам
зірнуць на месца свайго пахаваньня
адзін

навокал у пустых вуліцах
нікога з каменных ці бронзавых
ягоных братоў па часе
усе брантазаўры вымерлі

ён ідзе
каб запэўніцца ў сваёй сьмерці
ўжо столькі год і ніяк ня дойдзе
зямля ўцякае ў яго з-пад ног
вецер сыпле пяском у вочы
разганяе нябачнае войска
нідзе не пахаваных жаўнераў
што звыкла йдуць за сваім каралём
адылі магіла здаецца
няўхільна паўзе наперад
сьмерць упартая штука
як Зянонава чарапаха
схаваная пад шэрага колеру мармуровым
панцырам
нібыта стаіць на месцы
кшталту як гадзінная стрэлка
й адначасова незаўважна
рухаецца
ўвесь час
рухае час
штоймгненьне
няспынна паўзе

ня робячы паўзаў
таму й атрымліваецца
бы няшчасны кароль Карл Дванаццаты
на чале жалобнай працэсіі крочыць
увасьлед уласнай труне
й непралітая за Швэцыю блакітная кроў
у ягоных бронзавых жылах ад жаху
ператвараецца ў лёд.

* * *

Я заўсёды апынаюся ў Аргентыне
ўвосень неістотна якога году
карабель, які захаваў вясковаму хлопцу
трыццаць гадоў жыцьця,
каторыя той змарнаваў на пошукі скарбаў
з кніжак пра піратаў,
цяжкім сялянскім прасам
прыдушыў згомтаны ветразь мора
капітан расклаў на лапаткі мапу
на стале замест абруса,
потым яе сьцягнуў,
быццам ілюзіяніст:
не прайшло яшчэ й колькі тыдняў,
а мы ўжо ў Буэнас Айрэсе.

Абшары мёртвага мора
соль сузор'яў у глыбокіх разрэзах вачэй
невядомы французскі пілёт у начным паветры
ня ўмее спытаць кірунку
бог гаворыць па-араўканску
яшчэ да зьяўленьня Борхеса:
тотэмны слуп з крылцамі анёлка
(такія ў Эўропе ставілі
падчас чумы ў сярэднявеччы)
замест расьпяцьця
заціснуты ў дзіцячай далоні
вочы старога гаўчо
ўзіраюцца ў бягучы радок на даляглядзе
бягучы час
учытваюцца ў пісьмёны аблокаў
выпушчаных богам зь люлькі
міру з самім сабою
паляўнічы рог цягніка
ірваныя шнары на мапе пампы
пакінутыя ангельскім хірургам
альбо бізуном на скуры
тутэйшага жыхара
у небе міраж акіяну
пэрліна колеру *indigo*
вялікая абстракцыя роўнасьці
паміж людзьмі, травою, коньмі
цяпер: толькі голас Мэрсэдэс Соса
набярэжныя са слановай косьці
попельніцы з надпісам *Mar del Plata*
дзе мая бабуля, што ня ўмее чытаць,
працавала ў гатэлі пакаёўкай
і дзе зьявілася *La biblioteca de Babel*,
трубка для матэ, *Ceci n'est pas une pipe*,
попел гаванскай цыгары Эрнэсто Чэ Гэвары,
зьмяшаны з попелам самога Эрнэсто Чэ Гэвары,
які глядзіць з фотаздымку
кудысьці ў сваю сапраўднасьць,
ужо, на жаль, несапраўдную,
дый годзе.

Хуліё Кортасар зьбірае валізы,
зьбіраючыся ў Парыж:
як мага далей ад Радзімы,
як мага бліжэй да месца
дзе ён насамрэч нарадзіўся.

Напісанае — застаецца.

* * *

Вяртаньне сьнегу, бы разьбітай арміі —
зноў лісьцем дол штампуе чаравік.
Зь нябёсаў валяцца бязьлітасныя карнікі
на карак твой трывалы, сакавік.

За дзьве гадзіны ўсё ў руках агрэсара,
што лезе ў вочы сьлепнем, плюе ў твар.
Усё ізноў падзелена й акрэсьлена,
як некалі. Гнаіцца рэчкі шнар;

наўкол — што палявы шпіталь наладзілі:
уцеплены бавоўнаю шынель
нябёсаў тры спаскудзілі снарадзіны,
запэцкаўшы крывёй блакітнай бель.

Палонкі ад дыханьня хутка гояцца
на шыбах скурай лёду маладой,
атожылкі жыцьця таропка тояцца
ў сваёй калысцы, дзесьці пад вадой

ці пад зямлёй. Але як вызваліцеля
сьнег сустракаюць коткі. Ад людзей

ён іх збаўляе — уначы маліцьвенна
яны скавычуць голасам дзяцей

славу зямлі, што зноўку зьзяе цнотаю,
і значаць літарамі ім належны сьнег
нячутнаю хадой—і зь імі ўпотай я
згаджаюся, ідэйны сьнежня шпег.

У Крумлаве

Зямля нібыта ўзьнялася старчма:
відочная апошняя драбніца.
Кожная хатка, кожная карчма
мкнуцца сапраўднасьці прыпадабніцца.

Час запыніўся шмат гадоў таму,
маўляў усё вакол узьнікла ўчора,
хоць насамрэч даўно няма каму
атакаваць старога замку ўзгорак.

У пастку стогадовай даўніны
трапілі два мядзьведзі дзеля сьмеху
заўсёднае плебейскай бальшыні.
Бярвеньне замест дрэваў на пацеху
ім кінулі, як кідаюць дзіцям
у ложак цацкі. У вачох галодных
драпежнікаў — адвечны недацям,
насы ў вясновы ўнюхваюцца подых.

Ад шляхціцаў застаўся толькі дух
зьвярыны. Нібы радыё, сядзіба
паведамляе ў радыюсе двух
кілёмэтраў, каторая гадзіна.

Пена ў рацэ — нібы няспынны ток
аблокаў пры паскораным паказе...
О, любаснай правінцыі глыток!
Як хораша, што ўрэшце я ня ў Празе.

МАКС ШЧУР — нарадзіўся 5.12.1977 г. у Берасьці. Вершы спрабуе пісаць з 12 гадоў, некаторыя зь іх публікуе ў абласным і рэспубліканскім друку („Бярозка", „Першацьвет", „ЛіМ", „Полымя", „Крыніца"). З 1994 году — студэнт менскага Лінгвістычнага Ўнівэрсытэту, сябра антыпартыйнай групы „Чырвоны Жонд". Аўтар вершаванай п'есы *Сьмерць тырана* (1997). З 1998 г. жыве ў Чэхіі, навучаецца на філязофскім факультэце Карлава Ўнівэрсытэту. Выдаў зборнікі вершаў *Спадыня Адзіноцтва* (Берасьце, 1993), *Амфітэатар* (Гданьск, 1999).

Адам Глёбус

Далакопнік

— Калі што народзіцца, дык абавязкова памрэ. Калі нехта закопвае магілу, дык знойдзецца той, хто раскапае. І ня горшая ў мяне работа за ўсе астатнія работы. Далакопы з раніцы выкопваюць яміну, а ўдзень засыпаюць. Я ж наадварот: увечары раскопваю, а пад раніцу закопваю. Кожнаму сваё. — Далакопнік сядзеў на пяску й гаварыў да новенькага, толькі з-пад гэбліка, крыжа.

У Далакопніка быў сьвяты абавязак: перад тым, як пачаць раскрыцьцё капца, растлумачыць яму свой намер, пераканаць, калі заўгодна, у неабходнасьці эксгуматарскіх дзеяньняў.

— Вось ляжыш ты там, пад пяском, малады й прыгожы. Яшчэ малады й яшчэ прыгожы, а пройдзе тыдзень-другі, дабярэцца да цябе чарвяк... Шмат у нашым жыцьці ёсьць дарог, а вядуць яны ўсе да магілы. І дарога чарвяка завядзе ў магілу, у тваю магілу. І зьесьць ён цябе дарэшты...

Далакопнік узяў з суседняга капца шклянку з ландышамі. Кветкі вынуў і паклаў пад сіні крыж, ваду выліў на пясок. У вызваленую шклянку нацурболілася сьпірту, поўненька, пад самыя берагі. Пілося нагбом і не закусвалася. Ландышы вярнуліся ў прадэзінфікаванае шкло.

— Можна й пачынаць, — Далакопнік увагнаў блакітнае лязо рыдлёўкі ў жоўты пясок магілы.

Работа пайшла спраўна. Невысокі, шырокі, як шафа, Далакопнік рыў ня горш за экскаватар сярэдніх памераў. Зямля акуратнымі пагоркамі клалася вокол яміны. Сьветлы крыж стаяў прытулены да суседняга крыжа, нібыта абдымаў і цалаваў свайго старэйшага калегу й настаўніка. Празь якую гадзіну Далакопнікава рыдлёўка ўжо выбірала жвір абапал зялёнай труны.

— Вось і сустрэліся, — прагаварыў Далакопнік, уздымаючы века сталёвым цьвікадзёрам, — Так бы ляжаў і чакаў свайго чарвяка, а так пагуляеш яшчэ, дабегаеш тое, што не дабегаў, дакахаеш тых, каго не дакахаў, дасьпяваеш свае песьні.

Нябожчык быў надзіва прывабным юнаком з доўгімі льнянымі валасамі. Далакопнік прыпаў да юнаковых вуснаў сваім прасьпіртаваным ротам і пачаў рабіць штучнае дыханьне. Далакопнік соп, набіраў поўныя грудзі начнога паветра і ўганяў яго ў мёртвыя лёгкія. Жыцьцё вярнулася ў маладое цела пахаванага. Ён расплюшчыў блакітныя вочы й пабачыў зарослы кудламі твар Далакопніка.

— Што гэта? Дзе я? Ты хто? — хлопец сеў у труне.

— Ціха, ціха... Не гарлай, тут усе сьпяць, а ты крычыш. Пасядзі, сагрэйся крыху. Вось табе мая ватоўка, — Далакопнік ахінуў хлапечыя плечы старой, спрэс у закарэлай зямлі ватоўкаю.

— Ты, корч стары, кажы дзе мы? — блакітныя вочы наліліся чырвонай злосьцю. — Гавары, блядзь, а не то адарву тваю баранову галаву і ў зямлю закапаю, каб яе жукі зжэрлі.

Далакопнік спахмурнеў, моцна ўдарыў кулаком у юнаковы грудзі, так што той зноўку выпрастаўся ў труне, кінуў цьвікадзёр яму на шыю, ускочыў і наступіў на інструмант неваксаваным ботам. Юнак захрыпеў.

— Хрыпі, пахрыпіш у мяне яшчэ ня гэтак. Я цябе смаркача-нахабніка навучу, як са старэйшымі гаварыць. Ты мяне паважаць будзеш, любіць і шанаваць больш, чым Бога, чым Божую Маці. Я табе даў яшчэ кавалак жыцьця, а ты язык паскудны распускаеш. Цяпер сядзь і памаўчы. Я гаварыць буду. І ватоўку вярні, ноч халодная.

Цьвікадзёр зьняўся з шыі маладога нябожчыка, ватоўка сьцягнулася зь ягоных плячэй. Дамавіньнік паставіў пад нахілам века труны і спрытна, ускараскаўшыся па ім, вылез зь яміны, не забыўшыся прыхапіць рыдлёўку й цьвікадзёр. Наверсе ён яшчэ набухаў сабе сьпірту ў шклянку:

— Гігіена перш за ўсё! З такімі як ты безь сьпірытусу не абыйсьціся. А табе ўжо сьпірт не дапаможа. Ты свой алькаголь выжлукціў. Набраўся як дзюдзька — і за стырно. Чорт табе брат. Вось і сядзіш цяпер на дне магілы і ня ведаеш, як быць далей... А Далакопнік ведае, работа ў мяне такая — ведаць пра вас небарак усё чыста і ўзад і ўперад. Кроў... Сьвежая жаночая кроў дасьць табе жыцьцё. Маладая, гарачая, смачная, толькі яна і нішто іншае паставіць цябе на ногі. А цяпер вылазь, дапаможаш капец аднавіць, каб нараніцу ні знаку, ні сьледу не было пра нашыя справы начныя. Каб ландышы ў шклянцы пад крыжам стаялі, быццам ніхто іх і не кранаў.

Далакопнік паспрабаваў выцягнуць прыгажуна з магілы за руку. Тая лёгка адарвалася ад пляча, высьлізнула з рукава й засталася вісець у лапе Далакопніка.

— Работнікі ў моргах пайшлі. Усё робіцца, як не сабе. Руку й тую прышыць ня могуць. Ладна, не бяды, прышыю я табе руку. Давай другую.

Лёгка, як роднае дзіця, юнак выцягнуўся зь яміны.

Хутка, з азартам Далакопнік засыпаў магілу й зрабіў акуратны капец з крыжам, пад які паставіў кветкі ў шклянцы. Кароткая чэрвеньская ночь сканчалася. Мужчыны хуценька пабеглі праз могілкі і зачыніліся ў дамку вартаўніка. Далакопнік лічыўся на могілках за вартаўніка. Працаваў ён сумленна, кожную магілу любіў, як родную. Бамжоў, п'янтосаў і злодзеяў з вандаламі ганяў, лавіў і біў няшчадна. Яго паважалі. Яго нават вылучалі на атрыманьне ордэна, за выдатныя працоўныя подзьвігі. Але ўзнагароды не ўручылі, маўляў, што гэта за подзьвігі на могілках. Далакопнік старанна перапісаў прозьвішчы сквапных начальнікаў, каб у свой час прыгадаць ім абразу. Ёсьць дзень і ёсьць ноч. Удзень яны кіруюць сьветам, а ўночы ён правіць баль. Устае сонца і заходзіць сонца. І сонца зойдзе для тых уладароў, як зайшло для маладзенькага прыгажуна, калі ён п'яны ўдрэзіну разьбіўся на машыне аб дрэва насьмерць.

У старожцы стаяла халадэча, як у пограбе. Далакопнік зашморгнуў ніколі ня праныя фіранкі і засьвятліў кволую лямпачку. Аднарукі мярцьвяк разгублена стаяў у парозе.

— Праходзь да стала, здымай вясельны пінжак, сядай, будзем цябе рамантаваць, — гаспадар дастаў з шуфлядкі доўгую шавецкую іголку й тоўстыя ніткі.

Як тая швачка, ён і пры цёмным сьвятле спрытна ўдзеў нітку ў голку. Агледзеў парванае плячо, прыклаў да яго руку й пачаў шыць шпарка, як машынка. Юнак касавурыў вока на акуратнае шво, што ахоплівала абручом плячук. Іголка, зрабіўшы два колы, спынілася пад пахаю.

— Вось і прымацавалі. А цяпер у падпольле лезь, удзень пасьпіш, адпачнеш у халадку, увечары я швы здыму — і будзеш як новенькі. Чакай я тут яшчэ папырскаю мёртвай вадою на твае раны. Вось так і вось так. У цябе, мой даражэнькі, цяжкая ноч была. Ня так яно й проста з таго сьвету на гэты вярнуцца. Лезь у пограб, там у кутку матрац намацаеш, на яго й кладзіся. І хутчэй давай, бо сонечнае сьвятло цяпер шкоднае для твайго здароўя, загараць ты больш ня будзеш, гэта дакладна.

Далакопнік закрыў падпольле дашчанай накрыўкаю і паставіў на яе зэдаль з эмаляванай вываркай поўнай найчысьцейшай мёртвай вады.

Уставала сонца, ружавелі вершаліны могілкавых клёнаў, прачыналіся вароны, вечныя спадарожнікі жалобных рытуалаў. Пачынаўся дзень. Ён пачынаўся для жывых, а мёртвыя працягвалі глядзець бясконцы, безьсюжэтны, чорны сон. Такі сон бачыўся і маладому нябожчыку ў падпольлі, пакуль на захадзе не закацілася чырвонае сонца. І сон ня стаў крывавым, і ён не прачнуўся.

— Вылазь, ноч на двары і працаваць пара. Касьцюмчык у цябе ні к чорту. Вось я тут тое-сёе прыхапіў... Скураное, чорнае, надзейнае... Цяпер усіх хаваюць у нядзельных гарнітурах. Непрактычна. Адзін дожджык, другі — і ад гарнітурчыку лахманы засталіся. Каб я ў начальніках працаваў, выдаў бы загад, каб хавалі людзей у скураной вопратцы. Бачыш, як табе чорнае да твару. А цяпер павячэрай. Я дзеля твайго здароўя ў лякарню зьлётаў і бутэлечкай крыві разжыўся. Яна не зусім сьвежая, але лепш такая, чым з пустым страўнікам ісьці на паляваньне. Пі, не гідуйся.

Далакопнік пасунуў па стале шклянку поўную цёмнай, сьвежамарожанай чалавечай крыві. Дрыготка прабіла ягонага госьця. І раптам ён пачуў такую смагу, што адным глытком спаражніў вялікую шклянку, якая моцна патыхала ландышамі. Гаючая цеплыня разьлілася па целе. Галава крыху захмялела, і юнак адчуў усю радасную паўнату зямнога жыцьця. Ніколі раней яму не было так добра й прыемна. Ні гераін, ні какаін, ні тым больш алькаголь не давалі падобнай радасьці.

— Дайце яшчэ... Каб я ведаў, што ёсьць такое задавальненьне, я б памёр значна раней. А то алькаголь, наркотыкі й дзеўкі, сукі, пляшкі й кайф — усё жыцьцё зьбяёдаў на іх. Мог бы стаць прыстойным кампазытарам, паверце, вельмі прыстойным, ня Моцартам і ня Шонбэргам, але авангардовую опэру ў стылістыцы раньняга Пракоф'ева напісаў бы, нешта буфанаднае, цыркавое, з чорным гумарам... Я й лібрэта пачаў прыкідаць: танец чорных малаткоў зь белымі цьвікамі... Вам зусім не цікава?

— Гэта мінулае. Ты яго лепей забудзь, не ўспамінай. Ты цяпер паляўнічы за крывёю, бязь сьвежай крыві не пратрымаесься й аднаго дня. Будзеш хадзіць штоночы на паляваньне, спачатку забівай дзяцей і жанчын, старых лепей не чапаць, у іх хваробы, можна атруціцца, і з мужчынамі не сьпяшайся змагацца, напачатку трэба сілы назьбіраць. Кроў высмоктвай з горла і не вянозную, а артэрыяльную, яна ўдвая карысьнейшая. Пажывеш у мяне, а потым што-небудзь прыдумаем.

— Пачакайце, дык я што — Вупыр? Вы мяне з магілы ўзьнялі каб зрабіць крывасмокам? Няўжо нельга нешта іншае прыдумаць замест крыві?

Далакопнік выліў у шклянку з бутэлькі рэшткі крыві й паставіў перад Вупыром. Той адра-

зу ж высмактаў з бруднага посуду салонае зьмесьціва.

— Першы раз табе цяжка давядзецца, а таму вядзі ахвяру сюды, на могілкі. Я табе, калі што якое, дапамагу яе асьвежаваць. І не асуджай ні сябе, ні мяне. Сьвет такі, які ёсьць, і кроў цячэ ў ім у тых накірунках, куды мусіць цячы. Ночы цяперака кароткія, так што сьпяшайся, сынок.

Дзьверы старожкі расчыніліся ў непралазную могілкавую цемрадзь. Прыгожатвары Вупыр ступіў у яе, як у пекла. Ён ня стаў выбірацца з могілак праз браму, а пералез праз цагляны плот і скочыў у зарослы бэзам аднапавярховы завулак, па ім ён выйшаў на шырокую вуліцу, дзе ўдалечыні сьвяціўся знак мэтро. Вупыр ня змог прыдумаць нічога лепшага, як даехаць да свайго ўлюбёнага начнога клюбу. Ён усё яшчэ спадзяваўся, што батва з Далакопнікам — нішто іншае, як дурны сон. Зараз ён зойдзе ў клюб, замовіць віскі, вып'е, сустрэне каго-небудзь са знаёмых, і яны разам пасьмяюцца з крыважэрных маразмаў.

Ніякіх знаёмых у клюбе не знайшлося. І барманы за стойкаю стаялі новыя, і ахоўнікі зьмяніліся, і стрыптызёркі ўсе як адна — невядомыя. Пэўна з-за таго, што там ладзілі фэст геі зь лесьбіянкамі і трансвэстытамі, такім чужым выглядаў начны клюб. Вупыр сеў у кутку зь вялікай шклянкаю віскі. Ён паспрабаваў зрабіць глыток і ня змог. Страўнік сьцяўся, і алькаголь выліўся праз рот і нос на падлогу. Здаецца, ніхто не заўважыў, як скурчыла і званітавала крывасмока. Ён абмыў твар у прыбіральні і вярнуўся ў танцзалю. Каля барнае стойкі на высокім аднаногім крэсьле ён заўважыў даўнюю каханку.

— Ты сягоньня самотная? Такая прыгожая і адна сядзіш каля стойкі, гэта небясьпечна. Хочаш пачастую? Марціні. Раней ты вельмі любіла сухі марціні. Двайны марціні, барман. Ба-а-ар-ман, налі маёй жанчыне самага сухога марціні. А я сваё сягоньня выпіў. Усё выпіў, да кроплі. Болей не магу. Можа пазьней змагу, а зараз прапускаю. Пі. Я вельмі рады цябе бачыць. Як і кожны мужчына рады сустрэцца са сваёй першай у жыцьці жанчынаю.

Вупыр абняў жанчыну ў сінім парыку за аголеныя плечы й пацалаваў у шыю. Клюб перакуліўся ў вачах крывасмока дагары нагамі. І музыка загучала ў адваротным кірунку. Наведнікі не выпівалі зьмесьціва шклянак, а вылівалі яго зь сябе, несьлі да бармана, той вяртаў ім грошы, вадкасьці заліваліся ў бутэлькі. Дыджэй не гаварыў, а паядаў словы. Стрыптызёркі апраналіся...

— Што з табой? Э-э-й! Ку-ку! Я тут. Ты сапраўды перабраў. Так нельга. І твар у цябе белы, як у нябожчыка. Дарэчы, мне сказалі, што ты разьбіўся на машыне. А я не паверыла. Яны кляліся, што ты забіўся, а я сьмяялася і, як бачыш, мела рацыю. Пра цябе столькі рознага брыдкага распавядаюць, што я стамілася выслухоўваць. Ты разоў дзесяць канаў ад перадазіроўкі гераіну, разоў пяць сканчаў жыцьцё самагубствам, разьбіваўся на самалёце, паміраў на жанчынах, нават п'яны замярзаў у сьнезе на могілках, і такое гаварылі... Табе трэба дамоў, ты вырубаесься...

Крывасмок угаварыў жанчыну правесьці яго дамоў. Той стала шкада свайго першага ў жыцьці мужчыны. Яны разам выйшлі з аглушальнага грукату ў цішу начнога праспэкту. Вупыр адчуў сябе лепш, ён да болю сьціснуў цёплую жаночую руку й запрапанаваў набыць дозу. Каханка ня ўпарцілася. Яны занырцавалі ў мэтро і выйшлі непадалёку ад могілак, на якіх працаваў Далакопнік.

— Ты не паверыш, але я раскажу табе праўду. Ніякіх наркотыкаў, ніякай дозы гераіну ў гэтай чортавай старожцы я не набуду. Іх там і няма. Там, там іншае... Памаўчы. Я разьбіўся на машыне, заснуў п'яны за рулём, і клён выскачыў насустрач. І разьбіўся я насьмерць. І мяне пахавалі тут, на гэтых праклятых могілках, а нейкі... Як табе сказаць... Д'ябал, што называе сябе Далакопнікам, адкапаў мяне і ўваскрасіў.

Жанчына не паверыла. У якасьці доказу Вупыр паспрабаваў паказаць шнар на прышытай руцэ. Але ад швоў і знаку не засталося. Тады ён запрапанаваў пералезьці праз плот і адшукаць крыж са сваім прозьвішчам. Свой капец крывасмок знайшоў хутка. Жанчына ў сьвятле запальнічкі чытала прозьвішча каханка, калі лязо рыдлёўкі расьсекла яе сіневалосы голаў напалам. Далакопнік абцёр аб пясок скрываўленую рыдлёўку.

— Смакчы, давай, пакуль сьвежая. Што стаіш, як слуп. Грызі горла й сілкуйся. Ты ў мяне малайчына, талент, можна сказаць, ён або ёсьць, або яго няма. І няважна, чым ты займаесься, музыку пішаш, ці кроў высмоктваеш зь першай жанчыны, галоўнае, каб таленавіта справа рабілася. Зараз мы яе закапаем пад тваім крыжам, і адпачываць пойдзем. Я, між іншым, добрае жытло для цябе нагледзеў. Невялікая каплічка недалёка ад касьцёла зусім пустая стаіць, я ў ёй свой рыштунак трымаю, граблі розныя, вёдры, тачку, каб увосень лісьце звозіць, венікі. Табе за невялікую арэнду саступлю.

Ператомлены Вупыр ледзь дайшоў да старожкі. Некалькі разоў ён падаў між магілаў, а ўважлівы Далакопнік дапамагаў падняцца. У падполь-

лі на гнілым матрацы крывасмок імгненна абрынуўся ў сон. Ён бачыў райскі сад і сябе аголенага, і безьліч кветак, і безьліч дрэў пладаносных, і сваю першую аголеную жанчыну. Яна плавала ў празрыстым возеры. Сонца стаяла высока-высока. І не заходзіла тое сонца ў райскім садзе ніколі. Вечная сьвятлынь панавала ў раі. Сон абарваўся грукатам Далакопнікавых абцасаў. Вупыр вылез пад чэзлае сьвятло лямпачкі.

— Ты-ты... Ты засек яе. Як ты мог... Як ты мог забіць ні ў чым не вінаватую жанчыну. Ты — пачвара. Ты мусіш яе ажывіць, выкапаць і зашыць сваімі ніткамі, яе цудоўную галаву. Ты можаш. Я прашу цябе. Я дапамагу яе выкапаць, я сам яе адкапаю. Толькі зрабі яе назад. Я буду тваім рабом, на векі вечныя. Ты чуеш мяне? Ну што ты хочаш, каб я зрабіў? Я ўсё зраблю... Усё, усё, усё...

Далакопнік запатрабаваў ад Вупыра бутэльку мэдыцынскага сьпірту. Той выскачыў у дзьверы і паляцеў у дажджыстыя, плюгкія, гарадзкія нетры. Дамавіньнік застаўся ў старожцы чакаць. Крывасмок дабег да найбліжэйшай аптэкі. Вялізным каменем разьнёс вітрыннае шкло. Падскочыў да паліцы з бутэлькамі. У сьвятле запальнічкі спраўдзіў на этыкетках, ці тое ўзяў, і выляцеў на двор. З вуліцы, да аптэкі заварочвала міліцыйная машына з маланкавай мігаўкаю. Давялося бегчы ў двары, хавацца ў брудным пад'езьдзе за сьмецьцеправодам і перачакаць аблаву. Перабежкамі ад пад'езду да пад'езду, ад кустоў да кустоў Вупыр вярнуўся да соннага Далакопніка. Выпіты сьпірт яго ўлагодніў.

— Падыму тваю кралю. Угаварыў. Так яно табе весялей будзе. Адному сумнавата ў гэтым падмесячным сьвеце. Хто-хто, а я разумею. І цябе зь зямлі выкапаў, бо сумна было. А мог бы й не цябе, а каго іншага з труны выцягнуць. Такіх у мяне радамі насьцелена, збольшага стар'ё, рызьзё, сьмецьце. Маладзенькія ня часта хаваюцца, вось і спакусіўся. І цябе дарма слухаю. Хай бы яна там і ляжала, дзе ляжыць. Ты не перажывай, кладзіся, ноч за раніцу мудрэйшая. Заўтра падымем тваю Еву.

У месячным сьвятле расьсечаная напалам, засыпаная пяском галава жанчыны выглядала паскудна. Крывасмок абмыў яе мёртваю вадою. Дамавіньнік удыхнуў у дзявочыя грудзі могільнічнага паветра. Ледзь прытомную прыгажуню мужчыны прывялі ў старожку, дзе гаспадар склаў і сшыў ёй галаву. Парык давялося выкінуць. Вупыр абмыў сваю каханку цалкам і пераапрануў у сухую, чыстую, скураную адзежу. Потым апусьціў у сутарэньне, паклаў на матрац, абняў, і яны заснулі райскім сном.

— Марная марнасьць, усё марная марнасьць, марнатраўства, і ловы ветру і стома духу. Працуеш, робіш як найлепш, атрымліваецца найгоршае з магчымага. Піў бы ён кроў, жыў бы вечна... Не, сумна яму, самотна пад поўняю. Цацкі яму давай, цыцкі яму спатрэбіліся... Зраблю ўсё, што пажадаеце... Рабом вашым буду... Так і паверыў. Колькі такіх было. Ляжала-адпачывала пад маёю падлогаю... Войска. І дзе яны ўсе?

Дапіўшы сьпірт да рэшты, Далакопнік абрубіўся, седзячы за сталом. Ён салодка хроп, паклаўшы лоб на рукі з брунатнымі пальцамі й чорнымі ад зямлі пазногцямі. Ён і чуць ня чуў, як крывасмок з крывасмочыхай выпаўзьлі з-пад падлогі і ўзялі ён цьвікадзёр, а яна рыдлёўку. Далакопнік і ў сьвядомасьць не пасьпеў вярнуцца са сну, бо цьвікадзёр з трэскам увайшоў у цемя і вырваў патыліцу. Вупыр з Вупырыхай парвалі-пасеклі старое цела на кавалкі, кавалачкі, шматкі й шматочкі.

— Ты выдатна прыдумаў пакоцаць трупаведа на кескі, каб духу ягонага на могілках не было. Цяпер мы гаспадары цемры. І хай хто сунецца — парвем на палосы. А старожку сьмярдзючую спалім, хай думаюць: згарэў стары п'янтос. Зробім яму пекла. Дзяры ягоныя кнігі са сьпісамі мерцьвякоў. Вось так і пакамеч крыху старонкі, лепей гарэць будзе. Падпальвай у розных кутках і фіранкі, фіранкі запалі. Пайшло, схапілася, будзе гарэць... Сыходзім.

23 жніўня 2000

АДАМ ГЛЁБУС. У 1998 годзе ягоныя апавяданьні з кнігаў *Дамавікамэрон* (1994) і *Новы Дамавікамэрон* (тады яшчэ ў машынапісе) пераклала на польскую мову сябрына з 14 чалавек. Такім кагалам не перакладаўся ніводзін беларускі аўтар. У ходзе гэтага перакладніцкага праекту гартаваўся наш беластоцкі літаратурны гурт. Шмат хто з гэтага гурту ўжо выцерушыўся, але ядро застаецца надалей дзейным.

Юры Гумянюк

Нататнік экстрэмала

Верш на „Свабоду”

Нас абрубілі на высокай ноце,
і мы цяперака знаходзімся ў цэйтноце,
як мухі п’яныя на тлустым бэгемоце,
ці як жарынкі на патухлым кноце.

Мы ўсё жыцьцё чакаем новых цудаў,
жытло шыкоўнае будуем для прыблудаў
і молімся штодня на чэрап юдаў,
гукаючы: „Няхай жыве краіна хлудаў!”

Не дачакацца нам ніколі дабрадзея!
Калі ня ўздымемся, дык ў скрусе пасівеем.
Давайце ж станем мастакамі дзеі,
пакуль у сэрцах яшчэ паліцца надзея!

Гвалтаўнікі, што чыняць перашкоды,
уласнаручна зьнішчаць свае стоды,
пасьля патрапяць пад абцасы моды.
А мы адчуем корсткі смак свабоды!

23 красавіка 2001

* * *

Напэўна сёньня больш ніхто не самадастатковы...
Зьляцеў лускою з твару твой юнацкі шарм,
бо попыт значна перавысіў прапанову
ды на ілбе пакінуў шнар.

травень 2001

Адчуваньне рэжыму

Паветра сьціснута, нібыта звадкавана,
і турбуленцыя ў разумнай галаве.
Крывыя вэктары на жоўтым тле экрана
віруюць жэўжыкамі ў месячным сяйве.

Не распазнаць праз акулярчык мікраскопа
вар’яцкі сьвет структуры ДээНКа,
бо ў страўніку пакутуе Эўропа,
і дыхае ў патыліцу ЧэКа.

Ці знойдзецца дзе выйсьце з душагубкі?
Сьцяну дзяўбі хоць гаечным ключом!
Заместа рук — крывавыя абрубкі,
а ў мясе — перамеленае шкло.

Вось функцыя самотных анархістаў:
сканіраваць пануючы рэжым
ды голымі ляжаць пад небам чыстым,
нібыта бераг Нёмана ёсьць Крым.

Пасьля, калі мянтоўскія сабакі
забрэшуць ля пагрызеных кустоў,
мы друканем рэжым праз прынтар сракі —
няхай жаруць адборнае гаўно.

28 жніўня 2001

Сяброўства з псыхапатам

Мой хлопча, я ні ў чым не вінаваты.
Ты сам абраў псыхічны дыспансэр,
дзе вокны аздабляюць краты,
і пах вар’яцтва выклікае сьверб.

Цябе дарма кармілі „трыфтазінам”,
хіліў да сну заўсёдны дымэдрол.
Як добра, хлопча, што ты не загінуў,
адпрэчыў крыўды і мяне знайшоў.

А ці знайшоў сябе ты — невядома,
бо ў лес глядзіш някормленым ваўком,

з вачэй тваіх шалёных зеўрыць стома,
як піва п'еш на вуліцы нагбом.

Дарэмна трацяцца высокія пачуцьці
на дасягненьне мэты нічыёй!
Садомскі грэх у правінцыйнай каламуці
ўразаецца сталёвым вастрыём

у галаву, што пухне ад эмоцый,
набрыньвае паветрам, як пухір.
Цябе пазбыцца 'шчэ ня маю моцы,
хаця сьмярдзіш, як заляжалы сыр.

Пакуль нясу свой крыж — і не шкадую.
І на хрэна такія мне сябры?
Лепш зь месяцам навечна пасябрую —
самотнікам пляскатым угары.

29 жніўня 2001

Наканаваньне

Нахабным чынам, быццам у трупярні,
Нас прэпаруе дзядзька Постмадэрн.
Свой акт мудачы ён прымае за сьвятарны,
а скальпэль, нібы лыжка у руцэ

не задрыжыць пасьля салодкага дэсэрту,
бо ўжо ня зьменіцца хада падзей.
Мы ж, як удзельнікі бясплатнага канцэрту —
нямыя пудзілы ў забруджанай вадзе.

І будзе так, бо немагчыма перакрочыць
праз Рубікон адначасова ўсім сябрам.
Хай падарожжа ў часе будзе змрочным,
адной нагой мы ТУТ, другою — ТАМ.

29 жніўня 2001

Сяргей Астравец

Югаслаўскі варыянт

1.

Дзьвесьце тысяч югаславаў на вуліцах у цэнтры Бялграду! Кожную гадзіну радыё дадае ўсё новыя паведамленьні. Павелічэньне тэмпэратуры адчуваецца на адлегласьці, нават праз радыёхвалі. Пагатоў цераз тэлесюжэты. Дыктатар завагаўся. Першыя прыкметы. Нарэшце. А напярэдадні. Першае публічнае зьяўленьне: ён абыходзіць шыхт выпускнікоў вайсковай акадэміі. Маўклівая пагроза ў бок апазыцыі. Тэлевізар глядзяць усе. Асабліва ў такія напаленыя дачырвана дні. Вонкава нэўтральнае дэманстраваньне сілы. Маўкліва-годныя баёвыя шэрагі. Аддзелы розных войскаў. Нават марскіх. (Дзе тое мора?!) Штыхі, кукарды, аксэльбанты, шаблі, сьцягі. Сівы дыктатар, не зьмяняючы мімікі, з каменным тварам абыходзіць афіцэрскія шэрагі. Спыняецца, зазірае ў вочы. Ацэньвае ступень адданасьці й надзейнасьці? І ўсё ж завагаўся? Гэта здаецца неверагодным. Не паказваецца ў тэлевізары, не прамаўляе. Завагаўся! Чуткі аб тым, што нібыта пакінуў краіну.

Другі дыктатар, які пільна сочыць за падзеямі, робіць у тэлевізары крыху разгубленую заяву. „Я нікуды ўцякаць ня буду. Я тут нарадзіўся, тут памру і тут буду пахаваны". Упершыню публічна загаварыў аб сваёй сьмерці. Сэнсацыя! Першы раз збаяўся, затрымцеў — пасьля векапомных дзён працэдуры імпічмэнту, не даведзенай да канца. Апанаваў становішча, абаперся на руку Масквы, разагнаў парлямэнт, скасаваў Канстытуцыйны суд, прыдушыў апазыцыю. Пачаў зьнішчаць фізычна. Людзі сталі зьнікаць, як у Лацінскай Амэрыцы.

Акінчыц увайшоў у час міні-канцэрту, паміж музычнымі нумарамі. Гітарыст выконваў наступнай „Сарабанду". Сам строга ў чорным, далікатны і сьціплы да сарамлівасьці. „Спытаў у мяне — у якім стылі я граю „Сарабанду" — у вядомай апрацоўцы ці бліжэй да арыгіналу? Разьбіраецца", — пахваліў ён аднаго з амэрыканцаў. Пад нагой у гітарыста была адмысловая падстаўка-понаж. Пазьней ён піў толькі гарэлку, кілішкамі. Меў адбыцца ягоны канцэрт у вялікай залі. Акінчыц зацікавіўся, каб схадзіць. Аднак так потым і не схадзіў. І гэтак заўжды. Вось жа тым вечарам упершыню заехаў з адзіным канцэртам славуты БэГэ. Чаму б і не схадзіць? Нават зьбіраўся. Але ж не схадзіў! Для публікі курэўся фіміям. БэГэ сумленна і доўга працаваў на сцэне, а потым адказаў на ўсе журналісцкія пытаньні. Што змагацца мае сэнс толькі з уласнай лянотай, што ён любіць усе рэлігіі аднолькава і не стварае сабе куміраў.

Так, Акінчыц даўно не рабіў намаганьняў, нават мінімальных. Зараз вось трапіў на канцэрцік, дык паслухаў і першага выканаўцу, і наступнага. Аднаго ўпершыню, другога — соты, мабыць, раз. Той стараўся расьсьмяшыць госьцяў блазенскімі тэкстамі. Пра гістарычных пэрсанажаў. „Кукарачай". Адзін з амэрыканцаў, які ўмеў па-расейску, нечакана выявіў веды ў мясцовай ня вельмі ўдалай гісторыі, прапанаваў тост за таго вялікага князя, які так і ня стаў каралём. Абнадзеіў прысутных, што будзе і на іхнай вуліцы свабода і дэмакратыя. „Ягоныя б словы, ды Богу ў вушы", — падумаў Акінчыц і далучыўся.

Амэрыканцы былі новікамі, прыехалі знаёміцца з правінцыяй. Ім адразу — сустрэчу з мастакамі, да якіх любіў прыяжджаць былы пасол. І рэалісты, і фармалісты, і фальклярысты. Расстаўленыя і разьвешаныя карціны, статуэткі, галовы, скураныя вырабы — куфэркі, вокладкі. Ніякай палітыкі. Апроч згаданага тосту. Амэрыканцаў, наадварот, пачалі частаваць нейкім адмысловым бімбарам — зь зёлкамі ў бутлі, якія выглядалі як сена. Пасьля такой моцы іх хутка пацягнула да ложка. Узьняцца на паверх вышэй, душ — вой-вой-вой! — галава! Зубы, і спаць. А недзе ўначы прыдумваліся і друкаваліся ўлёткі. З узгадкамі пра югаслаўскі варыянт. Ніякай гарэлкі і бімбару, ніякай „Сарабанды" і „Кукарачы". Толькі нечаканая павага і зайздрасьць да сэрбаў.

2.

Багема трымалася да канца. Жлукціла „Нашу марку" і „Стары замак". Альбо гарэлку. Разам з маэстрамі балявалі таксама паэт Галубок і Акінчыц. Выйшлі разам учацьвярых — два апошнія, скульптар Бутрымовіч і каваль Няміра. Га, спачатку зь імі яшчэ быў мастак, які маляваў файныя піраміды, якія некалі вельмі падабаліся Акінчыцу. Пайшлі напачатку

ў адваротны бок, на пляц, дзе хтосьці зь іх набыў у жанчынак цыгарэты з-пад крыса. Мастак разьвітаўся першы.

Каваль з маэстрам наблізіліся да помніка, каля якога было цёмна — улада ідэалагічна не шанавала яго. Быццам змовіўшыся, раптоўна ўкленчылі перад ім. А файны мы зрабілі з табой помнік! Пачалі адзін аднаго пахваляць. Успамінаць, які быў ёдкі дождж-сьнег на адкрыцьці. Як гарадзкі галава схаваўся сярод гледачоў, але прыйшоў. Помнік замовілі самі ўлады, але пакуль паставілі, ідэалагічныя вятры зноў зьмяніліся . „Хацеў камень тут пакласьці, але грошай не хапіла, — узгадаў Бутрымовіч. — Давай зараз пакладзем, га?" „Давай", — адназначна пагадзіўся Няміра. „Я машыну залатвю, а ты кавалёў сваіх дай. Як яны, ці дужыя хлопцы?" „Кавалі? Ды кавалі самыя дужыя!" „Ну ўжо — самыя... Мы — мацнейшыя. Пастой некалькі гадзін з малатком, камень пакрышы", „А з кавадлам як? Жалеза разьмякчаць, распляскваць. Паспрабуй!" „Ведаю я: у вас цяпер мяхі мэханічныя, молат таксама. Часам пляснуць па жалезе... Яно ж мяккае, калі чырвонае. Гэта ж ня камень". „Ну, параўнаў". „Ты ж сам казаў: куй жалеза, пакуль гарачае".

Яны ўжо даўно ішлі назад. Абодва пісакі ў спрэчцы ня ўдзельнічалі. Акінчыц, які выпіў усяго пару пляшак піва, чамусьці вырашыў для сябе, што трэба абавязкова давесьці абодвух маэстраў. Хаця ўжо зрабілася зусім позна. Зрэшты, бадай недарма. Няміра з Бутрымовічам схапіліся — давай дужацца, хто мацнейшы! — і зьнянацку паваліліся. Непадалёк праяжджала міліцыя, машына прытармазіла. Акінчыц з Галубком кінуліся падымаць. Праз сто мэтраў тыя, аднак, зноўку пачалі дужацца, паставіўшы локці на парапэт. Няміра вельмі патрабаваў, каб другая рука была за галавою, каб не дапамагаць ёю. І — перамог!

Бутрымовіч паводзіўся як дабрадушны, крыху цельпукаваты мядзьведзь, якога ён і нагадваў. І ўвесь час пад'юджваў Няміру. А той, не адчуваючы жартаў, спрачаўся поўнасьцю сур'ёзна, змагаўся гэтак сама. Абодва выглядалі на шляхціцаў, якія паспрачаліся на мясцовым сойміку — зь вядомай кніжкі Ходзькі, якую перакладаў калісьці Акінчыц. Упершыню ён задумаўся: з чым лепей працаваць, што лепшае — жалеза ці камень? Проста з жалезам не дасі рады, цьвярдзейшае за камень, нават не высільвайся. Але калі ў агонь яго, ды моцна цяжка ўперыць. Карункі робяць! А камень заўжды аднолькавы. Але калі ня надта крохкі і калі рука спрактыкаваная, дык безь ніякай апрацоўкі зь яго таксама можна атрымаць цуд.

Каля дома Няміра дэкляраваў: давайце зойдзем на каву, жонцы разам растлумачым. Ня ў правілах Акінчыца ў гадзіну ночы заходзіць на каву, але ён згадзіўся. Жонка Няміры ня спала. Яна нагадала Акінчыцу князёўну. Яна ім сказала: „Каштуніца ўжо прэзыдэнт. Толькі што паведамілі. Сам сябе абвясьціў. Апазыцыя ўжо пачала штурмаваць тэлебачаньне. З бутэлькамі з запальнай сумесьсю". „З кактэйлем Молатава, — удакладніў Акінчыц. — А мы нічога ня ведалі. Гітару слухалі. Піва лідзкае пілі..." Удзень Акінчыц купіў чырвонага віна са славянскай назвай, каб упершыню выпіць за сэрбаў, якіх недалюбліваў.

3.

Сходка адбывалася пад сьвежыя бялградзкія тэлеўражаньні. У эйфарыі: можна ж, аказваецца! Можна загнаць у кут. Можна нават скінуць узурпатара. Калі вельмі захацець, калі пастарацца як сьлед! Можна. Магчыма. Калі яны могуць, чым мы горшыя тады?! „Югаслаўскі варыянт" — гэтыя магічныя словы гучалі ў пакоі, пакуль не пачалася сходка, гучалі часта, смачна, летуценна, упэўнена, пераканаўча. Як пажаданае, якое на словах рабілася рэчаісным ужо цяпер.

— Я толькі са сталіцы. Быў на паседжаньні цэнтаркаму, — не хаваючы задаволенасьці, паведаміў сакратар ячэйкі. — Там робяць стаўку на югаслаўскі варыянт. Ужо сёньня ёсьць пазытыўныя зрухі. Ёсьць падставы для аптымізму. Як нас калісьці вучылі, нізы ўжо ня хочуць жыць па-старому, а вярхі — кіраваць. Таксама ня хочуць і ня могуць. Гэта — галоўнае. Людзі ўжо цяпер гатовыя. Але яны вагаюцца. Іншыя баяцца, пабойваюцца ва ўсякім разе. Яшчэ на нешта спадзяюцца. Але як ударацъ маразы, як ня будзе чаго есьці, бэнзын падаражэе, даляр папаўзе ўверх, цэны падскочаць. Вось тады, навёсну. Тады пабачым. Калі ўсе выйдуць на вуліцы і пляцы, рэжым будзе мусіць капітуляваць. Югаслаўскі прыклад сьведчыць, што ў нас ёсьць рэальны шанец...

— Ды перастань ты, спыніся! Чэсь, ты што — сапраўды верыш, што гаворыш? Вярніся на зямлю. Гэта ж сьмешна, гэта ж фантазёрства!

— Ты не прасіў слова.

— Пачакай. Колькі ты спадзяешся на мітынг вывесьці, га? Колькі?

— На цэнтаркаме гаварылася пра дзьвесьце тысяч, але гэта — потым, не адразу. Але

мы павінны, я абяцаў цэнтаркаму тысяч, тысяч дзесяць — ня менш. Каб як у гімне — шчыльнымі радамі. Гэта будзе генэральная рэпэтыцыя.

— Божа мой. Прачніся!

— Кожны можа мець уласную думку. Гэта не забаронена.

— Ну, дзякуй Богу, што пакуль можна.

— Зразумей: праведзеная пэўная работа. Сто тысяч улётак. У кожную паштовую скрынку. Трэба паважаць працу іншых.

— Гэтыя вашы ўлёткі — кату пад хвост.

— Кожная сям'я атрымала.

— Ня будзь такім наіўным.

— З трох-чатырох у кватэры чалавек адзін будзе згодны нас падтрымаць. А гэта...

— Каму патрэбны твае напалеонаўскія пляны?

Астатнія да спрэчкі не далучаліся. Адчувалася, што яны згодныя напалам. Разумеюць, што спрэчнік мае шмат у чым рацыю, але таксама адначасова спадзяюцца, як і сакратар, на гэты самы югаслаўскі варыянт. Часам гэтак хочацца паверыць у цуд! Як калісьці ўжо здарылася. Як раптам атрымалі часова і незалежнасьць, і ўсё астатняе. Але тады, бадай што, наадварот — ніхто і ня верыў паважна. Без надзеі, бязь веры, і нават спадзяваньняў — атрымалі ўсё, што хацелі. У сэнсе — аб чым марылі ў глыбіні душы. Зараз жа — надзеі, спадзяваньні, пляны. Дзяльба шкуры неўпаляванага мядзьведзя.

Акінчыц, які таксама сядзеў на сходцы, думаў пра іхныя ўлёткі. Ніхто ніколі не папрасіў яго прачытаць, выказаць сваё меркаваньне, падказаць. На сходках з важнасьцю зачытваліся бездапаможныя тэксты. Гумовыя, расьцягнутыя, разьлічаныя толькі на саміх сябе. Таўталёгія, графаманства. Акінчыц часам стрымліваўся, каб захаваць сур'ёзны твар.

4.

Спачатку ў куце пляцу было да крыўды, да няёмкасьці мала публікі. Сёй-той, прыезныя журналісты, якім паабяцалі купы народу, міліцыянты, якія намаўлялі разыйсьціся. Але большасьць спазьнілася, як заўжды. Адчуўшы свае памеры, грамада пацягнулася, згодна са шматгадовай звычкай, да статуі. Вялікай-вялікай, грувасткай і бронзавай. Дзіва што, яна прыцягвала магнітна, сваёю масай.

Да нечаканай радасьці публікі праз некалькіх мясцовых прамоўцаў раптам з натоўпу выйшаў вядомы сталічны дзяяч, які ўпэўнена ўзяў мэгафон і выгукнуў колькі словаў па-сэрбску. Выклікаўшы ў публіцы энтузіязм. Слабадану, маўляў, капцы. Надыйдзе чарга і нашага янычара. Ён будзе наступны...

— Нашчадкі Каханоўскага! Вітальда Цудоўнага, сьвятога Губэрта й караля Стаха! Ці ж вам баяцца і сядзець шчуркамі пад мятлою? Вымесьці ёю трэба вашага Гуркова зь ягонай плютакратыяй! Жалезнай мятлою! На сьмецішча гісторыі. Зь іхным калгасным гербам, зь іхнымі лёкайскімі тварамі! Усіх кухарак — назад на кухню. Хай капусту гатуюць, а не каля дзяржаўнага стырна замінаюць!

— Яны нагатуюць! — са сьмехам адказала грамада.

— Нічога! Хай успамінаюць, хай вучацца, калі забыліся. Нам такія дзяржаўнікі ў двукосьсі не патрэбныя! Якія і капусту ўжо ня ўмеюць, і кіраваць не навучыліся! — Апошнія словы выклікалі новую хвалю эмоцый. Сярод публікі пачуліся выгукі, сьмех, сьвіст. Нават галёканьне.

Сталічнік прывез з сабою купу замежных журналістаў з тэлекамэрамі і вялізнымі мікрафонамі, каб паказаць тутэйшы Бялград, тысячы і тысячы незадаволеных рэжымам. Мясцовыя і ганарыліся, і раўнавалі разам. І паслухаць госьця цікава, і самім хацелася выступіць, надта ж рэдкімі сталі нагоды. Мы, канешне, па-сэрбску ня ўмеем, гаварылі паміж сабою потым, але па-польску сказаць можам. Хаця запомніць два-тры словы ўвогуле няцяжка. Капцы — Слабадану сёньня, нашаму янычару — абавязкова заўтра. Элемэнтарна! Наступныя таксама не абыходзілі ўвагай бялградзкі акцэнт, бо кожны загадзя абдумваў гэты козыр, рыхтуючыся да выступу.

— Мы прасілі ва ўладаў дазволіць мітынг, каб сваю салідарнасьць выказаць зь югаслаўскім народам. Які змагаецца супраць дэспата свайго. І што яны нам адказалі? Ідзеце на задворкі, там і мітынгуйце сабе. Гэта ўсё адно, што паслаць, прабачце, на тры літары. Мы прасілі дзе — не на пляцы нават, за палацам чыгуначнікаў у сквэры. Там, дзе наш янычар выступаў у прэзыдэнцкую кампанію. Яму ніхто не забараняў. А як усеўся зьверху, на нашу шыю, дык цяпер нам забараняе. Ды мы жывем тут! Падаткі плоцім! Хто нам можа забараніць — дзе зьбірацца?! Калі гарадзкая ўлада не дае, дык мы прыйшлі пад яе вокны!

— У-у-у! — ухвальна-радасна абазваўся пляц.

— Хай трасуцца там, як трусы! Хай трымцяць! За вокнамі сваімі патройнымі. Паставілі сабе шклопакеты, каб нас ня чуць. Нічога!

Пачуюць! Як пасьля Мілошавіча прыйдзе чарга да нашага узурпатара!

— Правільна! Далоў!

— Хай пачынаюць лічыць дні да дэмбелю!

— Тутэйшыя! Дзе вашае Магдэбурскае права?! Дзе Liberum veto?! Узьніміце свой голас супраць! Супраць несправядлівасьцяў, якія чыняцца гэтымі, што зачыніліся ў сваёй вялікай шэрай будыніне! Раней гэта быў гаркам, а цяпер — што? Ім напляваць на югаслаўскі народ, на сэрбаў. Ім галоўнае — рэжым. Такі самы, як у нас. Ня лепшы! І ў горадзе нашым рэжым пануе ўзурпатарскі. У кішэні ні граша, а ўсё робіцца навокал — паглядзеце! Адкуль грошы? — вы мяне спытаеце. Выбіваюць сілай зь людзей, прымушаюць, гвалтам. Плаці, альбо ня будзеш працаваць. Гэта як нейкія акупанты. Задушылі спачатку падаткамі, цяпер паборамі душаць. Мы думалі — капцы эканоміцы камандна-адміністрацыйнай. А яна жывучая — як халера, як пустазельле.

— Так! Далоў іх! Прэч! — сьмех напалову з абуранымі галасамі быў адказам з пляцу.

— Яны яе толькі ўдасканалілі ў нашым горадзе. Што ніякім генсэкам ня сьнілася! Я вас заклікаю! Я вам прапаную. Клікаць сюды — на Бацькаўшчыну — дзікае паляваньне караля Стаха. Хай адпомсьціць здраднікам, янычарам, якія прадалі нас, прадаюць кожны дзень за чачавічную пахлёбку. За гэтую поліўку, якую яны сёрбаюць з карыта, адпіхваючы адзін аднаго. Ганьба!

— Гань-ба! Гань-ба! — адказалі сотні глонавак.

Акінчыц стаяў убаку і ўяўляў, як уяжджае на пляц конная кавалькада. Шэра-белая, у смузе. Як вершнікі злавесна моўчкі пагражаюць зброяй мёртвым вокнам змрочнай установы, якую, выставіўшы грудзі наперад, спрабуе абараніць бронзавая статуя.

Потым нехта з рупарам прапанаваў сабраным не разыходзіцца, а прайсьці па вуліцах калёнай, каб прадэманстраваць схаваным у дварах міліцэйскім сілам, што яны не баяцца іхных друкоў і шчытоў, ды ўсіх астатніх фальшывых кляйнотаў.

Выцякаючы з пляцу, калёна трапляла пад вокны яшчэ большага шэрага гмаха — роднага дома яшчэ большай лічбы чыноўнікаў.

— Ганьба! Ганьба! — выдыхнула зь сябе абурэньне грамада. Ажно шыбы дробна затрымцелі.

5.

Такі горад і столькі дэманстрантаў. Дзе астатнія? — у думках меркаваў Акінчыц. Улётка́мі, калі верыць, засыпаны ўвесь горад. У кожную паштовую скрынку паклалі. Так, але потым яны будуць даказваць, што ўсе памыляюцца, асабліва журналісты, што каб ня дзялкі, капаньне бульбы, амаль палова гораду прыйшла б паслухаць прамовы.

Аднойчы — узгадалася — ён пайшоў на павадку, паведаміў, што быццам бы амаль тры з паловай тысячы прысутнічала, як хацелася арганізатарам. Адзін увогуле ў мікрафон сказаў, як хвалько — што вас тут пяць тысяч, выклікаўшы радасныя воплескі. Сорамна стала Акінчыцу, калі пачуў іншую — меншую лічбу, увогуле сьціплую, прачытаў у газэтах. „Дурань! — вінаваціў ён сябе. — Паслухаўся! Знайшоў каго слухаць! Пражэкцёраў".

Яны — мітынгоўшчыкі — заўжды чапляліся да яго за лічбы. На сходках сваіх. Да яго раз-пораз даходзіла. У вочы самому не гаварылі ніколі. Баяліся? Крывадушнічалі? Папросту ў яго быў аўтарытэт. Але, тым ня менш, бяз пошукаў ворагаў яны не маглі. Ужо раней даходзіла — на каго, маўляў, ён працуе, ці не на рэжым, калі ўвесь час замяншае нашыя лічбы? Мы стараемся, а ён зьмяншае, перакрэсьлівае працу! Акінчыц ужо стаміўся ад гэтага, махнуў рукой. Яны заўсёды паміж сабой раіліся і дамаўляліся — колькі паведамляць? Але — каб аб'ектыўна. Наколькі магчыма. Бо хто падлічыць дакладна? Часам спраўджаў свае дадзеныя зь міліцэйскімі, у іх існуе сыстэма падліку.

Міліцыя ўсё заніжае спэцыяльна! — ледзь не лямантаваў нехта на сходзе. Заніжае? Канешне, калі ў сталіцы зьбіралася з усяе краіны дваццаць ці болей тысяч, а „скрынка" хлусіла, што дэманстрантаў было ўдзесяцёра меней — з гэтым усё ясна. Але вось каля статуі ва ўгодкі гарматнага стрэлу сабраліся матэрыялісты-ўтапісты. Калі апошні раз, днямі. У міліцэйскай зводцы было — каля двухсот чалавек. І так было насамрэч. Ніхто ж лічбу не завышаў — толькі таму, што сьвята „дзяржаўнае", і што айцец гораду ў мікрафон абяцаў дзядам цяпло ў кватэрах, па бясплатным мяху бульбы, аднаму вэтэрану мэдаль прышпіліў ці ордэн. „Узнагарода знайшла героя праз 55 гадоў!"

Акінчыцу затэлефанавалі ў прызначаны час. Пасьля заканчэньня шэсьця — праз дваццаць пяць хвілін дакладна. Часу пісаць амаль не было. Хто ж ведаў, што ўсё зацягнецца! Акінчыц, хуценька зрабіўшы каву, пісаў на „аўтапілёце". Пасьпеў! Як заўжды, зрэшты. Што

яны ведаюць пра гэта? Прыдумваюць усёй гурмою адну ўлётку цэлы тыдзень, потым столькі ж спрачаюцца і робяць праўкі. Сьцісла, канцэнтравана, хутка! Ім гэта невядома. Аматары, дылетанты, саматужнікі. Іх ён гэтак ніколі раней не называў, толькі цяпер. Стараўся шанаваць іхны энтузіязм з ахвярнасьцю.

Яны, яны ж наадварот. Як тыя самыя кухаркі — кіраваць дзяржавай, яны палічылі, што здатныя на ўсё, Бога за бараду ўхапіць. Яны вымушалі Акінчыца называць іх у душы ўласьцівымі іхнымі імёнамі. Недарэкі, пражэкцёры, проста хамы. Я ўсё жыцьцё, столькі год займаўся тым, што сьцісла і хутка адказваў на пытаньні — што? дзе? калі? Мяне гэтаму вучылі пяць гадоў! Я болей нічога іншага ладам і ня ўмею рабіць! — размаўляў сам з сабою ў думках Акінчыц. — Значыцца, прафэсіяналы — нішто, не патрэбныя, самі з вусамі?

Тады, пасьля мітынгу, як дамоўлена было, ён падрыхтаваў тэкст, але яны размаўлялі з мадэратарам. Яна задавала пытаньні, Акінчыц адказваў. „З дваццаці месцаў — адно і тое ж, слухачы папросту ня вытрымаюць, — казала яна. — Трэба хоць нейк уразнастаіць. Ці быў у вас хтосьці з цэнтаркаму?" „Так, быў", — пацьвердзіў Акінчыц і сказаў пра сэрбскія словы. Потым яна выразала што ёй спатрэбілася. Небарака Акінчыц! Ён стаў адразу іхным ворагам, сам таго ня ведаючы. Ох, ужо гэтыя слухачы-чытачы. „Савецкі чытач самы ўважлівы і патрабавальны ў сьвеце!" Божа мой, нічога не зьмяняецца...

Ён жа іх не крытыкуе, што яны самыя сапраўдныя аматары, што не ідуць на заводы, баяцца, што ня маюць уплыву сярод рабочых, без чаго нічога ня будзе. Ён не крытыкуе, што ўжо дзесяць гадоў яны зьбіраюць на свае мітынгі аднолькавую колькасьць. Лічба не расьце! Хоць тоны паперы зьнікаюць у паштовых скрынках. Ён таксама хацеў бы, каб пляцы запоўніліся. Але ён гэтым не займаецца. У яго няма палітычных амбіцый. Гэта не ягоная дзялка. А яны, наадварот, хацелі, прагнулі. Што, аказаліся кепскімі танцорамі? Дык шукаць сабе вінаватых кінуліся? Журналісты сваё робяць, газэты выходзяць, хоць іх душаць, радыё гучыць. Але журналісты іх не чапаюць. Дзеля салідарнасьці, дзеля павагі да ахвярнасьці ці што. Да энтузіязму. Аднак гэтага ўжо замала, замала! Афіцыйныя рупары выліваюць на самавукаў цэбары бруду, і яны страцілі арыентацыю, яны ня бачаць, яны пачалі цаляць у тых, хто іх абараняе і падтрымлівае. Што яны ведаюць пра перасьлед, напады, закрыцьцё, месяцы бяз працы, пра зьнікненьне журналістаў?

Яны вырашылі зьнішчыць яго. „Робяць захады, каб яго замянілі кім-небудзь іншым, — як паведамілі яму сябры. — Нам патрэбны іншы, як у Кутне. Там адзін чалавек выйдзе з плякатам, а карэспандэнт гэтак паведаміць, што ўся рэспубліка зайздросьціць. А ў нас такая магутная акцыя, а ён — суха, без эмоцый, называе мала..." Мышыная валтузьня Акінчыца ўжо не зьдзіўляла. Яго абурыла іншае. Гэтая ідыёцкая прага нашкодзіць яму і наіўная самаўпэўненасьць. Яны думаюць, што яго галоўны абавязак — асьвятляць іхную дзейнасьць. А самі не чытаюць і як сьлед ня слухаюць. Адзін пачуе скрозь гуд радыёглушнікаў нейкі ўрывак і — пачынаецца пераказ — як у сапсаваным тэлефоне. Узялі б і зазірнулі ў Інтэрнэт, іхныя акцыі займаюць мізэрную частку. Яны ўявілі, што жыцьцё, увесь сусьвет нібы сьцяліся да памераў іхнага памяшканьня, іхных сходаў і спрэчак.

Акінчыц заўважыў апошнім часам, але не надаў увагі. Дарэмна. Увагі таму, што сакратар ячэйкі стараецца схаваць ад яго зьвесткі, амаль нават па-мэнтарску тлумачачы, ты павінен сам шукаць інфармацыю, мець свае крыніцы, гэта твая праца... Стрыманая інтэлігентнасьць не дазваляла Акінчыцу ставіць на месца у патрэбных сытуацыях іншых. „Што ж, хай буду браць у міліцыі пра вас усё, але не пашкадуйце толькі", — адказаў ён аднойчы. Яны яму зайздросьцілі. Ён гэта разумеў. Лічылі, што ён, увогуле рэпарцёры кормяцца зь іхнай рызыкі. Ён гэта таксама разумеў. Але ён ніколі не цярпеў капрызьлівых прэтэнзій у стылі савецкіх прадаўцоў — „Станьце на маё месца!"

Яны кусаюць сабе локці, але як мазахісты рэгулярна глядзяць „Санацыю" — перадачу асэнізатара рэжыму Зэелоўскага. Замест Кашпіроўскага, які калісьці зьбіраў ля тэлевізараў усё насельніцтва. Але той як-ніяк супакойваў, злагоджваў, набліжаў да нірваны, быццам бы загойваў пісягі. Гэты ж распаляе, разьятрывае. Прычым аднолькава — як праціўнікаў рэжыму, так і прыхільнікаў. Выклікае і замацоўвае масавую істэрыю, нянавісьць. Псыхоз. Небясьпечную эйфарыю. Утрывальвае, робіць станам душы, прычым жаданым, як наркатычнае ачмурэньне. Усё адно што нанюхацца, нашпрыцавацца, накурыцца да дурноты, да ванітаў. Хваравітая залежнасьць.

Ніхто зь іх не задумваўся, але Зэелоўскі быў па-сутнасьці найлепшым журналістам для ўсіх, каго прыцягвала яго заечая губа, як пашча кобры — трусоў. Яму было добра вядома, што публіцы падабаецца, калі забіваюць быка, калі засмажваюць на вогнішчы або хаця б кагосьці высьмейваюць, прыніжаюць, лаюць, абліваюць памыямі.

6.

З-за рогу турмы ўбачылася частка разьлеглага Сацыялістычнага пляцу з гайнікам перад касьцёлам. Поўна паляўнічых у плямных мундзірах. І паміж дрэў, і на тратуарах, і з машынамі. За дзесяць хвілін Акінчыцу пад сакрэтам сказалі, што ў гайніку парт'ячэйка ладзіць пікет. „Па дазвол не зьвярталіся", — не бяз гонару паведамілі пры гэтым. Ён кінуў усё, засьпяшаўся. Клясычны сакрэт полішынэля. У розных частках гайніка Акінчыц убачыў таксама знаёмыя постаці. Хто пакурваў, хто старанна ствараў уражаньне, што чакае тралейбуса. Хто трымаў у руцэ газэту, хто разгорнутую — перад вачыма. Каляжанка, якая стаяла з мужчынам, сказала, што міліцыянты пільна за імі назіраюць.

На касьцельным гадзіньніку было каля чвэрці на сёмую. Акінчыц, агорнуты скептычным настроем, збочыў на старасьвецкую Сацыялістычную вуліцу, хоць і пешаходную, але па якой шнуравалі міліцэйскія „казлы" зь лямпачкамі. Зьдзіўленьне не пакідала Акінчыца. Спаткаў маладзёнаў, якія вярталіся з канца вуліцы. Хадзілі распачаць пікет тамака, але міліцыянты праехалі за імі сьледам і цяпер ехалі назіркам. Якісьці татальны кантроль, — яшчэ раз зьдзівіўся Акінчыц і з пачуцьцём амаль выкананага абавязку пайшоў далей, у краму і дахаты. Але яго спыніла наступная група кансьпіратараў.

Раней ён сутыкнуўся зь імі за турмой, па дарозе на пляц. Яны, аказваецца, хадзілі мудрагелістым маршрутам, адцягваючы ўвагу міліцыянтаў і, быццам бы, уводзячы іх у зман. Цяпер яны вярталіся на пляц, у гайнік, каб працягнуць гульню ў кошкі-мышкі. Акінчыц не хаваў крыху іранічнай зьдзіўленасьці. Гэткай міліцэйскай масавасьцю на пікеце і адсутнасьцю завадатараў. Штосьці яшчэ можа адбыцца, сказалі яму і паўторна завабілі ў гайнік. У двух месцах па-ранейшаму дзяжурылі міліцэйскія двойкі-тройкі. Партыйцы сталі купкай пасярэдзіне, па суседзтве з камуфляжнымі мундзірамі. Зусім навідавоку. Акінчыц пастаяў убаку, падыйшоў да музычнага шапіка на прыпынку, каб меней кідацца ў вочы. Зрэшты, яшчэ калі ён вярнуўся на пляц, пачалі запальвацца жоўтыя фары машын. Неба ператваралася ў густа-сіняе, імкліва цямнела.

Змарнаваны вечар. Хіба што адзін зь імітатараў расказаў пра сонечную актыўнасьць. Толькі распачалася новая фаза. Гэта не магло не паўплываць на актыўнасьць і рашучасьць сэрбаў. Гэта на ўсіх уплывае. „Глядзі, колькі ў канцы тысячагодзьдзя катастроф, прыродных катаклізмаў, аварый, колькі зь людзей сыходзіць энэргіі — алімпіяда сыднэйская, колькі агрэсіі — бойкі ў Празе, у сэктары Газа, колькі ўсякай трасцы здараецца гэтай восеньню! А колькі самалётаў упала! Як ніколі... Югаслаўскі варыянт магчымы ў нас летам, — падсумаваў адзін зь няяўных пікетчыкаў. — Калі толькі здолеем, інакш, наадварот, гадоў на 26 — згодна з сонечным цыклам, можа замацавацца тое, што ўжо ўсталявалася. І — не відаць свабоды, не відаць дэмакратыі, як сваіх вушэй". „Нішто сабе — аптымістычны прагноз, — падумалася Акінчыцу. — Затое бяз звыклых ружовых акуляраў".

Потым ужо адзін з вымушаных удзельнікаў вечаровага спэктаклю іранічна патлумачыў: абзванілі чалавек сорак — прыходзьце на пікет, хто можа. На недазволены. Вось і прыйшло міліцыі болей, чым удзельнікаў. Спадзяваліся, што як увесну — пастаялі сабе, ніхто не зачапіў, ніякай міліцыі не было. А цяпер — не. Давайце, кажу, калі ўжо прыйшлі, дык разгорнем плякат. Не — пахапаюць! А нікому ня хочацца ў кайданках ды начаваць на нарах. Адзін дэкляруе: давайце я зраблю „лятучы пікет" — паеду па прыпынках на машыне, раздам улёткі, а вы ўвагу адцягвайце. Цырк на дроце! Вось табе і „сёньня Слабадан, заўтра — Янычар".

Змарнаваны вечар, Акінчыц нават у краму спазьніўся. Прыйшоў дахаты, уключыў „скрынку", а там Янычар, ачомаўся пасьля першага спалоху. Я, кажа, як Слабадан у бункеры хавацца ня буду, не дачакаюцца. Я ім пакажу югаслаўскі варыянт!

12-15 лістапада 2000

Міра Лукша

* * *

кароткі час стагодзьдзяў
ня стыне
прыскам варушыцца
ў маіх вуснах
галушка пярэпалахаў
сеяных маёй
малой прабабкай
слова бярэзіны
што вырасла
на яе даляглядзе

а наўкол
загоны
у пояс сагнёны
кругагляд каласоў
дзіця пад плахтай
называе маё імя
зь перапёлкай

* * *

кароткі пацер сьпешлівых вуснаў
перад душою браму зачыніць
каб
не ўцякла яна ў пяткі
каб не хадзіць мне з душой на плячы
каб сьвет не заўважыў
а
што сьвету да таго што мокра й мулка душы
што душа без пальчатак хапае агонь і сьцюжу
гэта ж і нецікава яму
іншая справа калі б мяне паказвалі на экране
на старонках каляровых бабскіх часопісаў
калі б я чалавек быў публічны
і брудныя майткі душы можна было б узьняць як сьцяг
як плахту на быка на карыдзе
бязбожнікаў праведнікаў
і нават выклятых паэтаў
хоць бы з прычыны
нетрадыцыйнай сэксуальнай прэфэрэнцыі

а мая душа сядзіць на маім плячы
і ў вочы тваёй глядзіць
а мы баімся зірнуць адно на адно

Дзедаў сад

Садзіў дзед сад.
Як дрэўцы, што садзіў іх, малады.
... Ці помню?
Я ўся ёсьць успамінам,
Як цень ад хмары, што плыве на ўсход,
усё вечна, па-над нашым домам,
што ставіў дзед, стагодзьдзя сьведка.
Спляло карэньне дрэў
Пракопавы чыгун,
кавалак Янава плуга,
жалезіва ад ровара і санкаў,
відэлец алюміневы Тэклі,
шматок сукенкі Любы,
гузік счарнелы Мітруковае кашулі,
грош што згубіў Іван у пахмельлі.
І блекла кожны год цвітуць нарцыс,
лілея пахкая, цюльпан і ружа.
Старэе сад у одуме ў атачэньні сьліваў.

Забуду сад і я,
і сад мяне забудзе.
Пакіну сад і я,
і сум сабе пакіне сад.

Па асфальце ступаюць людзі.
На сьцежцы каменьчык закоціцца ў сандаль
камусьці, каб прыстаў за плотам
і дрэва ўбачыў,
зь якога яблыкі ў вочы ўсё глядзяць
і выглядаюць тых хто ёсьць
у вечнасьці ўсёбачнай,
адкуль раса, сьляза і пот касца.

Астаўся сад на картах
там і будзе,
калі падступіць пушча пад паркан.
Груша сьлязою захлынецца.
Антонаўка ўдарыцца ў зямлю.
Кроў выступіць як сок на камені,
і пусьціць парасткі парог
нашага дому.

Сяржук Сокалаў-Воюш

Знак

Бомнулі званы на Сьвятой Сафіі. Рэхам перагукнуліся са званамі Сьвятога Францішка і Сьвятога Антона.

Пад заплюшчанымі павекамі яшчэ трымцелі сонечныя блікі на Дзьвінскіх хвалях, па якіх крочыў чалавек у доўгай сутане. Праз хвілю ён апынецца на беразе, і тады нашыя позіркі — ягоны відушчы і мой заплюшчаны — сустрэнуцца. Хто гэтым разам перапыніць мрою, якая безьліч разоў узьнікала ў сьвядомасьці яшчэ зь дзяцінства і ніколі нічым не сканчалася?

Раптоўны подых ветру, стракатаньне коніка, плёскат рыбы, ці, як найчасьцей, няўдала абранае месца... Ён заўсёды ішоў насустрач, а выходзіў за колькі крокаў, і гэтага было дастаткова...

Чалавек у сутане лепш ведаў Полацак, і Дзьвінскія берагі былі для яго меншай загадкай, ніж для мяне. Ды й мэта ягонага прыходу, відаць, што раз была іншая.

Ізноў бомнулі званы. Няшчыра, фальшыва, стратна...

Я расплюшчыў вочы. Вуліца была незнаёмая, але вядомая, а званы гэткія самыя, але іншыя, бо чужыя. Я не зразумеў іхнага голасу, іхнай мовы, а яны ня ведалі пра маю мрою...

На тым баку вуліцы — касьцёл Сан Франчэска, за пяць агранцаў за сьпінаю — Санта Сафія, і недзе далёка зьлева, невідно але адчувальна, базыліка Сан Антоніё на П'яцца дэль Санта.

Гэтым разам мы абавязкова мусім сустрэцца... Прастора рыхтавала гэтае месца для ягонага прыходу і старалася запоўніць сябе прадвесьцямі. Атрымалася ўсё як дома і зусім ня так, бо полацкія месьцічы змуравалі Сафію па-свойму, а царкву сьвятога Антона пры манастыры Францішканаў і наагул ад пачатку зрабілі драўляную.

Пяцьсот гадоў таму я спазьніўся на сустрэчу і цяпер усе спадзяваньні толькі на ўдалы выбар месца. Там, у Полацку, ён меў перавагу, тут, у Падуі, мы аднолькава не свае.

Я ўпэўнена зьвярнуў налева і пайшоў па вія Сан Франчэска да палацу дэль Бо. Прадчуваньне хады сьлед у сьлед і веда, што сьлед чалавека ў сутане на гэтай вуліцы ёсьць, фарбавалі шлях сонечнымі блікамі на буйных кроплях дажджу.

„Dotto-o-ore! Dotto-o-ore! Dot-to-re! Va 'ffa 'n culo..." З унівэрсытэцкай брамы высыпала на вуліцу грамада, наперадзе якой вялі босага маладога чалавека зь вялікім як у Дантэ бабковым вянком і ў доўгім ніжэй каленяў споднім. Яшчэ адзін дантаў вянок, перавіты чырвонымі істужкамі, пышыўся на шыі.

Сябры новасьпечанага дакторэ сталі ручайком, і той сагнуўшыся задаволена даў нырца ў ваду перажытага і пражытага. На сьпіну яму са звонкім пляскатам пасыпаліся разарваныя брамы рук-берагоў, а вольныя рукі пачалі секчы па голых лытках хвосткімі дубчыкамі. Не пасьпеў шчасьлівы пакутнік вынырнуць на паверхню, як іншыя сябры падхапілі яго за рукі і борзьдзенька прывязалі да сьпіны крыж, які іначай як сагнуўшыся, несьці было немагчыма.

„Дотто-о-орэ, дотто-о-орэ" — загула грамада і падганяючы крыжавалока рушыла некуды ў бок п'яцца дэльле Эрбэ...

Ручаёк. Бабковы вянок. Дубчыкі. Прыцягальныя прыкметы зманнага сьледу... Водгульле даўна забытага крывіцкага звычаю.

Там, дома, за чалавекам у сутане была брама Віцебскай вежы. Ён спусьціўся з Замкавай Гары, перайшоў мост і пакрочыў праз Запалоцьце. У дуброве за пасадам ужо палыхала вогнішча. Хлопцы ў дубовых, а дзяўчаты ў кветкавых вянках і ўсе ў доўгіх ільняных кашулях скончылі карагоды, пабраліся за рукі ў пары і пасталі водгульлем замкавай брамы

руча-руча-ёк-ёк

руча-руча-ёк-ёк

нырэц мусіў выбіраць хутка, іначай крапівіны з вольнай рукі на беразе стракалі ня толькі лыткі. А на канцы ўжо — каму як:

каму — крыж

каму — шыш

каму — кыш

каму — паміж...

Я прыбег захаканы і змарнелы, калі брамы дый самога замку ўжо не было, ручаёк расьцёкся, а вянкі крывіцкіх Дантэ падхапілі дзьвінскія плыні. Гарэзьлівы палымок яшчэ скакаў па галавешках і бесклапотна падмірг-

ваючы выкрасаў зь іх шэры а сіні дымок. Чалавек у сутане сыйшоў...

Прастакутны ўнівэрсытэцкі двор палацу дэль Бо прытоена маўчаў. Ніхто і нішто ў сьвеце не раскрывае сваіх таямніцаў ад шчодрасьці. Гнятлівае адчуваньне, што яго тут не было, а няўдалы выбар месца стаўся ўзьнёслым звычаем, пачало зьнікаць на галерэі другога паверху, калі ля дзьвярэй, што ў правым дальнім ад уваходу куце, замігцеў вершнік — адвечны знак нашай прысутнасьці ў гэтым сьвеце. Гэтым разам ён быў без шчыта, але я адчуў бы яго нават тады, калі б ягоная рука зь мячом апусьцілася перад чарговым замахам, альбо стомлены ад вечнага гону конь пусьціўся на самапас у зялёныя мурагі. І гэта зусім няйстотна як прачытаюць напісанае пад вершнікам:

Joannes Crevt 2
Schiltachensis
moravvs

геральдысты. Ці гэта будзе Янка Крэўт, ці Ян з Крэва, ці Янук Крывіч... Нават, калі гэта будзе ня тое, ня гэта, а й ня іншае, нават калі некаму заманецца прачытаць у гэтым адно з найменьняў Ярылы — Ян Ксьціцель, знак застанецца знакам...

З унівэрсытэцкай вежы чалавечымі вачыма пазірае Сонца дрэварытаў чалавека ў сутане. Сонца, якое тут ніколі не перакрые паўмесяц... Пакуль двор пусты, я апынаюся паміж двух Францішкаў. Адзін — там, на шыльдзе зь беларускім надпісам, на першым паверсе ўнівэрсытэцкага калідору, а другі — недзе за дзьвярыма, ля якіх скача вершнік. Я гляджу Сонцу ў вочы і не пасьпяваю загадаць жаданьне... Двор запаўняецца людзямі, і цяпер ужо немагчыма зразумець — паміж кім і кім апынуўся ты ў гэтай разнамоўнай пярэстай грамадзе.

Дзьверы „ля вершніка" адчыняюцца... Недзе там, у колішняй актавай, а цяпер зале сарака, фрэска Джакама Форна. Знаны італіец наўрад ці ведаў асаблівасьці крывіцкага твару, і таму намаляваны чалавек у сутане зусім не падобны да назіркам знаёмага мне аблічча.

„Але хворма галавы ваша," — кажа Джакама.

„Аж занадта," — адказваю я.

Лысаваты, з тонкімі вуснамі і простым носам, чалавек у доктарскай мантыі чорнымі кропкамі прыплюснутых вачэй безудзельна глядзіць паўз надпіс RUTHENO, зьмешчаны на ўзроўні скошанага назад ілба.

„Гэтае слова", — пачынаю я і заўважаю, што Джакама будзе маўчаць... Варта было адмераць тысячы кілямэтраў дасюль, каб пачуць гэтае маўчаньне... Беларус ня можа намаляваць італійца і ня выявіць у ім хаця б крышачку беларуса. „Понежэ от прыраждзенія... знаюць ямы свая... чуюць віры свая... бароняць ульев сваіх". А тут — італіец...

Італіец.

Раптоўны парыў ветру жмакнуў хмары, і першыя кроплі цяжка ўпалі на падсохлы асфальт. Заставацца пад скляпеністым геральдычным небам дэль Бо — дальбог не хацелася. Я перабег вуліцу і апынуўся пад дахам невялічкай ціто каплічкі, ціто альтанкі на дзьвюх калёнах і двух некалі прысьценных слупах, пасярэдзіне якой стаяла труна...

Той, хто ляжыць пад цяжэзным каменным векам, быў некалі вугорскім жаўнерам. Ягоныя парэшткі знайшлі, калі Новы Час пачаў мераць другі тузін стагодзьдзяў. Амаль столькі ж места існавала ў Старым Часе. Але тубыльцы вырашылі, што знойдзены вугорац і ёсьць славуты тут Антэнорэ — герой Траянскай вайны і заснавальнік Падуі. Прайшло яшчэ паўтузіна сотак і гэтага часу сталася досыць, каб чужынец прыняў сваё новае я.

„Бачыш, Джакама? Ты вырашыў маўчаць далей..."

„Guarda come passi: va sì, che tu non calchi con le piante le teste de' fratei miseri lassi".

„Даруй. Я ведаю, як балюча бурацца легенды і таму, каб не балела заўтра, шукаю сёньня. Усеагульныя законы кладуць раўналежнікі. Калі чалавек у сутане прыходзіў сюды, Антэнорэ яшчэ чуў адгалоскі сваёй мінуўшчыны. Калі сюды прыйшоў я — ён нічога не зразумеў і толькі пры слове Вугоршчына цяжка ўздыхнуў і сказаў: „Прыгожае слова", але нават паўтарыць яго ўжо ня змог".

„І ты даруй," — адказаў сумным позіркам мастак, і мы пакрочылі кожны ў свой дождж...

Раптоўны вечар нечакана выбухнуў Сонцам і вярнуў на зямлю мокрыя ашкалёпкі веснавога дня. Барвянымі пісягамі паласнулі па хмарах-уцекачах промні. Гэткім самым, толькі восеньскім вечарам ішоў тут некалі да храма вершніка — каплічкі Сан Джорджа — чалавек у сутане. Сёньня гэтую дарогу можна прайсьці амаль нацянькі — праз Прата дэла Вале — пляц зь невялікім і досыць брудным абручом каналу, вакол якога ўдзячныя нашчадкі паставілі 80 статуяў вялікіх падуанцаў. Тады гэта была звычайная забалочаная мясьціна са сьлядамі тэатру Дзаіро з часоў рымскай імпэрыі.

Чалавек у сутане пайшоў вакол, але ўсё адно прыйшоў да каплічкі першым. Я бачыў,

як ён стаў на калені, і пасьпяшаўся зрабіць тое самае.

Ярылавы промні наўсьцяж шугалі над малітоўняй Сан Джорджа, які ў абліччы Сьвятога Георгія-Юр'і ляцеў у імклівай пагоні над гэтай чужой зямлёй, каб дагледзець сваіх падданых, што воляю лёсу пакінулі на нейкі час абшары далёкай а блізкай Бацькаўшчыны.

„... в добрых дзелах і в любві отчыны ня толіка жоны, но і мужы насьледавалі і всякага тружанія і скарбаў для паспалітага добрага і для отчыны сваея не лютавалі".

Калі думкі вярнуліся на зямлю, таго, за кім ішоў, у капліцы ўжо не было...

На вуліцы мне здалося, што знаёмая сутана мільганула на рагу вія Орта Батані, і я прысьпешыў хаду. Вядома ж, гэта сад. Батанічны сад, у нэтрах якога мусіць быць ставок са статуямі пораў году, над якімі ўзвышаецца Салямон. Як я адразу не здагадаўся пра гэтае месца!

Заміж рэдкіх, рэліктавых расьлінаў чалавек у сутане глядзеў на немаведама адкуль занесены ў гэтае месца звычайны цмен-імартэль...

— Доктар Францыска! — неспадзявана сарвалася з маіх вуснаў.

Ад нечаканасьці чалавек уздрыгнуў, на момант зьнерухомеў, а затым спакойна і ўважна пагледзеў мне ў вочы:

— Францішак...

Канвой

Прагная зрэнка пачарнёнай рулі ўтаропілася ў халодны пясок. Яшчэ якіх паўгадзіны, і нагрэтае паветра затрымціць, забруіцца над гэтай пустэльнай роўнядзяй і шэра-брунатныя горы стануць прывідамі.

І тады ўжо няма сэнсу ўзірацца ў далеч, дзе цяпер праз кожную сотню крокаў навокал і ўздоўж дарогі выразна чарнеюць постаці ў бронегарсэтах.

Пясок. Горы. Рулі. Чорныя Беларускія магеркі — шапкі фараонаў, ператвораныя ў пранцускія ахоўніцкія барэты з чырвонай паласой праз верх — ад ілба да патыліцы.

Адсюль, з горкі, дзе я стаю побач з маўклівым арабам, добра відаць чорная стужка дарогі, на якой зьбіраецца канвой: легкавікі, фургоны, аўтобусы. Трэба ехаць. Зрэнка аб'ектыва ловіць суседа й на момант два вокі цывілізацыі сустракаюцца позіркамі... Наўспружаныя куркі... Наладаваныя набоі... Замкнёныя нэрвы... Ён азіраецца, апускае рулю і тлумачыць знакамі: хутчэй.

Я забіраю яго з сабой, а ён, нават ня глянуўшы мне ў сьлед, працягвае сачыць далягляд. Ужо з вакна аўтобуса я бачу, як адлегласьць учарняе на ім зялёны бронэгарсэт.

Дарога ня йдзе ў горы але паміж, бо тут не гара да Магамэта, а й не Магамэт да гары... У кожнага свой шлях, свая мяжа, свае пераходы, хаця й тая самая каляя... на сёньня.

Вялікі Ра бязьлітасна спапяляе гэты куток. Ён не карае, ён ахоўвае свае тысячы пірамідаў, і чалавек імкнецца як найхутчэй высьлізнуць з аманімічнага сьвету, які наўрад ці можна змагчы паасобку. Слабая йстота нарадзіла караван для тубыльцаў і канвой для прыхадняў. Раз, два, тры... Апошняя піраміда-гара. Ра-ро, ра-ро — рокашны розгалас роўнядзі, на якой сям там ужо пракідаюцца расьлінкі, а паабапал дарогі ізноў зьяўляюцца зялёныя а чорныя бронегарсэты.

Амон. Добра, што тутэйшыя ня ведаюць беларускага значэньня гэтага слова. У гэтай зямлі свой Амон, зь якім яна прайшла стагодзьдзі свайго шляху. Часам тут малявалі яго з галавой барана, і гэта было добра. Але мы на іншым рубе шматаблічнага кварцавага люстэрка.

Сукрыты, патаёмны, захаваны, нябачны, няўгледны, невідочны Амон і адкрыты, растоены, выяўны, бачны, выразны, відочны Ра. Амон-Ра. Апошні — радня нашага Роду — тая самая асоба на кварцавым рубе. Ра-ро, ра-ро — рокашны голас нізінаў і лугавінаў, безьмеж крокаці, якую мы самазьнішчальна аплявалі балотам: „багна, куп'ё — чортава харкавіньне," — нашэптвае паданьне. І нікому ня спала на думку назваць сухія выспачкі роднага раздолу аазісамі. Дзякуй богу — вылезьлі, перадыхнулі, абсохлі і зноў у твань.

Стагодзьдзямі мы так і ня здолелі ўзьнёсла прыстасавацца да сваёй жыцьцёвай прасторы.

Жардзіністы араб у белым турбане пакідае сваю сядзібу, свой рукатворны аазіс, адгароджаны ад пустэльні высокай сьцяной — абярэгам для пальмаў і кветак, бо араб без пустэльні — не араб. Ён думна гойдаецца паміж пірамідамі гарбоў свайго гэткага самага жардзіністага вярблюда.

Я люблю яго за ягоных папярэднікаў па абжытай прасторы, якія несьлі хвалу Амону-Ра;

люблю яго за ягонае мусульманскае сёньня: за кірмашовы спрыт і пустэльную разважлівасьць, за створаны і дагледжаны собскі аазіс — аазіс свайго роду і Роду-Ра; люблю за ягоных нашчадкаў, якія прыйдуць у гатовы да гэтага прышэсьця сьвет, а час усё ўдасканаліць і ўдакладніць...

Лапікі зеляніны шырацца і ператвараюцца ў дываны ніваў. Раскіданыя бронегарсэтнікі зьмяняюцца ватажковымі вайсковымі разьездамі. На скрыжаваньнях прысталічных вёсак разпораз трапляюцца людзі са стрэльбамі ў звычайнай будзённай апратцы — статычная частка нашага канвою...

Цяпер заместа сядзібаў вуліцы атачаюць нягеглыя хацінкі, зьлепленыя, а хутчэй — зьляпаныя — ці не абыяк. Пачуцьцё вечнасьці хаваецца за маску адвечнай часовасьці, з-пад якой вызіраюць чужыя гэтаму краявіду мячэты й мінарэты. Яны зусім не былі гатовыя зьявіцца ў гэтых месцах, як і месцы не былі гатовыя іх прыняць. Напэўна гэдак выглядалі некалі й першыя хрысьціянскія малітоўні, пакуль умовы не дазволілі хрысьціянам зруйнаваць паганскія сьвятыні й на прызначаных, створаных самой прасторай месцах для сьвятасьці ўзьвесьці храмы.

Часовасьць і выпадковасьць лепяць зацятасьць. Прага ператварыць часовасьць і выпадковасьць у непарушнасьць спараджае жорсткасьць, у якой заўсёды знойдуцца зброя й рукі як для канвою, так і супраць нязгодных ці проста інакшых, якія сваімі жыцьцямі аплочваюць самасьцьвярджэньне збройных. Для хрысьціянаў гэта былі часы крыжовых паходаў, царкоўных падзелаў, расколаў і інквізыцыі, для мусульманаў час уціснуў усё гэта ў мізэрныя межы кароткага сёньня.

Канвой. Як толькі мы ўяжджаем на сталічны абсяг адвечнага места Ўасэт, ахова зьнікае. Цяпер бараніць нас будуць два падуладныя Амону-Ра калосы Мэмнана-Амэнхатэпа III, да якіх мы сунемся з правага (мусульманскага) на левы (паганскі) бераг Нілу. Зь Люксору ў Тэбы (Уасэт) — з гораду жывых у горад мёртвых. Пакуль абодвы месты йснавалі пад адным імем, яны былі сталіцай краіны Кемэт, што азначае чорная. Але аднойчы пальмавая галінка першынства, якая лучыла берагі, зламілася, і плыткі Ніл (Хапэт) перанёс Уасэт у Каір.

Жвавы экскурсавод назваўся Рамзэсам... Ён удаваў на пахолка вартавых калосаў, прызначанага чарговым канваірам.

„Вілы сьмерці пратнуць таго, хто парушыць спакой фараонаў". „Я той, хто клічам пустэльні змушае на ўцёкі аблыжнікаў магілаў. Я той, хто стаіць на варце грабніцы Тутанхамона". Надпісы-папярэджаньні аднойчы ўжо споўнілі слова і скавалі ланцужок сьмерцяў з жыцьцяў выправы лёрда Карнарвана...

Грамада ляцела як на крылах, і калі праз гадзіну ўсе адмовіліся йсьці яшчэ ўв адну (апошнюю адчыненую на сёньня) грабніцу, туды накіраваліся чацьвёра беларусаў — тры вуніяты і адзін паганец...

„Але перш чым увайсьці ў тайныя ходы, у якіх нашы празорлівыя прадзеды захавалі ня толькі свае культурныя, але і вялікія матэрыяльныя багацьці, — таямніча падкідае неспакойная памяць даўна забытыя словы, — ты павінен даць абяцаньне, злажыць прысягу на кожную тайну"...

Ціха рыпаюць у тахт неспадзеў прыгаданаму прыступкі прыцемненага склепу... „мы знайшлі ў сьцяне нізкія чорныя дзьверцы... увайшлі ў даволі абшырны пакой, з мураванымі лавамі каля сьцен і высокім падмуркам пасярэдзіне, на каторым стаяла старасьвецкая труна, знаная яшчэ данядаўна месцамі на Беларусі пад назовам „корста".

Каму яшчэ *гэта* — больш вартае чымся проста гісторыя?

„Я, Ярамір, ходы гэтыя працай многай утварыў і дэманаў пяці моцай слоў тайных на пільнаваньне давечнае ўвязаў тут. Хай унасячага сюды прапусьцяць, а на вынасячым споўніцца слова".

Дзеля каго *гэта* — нешта, што некалі было вартай, то ж бо ледзь не тагачасным канвоем, а цяпер...

Шэры надгробак убірае ў сябе прыцемненае сьвятло. Там, пад векам, дзе некалі ляжаў вашчэц, цяпер пуста. Адкрыцьцё Эгіпту садрала накрыўкі з саркафагаў, а загадкавая таямнічасьць Беларусі пакінула ў схованах нашыя корсты. На „выносячых" споўнілася слова, але ў грабніцах — нікога няма, і толькі дух, якога ніхто вынесьці ня ўмее а й ня кожны чуе, захінуўшы балахон прыцемку, пазірае са сьценаў жывымі вачыма росьпісу.

У гэтым бясконцым шэрагу велічных нябёсных уладцаў я шукаю праўнука Ра, унука Шу і бацьку Геба — Бога Ўсіра які адвучыў людзей ад людажэрства, навучыў сеяць ячмень і воркіш, садзіць вінаграднікі і вырабляць віно, пячы хлеб і гатаваць піва. Ён навучыў людзей здабываць медзь і золата, а затым і карысьць ад іх. Таго самага Ўсіра, які цяпер ув абліччы Чарнабога жыве на крывіцка-дрыгавіцкіх і прылеглых абсягах. Дзе ён — чацьвертая асоба старажытна-эгіпэцкага пантэону — зялёна-альбо чырвонаскуры, у вашчацовых шатах і кароне этэф, зь ляскаю валапаса і арапнікам пастуха ў прытуленых да грудзей руках?

Дзе ён — адзіны, хто сярод вышэйшых заўсёды мае чалавечае аблічча побач з Сокалам-Горам, кракадзілам-Сэбэкам, парай ільвоў — Шу і Тэфнут, коткай-Баст, ільвіцай Сэгмэт ці Тотам з тонкай шыяй і дзюбай ібіса...

Ніжэйшыя ў рангах сядзяць на тронах, дамінуюць у сцэнах — уладараць, але сапраўдную ўладу мае той, хто традыцыйна найменш кідаецца ў вочы, хто заміж ужываньня ўяўнага права дыктаваць знайшоў тую згоду, у якой можна заставацца бачным але незаўважным, адцягненым але прысутным. Тую згоду, пры якой ты любіш усіх, а ўсе шчасна адчуваюць тваю існасьць і не пазьбягаюць яе.

Дзе ён — сын Геба і Нут — Зямлі і Неба, які ў часы боскіх дынастыяў атрымаў ад бацькі стол двух Эгіптаў і чые несьмяротныя папярэднікі Шу і Геб, засьпетыя старасьцю і прыгнечаныя чалавечай няўдзячнасьцю, сыйшлі ў захмар'е, пакінуўшы чалавецтва на руках больш здатнага і здольнага.

Я знаходжу Ўсіра: Чарнабог і Белабог — адно цэлае ў дзьвюх асобах. Цяпер з „унасячага" я ператвараюся ў „вынасячага". Ярамір нябачна кранаецца маёй рукі і вядзе ўверх. Мы — узаемны канвой адно аднога. Ра-ро, ра-ро — рыпаюць сходы...

Пахолак двух калосаў — самазваны Рамзэс — вядзе нас далей. Ён гуляе з маімі сынамі і ахвотна паказвае месца, дзе сутыкнуліся арганізаванасьць і згуртаванасьць, жорсткасьць і цьвёрдасьць, зацятасьць і ўпэўненасьць, дзе сустрэліся вочы цывілізацыі і аб'ектывы давялі сваю бесьзабароннасьць перад пачарнёнымі рулямі, дзе гара загіблых і грамада жывых з узаемнай нянавісьцю разьвіталіся на пляцы перад палацам Хатшэпсут — адзінай жанчыны-фараона, якая ўзурпавала ўладу ў сваёй сям'і, узвысіла Амона і ягоных жрацоў, а ўрэшце разваліла краіну.



СЯРЖУК СОКАЛАЎ-ВОЮШ — нарадзіўся 45 гадоў таму ў вёсцы Астоўшчына, што пад Полацкам. Жыве й працуе ў Празе. Мае жонку й трох сыноў. Найчасьцей піша па дарозе на працу й з працы. Два прапанаваныя творы — першая часопісная публікацыя прозы і вынік вандровак аўтара ў Італію ды Эгіпет.

Цямнее. Ярамір вядзе мяне залямі Карнацкага і Луксорскага храмаў Амона-Ра. Лес пакрытых надпісамі калёнаў, як зарасьці папірусу, цягнецца ў зорнае неба. Лёс ня даў ім стаць паперай, але прыпадобніў. На момант, калі я пачынаю бачыць сьвет вачыма Яраміра, узьнікае адчуваньне, што мы — адно цэлае ў дзьвюх асобах, і таму храмы здаюцца сымболямі сусьвету. А зусім побач гібее ў руінах храм Бога сонца Атона, узьведзены на загад бунтоўнага фараона Амэнхатэпа IV, насуперак Луксорскаму і Карнацкаму храмам. Фараон хацеў аднабожжа, ён таксама быў „выносячым", і нашадкі не далі дараваньня. Ні ўзятае ймя Дагодны Атону — Эхнатон, ні прыгажосьць жонкі Нэфэрціці не ўратавалі перакшталтоўца...

Стомлены канваір Рамзэс махае рукой на разьвітаньне. Прыцемненымі вуліцамі даганяем канвой, чыя галава ўжо сьвідруе непраглядную цемру прымесьцяў сотнямі аўтамабільных ліхтарак.

Паволі аціхаюць прыглушаныя галасы спадарожнікаў, каб потым ізноў ажыць у часе кароткага прыпынку ў аазісе, акурат пасярэдзіне дарогі ад'езду й вяртаньня, дзе ў бруднай прыбіральні на дне пісуару зазвычай хаатычныя сьцёкавыя дзюрачкі зробленыя ў форме хрысьціянскага крыжа.

Гэтым разам ужо не Ярамір, а Белабог-Чарнабог у вобразе Ўсіра ўтрымлівае мяне ад несьвядомага сьвятакрадзтва.

Я выходжу на вуліцу і гляджу ў зорнае неба:

Белая вада чорныя берагі, чорная вада белыя берагі пасярэдзіне груд

У грудзе воі свае й чужыя, на грудзе камень, на камяні таўро

Ра-ро, ра-ро.

Ляці, ляці маё да таго груда, да таго камяня

Адамкні таўро злучы чорнае, злучы белае,

Як да вою вой — ув адзін сувой

Розна-рознае, але цэлае...

Згары яскаркай-апаяскаркай адляцелае

Ды пакінь, пакінь са скрыдла пяро

Ра-ро, ра-ро...

Грудзі напаўняюцца паветрам як кавальскія мяхі. Гэта дыханьне Яраміра. Якая яшчэ небясьпека чакае мяне наперадзе?

1-26 красавіка 2001, Прага

Васіль Дзівашэвіч

Местатрыманьне

Учарашні пяшчотны дождж.
Шэсьце праз горад.
Гром.
Тэпкі на галаве.
Табе
ня выказаць. Хораша ўсё ж
У трубе
Струмені віруюць.
Ром
па жылах маіх цячэ.
З рэк
навальнічнай вадзе
пячэ
пяты сораму чэк.
Хек —
рыба жыве ў вадзе.
Гляньце, кудысь брыдзе
Пэйн.
Былы Альбэрт Айнштэйн —
геній.
Яйцагаловы Ясенін
ногі палошча ў струмені.
Хораша ўсё ж
дождж.
Неба ў дзіравасьці хмарнай.
У небывала цяжарнай
тым што будзе яшчэ —
цячэ.
Сныць
сьпіць
існуе і вандруе.
Неба ў кропельным спудзе.
Чэша рабая жніца
зад
аб зямны ствол.
Грому накат, як гол.
Падол
падпаясаны.
Жне
Нязнаны
дагэтуль зь нябёс
пракос
Зямліцы бракуе рос.
Як цяжка ўзыходзіць заранка!
Маланка
павольна спаўзла на мур.
Зноў варухнула між хмур
звон.
Ён
у хадзе араты
за плугам.
Добра, хадзем рабяты
дадому цугам.
Вільготна скрозь.
Валацугам
цяжка пры гродзенскай радзе.
Нэндзна, ніхто не прысядзе.
Пікнуўшы, хіба дасьць маху.
Спала маланка.
На даху
каты
мітусяцца між птушак.
Дзе ты,
о, боскі старушак?
Што больш ня просіш хлеба?
Зь неба
на голаў хвіліна
ўпала
і ні адна валасіна
не адказала
адпорам.
Хорам
песьню сьпяваем узорам
бурбалкам, пене марской.
Сорам
квітнее скрозь і паўзбоч.
Ах, як мільгаюць пяткі!
Ліпне адзеньне.
Дзяўчаткі
туляць адна адну.

Хіба яшчэ прайду.
Як?
Верагодна між імі.
Узьнікаюць грудзямі сваімі
цяжарна напудраны дамы.
Крамы
між вымытых сьцен мільгацяць.
Не ляцяць, не ляцяць, не ляцяць
болей кроплі.
Мёдам
выпэцкаў дождж валасы —
для красы.
Куродым
з долу, з асфальтнай ігліцы.
Водар — сынок навальніцы
паўзе каля носа — ня зловіш.
Віншую,
вы зноў Шастаковіч!
Цалую
кожную кроплю,
што зь неба
шэпча пяшчотна:
— Ня трэба...
І сьлізгае неўпапад.
Былы піянерскі
па-зьверскі
распырскаў ракі струмень.
Такі ён бывае
дзень.
Стос падзей нараджае.
Што там паціху ўсплывае?
— Голка!
І што, мо плыве па ртуці?
Прамыць бы мазгі,
абуць іх!
Вясёлка
неба падперла.
Давай,
выбягай,
выйдзі Сонца!
Зазьзяй крыху лепей.
Ваконца
прыадчыніў:
у дзьвярах —
вецер.
Недзе схаваўся ў кустах.
Грузна паўзуць машыны.
Цягнуць з сабою
вось.
Тарпэды
ах-ах
у руках алкашыны.
Кеды
хіба ўжо боль не прыдатны.
Далі, далі, далікатны,
трэба заўважыць,
пах.
Чаму працякае дах?
Ну, гэта нюансы майстэрні.
Капэрнік яе трымаў у руках.
Не давезьлі ў самалёце.
А я вам кажу:
— Вы „пьёте"!
Але гэта так.
Вятрак
паветра малоціць
сам насам.
Я вас забясьпечу матрасам.
У вас трусы з „Адзідасам"?
Што-о-о
жнівень
палошча ў вятрах?
Гмах.
Ваша выява тут — нонсэнс.
Рубэнс, Эклезіяст,
джаз
дарэчы будзе якраз.
Яшчэ трохі збоч заўважыць,
час
для таго не найлепшы.
Падручнік
аб ісьціннай праўдзе заенчыў.
Апеў усё былое тут.
Бруд
змыты з прастору.
Стэрыльна
наўкола і пахне ральлёй.
Няўхільна
выбегчы хоча з палёў
адкрытасьць.
Дарэчы, наконт перабору!
Ой-ё-ё-ёў
жэст!
Які ён калючы
агрэст
зялёны
хлапец аб'ядае.
Што і каго ён яднае?

Простае.
Так не бывае.
Будзе.
Прыходзьце, нарэшце людзі!
East Union Fest —
Test
на несамавітасьць.
Яднае
добрыя справы, людзей.
Дзей,
выбрыкаў акты анты.
Гэй,
тут чагось не хапае!
Супраць ці за?
Лу-ка.
Там дэфэнзывы рука —
тут вышук з канчаткам
бэ-э-э.
Спрычаленыя глузды
я...
буду цяпер як дым:
свавольным і падначаленым.
Няхай нехта ўзыйдзе як глыба.
Хіба
сорамна быць у гасьцях?
Сьцяг
створым проста з адзежы.
Межы
адсунем трохі падалей.
Імчыце эмоцыі хваляй.
Ці
іх узмацняльнік нам.
Ці-ра-ра ці-ра-рам
стрэнецца між гармоній,
акордаў, ладоў, какафоній.
Наноў выпрастуем струну.
Ох, як басуе смык!
Зык
ад яго адлятае
хваляю, айсбэргам, крыгай
лядачай.
Несамавіта
плача
расстрыга
жыд.
Трэба штось перайначыць,
пераўтварыць, а як?
Гляк
нас адлюструе сусьветам.
Кіньце рабіцца,
паэтам
мы як-ніяк неабходны.
Паходняй
іхнае трызьненьне сьвеціць.
Хопіць вярзець,
адпусьцеця
думкі,
хаця ж бы мух...
Дух
нейк вальгатней залунаў.
Упаў
зь неба апошні акрайчык
і запляскаўся Ікарам.
Зайчык
выбег насустрач хмарам.
Асірацела тлуміцца.
Людкі, што ж гэта тварыцца!
Дзе наша еднасьць
Царыца
нябесная
больш не бароніць.
Хопіць
пэўна нямога енку.
Адчуйце,
стварыце,
сукенку
ўсамчас з голых ног не дзярыце
і затварыце
галдзёж.
Хораша ўсё ж
дождж.

5-7 ліпеня 1998

ВАСІЛЬ ДЗІВАШЭВІЧ — нарадзіўся ў 1965 годзе. Да пары заканчэньня васьмігодкі жыў у савецкай частцы Белавескай Пушчы. Далей бесьперапынна вучыўся аж да заканчэньня ў 1990 годзе Гарадзенскага Дзяржаўнага Ўнівэрсытэту, дзе атрымаў прафэсію-званьне інжынер-фізык-радыёэлектронік, якое пацьвярджае да гэтага часу службова. У літаратуры — паэт, эсэіст, крытык. Друкаваўся „Калосьсем" як Васіль Дзівашэвіч і Ігнась Касоўшчынскі. Кніжна ў анталёгіі горадзенскай паэзіі *Лябірынты прывіднага замку*. Жыве ў Горадні.

Сяргей Абламейка

Канстатацыі

Пра посьпех, удачу, няўдачу

* * *

Своечасова зразумець — вось посьпех у жыцьці! Большасьць бо разумее, калі ўжо позна...

* * *

Беспадстаўным мы звычайна называем чужы посьпех.

* * *

Часам для посьпеху дастаткова вельмі добра думаць... аб сабе.

* * *

Мы заўсёды больш вінаватыя ў сваіх няўдачах, чым гатовыя прызнаць.

* * *

Нельга сказаць, што ўдача заўсёды ўзносіць на вяршыню нявартых. Значна часьцей яна ўзносіць на вяршыню таго, каго ўважаем нявартым мы.

* * *

Свае посьпехі мы часьцей называем провідам Божым, чым свае няўдачы.

* * *

Адзін з нашых закідаў пасьпяховым — няўвага да нашае пэрсоны. Закід няслушны. Той, хто рухаецца наперад, — наперад і глядзіць.

* * *

Посьпеху на зямлі значна менш, чым людзей.

* * *

Чым хутчэй малады чалавек пераканаецца, што ён ня самы лепшы і ня самы разумны, тым больш верагоднасьць, што зь яго нешта атрымаецца. І парадокс. Якраз тыя, хто ўважае сябе лепшым за астатніх, часьцей за ўсё дамагаюцца посьпеху і нешта ствараюць у гэтым жыцьці.

* * *

Хацець — мала. Трэба яшчэ магчы. Але й гэтага мала. Трэба каб і першае, і другое супалі ў часе і, адначасова, у іншых — якраз разыйшліся.

* * *

Посьпех і здрада — вось два спрадвечныя спадарожнікі!

* * *

Гісторыя посьпеху часта — гэта гісторыя прастытуцыі.

* * *

Прыстойнасьць і посьпех — рэчы часта несумяшчальныя. Таму з асаблівай скрухай я назіраю ў некаторых прыстойных гатоўнасьць стаць пасьпяховымі.

* * *

Бессаромнасьць, вядома, больш пасьпяховая за сарамлівасьць. З другога боку, ня кожнаму патрэбны бессаромны посьпех. Тут праблемы няма. Праблема ў тым, ці бывае посьпех сарамлівым?

* * *

Непрыстойныя і пасьпяховыя часам прыносяць праблемаў менш, чым напалову прыстойныя і напалову пасьпяховыя. Першыя бо не падманваюць надзеяў.

* * *

І здольнасьці, і розум, і веда, і шанцунак — важныя для посьпеху ў жыцьці, але не галоўныя. Галоўнае тут, на жаль, — гатоўнасьць скінуць з дарогі перашкоду. Ці то бервяно, ці то чалавека, няважна.

* * *

Большасьці няўдачнікаў для посьпеху не хапае ўсяго аднае „драбязы" — цынізму.

* * *

Адны людзі дамагаюцца посьпеху, іншыя сабе яго прыдумляюць. А ёсьць і такія, хто намагаецца прыдумаць пасьпяховае тлумачэньне сваёй няўдачы.

* * *

Амаль заўсёды асуджаныя на няўдачу тыя, хто павольна думае.

* * *

Пазіраць на посьпехі іншых некаторым з нас лягчэй, чым самому паспрабаваць ды прайграць.

* * *

Тыя, хто забывае на сябе дзеля іншых — менш пасьпяховыя. Затое яны лепшыя і прыгажэйшыя.

* * *

Параза канкурэнта паляпшае сон і апэтыт. Яна можа таксама дадаць вам новага сябра. Па няшчасьці.

* * *

Радасьць за посьпех суседа прыносіць нам плён на нябёсах. Затое сам пасьпяховы можа вельмі хутка, яшчэ на зямлі, прынесьці нам нешта... адваротнае радасьці.

* * *

Аб посьпеху мараць няўдалыя. Астатнія яго маюць.

* * *

Няўдачы ня ўсіх людзей псуюць. Шмат каго яны робяць лепшымі, а некаторых — ратуюць.

* * *

Наракаючы на няўдачу, не забудзьцеся, што пройдзе кавалак часу, і яна можа апынуцца найвялікшым шанцункам.

* * *

Большы посьпех чакае вас у тым выпадку, калі вы не імкняцеся рэалізоўваць ідэі адразу пасьля іх прыходу ў галаву.

* * *

Адна з перадумоваў посьпеху — навучыцца адмаўляць.

* * *

Бывае, што посьпех хутчэй знойдзеш не на дарозе самасьцьвярджэньня, але на шляху самавырачэньня. Таму і назіраем мы вакол састарэлых эгаістаў, якія сьцьвярджаюць сябе нават у шараговых сытуацыях і ў пабытовай драбязе.

* * *

Для посьпеху справы часта хапае слова. Тлумачэньні бываюць лішнімі.

* * *

Звычайна, калі мы разумеем, што ж трэба для посьпеху, нам самім ставацца пасьпяховымі ўжо позна...

* * *

Раньні посьпех рана і закончыцца.

* * *

Посьпеху бяз працы не бывае, а працы бяз посьпеху — шмат.

* * *

Той, хто ня любіць рызыкаваць, не даможацца вялікіх посьпехаў. Але й няўдачнікам ня стане.

* * *

Удача расьпешчаная людзьмі. Яе чакаюць усе, і таму яна такая пераборлівая.

* * *

Абмежаванасьць і прымітыўнасьць не зьяўляюцца падставамі для няпосьпеху.

* * *

Самазадаволены ёлупень — ня самы рэдкі тып сярод тых, каму шанцуе.

* * *

Калі нам пачынае здавацца, што мы больш вартыя і таленавітыя за іншых — гэта верная прыкмета таго, што мы трапілі ў паласу няўдач.

* * *

Стрымаць сябе ў патрэбны момант — часта палова посьпеху.

* * *

Хто ўмее далікатна дагадзіць, улесьціць — той ведае жыцьцё. Але гэтая веда не абавязкова вядзе да посьпеху. Яна можа быць і вынікам няўдачы.

* * *

Абмежаванасьць інтарэсаў і зацікаўленьняў хутчэй прыводзяць да посьпеху, чым іх шырыня. У абмежаванасьці мэты больш дасягальныя.

* * *

Для посьпеху чалавеку патрэбны мінімум прымітыўнасьці.

* * *

Вяршыня посьпеху тым вышэйшая, чым ніжэй чалавек згодны ўпасьці дзеля яе.

* * *

Усё вырашае ўзровень амбіцыі.

* * *

Некаторыя з нас, наракаючы на няўдачы, не разумеюць, што яны папросту занадта прыстойныя для посьпеху.

* * *

Наракаючы на няўдачы, мы часта проста не разумеем, што тое, што мы ня робім, абавязкова зробіць нехта іншы.

* * *

Кароткі розум — доўгі язык. Гэта абавязкова. Затое зусім неабавязкова: доўгі язык — кароткі сьпіс удачаў і посьпехаў.

* * *

Добра было б яшчэ зь дзяцінства ведаць, што нашыя посьпехі разам з намі могуць узрадваць толькі нашых сваякоў...

* * *

Пакуль вы не зразумееце, што аточаныя колам пасьпяховае пасрэднасьці, вы асуджаныя на няпосьпех.

СЯРГЕЙ АБЛАМЕЙКА — журналіст і гісторык. Нарадзіўся ў Менску (1962). Скончыў гістфак БДУ і дактарантуру Люблінскага Каталіцкага Ўнівэрсытэту (Польшча). Працаваў у школе, музэі, Скарынаўскім цэнтры. З 1990 году — на Радыё Свабода. З 1995-га — у Празе. Надрукаваў шэраг артыкулаў па гісторыі царквы ў беларускіх, польскіх, расейскіх і італьянскіх навуковых выданьнях. Аўтар друкаваных у апошнія гады ў „Нашай Ніве" імпрэсіяў, эсэ і афарызмаў.

Алесь Аркуш

Трохрадкоўі

* * *

Сплю ля мора
як выкінутая хвалямі
ахвяра караблекрушэньня

* * *

Ля Сафійскага сабору
над купалам
разглядаю зорку

* * *

Міма сьпяшаецца цягнік —
па рэйках
па раскладзе

* * *

Сябры вяртаюцца
як поры году
як успаміны

* * *

Кажан да скуры
працёр свае крылы
націраючы поўню

* * *

Трохгадовы сын
пабег насустрач бацькам
як шар у кегель-бары

* * *

У Вільні
ля Вострай Брамы
ляжыць мая манэтка

* * *

Для глуханямой поўні
пальцам па шыбіне
выводжу словы

* * *

Мой кактус дзень і ноч
глядзіць у вакно —
чакае мяне

* * *

Вікінгі
мінаюць Полацак
заўжды ўночы

* * *

Ня маючы голасу
лаўлю губамі
ноты разьвітаньня

* * *

Вось і верасень
сіні сушыць
свае вёслы

* * *

Ці згадзіліся б чараты
каб паміж імі
вырас дуб?

* * *

Завершанасьць
ня любіць
кропак

Міхась Андрасюк

Пан Носік

Пасьляабедняй гадзінай апынуўся пан Носік перад дзьвярыма пад'езда — знаёмага, шэрага й абдзёртага з масьлянай фарбы, як шэрым і абдзёртым з мрояў было апошнім часам яго мужчынскае жыцьцё. У акацыях шчабяталі птушкі, кветкі падміргвалі летняму сонейку, дзень увогуле выглядаў нібы ў турыстычным даведніку. А на трэцім паверсе чакала пані Носічыха, прыдбаная за жонку даўно таму, у выніку палымянага і, як у маладосьці наагул бывае, зусім не абдуманага памкненьня.

І цяпер тырчэў пан Носік перад наскрозь знаёмым блёкам і сумна ўсьміхаўся. Ня тут яго, пана Носіка, месца. Ня тут. І, мабыць, толькі ў выніку незразумелай касьмічнай катастрофы запаўняе ён якраз гэты, а ня іншы, лапік часапрасторы.

А потым ён адчыніў дзьверы. І натыкнуўся на нештадзённую зьяву. Трыццацігадовую, высокую, тонкую, зафіксаваную зьверху навальніцай фіялетава-чорных валасоў. Зьява адзетая была ў летнюю сукенку, даўжынёю, больш-менш, да паловы сьцягна. Калі аднак названы цуд краўцоўства разглядаеш зь іншае, вэртыкальна-перакошанае пэрспэктывы лесьвіцы, прапорцыя закрытых і аголеных мясьцін зьмяняюцца якраз на карысць гэтых апошніх. Нам, абыякавым да таемных сэансаў душы, пазбаўленым празьмернага красамоўства — што ж застаецца? Застаецца падтрымаць трызну зроку: лесьвіцаю сыходзіла пані Зіна.

А калі б, скажам, ня пан Носік стаяў тут, а сіньёр Сандра Батычэлі? О, тады зусім іншая іншасьць. Тады замест ступаць лесьвіцаю, пані Зіна вылузвалася б з залатой ракавіны, і з шэпту марской хвалі, і з анёльскай музыкі. А калі б, выпадкова, прыплёўся сюды мійнгер Рэмбрант? Ах, што й казаць...

— У вас прыгожыя ногі, і вельмі старанна выкананыя, — азваўся пан Носік.

— Дзякую. Вы вельмі ласкавы, — адказала пані Зіна. І ўсьміхнулася смуткам Джаконды.

— Ёсьць яшчэ шчасьлівыя людзі, — уздыхнуў пан Носік. Месца атрымалася зручным для назіральнага працэсу і ён не адступаўся ад дзьвярэй. І пані Зіна прыкмеціла тую зацікаўленасьць. З належнай жанчынам сьціпласьцю спрабавала выцягнуць сукенку, але дарэмна, бо, як агульна вядома, законы фізыкі грудзьмі стаяць супроць расьцяжнасьці тэкстыльнае матэрыі. І пані Зіна паўтарыла сарамлівую ўсьмешку Джаконды.

— Шчасьлівыя людзі?

— Далёка й шукаць ня трэба, — упэўнена падтрымаў пан Носік. — Вось, скажам, ваш муж.

— Ах, муж-муж, — сарамлівасьць ператварылася ў зьдзіўленьне. — Адно працуе і працуе. А я зусім адзінокая. Тэлевізар, кніжка. Кніжка, тэлевізар.

— Прыгожая дама ня можа быць адзінокай, — ахутваючы голас у цёмны шоўк мэлянхоліі прашаптаў пан Носік, затоптваючы недакурак у зацухмолены горб лесьвіцы.

— Яно быццам і так, — пагадзілася пані Зіна. — У нармальным сьвеце за дамай ступае натоўп паклоньнікаў. Дамы маюць нават асабістых рыцараў. У нармальным сьвеце. А тут? — яна павяла зрокам па запыленых сьценах. — Тут, не-е. Тут можна быць толькі нешчасьлівай жанчынай.

— Та-ак. Тут усё ня так. Дзе ні глянь — правінцыя, — працягваючы думку, уздыхнуў і пан Носік. А на душы ў яго — пасьвятлела. Вось, аказваецца, ня сам ты адзін у няшчасьці, ёсьць у цябе і таварышы.

— А можа... — яна пачала і спынілася. Раз яшчэ цаля за цаляй смутнымі, карымі вачыма зьмерала застылую каля падножжа лесьвіцы постаць. — А можа... вы будзеце маім рыцарам? Або — прынамсі сакрэтным адаратарам?

„А чаму ж не? Буду!" — амаль не закрычаў ад радасьці пан Носік. Але неяк паўстрымаўся: такія ж прапановы не ляжаць павалам на местачковых тратуарах. Тут і адказ даць трэба высакародны, падумалася пану Носіку, а ў мазгавых залежынах ішоў пошук слоў. Вялікіх і прыгожых. Важкіх, бы валун, і адначасна далікатных, як тхненьне майскага ветрыку. Аднак у Носікавых запасах не знайшлося такія дзіўных ці альхімічных выразаў. І ён сумна маўчаў.

— Ну як? — пані Зіна ступіла адзін крок уніз, потым другі і трэці. Раскошны далягляд скараціўся да надзённай пэрспэктывы. Тым-

часам лесьвіца дыхнула араматам варанай капусты. У кампазыцыі кмену, маярану й ангельскага перцу пан Носік угадаў кухоннае ўмельства свае жонкі.

— Я... я буду вашым рыцарам. Я абараню вас ад дрэнных людзей і благога сьвету, — пакланіўся ён прыгожа і, падбадзёраны энэргічным падскокам страўніка, шмыгнуў на спатканьне штодзённай, па-правінцыйнаму зямной раскошы.

* * *

Першы летні дзень у Носікавай кнізе жыцьця, тоўстай і зануднай, разгарнуўся абсалютна новым абзацам. Ён шыбаваў на спатканьне зь Зінай. Спыняўся ля стэндаў, абыходзіў кіёскі, то спавольваў крок, то зноў нечакана прысьпешваў.

Бываюць хвіліны, калі сьвет сядае табе на плячо каляровай птушкай. І зазірае табе ў вочы, і цырыкае, і манернічае, а калі падстаўляеш далонь — садзіцца на яе і паслухмяна зьбірае нябачныя крышынкі. І нават мястэчка — іншымі днямі засохлае і прагорклае нібы старая дзеўка — цяпер вітае цябе ветлівай усьмешкай. Дзень добры! — гранітным капелюшом кланяецца банк, які ўчора, пад пагрозай сэквэстратара, дамагаўся вярнуць адсоткамі ўздуты крэдыт. Прывітаньне, браток! — падміргвае курдупельны магістрат, хаця ніколі раней не азываўся да цябе іначай чым *Грамадзянін! Вы абавязаны!..*

У такія хвіліны пачынаецца новае жыцьцё. І вось пан Носік шыбаваў у местачковы парк на спатканьне зь Зінай і з новым жыцьцём.

Ён убачыў яе здалёк. Квяцістая сукенка на фоне пабляклай лавачкі ўявілася райскаю птушкай. І пану Носіку стала прыемна. Ён прысеў на крайнюю лавачку і глядзеў. Там, за сто крокаў далей, бачыш прыгожую жанчыну. Яна чакае. Побач праходзяць людзі. Мужчыны, хто крадком, а хто і адкрыта, разглядаюць яе, падкарочваючы крок. Можа і абмяркоўваюць, якія штучкі змаглі б вычварыць з гэтаю во паняй, калі б надарылася спрыяльная нагода. А яна абыякава гартае кніжку. А ты адзіны ва ўсім сьвеце, хто ведае, каго яна чакае. Таму вось пану Носіку было прыемна сядзець і сачыць за паняй Зінай. Было таксама жаданьне падняцца, падыйсьці бліжэй, пацісьнуць яе далоні. Хто ведае, мо нават пад парасонам летняга прыцемку вусны дакрануцца да вуснаў. А людзі — ідуць ды ідуць, і шмат хто знаёмы там. І згодна, здаецца, трымаюць вока на асобе пана Носіка, гатовыя кінуцца з усіх бакоў, калі толькі пераступіць ён нябачную, мястэчкам вызначаную мяжу прыстойнасьці. А калі трэба, няма чалавека — падумаў пан Носік. І ад незаслужанай крыўды закурыў. А потым — прыкурыў другую цыгарэту ад першай, трэцюю ад другой. Закругляючы вусны, выдыхаў дым зграбнымі абаранкамі. Далікатны летні вецер адразу псаваў іх, разьвейваў. Здавалася — усё зараз расьцярушыцца ветрам: парк, летні пасьляабедні час, пані Зіна. Думка, што яна зараз можа ператварыцца ў чыстую мрою, халоднай іголкай упілася ў грудзі. І пан Носік падняўся на ногі. Ступіў, глянуў, спыніўся. Побач зь Зінай прысела нейкая постаць. З пэрспэктывы ста крокаў зусім падобная да цёткі Варвары, якая на тое і жыве, каб ніякую местачковую таямніцу задоўга не заносіла пылам. А вось з пэрспэктывы гадоў, заглядаючы ў далёкую і блізкую мінуўшчыну, можна даць і другі адказ. Калі тваім сьледам крочыць усё жыцьцё нейкая ўсюдыісная фатальная сіла, будзь упэўнены: яна не празявае такой нагоды. Зьяўляецца невядома адкуль і — дзеля кансьпірацыі — прыкідваецца цёткай Варварай. Зьяўляецца, каб зруйнаваць усе твае, Носікавы, пляны. Малаважна — на вадзе, ці ў камні запісаныя.

І пан Носік ускіпеў ад злосьці. Ах ты, доля! Ах ты, мястэчка! Яму раптам захацелася растрэсьці ўвесь той парк, дашчэнту, да апошняга дрэва, да апошняй сьцежкі, да апошняй травінкі. І горад — хай ад яго не застанецца камня на камні, ні сьледу людзкога, ні слова, ні думкі нават. Заціснуўшы зубы, як чалавек, якому ўсё адно — паміраць зараз ці за сто гадоў — пан Носік рушыў наўкол лавачкі. Адзін круг закрэсьліў, другі, трэці, і наступны. Ажно яму закружылася ў галаве. Спыніўся. Кінуўшы вокам направа і налева, упэўнены, што ніхто ня сочыць за ягоным змаганьнем, ён прыцэліўся і ўрэзаў высьпяткам у зялёную сьпінку.

— А на табе, праклятая! — І канчаткова ўжо дабіваючы ворага, сплюнуў. І змораны тою барацьбою, пасадзіўся якраз у апаганенае месца. Задумаўся. Ад чэрвеньскай цеплыні злосьць расслабілася, памякчэла, цёплым воскам паплыла ў ногі. Пан Носік падставіў твар летняму сонцу, заплюшчыў вочы. Доўгай, зялёна-блакітнай сьцежкай, што вяла пад павекамі, накіраваўся да квяцістай сукенкі. Расклаўшы на ветры нябачныя крылы, ён закружыў пярэстым воблакам, а можа няважкім матылём, а можа неслухмяным бярозавым лістком, які, не чакаючы лістапада, дае веру абяцяньням

бяздоннай прастрані. Яшчэ хвіліна, і ён упадзе ля лавачкі.

— Ну, я ўжо тут, — прывітаецца.

— Ах, ужо тут, — ледзь заўважнай усьмешкай азьвецца Джаконда і працягне руку на прывітаньне. — Прагуляемся?

— Прагуляемся, чаму ж не, — адкажа пан Носік.

— Можа ў „Белую ружу". Або — у „Алімп", — запрапануе, усьміхнецца ветліва.

— З вамі — хоць на край сьвету, — адкажа пан Носік. І зараз жа, два воблакі, два матылі, два бярозавыя лісткі — паплывуць зялёна-блакітным шляхам.

Калі б у нашым мястэчку, нягледзячы на малады яго век, пасьпеў нарадзіцца, пасталець ды падняцца на неба сапраўдны паэт, дык зараз, разглядаючы панараму з-па-над бярозавых вяршыняў, ён мог бы сказаць: вось двое людзей ідуць на спатканьне зь няўхільным лёсам. Прыгожыя, сьветлыя і самавітыя, як прыгожым, сьветлым і самавітым бывае чалавек, калі ў яго ў руках шчасьце. Аднак цяпер адзінае, што займала рукі пана Носіка — пагаслы недакурак. Апошні ўжо ад расьпячатанага ўраніцу пачка. І творцу, дзесьці там на анёльскіх нівах, заставалася, як і заўжды, перавярнуць чарговую скібу пра любоў да роднай зямлі.

Ярына Дашына

* * *

Калі мужы маіх сяброўак
Прыводзяць да сябе каханак
І зь імі цешацца да ранку
Агеньчыкі ў цёмных вокнах

Я сплю спакойна. І вяроўка
Ня рэжа скуру. У мокрых сквэрах
Мае шчасьлівыя сяброўкі
Бяруць пад рукі кавалераў,
Што ў намочаных шкарпэтках
Праз лужы скачуць у танцы стройным...

З-пад ног адкіну табурэтку
І сплю спакойна.

* * *

Цішыня мяне не кранае
Толькі пах твайго цела напомніць
Што ты побач, а я забываю
Валасоў тваіх колер і вуснаў.

Я сьмяюся зь сьляпых забабонаў,
Рукавамі прасейваю цішу
І зьдзіўляюся — гузік са звонам
Ад маёй адарваўся сукенкі.

А калі незнаёмыя рукі
Валасы адкідалі ў цемрань
Кацянятка за печкаю муркаць
Пачынала ціхенечка. Ціха.

Апускае на зьмяты ложак
Сваё вока счарнелы месяц,
І раскідвае валошкі
У тваіх нерухомых зрэнках.

* * *

Мець слых — і не пачуць твой голас,
Мець зрок — і не пабачыць вочы.
Навобмацак даткнуцца крыкам
Да мілагучнасьці твайго імя.
І адчуваць халодны подых,
Што сярод начы п'е атруту
У зрэнках са старых партрэтаў
Вядзьмаркі-бабкі й дзеда-каваля.
Тады і сьмерць ня мела сэнсу
Трымала ў тонкіх пальцах сьвечку
Й бяззубай цішай пазяхала:
Як ты — яна хацела жыць.
Я ўспамінаю тваё цела
У снах, дзе час так проста зблытаць
Зь сьвядомасьцю. Я буду плакаць
Й лязо вастрыць.

* * *

Паміраюць вершы
як дзеці
ненароджаныя на сьвет
Забойцы ў халатах стэрыльных
рэжуць жаночыя чэравы,
Выцягваючы па частачках
тое,
што мелася жыць...
Нашу ў душы могілкі
зь ненароджаных вершаў.

* * *

Цалую дотыкамі пальцаў
Цябе як кветку, асьцярожна.
У шматгалосьсі варыяцый
Твой шэпт узьнёслы і трывожны.
Ты прапануеш паўстагодзьдзя
За тое, што табе належыць
Ня буду. У маўклівай згодзе
Падзелена Хрыстом і Будай.

Хацела паўстагодзьдзя слухаць
І чуць пустых пакояў рэха,

Трывожны шэпт і завіруху,
І цьвінтароў халодных уцеху.

Дзе сустракаліся мы зрэдку
Жабрачкі, прастытуткі, геі...

Як дзіўна — заквітнела кветка
За кратамі аранжарэі.

* * *

Быццам сьцежкі на сьнезе, лініі
На далоні тваёй глыбокія
Пратаптаныя бесклапотнасьцю
І каханкамі выпадковымі...

Пераблытаныя, пераплеценыя
Твае сьцежкі з маімі сьцежкамі.

* * *

Жыцьцё пакідала ўспаміны —
Маштабны, псыхозны запой
Маёй ідыёцкай краіны
І памяці хворай маёй.
Гадалі па квецені бэзу,
Гукалі з надзеяй вясну.
Пад сьцішаны плач палянэзаў
Дагульвалі дзеці вайну.
Да раніцы ўсе не дажылі,
Ратуючы свой легіён
Жывыя жывых патрашылі
Халодным, тупым вастрыём.
Маўчаньне чужых праклямацый
І лямант клясычных газэт,
Раўла, пульсавала нацыя —
Надуманы мэнталітэт.
Бязладны натоўп — іншаверцы,
Што Бога забілі ў раю,
Душу ўпіхнуўшы ў сэрцы
Шукалі краіну сваю.

* * *

Агнозія думак і сноў амярцьвеньне.
Рацэпты — крамзолі клясычнай латыні.
Штодзённа абмацваць паштовыя скрыні
Й знаходзіць пачуцьцяў тваіх асуджэньне.
У акенца прахожым паказваю дулі
Дурніца, шукаю ў газэтах даверу.
Чырвонымі гальштукамі піянеры
У карчме задушылі сьляпую бабулю.
Каго ўзбуджаюць такія здарэньні
Й гадлівыя словы ў ліфце. Чакаю.
Загнаная ў клетку сьляпога адчаю
Чакаю пачуцьцяў тваіх асуджэньне.
Ізноў задарма прапануюць бясьсьмерце,
А мне не памерці — такая маркота.
Твой пах, тваю ўсьмешку, твой погляд
і дотык
Сягоньня прынесьлі ў паштовым канвэрце.

* * *

Зьяжджаю з глузду з асалодай.
Пад мармытаньне слоў кашэчых
Знайсьці свой воблік чалавечы
Такая добрая нагода.
Правесьці псыхатэрапію —
Выпіхваць з булачкі павідла.
О Божа, да чаго ж абрыдла
Ня верыць у радасьці чужыя.
Гартаю стос энцыкляпэдый
Шукаючы свае хваробы.
У КДБ страсу жалобы
Для пастаноўкі інтэрмэдый.
І ведаю: зноў заўтра скрадуць
Панчохі п'янае суседкі...

Усунуць пальцы ў разэтку
І весяліцца да ўпаду.

ЯРЫНА ДАШЫНА жыве на ўскрайку Берасьця і працуе настаўніцай у школе. Скончыла Берасьцейскі Пэдадагічны Ўнівэрсытэт А. Пушкіна. Ярына піша ня толькі вершы, але й песьні на іх. Друкавалася ў берасьцейскай і рэспубліканскай пэрыёдыцы.

Сяргей Рублеўскі

Дождж у Стакгольме

У Стакгольм я ляцеў з Шэнану. Тэлеграма ад майго даўняга сябра Нгуэна Ван Буя была такая нечаканая, што я нават ня меў часу завітаць дадому. Ды і ў Ірляндыі я ня ўсе яшчэ свае пляны спраўдзіў: ня ўсё аб'езьдзіў, ня ўсё абгледзеў, і вось на табе — ляці ў Стакгольм.

А наважваўся ж яшчэ дзянькі са тры пабыць на ўзьбярэжжы, можа нават выйсьці ў мора...

У Ірляндыі я займеў інтарэс фатаграфаваць аканіцы, ліштвы ў старых паселішчах, хоць, прызнацца, прыехаў сюды зь іншай мэтай. Мне захацелася, нарэшце, на свае вочы пераканацца, што мы, беларусы, сапраўды маем прыкметнае падабенства зь ірляндцамі, аб якіх па сьвеце ходзяць забабоны: маўляў, Госпад зрабіў іх п'яніцамі, каб яны не зваявалі ўвесь сьвет... Праўда, у маім жаданьні ўзяць за радню абайнітых астраўлянаў была і доля скепсісу. Вось і беларусы ня зломкі выпіць, ды чаму, зь якой нагоды прыахвоціў нас да зельля Госпад? — былі думкі.

Ня ведаючы раскладу палётаў, я прыехаў у Шэнан аж за тры гадзіны да свайго рэйсу. І вось цяпер сядзеў у невялічкай кавярні, піў гарбату ды праглядаў альбомы з фотаздымкамі вокнаў ірляндцаў. Парэпаныя, выпетраныя дажджом і сонцам дашчуркі, выцьвілая фарба месцамі нават аблупілася... Пераканаўчы мастацкі густ, нібы каласок у атачэньні пустазельля, выструньваўся паміж расхрыстанасьці й абыякавасьці будзёншчыны.

І ў гэтым я ўбачыў драбок нашага падабенства з ірляндцамі. Што значыць „увесь сьвет", калі ёсьць свая выспачка лагоднай прыгажосьці! Я ўсьміхнуўся, усьцешаны сваімі думкамі, дастаў цыгарэту, прыпаліў і толькі ўзьняў вочы, як мой позірк сустрэўся з позіркам знаёмых мілых вачэй. Жанчына, якая сядзела за столікам насупраць, таксама паліла і прыязна ўсьміхалася. Джэсіка Кмін! Яна! Ад зьдзіўленьня я нават не прыўзьняўся ў вітаньні, нібы прыкарэў да крэсла, толькі нясьмела махнуў далонькай. Яна таксама сядзела нерухома, паранейшаму ўсьміхалася і, здаецца, любавалася мною. Нарэшце я ня вытрымаў, падыйшоў, і мы расцалаваліся.

Паміж намі з Джэсікай былі дужа няпэўныя пачуцьці. Летась мы пазнаёміліся зь ёй у самым пачатку жніўня на Сьвіцязі. Зачараваныя празрыстай прыгажосьцю, разам купаліся, плавалі на лодцы, і Джэсіка казала, што Сьвіцязь — срэбная капеечка на шчасьце, якую кінуў ёй на зямлю сам лёс. А яшчэ мы сядзелі ля вогнішча і кожны думаў пра сваё. А можа, пра тое самае, нават ня ведаю.

І былі паснулі ў траве на колькі хвілінаў. Абшчапіліся і паснулі. А потым я адчуў такую лагоду на душы, што захацелася ўсё кінуць-рынуць ды зьбегчы на край сьвету, каб ня спуджваць ды не змушаць паўтарыцца (усё адно нічога ня выйдзе) гэтую шчасную прагаліну часу. І мы разьбегліся.

І вось Шэнан. Залітая паўзмрокам і пахам пражанай кавы тлумная кавярня і — яна. Аказваецца, мы ляцім на тым самым самалёце. Джэсіка таксама ў Стакгольм. І таксама на цырымонію ўручэньня Нобэлеўскіх прэмій: атрымала тэрміновае заданьне рэдакцыі.

— Я думаю, Нгуена Ван Буя вылучылі больш з палітычных матываў, — ужо ў самалёце сказала мне Джэсіка. — За антыамэрыканскія настроі. А так кожная яго кніга сялянскім духам прапахлая, буйвалінай поўсьцю залепленая ды рысавым зернем усыпаная. А пра каханьне абзац-другі і кропка, — на апошнім слове сяброўка прыхінулася да майго плечука, узяла руку й гарэзьліва, казытліва перапляла нашы пальцы, як у час любошчаў, ды бессаромна зазірнула ў вочы.

„І трэба ж мне было памяняцца месцамі," — падумаў я. Але думка гэтая сьлізганула, як аблачынка ў ілюмінатары. Для парадку я яшчэ азірнуўся па баках, а потым і сам прыхіліў галаву да Джэсікі і глыбока ўдыхнуў пах яе духмяных валасоў. Мы накрылі ногі і рукі пледам і заціхлі ў сваёй няхітрай схованцы. Агорнуты стомай і шчымлівымі пачуцьцямі, я прымружыў вейкі і пачаў думаць пра тое, што амаль нічога няма незваротнага ў гэтым сьвеце, усё вяртаецца, апроч жыцьця. А шчасьцем можа ўнікнуць звычайная празрыстая прастора азёрнага навакольля, якая сталася прыпірышчам (амаль паводле Ньютана) целаў, ды і самі гэтыя целы — яе і маё. І яшчэ — блакіт нябёсаў для супакою ды імклівая бель аблокаў па ім — для пазначэньня часу. Мне рап-

там захацелася, каб гэты пералёт доўжыўся калі ня ўсё, дык палову жыцьця. З гэтымі думкамі я і заснуў на колькі хвілінаў, не раўнуючы, як тады, на Сьвіцязі.

Разбудзіў мяне голас сьцюарда, які настойліва раіў зашпіліць дзягі. А таксама — гузікі, жартаваў чорнаскуры ўсьмешлівы хлопец. А потым папярэдзіў: усё, што ён скажа далей, зусім ня жарт, а вельмі праўдзівае паведамленьне мэтэаролягаў: хоць і сьнежань пачаўся, а ў Стакгольме — спорны дождж. У кіёскі аэрапорту Арлянда раніцай нават дадаткова завезьлі вялікую партыю парасонаў, каб хоць такім чынам прывеціць пасажыраў ды падвысіць ім настрой.

— Нам аднаго на дваіх хопіць, — усьміхнулася Джэсіка і яшчэ шчыльней прыхінулася да мяне.

На такі дождж у нас кажуць „аблівака ідзе". Дождж колеру шызага паўзмроку, колеру мэталік, напоўнены неўтаймоўным памкненьнем пераканаць, што на двары ўсё яшчэ позьняя восень, а не пачатак зімы. Як мяне, дык дождж у чым хочаш пераканае...

На душы было хораша.

Я папрасіў таксіста спыніцца за квартал да Гранд-гатэлю, а Джэсіка, якая слаба ведала Стакгольм, нават не даўмелася, што да чаго, паныла чопала побач у сваіх кароткіх шнураваных боціках. Шырачэзны цёмна-зялёны парасон, які я прадбачліва набыў у аэрапорце, цалкам затуляў нас ад дажджу, балазе, ветру не было і струмені вынітоўваліся строга вэртыкальна. Трэтар, які ішоў па напятай тканіне парасона зусім (ледзьве не сказаў „ні на кроплю"), не перашкаджаў думаць аб прыемнасьцях сьвету. І я ўсьміхнуўся.

— Ты любіш непагоду... Ты любіш непагоду! — тузанула мяне за руку, а мы ішлі вядома ж подручкі, Джэсіка. — Чаму? Што за ахвота шпацыраваць такім макроцьцем! Чаму ты любіш?

— Таму што ў дрэннае надвор'е, нават калі ідзеш подручкі, ніхто не замінае быць сам на сам. Са сваім пачуцьцём. Са сваёй прыязнасьцю, душою...

— Ілжэш! Абы адчапілася...

Тым часам мы ўжо падыходзілі да гатэлю, які вабіў зіхоткім жоўтым сьвятлом.

— Андрэйка, міленькі, ну скажы! А то не пушчу ў гатэль, будзем коламі хадзіць. А ў мяне, бачыш, якія боцікі — застуджуся, зьлягу, ня траплю на цырымонію... Ты гэтага хочаш? — Джэсіка зноў тузанула мяне за руку.

Але я даў яшчэ адно кола вакол гатэлю, нягледзячы на тое, што сяброўка прыкметна спахмурнела і нават пакрыўдзілася. Мне было хораша, і я часам з жанчынамі не саромлюся быць эгаістам.

Мне сапраўды заўсёды хораша ў дрэннае надвор'е. Хіба магла зразумець такое дзівацтва Джэсіка, сьпешчаная дачка далёкага Квэбэку?! Яна ж і блізка не жыла пры калгасным ладзе і ніколі, у адрозьненьне ад мяне, ня чула дзіўнага слова „агіпта", якога няма ні ў водным слоўніку.

— Вучыся, сынок, а то ўвесь век будзеш працаваць у гэтай агіпце, — гаварыла мне маці.

— Дахадзі як-небудзь гарадзкое прапіскі, выдзірай ногі з гэтай агіпты, — зноў і зноў паўтарала яна, маючы на ўвазе наш калгас.

І я з маленства баяўся агіпты ня менш, чым вужакаў („Не адыходзь ад дому, малец, там вужакі ў хмызах!").

Але распазнаў я гэтае дакучлівае слоўца праз колькі дзесяцігодзьдзяў, калі ўжо далёка ўцёк ад яго. Было гэта яшчэ пры даволі разьвітым сацыялізме. Слухаў аднойчы ўвечары пад коўдрай варажнечы радыёголас, а ён нязвыклай гамонкай і кажа: „Прэзыдэнт Эгіпту заявіў у ААН..." Дык вось, думаю, адкуль тая агіпта і адкуль трэба сыходзіць, не раўнуючы, як Богам выбранаму народу з рабства.

Але каб не „агіпта", наўрад ці навучыўся б я так радавацца дрэннаму надвор'ю, а гэта, дарэчы, можна лічыць даволі прыкметным філязофскім здабыткам.

Калі церушыў дождж, ірваў страху вецер, жыгала бліскавіца, бацькам маім ня трэба было ісьці ў калгас, а мне рабіць па хатняй гаспадарцы. У такое надвор'е асабліва хораша было сядзець за сталом і перабіраць якія-небудзь паперы ці чытаць альбо гаманіць пра што-небудзь прыемнае зь сямейнікамі. Дрэннае надвор'е настойліва зводзіла мяне ўбок ад агіпты, ад калгаснай сьцежкі і з кожным разам усё больш і больш дапамагала ўсьвядоміць сябе чалавекам разумовай працы. А пазьней, ужо ў юнацтве, — годным мужчынам. Варта мне было выйсьці на шпацыр зь якой-небудзь дзяўчынай, як усчынаўся дождж. І я ўпадабаў дождж ня менш за дзяўчат.

З даўнейшай пары таксама не люблю я і вясну: калі ясьніцца неба, бруіцца над пожняй цеплыня, зацьвітае лотаць, выстрэльваюць клейкімі лісьцінкамі пупышкі на дрэвах, наліпае на гумавікі глеба, асабліва галасіста і поклічна кукарэкаюць пеўні, калі ў вясковых кра-

мах разьбіраюць таннае віно на апашкі, уводзіць у зман зязюля, што ўсім доўга жыць, а коні глядзяць на аратых надзвычай сумнымі вачыма. Я не люблю вясну таму, што яна змушае да распачыну турботных гадавых хлебаробскіх клопатаў. З гэтай прычыны замі-раньне і супачын прыроды куды бліжэйшыя маёй душы, чым буяньне і росквіт. Напэўна, нядобра, што так. І, напэўна, менавіта таму пакрысе я стаў ціхім змрочным фаталістам. Я гатовы быў стаць лесьнікам і рыбаком — толькі б ня быць земляробам. І таму нават палюбіў дрэннае надвор'е.

А цяпер скажыце: ці мог бы я ўсё гэта распавесьці Джэсіцы, ці зразумела б яна мяне? Вядома, не. Лепш кружляць вакол гатэлю. Шкадаваў яе, але не настолькі, каб разварушыць, нібы вулей, супакой сваёй душы.

Дождж не сунімаўся, гергятліва лапатаў і лапатаў над нашымі галовамі, нібы гаваркі нобэлеўскі ляўрэат у час падзячнай прамовы. Гатэль з усімі прыбудовамі, як высьветлілася, займаў добры пляц, так што собіла шпацыраваць і шпацыраваць.

Джэсіку пачалі браць дрыжыкі, але яна была непахісная: распавядзі да драбніцы, чаму ты любіш дрэннае надвор'е, інакш пойдзем на новае кола... І тады я скарыстаўся тым, што мы наблізіліся да ўваходу, бразнуў вобзем валізку, падхапіў яе на рукі і, нібы здурнелы ад юру маладзён, вобмігам, так, што паненка і ўцяміць не пасьпела, што да чаго, унёс яе ў жоўтую, цёплую, напарфурмленую ўтульнасьць гатэльнага вэстыбюлю. Добра, што мажны швэйцар, яшчэ малады хлопец з абвіслымі сьветлымі вусамі, усё зразумеў і хуценька расчыніў перада мной дзьверы.

У гатэлі я першым чынам выпіў добрую чарчыну віскі і трошкі пацялёпкаўся ў гарачай ванне. А потым зайшоў павітацца з Нгуенам Ван Буем. Такога лавэру, як у яго ў апартамэнтах, шчыра кажучы, я даўно ня бачыў: параскіданае адзеньне, у тым ліку і смокінг на ўрачыстасьць, нейкія хатулі, саламяныя брылі, бутэлькі невядомага напою з яшчаркамі ў сярэдзіне, аркушы паперы, парык і нячысьцік яго ведае што яшчэ.

Нгуен, узрадаваны маім прыездам, тут жа ўзяўся чытаць на сваёй ледзьве зразумелай ангельскай некаторыя месцы ляўрэацкай прамовы. Тое-сёе ён дапрацаваў, давёў да ладу й дапоўніў ужо ў Стакгольме, у тым ліку і пад уражаньнем гэтай прыкрай зімовай залевы.

— Ты ўявіць сабе ня можаш, як гэта дзіўна па адной ледзяной кропельцы ўзгадаць, адчуць сьпякотную цеплыню сваёй радзімы. Дождж ёсьць субстанцыя, якая нашыя асацыяцыі, уяўнае злучае з рэчаісным. Мне здаецца, што заўтра вось тут, у канале перад гатэлем, швэдзкія бабы выйдуць высяваць рыс, і я ім праз расчыненае вакно кіну некалькі саламяных капялюшыкаў. Дождж — гэта ўраджай. Гэта многа рысу. Многа жыцьця, — Нгуен па-сяброўску шлёпнуў мяне па плечуку.

Я нахіліўся і зрабіў на твары ветлівую віетнамскую ўсьмешку. А сам падумаў: „Госпадзе, які шчасьлівы селянін!"

СЯРГЕЙ РУБЛЕЎСКІ — нарадзіўся ў 1954 годзе на Лепельшчыне. Празаік, паэт. Закончыў фізыка-матэматычны факультэт Віцебскага пэдінстытуту. Крышку працаваў у школе, шмат — у раённых і абласных газэтах. Аўтар кнігі *Апостраф* (2000). Цяпер — галоўны рэдактар віцебскай абласной газэты „Народнае слова".

Віктар Шалкевіч

Zdenek Dragoun — Vzpomínalka

Плёнтаючыся па пакоі з кутка ў куток
Патрапляю на зграі непатрэбных прадметаў...
Вось блішчыць васковым люстэркавым бокам
Залатая вялікая ранэта
Я яе атрымаў ад цябе ў сьнежані
Ў якасьці ўзнагароды за асабістую адвагу
Мы ўзышлі тады пехатою ўдваіх на глядзельную вежу
У мястэчку пад назваю Пэтэрсхаген
Ціха пост дагасаў... Унізе немкі зь немкамі
Выцягалі з супэрмаркетаў вазкі... Заўтра Сьвята...
На мяне, як вароны, глядзяць цікаўнымі зрэнкамі
Два білеты ўваходныя зь перадкаляднаю датаю...
Ад кашулі тры гузікі... Тры глыткі твайго дыханьня
Схаваныя ў бутэльцы з-пад цёмнага піва
Жалуды, дзіравыя гарэхі, пажоўклая галінка амялы —
Сьведкі колішняга каханьня
Фотаздымкі толькі з нашымі тварамі, дурнымі і шчаслівымі
У сераду мы згубіліся ў цемры аднолькавых завулкаў
Але выйшлі аднак на сьвятло... кавярні... і доўга сядзелі
А потым ты зьнікла... а ў пятніцу папрасіла прытулку
Палітычнага ў месьце Брусэлі
Цябе бачылі нехта потым з чыста апранутым панам
То ў Люўры, то на Златай Улічцы, то ля статуі Свабоды
А аднойчы ты паляцела церазь Ля-Манш аэраплянам
І сьлед па табе прапаў назаўсёды.

Zdenek Dragoun — 30 listopad 1982

Радыё і тэлебачаньне
Сумныя граюць мелёдыі
Са зьнэкралёжанымі бачынамі
Зранку газэты выходзяць
Чорныя стужкі прыўкрасілі
Крамы, палацы і школы...
Вось яго мыюць у трупярні
Ён увесь сіні і голы...
Вось пазуры абстрыгаюць...
Вось апранаюць бялізну...
Як камяні сярод гаю
Сьціпла ляжаць атавізмы...
Вуркае сыценькі коцік

Боршчык у талерачцы стыне...
Колькі Ён, курва, напсоціў
Нашай бязьвіннай краіне!
Заўтра Яму адсьпяваюць
Доўгую „Вечную памяць"
Заўтра Яго закапаюць
Ён, Далі Бог, больш ня ўстане!
Быццам бы я хрысьціянін
Трэба за ўмёрлых мадліцца...
Але чаму жа бруяе
Радасьць ува мне, як у крыніцы?
Зараз абуюся ў боты
І пашпацырую па садзе
Заўтра Яго закапаюць
Каб больш да нас не вылазіў!

(пераствораная са зборніку Zdenek Dragoun, *Říkanky k pivu, vínu, chlébu a vodě*, Praha 1991)

ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ — нарадзіўся ў 1959 годзе ў мястэчку Поразава Сьвіслацкага раёну Горадзенскай вобласьці. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1980). Зьняўся ў мастацкіх фільмах „Сьлёзы блуднага сына", „Плач перапёлкі", „Салодкі яд каханьня". Выпусьціў альбомы ўласных песень „Правінцыя" (1994), „Смутны беларускі блюз" (1996), „Балады і рамансы" (1998). Займаецца пэдагагічнай дзейнасьцю. Як бард выступае з канцэртамі ў Беларусі і за мяжою. Здымак з Басовішча 1992 году.

Словы за словы

Анджэй Бурса

ЛЮІЗА

Краявід I

Люіза... Я дык ведаў — тут ударыць гром
Над дабравесьцем дрэў павіснуў ясны меч
Бугры апыленыя вечаровым матылём
Лагчыны сьцежкі я стаптаў усьцяж і ўшыр

Я йшоў сюды сьпяваючы і нёс белы нарцыс
І слухаў варанай лухты ў кіпучым сэрцы
І са шчытом (крывавым сонечным шчытом) ішлі
Мае палеглыя тут мары і блюзьнерствы

Тут Эрас срэбнапёрысты руліць вэлясыпэд
Геркул зь сям'ёй зьядае яйкі укрутую
Дыяна шпацыруе з ваўкадавам... о багі
Багі маіх завулкаў запіваюць пірагі
Запальчывыя вусны дышуць клятваздрадай

Калі пагляне далягляд чырвоным вокам
Пагрозіць горад беспахібна бронекулаком
І гэты радасьці нясыты кірмашок убогіх
Адсюль той гром схаваны й меч узьняты ўдараць

Краявід II

Жывой крывёй брыняюць дрэвы і смыляць
Зялёная зязюля у ракітніку
Сьцябло пячэ у роце горкай сольлю
Калі змаўкае горла вечару

Штылеты забіваюць рэчку пакрыёма
Застыглы пульс вады і сьлізгат лёзаў
На лесу звугленых плячох
Згасае нашага каханьня краявід

Люіза тут знаёмае мне ўсё да сьлёз крыві
Я разумею кожны знак на небе і ў мэтале
Глядзі вось наш сакрэтны альфабэт схаваны
У краявідзе на які спадуць і меч і гром

Джазавая песьня

Чаму мяне забралі з мае Афрыкі?
Пытаюся: Чаму мяне забралі з мае Афрыкі?
Дзе мае зьвяры павыразаныя з кары
Амулеты і касьцяныя нажы...
Навошта мне было так доўга працаваць
На плянтацыі бавоўны якой матаюць словы
Калі сапраўдная толькі старая песьня крыві
Якую ўмее засьпяваць адно саксафон
Што я тут раблю
Я ж даўным даўно
Меўся адплысьці пірацкім караблём
Па месяцы і зорках мы вызначалі час
З барадатым капітанам у Шчэціне
Але трусьлівец... я пабаяўся ўсьпененае брызы
А капітан аказаўся шулерам і злодзеем
Цяпер шукаю ў абдымках Люізы
Сноў пагубленых як сьлядоў на вадзе

Пятля архітэктуры

Зашмат пустых паглядаў тут я утаптаў у цішу
Старых гарышчаў і легендаў чужых вокан
Дык сёньня мне лагодны горад помстай дыша
З-над купалу страляе вогненным аблокам

Бягуць насустрач мне бэтон і бронза вежаў
Мур адразае галаву бяскроўна й крыва
Ў вясёлых лодачках далоняў скрый мяне Люіза
Ад страшнага наступства мёртвай пэрспэктывы

Але замова не ўратуе вязьня ад пятлі
Забітага пагляду доўга кружыцца астраль
Бо хто дзіцём перад хімэрай на калені стаў
Таму памерці маладым пад места тапаром

Прынц

Хлапечы прынц Люізінага прадчуваньня моцай
Ў гарачцы шмыгае цераз халодныя пакоі
Сьціскаючы кароткі мечык блізіцца да ценяў
І пудзіць іх з падножжа крышталёвых калянадаў

Ваярству прынца нават чорт рагаты не страхоцьце
Але і самы мужны з ваяроў ня ў змозе ўцяміць
Званоў суцішша ў вуркатаньні электрычных лямпаў
Фатальных вежаў і муроў у круцельстве плянэтаў

О прынц... Тваё ўладарства абяртаецца у попел
Істотнае — чаго табе не дасягнуць ніколі
Асірацеласьць позіркаў бязмэтнасьць крокаў
Крывавае віно крыштальны пульс таблё аблокаў
Адпусьцяць грэх крутні плянэты й кратэру старому

* * *

Хлусьня ў фальшывых люстрах вечаровай барвагамы
З стратэгій Задыяку непазьбежна вынікае
Што ў Рыбы мае перайсьці часіна Казярога
А Барана чульлівасьць у Быка тупую юрнасьць

Махлярства Задыяку вытварае строгі графік
Аголенае церпкасьці вясны і гербаў восені
Празрыста-чыстая крыніца ціхіх таямніцаў
Усьпеніць цёмнае віно чырвонай маладосьці

Тады Люізы зорка патанае ў чорных хмарах
Яе паставай сірацяцца далягляды мараў
Адно над галавой растуць у мацату абсурду
Задыякальных конаў благавесныя фігуры

Сад Люізы

У чэрвені найпрыгажэй цьвіце Люізы сад
Ягоная няіснасьць забівае як тапор
Павешаны зь вясёлкаю на ўяўны далягляд
Гарыць пад бляскам пурпуровых купалаў сабор
У чэрвені найпрыгажэй цьвіце Люізы сад

Люіза у якой свабода грацыя і спрыт
Зьвянчае крэмень з воблакам ды з ружаю мэтал
Безабаронна убягае ў саду цёмны скрыт
Дзе толькі сэрца на кары вартуе ейны бег
Люіза у якой свабода грацыя і спрыт

Дубровы кавалькад і чуйны сарнаў мільгацень
Люізы сьмехагаму паўтараюць а яна
Рассыпле валасы марской зарой на пескавень
І з голым горлам кідаецца сьмеху у палон
Дубровы кавалькад і чуйны сарнаў мільгацень

Люіза ласкаю абдорыць толькі ваяроў
За ўпэўненасьць кідка і за шалёны нэрваў скрут
Ты пераможца змазаны густой крывёй зьвяроў
Нясі ёй пашчу льва і сэрца лебядзінае
Люіза ласкаю абдорыць толькі ваяроў

Люізінага саду тайнічную прастату
Альтанак лябірынтаў кветных градак гушчароў
Птушкарнікаў зьвярынцаў гонаў антылёпаў гну
Уцяміць зможа толькі праведны й шляхетны дух
Люізінага саду тайнічную прастату

Ягоная няіснасьць забівае як тапор
Сапраўднасьцю сьмяротных пачакальняў для зямлі
Пракляты мроямі прыдуркаў і малых дзяцей
Абсьмеяны смугой абсурду гіне нэўрастэнік
Ягоная няіснасьць забівае як тапор

Злачынства Люізы

Сярод сталоў з чырвонае драўніны й льсьняных шафаў
На посуд — ходзяць насарогі й маманты ўчарнелыя
Ў гасьцёўні вечарам адчараванай з нонсэнсу
Храпе ў фатэлі Даглас з горлам расхалястаным

Віноўніцай злачынства й трызны гэтае Люіза
Яна муры і рэйкі можа зашмаргнуць у петлі
І выпаўніцца ўдар мяча і выпаўніцца гром
Але Люізы грудзі й надалей прыгожыя

Люіза прылізаная павевамі з заходу
Напасеная затхлымі падлотамі нэўрозу
Няісная як млечнабарадатыя багі
Над краявідамі стае і расьпінае жах

Распаленая кроў як голка пшыкае на нэрвах
Трызну Люізе вытварае з колераў паветра
Люіза — гэта драма для якой ня будзе сцэны
І ў тым яна фатальная што Даглас стаўся вепрам

РАЗЬВІТАНЬНЕ З САБАКАМ

Мой шэпт парушыў вялізную пысу.
Ну што ж, браток — бяда.
Мне вельмі прыкра, фінансавы крызыс.
Трэба цябе прадаць.

Ужо ня буду за тваім слыхам відушчым
Пушчанскім нерушам па выварацтнях лазіць.
Ня будзе ўжо пушчы.
Будзе парк гарадзкі — поўны гразі.

Ах, як жа ты скакаў, сігаў,
Як сцаў з задзёрам лапы завад'яцкім,
Як белым вахляром хваста махаў!
Ды што рабіць — няма жрачкі.

Ядун ты неблагі, вядома.
А я заўжды ня маю грошай.
Ды й клопат з табою дома:
Ты ўжо зжэр чатырох лістаношаў.

Хадзі сюды, хадзі — ваўчыная твая маць
Крадком вызірае з тваіх сьлепняў.
Калі б мае сябры маглі так разумна маўчаць
Мне было б нашмат лепей.

Ну йдзі, ляжы. Няварта плакаць.
Жыцьцё ў шчэ большы кіне нас дурдом.
Я любіў нязьведанасьць шляхоў з сабакам
І збэрсаную поўсьць што пахнула дажджом.

ТУГА-ПЯРСЬЦЁНАК

Я йшоў па вуліцы стамлёны ад згрызоты
І маладосьць мая як ноч з благімі снамі
Цьмяной заранкай на бэтонных тратуарах
Неразгадана й тайна гасла між дамамі

Маім прагорклым словам што захрасьлі жалем
Патрэбна ўжо гарбата й цёплая начлежка
О прападзі дзе-небудзь у завулкаў далі
Згінь з грукатам вазоў і вострай тхлінай места

О божухна — зноў ранак стане дня зачынам
У клубаваньні хмар Як гэты дзень пражыць мне
Ваконца вузенькае — а за ім дзяўчына
Танюсенькія пальцы на канве спачылі

На шэрае радно спадае ясны лёкан
Відаць у працы ноч уся ёй прамінула
Пабледлі ад бяссоньніцы дзяўчыне шчокі
Паэтаў голас ёй шапнуў на вуха чула

— Што ведаў я калі спазнаў каханьне
Пакінуў бацьку з маці ў паняверцы
— Табе мой мілы выйду на спатканьне
Туга-пярсьцёнак злучыць нашы сэрцы

Што даць табе магу — дзявоцтва кроў сьвятую
Сваёй чульлівасьцю аздоблю ночы
Каханьнем верным і чуцьцём жаночым
Тугу-пярсьцёнак назаўсёды ахвярую

СУБОТА

Божа які файны вечар
столькі гарэлкі і столькі піва
а потым блытаніна
у закулісьсі гэтага раю
паміж плюшавай заслонай
і кухняй за кратай
я адчуваў як пазбываюся лішку энэргіі
якую мне адпусьціла маладосьць
магчыма
я мог бы скарыстаць яе інакш
напр. напісаць 4 рэпартажы
аб пэрспэктывах разьвіцьця малых мястэчак
але
я маю ў срацы малыя мястэчкі
я маю ў срацы малыя мястэчкі
я маю ў срацы малыя мястэчкі!

Пераклала з польскай мовы
Хрысьціна ГРАМАТОВІЧ

АНДЖЭЙ БУРСА (ANDRZEJ BURSA) нарадзіўся ў 1932 у Кракаве. Пасьля заканчэньня сярэдняй школы нейкі час вучыўся на гістарычна-філязафічным (журналісцкае аддзяленьне) і філялягічным (балгарская мова) факультэтах Ягелёнскага Ўнівэрсытэту, але вучобы не закончыў. У 1954-57 гадох працаваў журналістам у кракаўскім *Dzienniku Polskim.* Раўнабежна з журналісцкай працай пачаў пісаць вершы і прозу. За няцэлыя тры гады свайго трагічна абарванага творчага шляху здолеў апублікаваць усяго каля чатырох дзясяткаў вершаў і адно апавяданьне. Бурса памёр раптоўна, хоць і спадзеючыся такога зыходу, ад невылечнай хваробы сэрца ў 1957. Год пазьней выйшаў ягоны дэбютны паэтычны томік *Wiersze*, стаючыся выдавецкай сэнсацыяй у краіне. Дванаццаць гадоў пасьля сьмерці Бурсы, у 1969, выйшла ягоная поўная паэтычная, празаічная і драматычная спадчына ў томе *Utwory wierszem i prozą*. Зборнік уключаў знакаміты гратэскна-макабрычны мікрараман *Zabicie ciotki* і паэму *Luiza*. Адзін з польскіх крытыкаў назваў *Люізу* „ілюмінацыйным вершам з наркатычнай сілай", які можна паставіць упоравень з *Кветкамі зла* Шарля Бадлера. Бурса стаўся культавым паэтам у Польшчы, сымбалем жыцьцёвага нонканфармізму і духоўнай незалежнасьці. Адначасова, з увагі на ягоны перадчасны зыход, крытыкі прычапілі Бурсу таўро першага „праклятага паэта" Народнай Польшчы. Пасьля Бурсы гэты „тытул" дастаўся таксама Галіне Пасьвятоўскай (памерла ад хваробы сэрца ў 1967), Рафалу Ваячаку (пакончыў самагубствам у 1971) і Эдварду Стахуру (пакончыў самагубствам у 1979).

Рафал Ваячак

Я ГАВАРУ З ТАБОЮ ЦІХА

Я гавару з табою ціха быццам сьвецячы
І заквітаюць зоркі на лугох мае крыві
Стаіць мне у вачох зараначка твае крыві
Я гавару так ціха аж мой цень бялее

Я — выспа схаладалая для твайго цела
Якое падае у ноч гарачай кропляй
Я гавару з табою ціха як праз сон
Твой пот гарыць на маёй скуры

Я гавару з табою ціха быццам птушка
на досьвітку ўпускае сонца ў твае вочы
Я гавару з табою ціха
так як сьляза цячэ маршчынай

Я гавару з табою ціха
як ты са мною

ПЕСЕНЬКА З НАЙВЫШЭЙШАЙ ВЕЖЫ

З грудзьмі праколатымі сьпіцай для вязаньня
Упала жонка А далей натхнёны кат
Бярэ яе крывавы корпус сьвежаваць
Нажом кухонным клубы тоўста наразае

І прыпякае ступні й прысмаляе лыткі
З каленяў рэпку вылузаў Дапяў да жыл
Цяпер раскрыў касым разрэзам ёй жывот
І на стары відэлец кішкі панамотваў

І надалей шукае Вобмацкам адгаліў
Хрыбетны копчык і адсек сякераю
І ножнічкамі для пазногцяў вульву цяў
І ўпрэпараціў Потым павыколваў вочы

Празь мясамолку прапусьціў драбнейшым сітам
Абедзьве ягадзіцы а сырую кроў
Разьвёў па шкельцы каб пад мікраскоп узяць
І кожны валасок счацьверыў для парадку

Бо верыць ён усё ж што праўда ёсьць на сьвеце
Такім цярплівым выродкам адно паэт
Быць можа — ведаю хто гэты сукінсын
Завуць яго — запомніце — Рафал Ваячак

ГВАЛТ

Мне цела настрамляецца на кол
Праменьне болю паліць мае тканкі
Якія коні ўпрэжаны між ног
Так цягнуць Добры поплаў прасьцірадла

Ніколі шчэ ня рос падобны крык
Праз столі у вакно глухое неба
Цяпер пачулі ўсе што сёньня я
З Тваёй ласкавасьці жанчынай стала

Паваленая назаўжды наўзнак
Хачу ляжаць У горле костка болю
Няхай ня скончыцца ніколі гвалт

Няхай так станецца як кол мне мілы
Крыжом заякарыцца б ува мне
Я веру крык мой чуе камень неба

ПРОСЬБА

Зрабі мне штось, каб я магла разьдзецца дагала
Апошні сораму лісток даўно зь мяне апаў
І нат найценьшы успамін сукенкі змыла я
І хоць больш голае за голую мяне ты мець
Ня мог ніяк, зрабі мне штось, каб я паверыла

Зрабі мне штось, каб я магла раскрыцца шчэ глыбей
Ты так даўно праз поры ўсе пад скуру мне пранік
Што я ня веру каб ты там калісьці шчэ ня быў
І хоць ня веру каб табе хто мог адкрыцца больш
Чым я цяпер, зрабі мне штось, раскрый мяне, разьдзень

БУДЗЬ ДЛЯ МЯНЕ

Будзь для мяне ад ступняў да чала, ад пят да вуха
З каленяў па пахвіну, з локця па пазногці
Пад пахай, языком, ад ласкаценю да павекаў

Будзь полюсам майго зьбязглужджанага сэрца
Будзь ракам што зьядае мозг і гэтым мозг сьцьвярджае
Будзь кісароднаю вадою для ўгарэлых лёгкіх

Будзь для мяне падвязкай, станікам, трускамі
Калыскай будзь для цела, нянькай што калыша
Бруд з-пад пазногцяў еш, пі месячную кроў

Будзь прагай і спатоляй, насалодай, голадам
Мінуласьцю і будучыняй, вечнасьцю й сэкундай
Будзь для мяне дзяўчынай, хлопцам, днём і ноччу

Будзь для мяне жыцьцём і радасьцю, будзь сьмерцю
Будзь злосьцю і пагардаю, нудотай і няшчасьцем
Будзь Богам, будзь мурынам, бацькам, маці, сынам

Будзь — не пытайся, як табе я адплачуся
Тады задарма возьмеш найпавабнейшую здраду:
Каханьне, што ў Табе прабудзіць сьмерць

СУТОНЬНЕ МЯККА РАСШМАРГНУЛА

Сутоньне мякка расшмаргнула цесны вузел мозгу—
Сьвятло запаленае лямпы быццам сьсекла рукі

Марозу, што расьлі праз шыбу каб памацаць сэрца —
Крышталь крыві растаяў, лопнула шкляніца лімфы

І інею іржа сплыла з павек; альбо упала
Сьляза ласкавая нарэшце. Сьмерць як злая сука

Прыпала на жывот ва ўзножжы ложка, тыцкаючы
Халодным носам выстаўленыя з-пад коўдры ступні

Пакуль я не схавала іх назад. — Адно тады я
Магла пачаць баяцца; бо ўжо ж ня тое сьмерці,

Як столькі дварнякоў ля сьметніц, безымяннай,
Што развалілася наўзнак на тратуары

І драпаецца ў голае падбрушша; мне ўдалося
Свае ўсе боязі паклікаць імем паасобку

З рэестру сноў, запісак явы, каталёгу
Бібліятэкі, Гоцкага гербоўніка,

Вучнёўскіх хрэстаматый, нарысу фрэйдызму,
З жыцьця сьвятое Кінгі, порначасопісаў

— са сьпісаў памяці... Я толькі сьцераглася
каб выпадкам ня вымавіць Тваё імя.

АКСЫЁМЫ

Выпукласьць маіх грудзей толькі ўпадзінамі
Тваіх далоняў учыняецца
Гладкасьць маіх азадкаў толькі шорсткасьцю
Тваіх пальцаў разгладжваецца

Спажыўнасьць маёй сьліны толькі Твой голад
Вітамінна стварае
Тоеснасьць майго цела толькі боль
— які мне спрычыняеш — пацьвярджае

Царкву майго полу толькі высокая малітва
Твае пажады узвышае
Чорная сьмерць толькі тады рот раскрывае
Калі Тваё жыцьцё азьвецца

Пераклала з польскай мовы
Хрысьціна ГРАМАТОВІЧ

РАФАЛ ВАЯЧАК (RAFAŁ WOJACZEK) нарадзіўся ў 1945 у Міколаве на Шлёнску. Сярэднюю школу пачаў у родным мястэчку, але з увагі на праблемныя паводзіны вучобу працягваў у Катавіцах, а матуру здаваў у Кэндзежыне. У 1963 паступіў на польскую філялёгію Ягелёнскага Ўнівэрсытэту, аднак на першым курсе кінуў унівэрсытэт і пераехаў ва Ўроцлаў, дзе жыў да свае сьмерці ў 1971, нідзе не працуючы і ўтрымоўваючыся дзякуючы дапамозе бацькоў, стыпэндыям і літаратурным ганарарам. У сярэдняй школе пачаў выпіваць, і гэтая звычка зь цягам часу паглыбілася да цяжкага алькагалізму. У яго зьявіліся таксама сымптомы псыхічнай хваробы. У 1965, будучы на абсьледаваньні ў псыхіятрычнай клініцы, Ваячак пазнаёміўся з мэдсястрой, зь якой неўзабаве ажаніўся. У іх нарадзілася дачка, але сямейнае жыцьцё закончылася разводам пасьля няпоўнага году. Жыцьцё Ваячака ва Ўроцлаве было багатае на скандалы, зьвязаныя зь ягонымі п'янкамі і бойкамі. Ва ўроцлаўскіх кнайпах Ваячак надрыўна выбудоўваў свой міт „праклятага паэта". Пасьля некалькіх няўдалых спробаў самагубства Ваячаку ўдалося разьвітацца з жыцьцём 12 траўня 1971 пры дапамозе снатворных сродкаў.

Дэбют Ваячака адбыўся ў 1965 у першым нумары месячніка *Poezja*. Фактычна з моманту дэбюту Ваячак стаўся заўважным і важным паэтам маладога пакаленьня, якога сталі друкаваць у сур'ёзных літаратурных пэрыёдыках. З друкам кніжак было цяжэй, між іншым з увагі на праблемы з цэнзурай. У 1969 Ваячак выдаў свой першы паэтычны томік, *Sezon*, а ў наступным годзе выйшаў другі томік пад назовам *Inna bajka*. У 1972 выйшлі дзьве паэтычныя кніжкі, якія Ваячак падрыхтаваў перад самагубнай сьмерцю: *Nie skończona krucjata* і *Którego nie było*. Яшчэ пры жыцьці паэта ўзьнік ягоны культ, які трывае сярод маладых аматараў паэзіі ў Польшчы і па сёньня. Спрычынілася да гэтага культу як жыцьцёвая легенда Ваячака як збунтаванага скандаліста і дэкадэнта, так і ягоная паэзія, драпежная і брутальная, пісаная натуралістычнай і нярэдка непрыстойнай мовай. „Правінцыя" прадстаўляе жменю Ваячакавых эротыкаў, наогул даволі „спакойных" на фоне ягоных іншых „фізыялягічных" вершаў.

Эдвард Стахура

ЛУЧОК НАД ЫПСЫЛЁНАМ

о, нашаніўскіх рымаў вастрабрамская лапатанда
о, пах, парфума, ляванда
шматколерная шматвясёлачная скочлівая банда
ніколі невычэрпная вівэнда
адкрыўчых картаграфій сівая падрабязная легенда
гасьцінных касьмічных адрасоў паўнюткая агенда
астранаўтычная сярмяга

∞ плыві па заблукалішчах з бадзягай ∞

шаблён
як ты ня любіш тых хто вышаблёньваецца
тых каго ня можаш:

а) ахапкам ахапіць
б) бізуном бацюшкі біцюгнуць
в) ворганамі варгануць
г) горам гаротным гарапахнуць
д) дурдомам дырдануць
е) енісейнуць
ё) ёкнуць
ж) жахнуць
з) замызгам закандрычыць
і) idem
й) йашкар-з'алыніць
к) куд-кудахам кукарэкнуць
л) ломам ламануць
м) мэдалём маёрнуць
н) нікчэмнасьцю натхніць
о) оптам огогокнуць
п) прыручыць
р) раструбам растрыбушыць
с) сілком ссабачыць
т) тандэтным татуажам тарабахнуць
у) ухваткай ухабістай уходаць
ў) ў Іўі ў еўні ўяўніць
ф) фатазмарганіць

х) хвоснуць
ц) цыцнуць
ч) чаркай чапялахнуць
ш) шкваркай шарахнуць
ы) ыгыгыкнуць
э) эхёбтваюматнуць
ю) ююбнуць
я) яйцамі нармальнымі чалавечымі забясьпечыць

бо не сягае болей за дасяг
ні герб твой ні сьцяг

шаблён
піжон адзеты ў ватаваны палітон
nihil novi sub Sole
варыцца ў саўковым расоле
хай яму нялёгкім будзе скон
хай скрутным спрутам спруцянее ён
зараз маладзік
дык
я прапаную йсьці ў тупік
дзе шчыры дзік ашчэрыць клык

пасоб дапамажы і выручы вынятак мілы
бо я стрываць навалу правілаў ня маю сілы

вось пад штрафным паходам расьце балота ў глыб
(для мовазнаўцы-эратамана proszę pana
як кажа беластоцкая бульбашная шпана
дык вось для мовазнаўцы-эратамана
балота — наогул змочаная прасьціна
а мы хапаем альфабэт
шчамлёткамі раструшчваем хрыбет
і выбіраем не калюжыну пад плотам
а балота як балота)

яшчэ раз

пасоб дапамажы і выручы вынятак мілы
бо я стрываць навалу правілаў ня маю сілы

вось пад штрафным паходам расьце балота ў глыб
наёмнай інфантэрыі палкі цялёпкаюцца марна у пагоні
ланцуг стралкоў што прытаіўся у мятліцы
папаўся у абдымкі гожай дрыгвяніцы
штаб інжынэрных войскаў з роспачы заломвае далоні

спусьціць спаніэлі й вадалазы-ганчакі
кажа павадыр

важак важак
табе ня жаль прывучанай зьвярыны

вяртаюцца сабакі — поўсьць апараная й морды
что эта — кажа павадыр гаўнокамандуючы
эта блуждаюшчы агонь

зьніміце каптуры шуляком і сокалам
кажа павадыр

важак важак
табе ня жаль прывучанай зьвярыны

вяртаюцца птушкі — зь нічым і звар'яцелыя
что эта — кажа павадыр
эта няйзьвеснае — адказваюць яму

ну й зь ім хрэн
сказаў бязьмен
давайце дамо швайку ў бок
дзічыне

вогнішча распалім
кабанчыка асмалім
памыем растрыбушым
засмажым скварачку-пячоначку
дастанем самагоначку
асушым

пахоцьце пойдзе ў лес

і нам ня трэба будзе нават дэлегата
пасылаць каб з гушчароў ён выцяг рэнэгата
сам сюды прыкарачкае

тады яго цап і ў шаблён
няхай пасядзіць і ён

мясьнік мясьнік
начальнік кіраўнік
ідуць
партызанскія рэйды па мяса
багамольныя паломніцтвы па мяса
крыжовыя паходы па мяса
перасяленьні народаў па мяса
але ня мы
мы ня тое

мы гэтае
ажынамі чарніцамі брусьніцамі
малінамі калінамі суніцамі
арэхамі рагульнікамі жалудамі
грыбочкамі клубеньчыкамі каранямі
мічурынскімі яблычкамі
лысенкаўскімі грушкамі
лебядой канюшынай
дзікай вішняй шыпшынай
лугавым шчаўём
бурачыным цяўём
зрэбным цярноўнікам цьвілым бульбоўнікам
уежным глогам бярозавым сокам сытным мёдам
падарожнай цыкорыяй
заблуканай калёрыяй
вадой салёнай і прэснай
ну й маннай нябеснай
што ў роце тае
sum per ipsum

ах вы сукі
посна-млосныя бульбаеды
каму трэба
расьлінныя вашы веды
хоць ты памірай ад скукі

давай скаромнае
а то забяру бумагу й карандаш
калі ня даш

дзе чорт ня можа
там бабу шле
што крый ты Божа

дык мігам да мяне давай
артыстка маіх сноў
ультрасупэргіпэр ай-цвай-драй
амаль зь нямога кіно

ужо ідзе
зь ляскам
як крылалёт па вадзе
апрача пасталоў
на ёй нічога
нават трусоў
быццам проста ад Бога
але дзеўка з клёкам
зграбная халера
і ўвішная

як пантэра
або pani teraz

пасоб дапамажы і выручы вынятак мілы
бо я стрываць навалу правілаў ня маю сілы

раз ты сюды прыйшла
(ты раз зь мяне ўжо выйшла бокам)
дык мне скажы як дзеўка з клёкам
чаго шукаеш не згубіўшы

але найперш адзень хаця б хоць гэты во лісток
не, ня чвэрць лістка
не, ня дзьве чвэрці
увесь, каб цябе чэрці

адзетая ў лісток
як у піжаму цмок
лёля гамоначкай даймае
ў амаль нямым кіно іграе

ах сокал мой мальтанскі
пакінь свой нораў пурытанскі
схапіся за мяне як за нагоду
кінь вокам на маю уроду
кінь зубам на мае банбончыкі
мае балёнчыкі
ну-ка ўкусі

ну ты ж ня муха цэцэ
ні рак у рацэ
ну-ка ўкусі во яблычкі заснулыя
тут і яшчэ тут і яшчэ тут і яшчэ тут
мой шалапут

гэтым з табой займуцца, лёля
у дэканаце у палаце у сэнаце
у каганаце камбінаце курнай хаце
на штаце ваце маце мяце
і ў квадраце
не, не сястра мая
хутчэй — мой браце

слухай, лёля
зь цябе не філёляг
гэта вялікі плюс
а я не антыфэміністт
гэта другі плюс
а твой аэрааквадынамічны кшталт

гэта трэці плюс zur Gewalt
нам застаецца толькі міг
і кароткі da each other сіг

я ведаю, лёля
табе гэта як вады напіцца
у гэтым маеш практыку амаль зь дзяцінства
а мне нэрвы да таго як савакупіцца
а потым сумна робіцца як пасьля сьвінства
ды сумна гэта ня тое слова
пасьля мне нейк трагічна-дурнавата-адмыслова

кажуць
ды чаго людзі ня кажуць
што гэта нібы зносіцца зь ідэалам
што абсалют нірвана й так далей
а я лічу што такім чынам даюць драла
ад абсалюту зь ідэалам

даюць лататы драпака ходу
абсалют — ён між намі заўсёды
ну а калі мы да сябе падыходзім патрошку
і дыстанцыю ў прасторы зьмяншаем
а потым кладземся як дошка на дошку
(прабач мне негабляванае параўнаньне)
дык абсалют для сябе *месца ня мае*

ды ўсё гэта выкрунтасы
званай інтэлігенцыі
якая была дурной і дурной засталася
і для якой шкада рыму і рытму
і клясычнага правапісу

не, лёля
гэта ўсё ня гэта
гэта не таму маё вэта
а вось у чым рэч

калі мы той таго
з налапу прыбамбасам у чвякулю шпорка забульбонім
і я забуду ў гэтым апантаньні што мяне падсьцерагае шэрыф
дык можа спадцішка якраз тады той цэпэлін зьявіцца
й буфала біл згары закіне на мяне сваё ласо і зловіць
амнегэтапофіг

дык рэч у тым
што ёсьць як ёсьць
што я ў аблозе
і ў гэтай сытуацыі

я не магу сабе дазволіць нат хвіліны
з табой супольнай рэкрэацыі

аднак давай мы зьменім тэму
бо трохі іншую я маю — вельмі лепшую
вернесься, лёля, да гайлайфу ў родны кут

а на дарогу возьмеш гэты звой
паслужыць ён табе пакуль як строй
закрыеш ім сваіх вабнотаў лік вялікі
пад вечар Сонца йдзе звычайна ў бок Мэксыкі
па ночы доўгай і па доў-
гім і змагарным дні
чакацьмем халадоў

але nota bene, лёля
інакш — матай на вус
пры ўсім пры гэтым гэты звой
ёсьць паэмай папулярна-навуковай
працавіта напісанай сакавітай мовай
уласнаручна маёй нагой

цэзару я цэзарава аддаю
у манеры магчыма
крыху калгасна-ужаснай
за што яны ў мяне пэўна ляснуць
(pluralis maiestatis)
ня ведаю зь якой
але зь цяжкой
гарматы

дык давай, лёля, на сход

ты прачытаеш справаздачу
нібы ў палаце ці ў сэнаце
тут во у нас у сэрцы пушчы
у гушчарох хмызох і чаратох

паехалі далей
вось табе далейшая расьпіска целарухаў
ты памалютку абарочваесься вакол вогнішча-фокусу і ўласнай восі
(як плянэта вакол зоркі)
увадначас звой адвіваючы
і ўвадначас звой чытаючы

твой крут і віў натуральны
рэгулярны і сэксуальны
твае дзівы нівы й нінівы
твае гоні прасторы й разоры

уклад унясуць вырашальны
і сход лягчэй глыне мае горкія пігулкі
за тваім пасярэдніцтвам падкінутыя
як яйкі (ці можа яйцы?) зязюлькі

і звышруплівая вэртыкаль
не пакладзе цябе ў гарызанталь
і не размажа ў СБ і на БТ
як мае ў звычцы

запэўніваю, лёля
клянуся вершакрапна на самога люіса бунюёля
гэта будзе твая найлепшая
у фільме жыцьця роля

цяпер ідзі
зайдзі да мяне калі-небудзь зноў
уступі заглянь заіржы
але безь целааховы без эскорту безь мянтоў
бо да таго, ведаеш, візаві
мянтоў ня трэба
толькі трохі неба
ці хоць бы паветра
ты пагаджаесься
шэрыф?
чуваць цокат ад лесу
здаецца мне што вяртаецца лёля
на кратаванае наша поле

нарэшце
дзе была такі луст часу
гдзе вязень

я нічога ня бачу празь ячмень
што ад перанапругі зроку
узыйшоў мне на воку

давай юпітэры, раз тваю ў марцыпана

я бачу, дзявуля
ты зноў сюды без пахана
ты што, піндзюля
надумала кайфаваць адна?

яе я бачу а дзе ён
давай дакладывай, пісака
рыкае мне шаблён

а лёля і брывом

а лёля і вухом
не павяла —
па радочку па страфе
па трахеі па крысе
паэму-строй адмотваць
пачала:

ты сьвінскі лыч, ты сьвінскі хвост, ты сьвінская ножка, ты кормная матрошка, ты трыбух, ты сальцысон, ты кішка, ты калдун, ты глытаўка, ты таўстун, ты жарун, ты пузач, ты камбікорм, ты прывес за суткі, ты жлоб, ты блін, ты гліст, ты зараза, ты паўзун, ты гад, ты асьпід, ты паразіт, ты мікроб, ты труцень, ты паморак, ты сьверб, ты матыліца, ты замста, ты буфон, ты фармазон, ты хамэлеон, ты ні ў пяць ні ў дзевяць, ты гіцаль, ты стукач, ты пахан, ты палімір, ты нафтан, ты накакаў у каптан, ты даўбешка, ты калодка, ты абух, ты каб ты спух, ты казёл, ты казапас, ты канякрад, ты гіт-парад, ты касіў ясь канюшыну, ты ногі ўшыркі раскіну, ты ўсё могуць каралі, ты белыя розы белыя розы, ты галотнік, ты галашчап, ты галцапнік, ты пяць лыжак заціркі, ты глумак, ты глей, ты сапрапель, ты донная марэна, ты абрыдлая морда, ты шклоўскі вусень, ты курашчуп, ты маслабой, ты асьліны сырадой, ты апсюган, ты абакула, ты абдулейка, ты аглаед, ты апруда, ты забрында, ты клоп, ты блыха, ты мандавошка, ты пранца, ты заглоба, ты зарэзіна, ты калупша, ты клікун, ты лабідуда, ты паскуда, ты аторва, ты атраха, ты ашара, ты баўдыр, ты пухір, ты партач, ты смаркач, ты вітушнік, ты вылупак, ты выпаўзень, ты вылівак, ты залупа, ты запаўзьня, ты заліваха, ты казёл, ты гарладзёр, ты не туды дапёр, ты й ня думаў што так палучыцца, ты палачка за працадзень, ты тандэтнік, ты савецкі сьметнік, ты булава, ты доўбня, ты лукамольны камсамолец, ты бязбожны багамолец, ты лгун, ты мудак, ты няўвега, ты таварышч сапега, ты піжон, ты чуў звон ды ня ведаеш скуль ён, ты галамоўза, ты памаўза, ты валасень, ты трухлы пень, ты ступайка, ты сьмярдзючая фуфайка, ты трапло, ты хамло, ты паехала-пайшло, ты безадбойнае дула, ты гнойная скула, ты фурункула, ты балотная крыца, ты заржавелая сьпіца, ты ў сподніках асьцюк, ты байструк, ты падкідыш, ты цяльпук, ты вяпрук, ты гаўнюк, ты з дупы пук, ты раённы агітатар, ты сэлектарны аратар, ты да ўсёру інтэгратар, ты славянскі махінатар, ты казёл, ты народны графаман, ты нацыянальны халтурнік, ты эспэбэўскі геній, ты эсэндэўскае сьвяціла, ты абэвэгэдэўскі прарок, ты кій табе ў бок, ты бандзюк, ты падлюк, ты гангстэр, ты рэкецёр, ты скурадзёр, ты скуралуп, ты рабаўнік, ты злодзей, ты забойца, ты жулік, ты шыбенічнік, ты падонак, ты азьвяронак, ты прыхвасьцень, ты скупянда, ты жмінда, ты блында, ты манда, ты абібок, ты гультай, ты лайдак, ты шэльма, ты з боку прыпёку, ты бяльмо на воку, ты прышч, ты гемарой, ты экзэма, ты ананіст, ты сракачыст, ты дурное цяля, ты тля, ты забалоньнік, ты лубаед, ты караед шасьцізубы, ты караед валежны, ты казёл, ты п'яны трактарыст, ты саюзны кантрабандыст, ты падлізьнік, ты лісьцімон, ты падлыжнік, ты прыкарытнік, ты падкалоднік, ты ўдарных выкідаў гною тройчы герой, ты хрэн з табой, ты маздан, ты мамай, ты качубей, ты здохлы ўюн, ты пціца гамаюн, ты мардун, ты мымра, ты патароча, ты пудзіла гарохавае, ты чмут, ты перакіднік, ты губашлёп, ты скаруза, ты склют, ты махляр, ты чмур, ты замутак, ты мантульнік, ты саўгасны сакрат, ты тарбахват, ты магілёўскі афраазіят, ты сто баксаў у месяц, ты ідыёт самы настаяшчы на лыжах, ты машоначная грыжа, ты крэцін на канькох, ты немарасьць у вачох, ты баба з возу коням лягчэй, ты шыла на мыла, ты змылак, ты цапное біла, ты кароста, ты з мосту проста, ты казёл, ты цьвілы піць, ты табе ніколі не стаіць, ты брахун, ты сцун, ты бздун, ты дрыстун, ты сярун, ты лапатун, ты ёлупень вусаты, ты скрай бяз хаты, ты жук гнаявік, ты крывы цьвік, ты зь печкі пшык, ты кнот, ты сьляпы крот, ты спароньнік, ты конская п'яўка, ты маляўка, ты вышкрабак, ты курдупель, ты гном, ты адрыга, ты маталыга, ты пустабрэх, ты курам на сьмех, ты пустамеля, ты анучнік, ты бульбаакучнік, ты вышчарака, ты нямытая срака, ты

бязьмен, ты на ўсход дзікі крэн, ты чортведама чый ген, ты габэшны палітрук, ты гнілы друк, ты дуй адсюль мігам, ты давай цягу, ты давай стракача, ты змыйся, ты збрыйся, ты правалі-ся, ты заваліся, ты прападзі, ты згінь, дзынь, дзынь, дзынь.....

адставіць
во гэта быў апошні звон
працяў палкоўнік парамон
сьмяецца нам у вочы ён
меру знай
і цераз край
нават сьвіньні не налівай

нам трэба ў пратаколе
далажыць аб крамоле
каб за гэты злосны прыкол
нацяглі пісаку на кол

падвялá нас інфантэрыя
прывя́ла наша фанабэрыя
спалохалася прыручаная зьвярына
спалахнулася прыножаная птушына

скрышыўся на ім зуб вала зламаўся і кол дзіка
і не стала ні вала ні кала ні дзіка

і нават сэкс-бомба не сэксоціла
а бомбіла паэ-матам

атам?

атам, ядры тваю ў грахі

калі ты нам матам
дык мы табе атам
мы табе так забомбім
што лопнуць трыбухі
хі-хі-хі

пасоб дапамажы і выручы вынятак мілы
бо я стрываць навалу правілаў ня маю сілы

і ўпала як падла як падліна найпадлейшае зь зямных слоў і нацэлены ўніз з кулака выдзюбіў-ся вялікі палец і націснуў гузік але ня быў гэта звычайны прыгожы здаровы гузік як на маёй зялёнай блюзе ад кэвіна клэйна а быў гэта фатальны гузак зьверху струп танюткі струп а спадысподу скула жахлівая фурункула і раздаўся канчатковы апакаліптычны бабах і не засталося зь зямное апукі анічога апроч усеагульнага расчараваньня і вялікага беспардон-нага сораму і злавесны гіганцкі грыб ўзносіўся ўсё вышэй і вышэй але ня быў гэта грыб высакосны як спаміж цёмных хмараў залацістыя косы палымянага Сонца а быў гэта грыб нізакосны папраўдзе зусім няскосны ніжэй найніжэйшага пакосу о пасоб о дапамажы о вы-

ручы вынятак мілы перамагчы глухагучныя ніштожнасьці сілы і вось такім простым чынам сеўшы зайцом на транс-лінгвальны паром прыплыў з таго сьвету nomen omen і стаўся новым дзяньком і стаўся канцасьвету канцом і стаўся галасістым жаўруком пад купалам неба пад адчыненым наросьцеж небавакном пад блакітным бязьмежным антыпляфонам і так вось залунаў лучок над ыпсылёнам.

З польскай мовы пераставрыла
Хрысьціна ГРАМАТОВІЧ

ЭДВАРД СТАХУРА (EDWARD STACHURA) нарадзіўся ў 1937 у дэпартамэнце Ізэр у Францыі, у сям'і польскіх эмігрантаў. У 1948 сям'я з адзінаццацігадовым Эдвардам пераехала ў Польшчу і пасялілася ў Александраве Куяўскім, дзе будучы пісьменьнік закончыў пачатковую школу. Пасьля сярэдняй школы паступіў на францускую філялёгію Каталіцкага Ўнівэрсытэту ў Любліне, але ў 1960 перанёсься на раманскую філялёгію Варшаўскага Ўнівэрсытэту, якую закончыў у 1965.

Стахура дэбютаваў у 1956 у студэнкім часопісе, як паэт-пачатковец атрымаў шмат узнагарод. У 1962 выйшаў ягоны зборнік апавяданьняў *Jeden dzień*, а ў наступным годзе зборнік паэзіі *Dużo ognia*, пасьля якіх Стахуру прынялі ў Зьвяз Польскіх Літаратараў. Потым пайшлі наступныя кніжкі: *Falując na wietrze* (1966, апавяданьні), *Przystępuję do ciebie* (1968, паэма), *Po ogrodzie niech hula szarańcza* (1968, паэма). Пасьля публікацыі раманаў *Cała jaskrawość* (1969) і *Siekierezada* (1971) Стахура стаўся шырока вядомым і папулярным пісьменьнікам.

Стахура быў тыпам пісьменьніка-вандроўніка, паэта-барда. З заплечнікам і гітарай, па розных прычынах і бяз дай прычыны, ён наведаў сотні гарадоў, мястэчак і вёсак у Польшчы. Адзін зь ягоных найбольш папулярных паэтычных зборнікаў называўся папросту *Piosenki* і быў напісаны „пад гітару". Стахура аб'езьдзіў таксама ладны кавалак сьвету: Югаславію, Мэксыку, Блізкі Ўсход, Нарвэгію, Францыю, Швэйцарыю, Канаду, Злучаныя Штаты. І ўвесь час пісаў — пра тое, што бачыў, чуў і перажыў — вершам і прозай. Ягонае жыцьцё праходзіла пад дэвізам *Wszystko jest poezja* (назоў зборніка ягоных эсэ з 1975). Адзін з польскіх крытыкаў напісаў: *Стахура піша ўсім сабой, усё ў ім падпарадкаванае пісаньню, па-за пісаньнем Стахуры ўвогуле не йснуе. Ён толькі як быццам бы вучыўся ў двух (ці нават трох) унівэрсытэтах. Ён толькі як быццам бы ведае што-колечы аб чым-колечы, што ня ёсьць ягоным пісаньнем і ягоным пісьменьніцкім досьведам. Стахура жыве, калі піша, а апроч гэтага не жыве зусім... Творчы працэс у шырокім разуменьні ёсьць у яго адзінай формай лучнасьці са сьветам.*

У другой палове 1970-х у жыцьці й творчасьці Стахуры наступіла драматычная перамена, якую паэт апісаў у прозе *Fabula rasa. Rzecz o egoizmie* (1979). Стахура, адчуваючы, што даходзіць да скраю пісьменьніцкіх магчымасьцяў, у гэтай апошняй сваёй кніжцы запрагнуў стварыць ідэю „чыннай паэзіі", пазбаўленай літаратурнай канвэнцыянальнасьці і зьяднанай з „голым жыцьцём". Год раней Стахура выступіў са Зьвязу Польскіх Літаратараў, „у сувязі з заканчэньнем літаратурнай дзейнасьці", як сам напісаў у афіцыйнай заяве. 24 ліпеня 1979 паэт пакончыў жыцьцё самагубствам.

Выдадзены ў пачатку 1980-х пяцітомны збор твораў Стахуры кананізаваў яго як, бадай, найбольш культавага і ўвадначас вядомага польскага пісьменьніка.

Прадстаўленая ў „Правінцыі" паэма *Лучок над ыпсылёнам (Kropka nad ypsylonem)* была апублікаваная ў 1975. Бравурны пераклад Х. Граматовіч шчодра перадае моўную віртуознасьць Стахуры і зусім нечакана надзяляе сюррэальны польскі твор ня менш сюррэальным беларускім калярытам.

Ежы Плютовіч

Першы сьнег

раптам убачыш прачыненыя дзьверы
засьнежаную яблыню
востры зык працінае нябачныя абрысы
белыя прадметы ападаюць бяз шуму

адзін кот на гарышчы чатыры мяккія стыхіі
пакой бязьлюдніць прастора набірае важкасьці
хай хлопцы пераступяць першыя мужчынскія парогі
хай дзяўчаты сьняць

вецер корміць уяўленьне вусны прымерзьлі да зубоў
і лёд на шыбіне застыў як думка
паўтараем да болю словы старых людзей
нічога напэўна ня ведаем падае першы сьнег

Бельск

пляма што ад сэрца пранікае проста ў цемру
хіліш галаву на сон вочы бачаць у спаньні
за вакном калядніки чаму ў вакне так цёмна
бельск павека над вачніцай кветка ў валасы каханьне

кірмаш на кірмашовым пляцы хоць тэатар прадалі
алькаголь цячэ у жылах кроў цячэ па бруку
падымаесься на пальчыкі танцуеш у сьне танец
эрата белая магія птушка падстрэленая з лука

двары сьмярдзяць сутоньнем мёртвая вада у сажалцы
у ценю замкавай гары чартапалохі як лілеі
расьсеяны і сонны я пакахаў цябе
бельск птушка на вялізным небе напятая цеціва

Прадмесьце

сьнег нібы насьліненая вата
аскялепкі бутэлек саломінкі іржа й агонь
каляіны вызначаюць далячынь між сэрцамі
вароны хмарацца як судзьдзі з гранд гінёлю

ноч вісіць паміж слупоў электраперадачы
жалобным транспарантам
ведаем жыцьцё на памяць хопіць перавесьці ўзад гадзіньнік
маладосьць пульсуе ў стомленых нагах

яблынь-дзічка мышалоўка пук грамнічных сьвечак
набраць у рот зялёнае кары
угадаць што абясколервае кроў
увайсьці на сьцежку да вясны

Дзяцінства

Сыход у даліну. Вогнішчы дымяць на беразе.
Хаціны без вакон на фоне неба.

Рэчка нараджаецца зь пярэстых аблачынаў.
Мы любім колеры зямлі на летаконадзень.

Вочы нам адплюшчваюцца на прасьцяг паветра.
Вецер затаіўся пасярод шкляное клеткі.
Зь цераспалосіцы вады чытаем запіс захапленьня.

Залацістыя й рудыя промні колюць у павекі.
Йдзем навобмацак, танцуюць цені ўкруг агнёў.

Наша сьцежка зарасла хмызоўем забыцьця,
хоць столькі раз мы йшлі праз сон.

Сіла, якая цягне нас вярнуцца,
ёсьць сілай апякунчай ды ўсё ж суворай.

Адкуль прыходзіш, тайніца сусьвету?
Цені вогнішчаў рысуюць шнары ў камянёх.

Выспа Вадавіка

У тую часіну ўсё мела сэнс.
Кропля віна пякла як кропля крыві.
Ліповая калыска ля вясла ад лодкі,
у якой дзяўчаты выплывалі галышом на сажалку.
Гадзіньнік, што сьвяціў дарослым,
калі яны выходзілі ў раззоранае неба.

Поры году мы гадалі па драбніцах:
масьнічыны адшараваныя як сьнежныя сумёты,
кропля атраманту разрываецца як сонца,
лісток паперы з тэкстам першага,
найважнейшага верша,
волас на падушцы — усё, што засталося ад каханьня.

Тая жанчына магла быць дзяўчынкай,
якая ляльцы распавядае летапіс княства Аквітаніі,
і, хутчэй усьцешаная чым зьляканая,
выблытвае з касы ніць бабінага лета.

Той хлопец мог быць зацьвярдзелым хлусам,
які скідае дзіравыя чаравікі перад парогам
і хоча праспаць толькі дзесяць гадоў,
дзесяць шэрых зім.
Дзесяць сонечных выспаў.
Дзесяць стрэмак, дзесяць праклёнаў.

Таго сьвету ўжо няма.
Дом, іртуць ракі, граньнё на розе.
Клубок пылу лашчыцца ля ног.
Той сьвет трывае.
Як начны матылёк камянееш у ягоным ценю.

* * *

Хопіць.
Ужо ніколі не пастаўлю ступняў на белы камень
за паваротам рэчкі Локніцы,
не прабягу травой па пояс
да ціхіх хат на хутары.
Я вырас. Не працягну рукі да матылька і з плачам не скажу,
што больш ня буду гуляць
гэтай рэчкай, лугам, цэлым гэтым сьветам.

Я вырас.
Стаміўся адлётамі, цягнікамі, дарожнымі паказьнікамі,
словамі на разьвітаньне
дый на зачараванасьць колерамі неба і зямлі,
смакам ветру, бегам аблоку.

Я вырас.
Прырода кранае мяне ня больш
за агеньчык запалкі ў халодных сенях.
Калі згасьне ў скразьняку.

Паляваньне

Той самы хісткі масток над ровам
з бляшанкамі з-пад піва між запыленае крапівы.
Усё той самы вечар над ліхтарным слупам.
Тыя самыя людзі асьцярожна ступаюць па абшмуляных масьніцах.
Тым самым паветрам дыхаю ажно да захлісту.

А я ж пражыў інтымную рэвалюцыю.
Я быў сьведкам катастрофы цела.
Быў верным сьведкам.
Падпісваў паказаньні аберуч як містык.
Выцягваў думкі
як жабрак далонь.

Роў ёсьць стыхіяй. Масток вясёлкай.
Я сьляпы.
Палюю на вобраз сьвету.

* * *

Падвойны сьлед ад палазоў. Побач засьнежанага каменя.
Побач кораня старога клёну. Побач. Заўсёды побач.

Унізе побліск чорнага лёду. Нязьмераная глыбіня сажалкі.
Абледзянелы травяністы бераг. За берагам пачынаецца сьвет дарослых.

Сьніцца мне зіма. Сьніцца мне сусьвет зімы.
Замёрзлая сьляза. Пякучая масянжовая клямка.

Круг сьвятла вакол лямпы. Твары над белым абрусам.
Перавернутае дзяцінства. Сон як агромністы сумёт.

* * *

Бераг за другім сном. Паднебная хваля. Цемра.
Даплысьці да выспы. Уратавацца.

Краіна мёртвай вады, лопнутага месяца.
Засохлага дрэва. Маўчаньня глыбокага як звон.

Завяду цябе ўскраем сьвятла аж да дзяцінства.
Каб адчыніць дарогу. Выклікаць падарожжа. З-за рога.

Гэта дно лябірынту. Ліхтарык, сьвечка. Цемра.
Пацучыным крочкам. Пошугам дыму.

Гэта фальшывая зорка. Цемра.
Гэта жывая хлусьня. Жыцьцё пад фальшывай зоркай.

Аддай

Аддай мне лусту хлеба з хрумсткаю скарынкай,
аддай урок зададзены на пазаўчора.

Аддай птушку над садком, аддай ня сьсечанае дрэва,
не дачыненыя весьніцы, не працёртую сьцежку.

Тут не павернеш лёту каменя да шыбіны на ганку
усьлед за промнем зьвечарэлага сонца.

Тут не пераступіш кола абярнуўшы ключ.
Сама больш за струменем і кладкай спатыкнесься аб цень.

Дык утапі у студні зорку. Выпі шклянку малака.
Засьні. Прачніся. Памры. Паабяцай паправу.

Абмый дзіцяці тварык. Пасталей. Павер
у сьвет, які старэецца з табою і са мною.

* * *

Апошнія вакацыі. Канец жніўня. Сонца пазалочвае лістоту.
З галінкай у роце йдзеш па прыступках на ганак.

Тое ўжо ніколі не паўторыцца. Сьмялей.
Змахваеш з твару залаты прамень сонца.

За плотам сакоча матацыкал. Сьцежкай за белы камень,
да ракі. Цёплы, мокры пясок.

Дотык вады. Усё яшчэ цяпер.
Шкілецік рыбіны на пяску. Яшчэ ня час на сьмерць.

* * *

Мох сівы на камені. Холад. Не пайду адсюль.
З павевам ветру даляцеў чырвоны ліст.

Праспаць вялізарную восень, палунаць над сьветам.
Захінуць шыю крацястым шалікам, насунуць шапку на вочы.

Не глядзець у прыцьмёнае сьвятло надвячорка.
Зьбіраецца на дождж. Зьбіраецца на сьмерць.

Павярні ключ у замку, пакладзі ключ пад камень.
Бязьлюдны сад. Сьцежка брыняе вадою. Амін.

* * *

А потым ужо няма месяца і далёкіх грымотаў,
твараў пахіленых над сталом, калі разблісьне сьвятло.

Фіранкі разьвяванай проймай з прачыненага вакна.
Ценяў ад дрэваў у садзе, сьцежкі за рогам дому.

Ты тут сам з сабой, прачніся, абтрасіся з часу.
Гадзіньнік як быццам пасьпяшае, далонь як быццам стыне.

Хто застанецца з табою, калі ня я.
Пры кім адпачнеш, забудзесься, зачыніш з бразгатам вакно.

* * *

Калідорам паўзь люстра, попах дыму.
Цень ад гадзіньнікавай стрэлкі, хай праб'е поўнач.

У сталовым пакоі звоніць парцаляна.
Твая далонь да валасоў у сінім бляску месяца.

Твае вусны ў цемры, я запомню шэпт,
шэлест сукні, скрыгат лыжачкі аб шкло.

Плашч кінуты на крэсла, зябкасьць ад вакна.
Дзьверы хістаюцца на ветры. Хай застанецца гэты дом.

* * *

На стале дагарае сьвечка. Хто ўстае, з грукатам
перакульвае крэсла? Хто запыняе стрэлкі

гадзіньніка, кідае ручнік на люстра? Хто адчыняе
вакно ў садок? Чый гэты дом?

Прачынаесься, спускаеш ступні на зябкую падлогу.
Сьпі, гэта толькі доўгая ноч. Гэта толькі сьвет. Гэта толькі

прысмак попелу, прысмак іржы. Нічога тут ня дзеецца.
Усё ўжо сталася. Усё месьціцца ў прамежку між мной і табой.

* * *

Я ўратую цябе, мой сьвет, мая ноч, маё
небыцьцё. Распалю цябе, маё каханьне, даплыву

да майго берагу, абатру табе пот, мая сьмерць.
Захліснуся маёй мовай, маім

сном, маім адлюстраваньнем. Адчыню
наросьцеж дзьверы ў халодныя сені.

Адбудую цябе, мой дом, сьцежку да
майго дому, майго дзяцінства, майго попелу.

* * *

Пастаў кропку за мёртвым сказам, абапрыся аб цень.
Адчыні вакно ў садок, удыхні паветра.

Узьлезь па драбіне на гарышча, зьнясі гадзіньнік
у склеп. Падзямельная вада, па вусны,

па бровы. Невыразнае адбіцьцё ў люстры,
нячутнае рэха. Прадмет, які стаецца

бязважкім. Павук, які тчэ павуціньне ў адкрытым
роце. Дом, адбудаваны са сну.

* * *

Скокам цераз роў, бясшумна, ажно на той бок.
Удараны галінкай у вусны, прасьветлены промнем раніцы, сутоньня.

Пагрукаеш у ваканіцу ад садка, абудзіш памёрлых.
Няхай тут пастаюць, няхай паскачуць, з прыкурам, з прыдурам.

Як жа важыць галава, як жа сьлязіцца трэцяе вока, як жа нікчэмніцца сон.
Папяровае крыло анёла, сьцежка толькі ўглыб люстра.

Сьмяцярня, барахлярня, загаджаная лазьня, чыстая паэзія.
Чыстая роспач, божае пакараньне, істы цуд.

Пераклала з польскай мовы
Хрысьціна ГРАМАТОВІЧ



ЕЖЫ ПЛЮТОВІЧ (JERZY PLUTOWICZ) нарадзіўся ў 1947 у Бельску, з 1976 жыве ў Беластоку. Сам пра сябе кажа, што хоць ёсьць польскім патрыётам, адначасова адчувае сябе беларусам і расейцам, з увагі на сямейныя карані. Закончыў расейскую філялёгію ў Варшаўскім Унівэрсытэце. У Варшаве, у часопісах *Współczesność* і *Twórczość*, апублікаваў свае першыя вершы. Ягоны першы паэтычны томік, *Niegdyś to znaczy nigdy*, выйшаў у 1975. Потым наступныя: *Zasłyszane do końca* (1981), *Pusty zegar* (1987), *Motyl i kamień* (1992), *Rzeka. Cienie na wodzie* (1996). У 1998 выйшла кніжка ягоных выбраных вершаў пад назовам *Kotlina*, а ў 2000 — *Zapomniana wojna (Okno na sad). Wiersze z lat 1995-1999*. Вершы, перакладзеныя ў „Правінцыі", выбраныя якраз з гэтых двух апошніх зборнікаў.

„Незаўважальна", пражываючы й публікуючы на правінцыі, Ежы Плютовіч стаўся адным з найвыдатнейшых польскіх паэтаў-лірыкаў. У прадмове да *Kotliny* Плютовіч напісаў: *Добры, цікавы верш павінен мець у сабе нешта ад магіі, малітвы, міту, сну. Чым ёсьць паэзія? Мне прыгадваецца сьцьвярджэньне Сьв. Аўгустына наконт часу. Ведаем, чым ёсьць час, але калі хочам яго дэфініяваць, не даем рады. Я ведаю, чаго ў паэзіі кроўна не пераношу. Не люблю рыторыкі, адцягненых паняткаў, абстрактнасьці, актуальных і палітычных тэмаў. Стараюся выбудоўваць сьвет на падмурку слоўных вобразаў. Захаваць мінулае, вярнуць страчаны час, памяць. Блакітнае дзяцінства... Мястэчка. І столькі таго? Ці ажно столькі?* Бельск, задрыпанае правінцыйнае мястэчка, у вершах Ежы Плютовіча набывае мройна-магічную, міталягічную аўру.

Эдвард Стахура, якога таксама прадстаўляем у гэтым выпуску „Правінцыі", напісаў пра паэзію Плютовіча: *Выдатныя тэксты. Ужо некалькі гадоў таму мне хацелася прачытаць іх. Беспахібна складаныя і проста з мосту. Пасьпешлівыя і дакладныя як хуткая дапамога. Багатыя як сьметнік мэтраполіі. Дзіўныя як вока мёртвай рыбіны. Хірургічныя. Андалюзійскі сабака. Белачорны луг. Black and white negative film for colour prints. Шкляная вата на патыку для лізаньня. Ртуць для піцьця. Тропік і ледавік сярэдняга поясу. І гэтак далей.*

Патрык Мадыяно

Віла Журба

(заканчэньне; пачатак у папярэднім нумары)

VIII

— Як мага сьвятлейшага партвэйну, дзетка, — паўтарае Мэйнт.

Бармэнка ня цяміць.

— Сьветлага?

— Вельмі-вельмі сьветлага.

Але ён кажа гэта неяк безь перакананьня.

Ён праводзіць даланёю па кепска паголеных шчоках. Дванаццаць гадоў таму ён галіўся два або й тры разы на дзень. Недзе на дне схованкі ў доджы валялася электрабрытва, але ён казаў, што гэтая прылада нічога ня вартая, бо ягоная барада стала занадта калянаю. Нават найлепшыя лёзы шчарбіліся на ёй.

Бармэнка вярнулася з бутэлькай „Сандэмана" і налівае яму ў келіх:

— У мяне няма... сьветлага.

Яна вымаўляе „сьветлага" шэптам, як быццам гэта было непрыстойнае слова.

— Гэта неістотна, дзетка, — кажа ёй Мэйнт.

Ён усьміхаецца. І адразу маладзее. Дзьмухае ў келіх і назірае за рабізной на паверхні партвэйну.

— А саломінка ў вас ня знойдзецца, дзетка?

Яна прыносіць яму саломінку неахвотна, з зацятым тварам. Ёй ня больш за дваццаць гадоў. Яна, відаць, думае: „Колькі часу гэты ёлупень зьбіраецца тут сядзець? А той у крацястым пінжаку, там далей?" Як і штодня, а восьмай гадзіне яна заступіла Жэнэўеву, якая тут была ўжо ў пачатку шасьцідзясятых і ўвесь дзень стаяла за стойкай „Спортынгу", каля купальных кабінаў. Ветлівая бляндынка. Здаецца, у яе былі шумы ў сэрцы.

Мэйнт павярнуўся да чалавека ў крацястым пінжаку. Гэты пінжак — адзінае, што прыцягвае ўвагу да ягонай асобы. Усё іншае ў ягоным выглядзе — пасрэднае: чорныя вусікі, даволі вялікі нос, цёмна-каштанавыя валасы, зачасаныя назад. Хвілю таму здавалася, што ён п'яны ўдрызг, а цяпер ён сядзіць выпрастаны, з самазадаволенай усьмешкай у куточку вуснаў.

— Ці вы мяне не зьвязалі б, —гаворыць ён няўпэўнена, ледзь варочаючы языком, — з нумарам 233 у Шамбэры?

Бармэнка набірае нумар. Нехта адказвае на другім канцы дроту. Але чалавек у крацястым пінжаку сядзіць незварушна за столікам.

— Мэсьё, там адазваліся, — нэрвуецца бармэнка.

Ён не паварушыўся ні на валасок. Талопіць вочы, зьлёгку выставіўшы падбародак.

— Мэсьё...

Усё роўна што камень. Яна вешае трубку. Пэўна, захвалявалася. Усё-ткі дзівакі гэтыя два наведнікі... Мэйнт назірае за сцэнай з-пад прымружаных павекаў. Праз некалькі хвілінаў той другі паўтарае яшчэ больш няўцямным голасам:

— Ці вы мяне не зьвязалі б... з нумарам 233 у Шамбэры...

Бармэнка ні зварухнецца. Той цягне сваё:

— Ці вы мяне не зьвязалі б...

Яна пацепвае плячамі. Тады Мэйнт нахіляецца да тэлефона і сам набірае нумар. Калі ў трубцы адзываецца голас, ён спрабуае перадаць яе крацястаму, але той не варушыцца, вырачыўшыся на Мэйнта.

— Бярэце, мэсьё, — мармыча Мэйнт. — Бярэце...

Урэшце адкладвае трубку на стойку і пацепвае плячыма.

— Вам, пэўна, хочацца спаць, дзетка? — пытаецца ён у бармэнкі. — Мне не хацелася б вас затрымоўваць.

— Нічога. Мы й так зачыняем а другой гадзіне ўначы... Яшчэ прыйдзе куча народу.

— Куча народу?

— Нейкі кангрэс. Яны сюды й прываляць.

Яна налівае сабе шклянку кока-колы.

— Ня надта дзе павесяліся тут зімою, га? — сьвярджае Мэйнт.

— Я й так зьеду ў Парыж, — кажа яна шорсткім тонам.

— Ваша праўда.

Той ззаду пстрыкае пальцамі.

— Калі ласка, наліце мне яшчэ адно марціні. — Потым дадае: — І зьвяжэце з 233 у Шамбэры.

Мэйнт яшчэ раз набірае нумар і, не адварочваючыся, кладзе трубку на крэсьле побач. Дзяўчына рагоча, як вар'ятка. Ён падымае галаву, і ягоныя вочы натыкаюцца на старыя

здымкі Эміля Але і Джэймса Кутэ пад бутэлькамі апэрытываў. Да іх дачапілі здымак Даніэля Анрыкса, які загінуў некалькі гадоў таму ў аўтамабільнай катастрофе. Гэта напэўна Жэнэўева, другая бармэнка. Яна была закаханая ў Анрыкса, калі працавала ў „Спортынгу". У часы Кубка Хулігантнасьці.

IX

Дзе цяпер той кубак? На дне якой шафы? У якой барахольні? Апошнім часам ён служыў нам папяльнічкай. Падстаўка, на якой стаяла танцорка, была абведзеная круглым борцікам. Туды мы і страсалі цыгарэтны попел. Магчыма, мы забылі кубак у гатэлі, ды ўсё ж мне дзіўна, як я, з маёй прывязанасьцю да рэчаў, мог яго ня ўзяць.

Спачатку, аднак, здавалася, што Івона ім дарожыць. Паставіла яго на самае віднае месца, на стол у гасьцёўні. Гэта быў пачатак ейнай кар'еры. Потым пойдуць „Вікторы" ды „Оскары". Калі-небудзь яна з чульлівасьцю згадае пра кубак журналістам, бо я ні трохі не сумняваўся, што Івона стане зоркаю кіно. А пакуль мы прышпілілі на сьцяну ў ваннай вялізны артыкул з *L'Echo Liberté*.

Мы лайдачылі дзень за днём. Уставалі досыць рана. Раніцай часта стаяла імгла ці, хутчэй, сіняя смуга, у якой нам здавалася, што мы пазбаўляемся ад зямнога прыцягненьня. Мы ставаліся лёгкімі, такімі лёгкімі... Калі мы спускаліся бульварам Карабасэль, нашы ступні ледзь краналіся ходніка. Дзявятая. Сонца неўзабаве разьвее гэтую далікатную смугу. На пляжы „Спортынгу" яшчэ ні душы. Толькі мы і хлапец у белым, які выдаваў лежакі і парасоны. Івона адзявала двухдзельны купальнік апалавага колеру, а я пазычаў у яе купальны плашч. Яна купалася. Я назіраў, як яна плавае. Сабака таксама сачыў за ёю. Яна мне махала рукою, сьмяялася, крычала, каб я далучыўся да яе. Я гаварыў сабе, што ўсё гэта занадта прыгожа і што заўтра абавязкова здарыцца нейкая бяда. 12 ліпеня 1939, думаў я, хлопец майго кшталту, у купальным плашчы ў чырвона-зялёныя палоскі, назіраў, як ягоная нарачоная плавае ў басэйне ў Эдэн-Року. Ён, як і я, баяўся слухаць радыё. Ды нават тут, на мысе Антыб, яму не ўцячы ад вайны... У ягонай галаве круціліся назвы сховішчаў, але ён ужо ня меў часу туды ўцячы. На колькі сэкундаў мяне ахапляў невытлумачальны жах, але тут яна выходзіла з вады і клалася побач са мною, каб пазагараць.

Каля адзінаццатай, калі людзі пачыналі запаўняць „Спортынг", мы сыходзілі да нечага накшталт малой заточкі. Туды можна было прайсьці тэрасай рэстарану па збуцьвелых сходах, якія засталіся з часоў Гордана-Грама. Унізе быў дробнакамяністы пляж з параскіданымі скалістымі камлыгамі. Там таксама стаяў малюпасенькі дамок з аканіцамі. На хісткіх дзьвярах былі выразаныя дзьве гатычны літары: ГГ — Гордан-Грам — і дата — 1903. Ён напэўна паставіў гэты лялечны дамок сваімі рукамі і прыходзіў сюды паразважаць. Далікатны, прадбачлівы Гордан-Грам. Калі сонца прыпякала замоцна, мы ўмомант хаваліся ўсярэдзіну. Паўзмрок. Зыркая пляма сьвятла ля парога. Лёгкі попах плесьні, да якога мы ў рэшце рэшт прызвычаіліся. Шум адліву, нароўні манатонны і супакойлівы, як стукат тэнісных мячыкаў. Мы зачынялі дзьверы.

*

Яна купалася і загарала. Я аддаваў перавагу засені, як мае ўсходнія продкі. Пасьля паўдня мы вярталіся ў „Эрмітаж" і не выходзілі з нумару ажно да сёмай або восьмай. Івона выцягвалася пасярэдзіне прасторнага балькону, я прыладжваўся побач, прыкрываючы галаву белай „каляніяльнай" панамай, адной зь нешматлікіх рэчаў, што мне дасталіся ад бацькі і якой я асабліва даражыў, таму што мы купілі яе разам. Гэта было ў краме „Спорт і клімат", на рагу бульвару Сэн-Жэрмэн і вуліцы Сэн-Дамінік. Мне было восем гадоў, а мой бацька зьбіраўся ехаць у Бразавіль. Што ён там хацеў рабіць? Ён мне так ніколі і не сказаў.

Я спускаўся у хол па часопісы. Каб дагадзіць замежным гасьцям, у гатэлі прадавалі большасьць эўрапейскіх выданьняў. Я купляў усе: *Oggi, Life, Cinémonde, Der Stern, Confidential...* Мімалётам зіркаў на вялізныя загалоўкі штодзённых газэтаў. Нешта нядобрае адбывалася ня толькі ў Альжыры, але і ў мэтраполіі ды па ўсім сьвеце. Мне не хацелася пра тое нічога ведаць. Страх зноў падступаў да майго горла. Я меў надзею, што ілюстраваныя часопісы пра ўсё тое зусім ня згадвалі. Не. Не. Пазьбягаць сур'ёзных тэмаў. Мяне зноў ахапляла паніка. Каб супакоіцца, я куляў кілішак каньяку ў бары і падымаўся ў нумар са стосам часопісаў. Мы чыталі іх, валяючыся ў ложку або й на падлозе, перад расчыненымі дзьвярыма на балькон, пасярод залатых плямаў ад апошніх праменьняў зьвечарэлага сонца. Дачка Ланы Тарнэр зарэзала матчынага каханка. Эрал Флін памёр ад сардэчнага прыступу якраз калі яго-

ная маладая сяброўка пыталася, куды ёй страсянуць попел, а ён яшчэ пасьпеў ёй паказаць на раскрытую зяпу плюшавага леапарда. Анры Гара памёр як валацуга. А прынц Алі Хан — у аўтамабільнай катастрофе недзе ў Сюрэнах. Радасныя здарэньні мне не запаміналіся. Мы выразалі некалькі фатаграфій і наляпілі іх на сьцяну пакоя — гатэльная адміністрацыя, здаецца, не чаплялася.

Нудныя папалудні. Гадзіны цягнуліся. Івона часта хадзіла ў чорным шаўковым халаце ў чырвоныя гарошынкі, сям-там прадзіраўленым. Я забываўся здымаць сваю старую „каляніяльную" панаму.

Часопісы з павыдзіранымі старонкамі засьмечвалі падлогу. Паўсюль валяліся флякончыкі з крэмам для загару. Сабака драмаў на фатэлі. А мы ставілі кружэлкі на старым прайгравальніку. Забываючыся ўключыць сьвятло.

*

Нанізе пачынаў граць аркестар, і ў рэстаране зьбіраліся госьці. Паміж музычнымі кавалкамі мы прыслухоўваліся да шуму размоваў. З таго гоману часам выдзяляўся нейкі жаночы голас або выбух сьмеху. І зноў граў аркестар. Я пакідаў дзьверы на балькон адчыненымі, каб да нас даляталі тыя гамана й музыка. Яны нас ахоўвалі. Прытым яны пачыналіся штодня той самай парою, і гэта абазначала, што сьвет працягваў круціцца. Толькі дакуль?

Дзьверы ў ванную вымалёўваюць прастакутнік сьвятла. Івона накладае макіяж. Я, усьпершыся на парэнчы балькона, назіраю за тымі людзьмі (бальшыня зь іх адзетая па-вечараваму), за беганінай гарсонаў, за музыкамі, кожную міну якіх я ўжо ведаю на памяць. Вось кіраўнік аркестру нахіліўся, амаль прыціснуўшы падбародак да грудзей. А калі аркестар пераставаў граць, ён гвалтоўна ўскідваў галаву з адкрытым ротам, нібы задыхаючыся. У скрыпача быў лагодны, крыху парасячы твар, ён заплюшчваў вочы і ківаў галавою, уцягваючы паветра.

Івона гатовая. Я запальваю лямпу. Яна ўсьміхаецца мне з таямнічым тварам. Дзеля забавы яна нацягнула чорныя пальчаткі ажно за локці. Стаіць пасярод усяго таго бязладу, каля незасланага ложка, параскіданых пэнюараў і сукенак. Мы выходзім на пальчыках, стараючыся не зачапіць сабаку, папяльнічку, прайгравальнік і пустыя шклянкі.

*

Позна ўначы, калі Мэйнт завозіў нас назад у гатэль, мы слухалі музыку. Суседзі з-за сьцяны скардзіліся некалькі разоў на „гармідар", які мы падымалі. Я даведаўся ад парцье, што мы жылі побач зь ліёнскім прамыслоўцам і ягонай жонкаю, якую я заўважыў у дзень Кубка Хулігантнасьці, калі яна паціскала руку Фасар'е. Я паслаў ім букет півоняў з запіскай: „Прымеце гэтыя кветкі як перапросіны ад графа Хмары".

Калі мы вярталіся, сабака пачынаў жаласьліва й працягла брахаць, і гэта трывала з гадзіну. Супакоіць яго было немагчыма. Тады мы заводзілі музыку, каб заглушыць ягоны брэх. Пакуль Івона распраналася і мылася, я прачытваў ёй некалькі старонак з кніжкі Маруа. Мы не выключалі прайгравальнік, і зь яго ўвесь час гучала дзікая песьня. Мне невыразна чуліся ўдары кулаком у дзьверы, якія нас аддзялялі ад ліёнскага прамыслоўца, і тэлефонныя званкі. Ён, відаць, скардзіўся начному парцье. У рэшце рэшт яны нас, напэўна, выкінуць з гэтага гатэлю. Ну й хай сабе. Івона адзявала пляжны халат, і мы браліся гатаваць ежу для сабакі (дзеля гэтага мы мелі кучу кансэрваў і нават плітку). Мы мелі надзею, што паеўшы, ён перастане брахаць. Стараючыся перакрычаць гарлапаннага сьпевака, жонка ліёнскага прамыслоўца вішчала: „Ды зрабі што-небудзь, Анры, зрабі што-небудзь. ПАЗВАНІ Ў ПАЛІЦЫЮ..." Іхны балькон быў побач з нашым. Мы не зачынялі бальконныя дзьверы, і прамысловец, стаміўшыся грукаць у перагародку, лаяў нас знадворку. Тады Івона скідала пэнюар, нацягвала свае доўгія чорныя пальчаткі і выходзіла на балькон зусім голая. Той вырачаўся на яе, пачырванелы. Жонка адцягвала яго за руку, павіскваючы: „Ах вы падлюгі! Шлюха!"

Мы былі маладыя.

*

І багатыя. Шуфляда ейнага століка была запханая банкнотамі. Адкуль былі тыя грошы? Я не наважваўся запытацца. Аднойчы, калі яна акуратна раскладала пачкі банкнотаў, каб зачыніць шуфляду, яна патлумачыла, што гэта быў ганарар за фільм. Яна дамаглася, каб ёй выплацілі гатоўкай, паперынамі па пяць тысяч. Яна дадала, што таксама атрымала грошы паводле чэку з Кубка Хулігантнасьці. Паказала мне газэтную абгортку: восемсот тысяч франкаў па тысячы. Ёй падабаліся дробныя купюры.

Яна мне ветліва запрапанавала карыстацца гэтымі грашмі, але я адмовіўся. На дне маёй валізы заставалася ўсё яшчэ восемсот-дзевяць-

сот тысяч франкаў. Гэтую суму я атрымаў, прадаўшы аднаму жэнэўскаму букіністу два „рэдкія" выданьні, купленыя за бесцань ад старызьніка ў Парыжы. Я разьмяняў у рэцэпцыі пяцідзесяцітысячныя купюры банкнотамі па пяць тысяч і прывалок іх у пакой у пляжнай торбе. Апаражніў торбу на ложак. Яна высыпала свае банкноты з шуфляды, і разам яны ўтварылі ўражлівы пагорак. Мы глядзелі, як зачараваныя, на гэтую кучу грошай, якую мы пасьля распусьцілі без аглядкі. Яна, як і я, упадабала гатоўку, гэта значыць, гатовыя лёгкія грошы, якія расьпіхваеш сабе па кішэнях, шалёныя грошы, што працякаюць скрозь пальцы, як вада.

*

Пасьля таго, як зьявіўся артыкул, я выпытваў яе пра дзяцінства, якое яна правяла у гэтым мястэчку. Яна ўхілялася ад адказаў, таму што ёй бясспрэчна хацелася быць як мага больш таямнічай і яна, пэўна, крыху саромелася свайго „сьціплага" паходжаньня перад „графам Хмарой". Каб падтрымаць сваю жыцьцяпісную вэрсію, я ёй распавядаў байкі пра сваіх продкаў. Мой бацька пакінуў Расею вельмі маладым, з маці й сёстрамі, уцякаючы ад рэвалюцыі. Яны жылі нейкі час у Канстантынопалі, Бэрліне й Брусэлі, пакуль не аселі ў Парыжы. Мае цёткі зарабляли на жыцьцё манэкеншчыцамі ў Ск'япарэльлі, як бальшыня прыгожых высакародных расеек зь белай эміграцыі. У дваццаць пяць гадоў мой бацька адплыў на парусным караблі ў Амэрыку і ажаніўся там з дачкою ўласьніка сеткі крамаў „Вулварт". Потым ён разьвёўся і атрымаў ад жонкі вялізную кучу грошай. Вярнуўшыся ў Францыю, ён сустрэў маю маму, ірляндзкую сьпявачку зь мюзік-холу. Нарадзіўся я. Яны абое загінулі ў авіякатастрофе каля мыса Фэра ў ліпені 1949-га. Мяне выхоўвала бабка, у Парыжы, на першым паверсе ў доме на вуліцы Лорда Байрана. Вось так.

Ці яна мне верыла? І так, і не. Перад сном ёй трэба было распавесьці „цудоўную" казку пра людзей з арыстакратычнымі тытуламі і кінааакторак. Колькі ж разоў я апісваў ёй раман майго бацькі з акторкай Люпэ Вэлес, які адбываўся ў гішпанскай віле ў Бэвэрлі Гіле! Але калі я прасіў, каб яна расказала мне пра сваю сям'ю, яна адмаўлялася: „Ох, гэта нецікава..." Гэта было адзінае, чаго мне не хапала для шчасьця: аповеду пра яе дзяцінства і дзявочыя гады ў правінцыйным мястэчку. Як мне было растлумачыць ёй, што для мяне выгнаньне, Галівуд, расейскія князі і эгіпэцкі прынц Фарук бляклі і цьмянелі перад той нязвыклай і амаль незразумелай істотай — малой францужанкай?

X

Гэта адбылося аднойчы надвячоркам, зусім проста. Яна сказала: „Сёньня павячэраем у майго дзядзькі". Мы чыталі часопісы на бальконе. Мне прыгадваецца, што на вокладцы аднаго зь іх быў здымак ангельскай акторкі Бэлінды Лі, якая загінула ў аўтамабільнай катастрофе.

Я зноў апрануў свой флянэлевы гарнітур, а дзеля таго, што каўнер маёй адзінай белай кашулі быў дашчэнту працёрты, нацягнуў белую тэніску, якая няблага пасавала да майго сіне-чырвонага гальштука *International Bar Fly*. Я задаў сабе шмат клопату, каб завязаць яго пад мяккім каўняром тэніскі, але мне хацелася мець дагледжаны выгляд. Я ажывіў свой пінжак, засунуўшы ў яго кішэньку цёмна-сінюю хустачку, якую я калісьці купіў дзеля яе глыбокага адценьня. Што да абутку, дык я вагаўся паміж парванымі макасынамі, сандалямі і амаль новымі пантофлямі „Вэстан" на тоўстых каўчукавых падэшвах. Я выбраў апошнія, палічыўшы іх найбольш адпаведнымі. Івона намовіла мяне ўставіць манокль: гэта мусіла зацікавіць дзядзьку і падаць мяне ў забаўным выглядзе. Праўду кажучы, мне зусім не хацелася яго забаўляць, і я спадзяваўся, што гэты чалавек убачыць мяне такім, які я ёсьць: сьціплым і сур'ёзным хлопцам.

Яна адзела белую шаўковую сукенку і турбан колеру ружовай фуксіі, як у дзень розыгрышу Кубка Хулігантнасьці. Яна накладала макіяж даўжэй чым звычайна. Вусны пафарбавала пад колер турбана. Нацягнула свае чорныя пальчаткі ажно да паловы перадплеччаў, і мне падумалася, што гэта было занадта экстравагантна, як для вячэры ў свайго дзядзькі. Мы ўзялі з сабою сабаку.

У холе гатэлю некаторыя госьці глядзелі на нас, стаіўшы дыханьне. Сабака бег перад намі, танцуючы сваю кадрыль. Гэта зь ім здаралася, калі мы зь ім выходзілі ў нязвыклую пару.

Мы селі на фунікулёр.

*

Мы пайшлі вуліцай Пармэлян, якая была працягам вуліцы Руаяль. Я паступова адкрываў для сябе зусім іншае мястэчка. Мы пакінулі за сабою ўвесь штучны поваб курорту, усю тую танную апэрэтачную дэкарацыю, у якой памёр ад тугі ў выгнаньні эгіпэцкі па-

ша. Прадуктовыя крамы й майстэрні, дзе напраўлялі матацыклеты, замянілі люксусовыя крамы курорту. Неверагодна, колькі там было тых матацыклетных майстэрняў. Часамі трапляліся па дзьве побач, з выстаўленымі на ходнік ужыванымі вэспамі. Мы прайшлі каля аўтобуснай станцыі. Аўтобус з уключаным маторам рыхтаваўся ў дарогу. На баку ў яго была назва фірмы і маршрут: Сэўрые — Прыні — Альбэрвіль. Мы дайшлі да скрыжаваньня вуліцы Пармэлян з алеяй Маршала Леклерка. Гэтая алея насіла імя Маршала Леклерка ўсяго на невялікім адцінку, таму што пераходзіла ў краёвую шашу 201 у Шамбэры. Абапал яе расьлі плятаны.

Сабака страхавіта ціснуўся як мага бліжэй да дамоў. Ягонаму стамлёнаму сілюэту лепш пасаваў інтэр'ер „Эрмітажу", тым часам як на прадмесьці ягоная прысутнасьць выклікала цікаўнасьць. Івона не адзывалася, але ваколіца была ёй знаёмая. Яна, пэўна, гадамі хадзіла гэтай дарогай, у школу або на прыватці ў мястэчка (назоў „прыватка" ня надта падыходзіць — яна хадзіла на „балі" альбо на „дансынгі"). Што да мяне, дык я ўжо быў забыўся пра хол „Эрмітажу", мне было усё роўна, куды мы йшлі, але я быў загадзя гатовы жыць зь ёю тут, на краёвай шашы нумар 201. Шыбіны нашага пакою дрыжалі б ад грузавікоў на шашы, як у кватэрцы на бульвары Сульт, дзе мы з бацькам пражылі некалькі месяцаў. Я адчуваў сябе так лёгка. Толькі новыя пантофлі крыху намулялі мне пяткі.

Зьмяркалася, калі мы праходзілі ўсьцяж шэрагу двух-трохпавярховых белых дамкоў абапал вуліцы, у якіх было нешта ад каляніяльнай атмасфэры. Такія дамкі стаялі у эўрапейскіх кварталах Тунісу ці нават Сайгону. Час ад часу дамок у форме горнай хаткі пасярод маленечкага садочка нагадваў мне, што мы ўсё ж былі ў Верхняй Савоі.

Мы мінулі цагляную царкву, і я запытаўся ў Івоны, як яна называецца. „Сьвятога Хрыстафора", — сказала яна. Я, пэўна, расчуліўся б, уявіўшы, як яна йдзе першы раз да прычасьця, але, баючыся расчараваньня, не запытаўся ў яе пра тое. Крыху далей стаяў кінатэатар *Splendid*. Ягоны брудна-бэжавы фасад і чырвоныя дзьверы з круглымі ваконцамі нагадалі мне кінатэатры ў прадмесьцях Парыжу, у ваколіцы алеяў Маршала дэ Лятра дэ Тасіньі, Жана Жарэса або Маршала Леклерка. Яна, відаць, хадзіла сюды ў шаснаццаць гадоў. У *Splendid* гэтым вечарам ішоў фільм нашага дзяцінства — „Вязень Зэнды". Я ўявіў сабе, як мы бярэм у касе два квіткі на балькон. Я ведаў гэтую залю здаўна, крэслы з драўлянымі сьпінкамі і дошка з аб'явамі перад экранам: Жан Шэрмо, уладальнік квяцярні, вуліца Самэе 23. ПРАЛЬНЯ, вуліца Прэзыдэнта Фора 17. Дэку, радыёпрыёмнікі, тэлевізары, прайгравальнікі, алея д'Алеры 23... Далей пайшлі кавярні. За шыбай апошняй было відаць, як чатыры гарсоны з хвалістымі фрызурамі гулялі ў настольны футбол. Зялёныя столікі стаялі на вольным паветры. Госьці за імі разглядалі сабаку зь цікаўнасьцю. Івона зьняла свае доўгія пальчаткі. Увогуле, яна адчула сябе тут зусім свабодна, і ў сваёй белай шаўковай сукенцы выглядала, як быццам выйшла пагуляць на мясцовае сьвята або на танцы 14 ліпеня.

Мы прайшлі мэтраў сто ўздоўж панурага драўлянага паркану. На ім былі налепленыя разнастайныя афішы. Рэпэртуар кінатэатру *Splendid*. Абвесткі парафіяльнага сьвята і прыезду цырку Піндэр. Напалову зьдзертая выява Люі Марыяно. Старыя, ледзь чытэльныя надпісы: „Свабоду Анры Мартэну"... „ Рыджвэй — прэч"... „Альжыр застанецца францускім"... Сэрцы, пранізаныя стралой, зь ініцыяламі. Вакол стаялі трохі перакошаныя бэтонныя ліхтарныя слупы. Ліхтары кідалі на паркан цені ад плятанаў ды іхнай шаматлівай лістоты. Ноч была вельмі цёплая. Я зьняў пінжак. Мы спыніліся перад уваходам у вялізарны гараж. Па правы бок, на дзьверцах, была бронзавая плітка з гатычным надпісам: Жакэ. І вывеска, на якой я прачытаў: „Запасныя часткі для амэрыканскіх аўтамабіляў".

*

Ён чакаў нас на першым паверсе ў пакоі, які, мусіць, служыў адначасова гасьцёўняй і сталовай. Два акны і зашклёныя дзьверы выходзілі на гараж, што нагадваў разьлеглы ангар.

Івона прадставіла мяне, дачапляючы мой шляхецкі тытул. Я зьбянтэжыўся, але ён прыняў тое як нешта зусім натуральнае. Павярнуўшыся да яе, ён запытаўся бурклівым тонам:

— А ці твой граф любіць эскалёпы ў сухарах? — У яго быў вельмі выразны парыскі акцэнт. — Бо я згатаваў вам эскалёпы.

Ён гаварыў, не выймаючы з рота цыгарэты, — ці, хутчэй, недапалка, — і мружыў вочы. Голас у яго быў глыбокі і асіплы, як у п'яніцы або зацятага курыльшчыка.

— Сядайце...

Ён паказаў на сіняватую канапу пры сьцяне. Потым дробным, хісткім крокам рушыў

да прылеглай кухні. Было чуваць, як ён адчыняе духоўку.

Ён вярнуўся і паставіў на ўскрай канапы тацу з трыма шклянкамі і поўнай пасудзінай печыва, якое называюць кашэчымі языкамі. Падаў нам зь Івонай шклянкі з бледна-ружовым напоем. Усьміхнуўся мне:

— Скаштуйце. Гэта грымотны кактэйль. Б'е, як дынаміт. Называецца... „Спадарыня Ружа"... Скаштуйце...

Я абмачыў вусны. Адпіў глыток. І адразу закашляўся. Івона зарагатала.

— Дзядзька Ралян, ня трэба яму гэтага даваць...

Мяне кранула і зьдзівіла, што яна сказала яму „дзядзька Ралян".

— Як дынаміт, га? — спытаўся ён зь вясёлымі іскрынкамі ў вырачаных вачох. — Трэба прывыкаць.

Ён сеў у фатэль, абцягнуты такой самай сіняватай і выцьвілай тканінай, што і канапа. Палашчыў сабаку, які прыкархнуў ля яго, і добра пацягнуў свайго кактэйлю.

— Як справы? — запытаўся ў Івоны.

— Нічога сабе.

Ён пахітаў галавою. Ня ведаў, што сказаць. Магчыма, не хацеў размаўляць пры чалавеку, якога стрэў першы раз у жыцьці. Чакаў, што я загавару першы, але я быў зьбянтэжаны яшчэ больш за яго, а Івона не рабіла нічога, каб адолець няёмкасьць. Наадварот, яна выняла з торбачкі свае доўгія пальчаткі і памалу пачала іх нацягваць. Ён сачыў спадылба за гэтай дзівотнай і працяглай працэдурай, зьлёгку скрывіўшы рот. Запанавала доўгае маўчаньне.

Я крадком назіраў за ім. У яго былі густыя цёмныя валасы і чырвоны твар, але вялізныя чорныя вочы і вельмі доўгія вейкі надавалі ягонаму цяжкаму твару нейкі млявы шарм. У маладосьці ён, пэўна, быў прыгожы, нават калі ягоная прыгажосьць была трохі сярмяжная. Ягоныя вусны, наадварот, былі тонкія, рухавыя, вельмі францускія.

Было відаць, што ён выстраіўся на нашы адведзіны. Ён меў на сабе гарнітур з шэрага цьвіду, шыракаваты ў плячох, і цёмную кашулю без гальштука. Напарфумаваўся лявандавай вадою. Я паспрабаваў знайсьці нейкае сямейнае падабенства між ім і Івонай. Беспасьпяхова. Але я падумаў, што да канца гэтай вечарыны мне ўдасца нешта знайсьці. Я буду сядзець насупроць абаіх і разглядаць іх увадначас. Урэшце мне ўдасца заўважыць нейкі агульны жэст або міну.

— А ты, дзядзька Ралян, цяпер шмат працуеш?

Мяне зьдзівіў тон, якім яна паставіла гэтае пытаньне. У ім дзіцячая наіўнасьць мяшалася з нахрапістасьцю жанчыны, што зьвяртаецца да мужчыны, зь якім жыве.

— Ды ўжо ж... амэрыканскія барахлякі... і ўсе тыя сраныя студэбэкеры...

— Не жартуеш, га, дзядзечка Ралян?

Гэтым разам можна было падумаць, што яна зьвярталася да дзіцяці.

— Не. Таму што у маторах тых барахляных студэбэкераў...

Ён не дакончыў фразы, як быццам раптам да яго дайшло, што тэхнічныя дэталі нас не зацікавяць.

— Ну добра... А што ў цябе? — запытаўся ён у Івоны. — Ладзіцца?

— Так, дзядзечка.

Яна думала пра нешта іншае. Пра што?

— Выдатна. Калі ладзіцца, дык ладзіцца... А ці не пайсьці нам да стала?

Ён ўстаў і паклаў руку мне на плячо.

— Эй, Івона, ты мяне чуеш?

Накрыты стол стаяў каля зашклёных дзвярэй і вакон у гараж. Крацясты абрус, белае з морска-сінім. Шклянкі „дуралекс". Дзядзька пасадзіў мяне там, дзе мне хацелася — насупроць іх абаіх. На талерцы Івоны і на ягонай ляжалі колцы для сурвэтак з выразанымі наўкруг імёнамі „Ралян" і „Івона".

Лёгка пакалыхваючыся, ён пайшоў на кухню, а Івона скарысталася нагодай, каб пазногцем паказытаць мне далонь. Ён прынёс пасудзіну зь „ніцэйскай салатай". Івона расклала яе нам на талеркі.

— Спадзяюся, вам смакуе?

Потым, зьвярнуўшыся да Івоны, ён сказаў, расьцягваючы кожны склад:

— Гра-фу са-праў-ды сма-ку-е?

Я ня вычуў у гэтым ніякай зласьлівасьці, усяго толькі іронію і чыста парыскую галянтнасьць. Дарэчы, я ніяк ня мог даразумець, адкуль у гэтага „савойца" (я прыгадаў артыкул пра Івону, дзе сказана, што „яе сям'я таксама тутэйшая") узяўся нядбалы сталічны акцэнт.

Не, яны былі зусім не падобныя адно да аднаго. У дзядзькі не было Івонінай далікатнасьці рысаў, яе доўгіх рук і тонкай шыі. Побач зь ёю ён здаваўся яшчэ больш грузным і набычаным, чымся тады, калі сядзеў у фатэлі. Мне вельмі хацелася б ведаць, у каго яна ўдалася з сваімі зялёнымі вачмі і каштанавымі валасамі, але бязьмерная пашана да францускіх сем'яў ды іхных сакрэтаў не дазволіла

мне запытацца наўпрост. Дзе цяпер Івоніны бацька й маці? Ці яны яшчэ жывыя? Чым займаюцца? Я працягваў цішком назіраць за Івонай і дзядзькам і нават адкрыў нешта агульнае ў іхных жэстах. Напрыклад, абое аднолькава паслугоўваліся відэльцам і нажом, прыціскаючы іх далекавата адсунутым указальным пальцам, і аднолькава паволі несьлі відэльцы ў рот, а часам аднолькава мружылі вочы, ад чаго вакол вачэй у іх утвараліся зморшчынкі.

— А чым вы займаецеся ў жыцьці?

— Ён нічым не займаецца, дзядзечка.

Яна мне нават не дала часу адкрыць рот.

— Гэта няпраўда, — прамармытаў я. — Няпраўда. Я працую... з кніжкамі.

— З кніжкамі? З кніжкамі? — ён паглянуў на мяне неверагодна круглымі вачыма.

— Я... Я...

Івона разглядала мяне зь дзёрзкай усьмешачкай.

— Я... пішу кніжку. Вось так.

Я сам зьдзівіўся ўпэўненаму тону, якім я вымавіў гэтую хлусьню.

— Вы пішаце кніжку..? Кніжку..? — Ён зморшчыў бровы і крыху пахіліўся да мяне. — Дэтэктыўную?

Яму відавочна палягчэла. Ён усьміхаўся.

— Ну так, дэтэктыўную, — мармытнуў я. — Дэтэктыў.

На кухні раззваніўся вялікі гадзіньнік. Хрыпаты матыў цягнуўся й цягнуўся. Івона слухала, разявіўшы рот. Дзядзька зіркаў на мяне, яму было сорамна за гэтую несвоечасовую й няскладную мэлёдыю, якой я ня здолеў распазнаць. Але як толькі ён выкрыкнуў: „Яшчэ толькі не хапала гэтага клятага ўэстмінстэра!", я ўлавіў у гэтай какафоніі матыў лёнданскага Біг Бэну, праўда, больш мэлянхалічны й трывожлівы за арыгінал.

— Гэты кляты ўэстмінстэр зусім з глузду зьехаў! Ён увесь час б'е па дванаццаць разоў... я захварэю праз гэтага падлюку... Дзіва, што я яго яшчэ ня выкінуў...

Ён гаварыў пра гадзіньнік як пра нейкага асабістага й нябачнага ворага.

— Ты чуеш, Івона?

— Ды я ж табе казала, што гэта мамін гадзіньнік. Аддай яго мне, і канец усёй размове...

Ён раптам расчырванеўся, і я баяўся, што яго хопіць паляруш.

— Ён застанецца тут, ты чуеш... Тут...

— Добра, дзядзечка, добра... — яна сьцепанула плячыма. — Пакінь сабе свой гадзіньнік... Твой паганы ўэстмінстэр...

Яна павярнулася да мяне і падміргнула. А ён нібы браў мяне за сьведку.

— Разумееце, мне было б зусім самотна, калі б я перастаў чуць гэтага падлюку...

— А мне гэты гадзіньнік нагадвае дзяцінства, — сказала Івона. — Ён мне не даваў заснуць...

Я ўявіў, як яна ляжыць у ложачку з шырока расплюшчанымі вачыма, прыціскаючы да сябе плюшавага мядзьведзіка.

Прагучала яшчэ пяць нотаў у нерэгулярных прамежках, быццам п'яная гікаўка. І ўэстмінстэр заглух, як падалося — назаўсёды.

Я набраў як мага больш паветра і павярнуўся да дзядзькі:

— Яна тут жыла, калі была малая?

Я вымавіў гэтую фразу такім сьпехам, што ён не зразумеў.

— Ён у цябе пытаецца, ці я тут жыла, калі была малая. Дзядзечка, ты аглух?

— Ды ўжо ж, жыла. Там наверсе.

Ён паказаў пальцам на столь.

— Я табе зараз пакажу мой пакой. Дзядзечка, ён яшчэ стаіць?

— Але ж, я нічога не кранаў.

Ён устаў, пазьбіраў нашы талеркі і відэльцы і панёс іх на кухню. Вярнуўся з чыстымі талеркамі на галоўную страву і чыстымі відэльцамі.

— Вы любіце добра засмажанае мяса? — запытаўся ён у мяне.

— Паводле вашага густу.

— Ды не, паводле ВАШАГА густу, мэсьё граф.

Я пачырванеў.

— Ну дык як? Больш падсмажанае ці менш?

Я ня здолеў выціснуць зь сябе ні зыку. Я неакрэсьлена махнуў рукою, проста каб выйграць час. А ён стаяў нада мной аслупянелы, скрыжаваўшы рукі. Разглядаў мяне зь няўцямнасьцю.

— Скажы мне, ён заўсёды такі?

— Так, дзядзечка, заўсёды. Ён заўсёды такі.

Ён падаў нам тыя эскалёпы з гарошкам, удакладняючы, што гарошак „сьвежы, а не кансэрваваны". Наліў нам віна, мэркюрэ, якое купляў адно для „пашанотных" гасьцей.

— Значыць, ты лічыш, што гэта і ёсьць „пашанотны" госьць? — запыталася Івона, паказваючы на мяне.

— Ды ўжо ж. Першы раз у жыцьці абедаю з графам. Прабачце, граф, я забыў вашае прозьвішча...

— Хмара, — суха адказала Івона, як быццам злуючыся на ягоную забыўлівасьць.

— Гэта чыё прозьвішча — Хмара? Партугальскае?

— Расейскае, — выціснуў я.

Ён хацеў даведацца больш.

— Вы сам будзеце расеец?

Мяне ахапіла страшэнная зьнямога. Трэба было нанава распавядаць пра рэвалюцыю, Бэрлін, Парыж, Ск'япарэльлі, Амэрыку, спадкаемніцу крамаў Вулварта, бабулю на вуліцы лорда Байрана... Не. Мне стала млосна.

— Вам нядобра?

Ён па-бацькоўску паклаў далонь мне на плячо.

— Наадварот... Я даўно не адчуваў сябе так добра...

Яго, здаецца, зьдзівіла мая заява, тым больш, што першы раз за ўвесь вечар мне ўдалося выказацца разборліва.

— Ну дык давайце па кроплі мэркюрэ...

— А ведаеш, дзядзечка... — Яна перапынілася, і я здранцьвеў, прадчуваючы, што яна зараз ашпарыць мяне нейкай неспадзеўкай. — Ведаеш, што ён носіць манокль?

— Не... сапраўды?

— Устаў свой манокль, каб ён пабачыў...

У ейным голасе чуваць было пракудлівую нотку. Яна пачала паўтараць, як накручаная: „устаў свой манокль, устаў свой манокль"...

Я сунуў дрыготкую руку ў кішэню пінжака і паволі, як люнатык, паднёс манокль да левага вока. І паспрабаваў яго ўставіць, але мышцы твару перасталі мяне слухацца. Разы тры манокль падаў. Як адчуў, як дранцьвее шчака. Апошні раз манокль упаў у гарошак.

— А ну яго! — вырвалася ў мяне.

Я пачынаў траціць самавалоданьне і баяцца, што пальну нешта страшнае, чаго ніхто ад такога хлопца, як я, не чакае. Супроць такога настрою я нічога ня мог зрабіць, ён находзіў на мяне прыступамі.

— А вы ня хочаце паспрабаваць? — запытаўся я ў дзядзькі, працягваючы манокль яму.

У яго выйшла зь першай спробы, і я яго шчыра павіншаваў. Манокль яму пасаваў. Ён нагадваў Конрада Вайдта ў *Nocturno der Liebe*. Івона залілася сьмехам. Я таксама. І дзядзька. Мы доўга не маглі спыніцца.

— Заходзьце часьцей, — папрасіў ён. — Нам траім так весела. Вы такі забаўны.

— Во, праўду сказана, — пагадзілася Івона.

— І вы, вы таксама забаўны, — сказаў я.

Мне хацелася яшчэ дадаць „надзейны", таму што ягоная прысутнасьць, манера размовы і жэсты мяне супакойвалі. У гэтай кухні, разам зь Івонай і ім, я нічога не баяўся. Нічога. Я быў незачэпны.

— У вас шмат працы? — наважыўся запытацца я.

Ён закурыў.

— Хапае. Даводзіцца рабіць усё гэта самому...

Ён махнуў рукою на гараж за вокнамі.

— І даўно ўжо?

Ён працягнуў мне пачку руаяляў.

— Мы пачыналі яшчэ зь Івоніным бацькам...

Ён быў відавочна зьдзіўлены і крануты маёй увагай і зацікаўленасьцю. Нячаста, відаць, пыталіся пра ягоную працу. Івона адвярнулася і працягнула кавалак мяса сабаку.

— Мы купілі гэта ў авіякампаніі Фарман... Мы былі адзінымі прадстаўнікамі фірмы Гочкіс на ўвесь дэпартамэнт... Працавалі пры люксусовых швэйцарскіх аўтамабілях...

Ён вымаўляў гэтыя фразы вельмі хутка і паўшэптам, як быццам баючыся, што яго перапыняць. Аднак Івона не надавала ўвагі нашай размове — яна гаварыла з сабакам і лашчыла яго.

— Зь ейным бацькам усё йшло гладка...

Ён зацягнуўся цыгарэтай, якую трымаў між вялікім і ўказальным пальцамі.

— Вас цікавіць? Гэта было ўжо так даўно...

— Пра што ты распавядаеш, дзядзечка?

— Як мы пачыналі гараж з тваім бацькам...

— Ты ж яго занудзіш...

У ейным голасе вычувалася дамешка злосьці.

— Зусім не, — сказаў я. — Зусім не. А што сталася з тваім бацькам?

Гэтае пытаньне вырвалася ў мяне зьнячэўку, і нельга было адкруціць яго назад. Агульная зьбянтэжанасьць. Я заўважыў, як Івона нахмурылася.

— Альбэр...

Дзядзька вымавіў гэтае імя з адсутным паглядам. Потым ачнуўся.

— Альбэр трапіў у бяду...

Я зразумеў, што больш нічога ад яго ня выцягну; я нават зьдзівіўся, што ён сказаў мне так шмат.

— А ты як? — ён ляпнуў Івону па плячы. — Усё йдзе па-старому?

— Так.

Размова не вязалася, і я пастанавіў пайсьці ў атаку.

— А ці ведаеце, што яна будзе кінааткоркай?

— Вы сапраўды ў гэта верыце?

— Я ў гэтым упэўнены.

Яна зь ветлівай мінай пускала мне ў твар цыгарэтны дым.

— Калі яна мне сказала, што будзе здымацца ў кіно, я не паверыў. Хоць гэта была праўда... Ты скончыла той фільм?

— Так, дзядзечка.

— Калі можна будзе яго паглядзець?

— Ён выйдзе ў пракат праз тры-чатыры месяцы, — сказаў я.

— І тут яго таксама пакажуць?

Ён ня надта каб верыў.

— Безумоўна. У кінатэатры Казіно, — я гаварыў штораз больш упэўнена. — Вось пабачыце.

— Ну дык трэба гэта адзначыць... Скажэце мне, гэта сапраўдная прафэсія?

— Вядома. Яна ж будзе працаваць далей. Яна будзе здымацца ў наступным фільме.

Я й сам зьдзівіўся запалу, зь якім я гэта сказаў.

— І яна стане зоркай кіно, мэсьё.

— Сапраўды?

— Вядома ж, мэсьё. Самі ў яе запытайце.

— Івона, гэта праўда?

Ейны голас быў трохі кплівы.

— Ну так, усё што Віктор кажа — гэта праўда, дзядзечка.

— Як бачыце, мэсьё, я маю рацыю.

Я сказаў гэта саладжавым, згодлівым тонам, за які мне стала сорамна, але размова зачапіла мяне за жывое, і каб яго пераканаць, я хапаўся ўсіх даступных сродкаў дзеля большае вымоўнасьці.

— У Івоны незвычайны талент, паверце мне.

Яна гладзіла сабаку. Ён глядзеў на мяне, зь недапалкам руаяля ў куточку рота. Зноў на ягоным твары зьявіўся цень неспакою, позірк стаў заклапочаным.

— А вы сапраўды думаеце, што гэта прафэсія?

— Найлепшая прафэсія на сьвеце, мэсьё.

— Ну што ж, спадзяюся, табе пашанцуе, — паважна сказаў ён Івоне. — Урэшце, ты ж не дурнейшая за іншых...

— Віктор мне будзе даваць добрыя рады, праўда, Віктор? — Яна паслала мне чульліваіранічны пагляд.

— Вы ж ведаеце, што яна здабыла Кубак Хулігантнасьці? — запытаўся я ў дзядзькі.

— Я сваім вачом ня верыў, калі чытаў у газэце. — Пасьля невялікай замінкі ён спытаўся: — Скажэце мне, а той Кубак Хулігантнасьці чаго-небудзь варты?

Івона хіхікнула.

— Ён можа паслужыць заходным пунктам, — заявіў я, праціраючы манокль.

Ён запрапанаваў нам выпіць кавы. Я сядзеў на старой сіняватай канапе, пакуль Івона зь ім прыбірала са стала. Івона нешта напявала, заносячы посуд на кухню. Ён уключыў ваду. Сабака спаў каля маіх ног. Я дакладна запомніў гэты сталовы пакой. На шпалерах паўтараліся тры матывы: чырвоныя ружы, плюшч і птушкі (не магу цяпер прыгадаць — ці то дразды, ці то вераб'і). Прыблеклыя шпалеры крэмавага або белага адценьня. Круглая жырандоля з драўляным каркасам і тузінам лямпачак пад абажурам з пэргаміну. Яна давала бурштынавае, цёплае сьвятло. На сьцяне карцінка бяз рамкі з малюнкам узьлеску — мне спадабалася, як мастак прадставіў дрэвы на фоне яснага вечаровага неба і смугу апошняга промня між камлёў. Ад гэтага малюнку пакой рабіўся яшчэ больш утульным. Падхапіўшы знаёмы матыў ад Івоны, дзядзька пачаў падпяваць тое, што і пляменьніца. Мне было добра. Мне хацелася, каб гэты вечар цягнуўся бясконца, я мог бы гадзінамі назіраць, як яны прыходзяць і выходзяць, як зграбна рухаецца Івона і як качкавата ходзіць ейны дзядзька. І слухаць іхнае мармытаньне рэфрэну песенькі, якую я сам ніколі не наважуся заспяваць, так дарагі мне ўспамін пра тую перажытую хвіліну.

Ён сеў побач са мною на канапу. Каб падтрымаць размову, я сказаў, паказваючы на карцінку:

— Вельмі прыгожа...

— Гэта Івонін бацька намаляваў... так...

Малюнак, пэўна, вісеў на тым самым месцы доўгія гады, але яго і дагэтуль расчульвала думка, што маляваў ягоны брат.

— Альбэр прыгожа клаў мазкі... У правым ніжнім куце можаце ўбачыць ягоны подпіс: Альбэр Жакэ... Дзіўны чалавек быў мой брат...

Я зьбіраўся паставіць адно нясьціплае пытаньне, але тут увайшла з кухні Івона з кавай на тацы. Яна ўсьміхалася. Сабака пацягваўся. Дзядзька зацягнуўся сваім недапалкам у куточку вуснаў і закашляўся. Івона ўціснулася паміж валікам канапы і мною і паклала галаву мне на плячо. Дзядзька наліваў каву, адкашліваючыся так, што здавалася, быццам ён парыквае. Ён падаў кавалак цукру сабаку, і той асьцярожна ўзяў яго ў зубы. Я ведаў наперад, што ён таго кавалка не раскусіць, а будзе яго пасмоктваць, уставіўшы пагляд удалеч. Ён ніколі не пераж оўваў ежы.

Ажно да гэтай пары я не заўважыў століка за канапай, на якім стаяў сярэдняга памеру белы радыёпрыймач, нешта паміж звычайным і транзыстарным апаратам. Дзядзька пакруціў за галушку, і тут жа паціху загучала музыка. Мы папівалі каву малымі глыткамі. Дзядзька ад часу да часу адкідваўся на сьпінку

канапы і выпускаў колцы дыму. Яны яму добра даваліся. Івона слухала музыку, нядбала выстукваючы такт указальным пальцам. Мы сядзелі моўчкі, як людзі знаёмыя з незапомнага часу, як тры сямейнікі.

— Ты павінна паказаць яму дом, — шапнуў дзядзька.

Ён заплюшчыў вочы. Мы зь Івонай усталі. Сабака хітравата глянуў на нас, таксама ўстаў і пайшоў за намі. Мы якраз пачалі падымацца па сходах, як раптам зноў зазваніў уэстмінстэр, але гэтым разам яшчэ больш бязладна і грукатліва, так што мне прыйшоў на думку піяніст, які б'е па клявішах кулакамі і галавой. Сабака ў жаху сіганув па сходах і чакаў нас наверсе. Ад лямпачкі пад стольлю лілося жоўтае халоднае сьвятло. Ружовы турбан і ярка-чырвоная памада падкрэсьлівалі бледнасьць Івонінага твару. А мне пад гэтым асьвятленьнем здавалася, што я пакрыты сьвінцовым пылам. Па правы бок стаяла люстраная шафа. Івона адчыніла дзьверы насупраць нас. Пакой з вакном на шашу — я пачуў шум ад грузавікоў, якія за ім праяжджалі.

Яна запаліла настольную лямпу. Ложак, зь якога засталася толькі рама зь сеткай, быў вельмі вузкі. У кутку, дзе ён стаяў, высіліся паліцы. Па левы бок маленькі ўмывальнік зь люстрам. Пад сьцяной драўляная шафа. Івона прысела на край ложка і сказала:

— Вось мой пакой.

Сабака прылёг пасярод дывана з працёртым узорам, але потым раптоўна ўсхапіўся і выбег з пакою. Я агледзеў сьцены і паліцы, спадзеючыся знайсьці нейкую памятку зь Івонінага дзяцінства. Тут было значна цяплей, чым у іншых пакоях, і Івона зьняла сукенку. Яна расьцягнулася на сетцы ложка. На ёй былі панчохі з падвязкамі, майткі, станік — словам, усё тое, чым жанчыны зашорваюцца і надалей. Я адчыніў белую драўляную шафу. Магчыма, нешта засталося ўсярэдзіне?

— Што ты шукаеш? — спыталася яна, прыўзьняўшыся на локцях.

Яна прымружыла вочы. Я выграб малую школьную сумку з дна шафы. Выняў яе і сеў на падлогу, прыхінуўшыся сьпінай да ложка. Яна паклала падбародак мне на плячо і дзьмухнула ў шыю. Я адчыніў сумку, сунуў руку ўсярэдзіну і выцягнуў адтуль стары аловак, напалову сьпісаны, з шэрай гумачкай на кончыку. У сярэдзіне сумка гідка пахла скурай і яшчэ, як мне здалося, воскам. У першы вечар сваіх вялікіх вакацый Івона схавала яе назаўжды.

Яна згасіла сьвятло. Якія долі, якія сьцежкі зьвялі нас на гэтым ложку ў закінутым пакойчыку?

*

Колькі часу мы там заставаліся? Нельга было давяраць уэстмінстэру, які канчаткова звар'яцеў і разы тры, з прамежкам у некалькі хвілін, адзваніў поўнач. Я ўстаў і ўбачыў, як Івона адварочваецца да сьцяны. Мабыць, хацела падрамаць. Сабака ляжаў наверсе сходаў у позе сьфінкса, ягоная морда адбівалася ў люстры шафы. Ён глядзеў сам на сябе з нудотнай высакамернасьцю. Калі я праходзіў міма, ён не зварухнуўся. Застыў, выцягнуўшы шыю, зьлёгку падняўшы галаву, навастрыўшы вушы. Спускаючыся па сходах, я пачуў, як ён пазяхае. Лямпачка пад стольлю ўвесь час праліваіла жоўтае халоднае сьвятло, якое мяне атупляла. Праз прачыненыя дзьверы сталовага пакою далятала ясная і халодная музыка, якую часта перадаюць па радыё ноччу і якая навявае думкі пра пусты аэрапорт. Дзядзька сядзеў у фатэлі і слухаў радыё. Калі я ўвайшоў, ён павярнуў галаву:

— Ну як?

— А вы?

— Дзякуй, — адказаў ён. — А вы?

— Дзякуй.

— Калі хочаце, працягнем у тым самым кірунку... А вы?

Ён глядзеў на мяне незварушна, з застылай усьмешкай, як быццам седзячы перад фатографам, які зьбіраўся яго сфатаграфаваць.

Ён працягнуў мне пачак руаяляў. Я зламаў чатыры запалкі, не дамогшыся посьпеху. Урэшце мне удалося асьцярожна данесьці агеньчык да кончыка цыгарэты. Я зацягнуўся. Я адчуваў сябе так, нібыта курыў упершыню. Ён сачыў за мною, насупіўшы бровы.

— Па вас відаць, фізычнай працай вы не займаліся, — заключыў ён вельмі сур'ёзным тонам.

— Не, на жаль.

— Чаму на жаль, малады чалавек? Вы думаеце, што прыемна калупацца ў маторах?

Ён глянуў на свае рукі.

— Часам і гэта прыносіць задавальненьне, — сказаў я.

— Няўжо? Вы так думаеце?

— Усё ж аўтамабіль — выдатнае вынаходзтва...

Але ён мяне ня слухаў. Музыка змоўкла, і дыктар зь інтанацыяй адначасна ангельскай і швэйцарскай — так што я нават задаўся пытаньнем, хто ён паводле нацыянальнасьці —

вымавіў фразу, якую і цяпер, пасьля гэтулькіх гадоў, я паўтараю ўголас падчас шпацыраў: „Шаноўнае спадарства, перадачы Радыё Жэнэва-Мюзік закончаныя. Да заўтра. Спакойнай ночы." Дзядзька і не падумаў выключыць прыймач, сам я зрабіць гэта не наважыўся, так што пачулася бесьперапыннае шыпеньне і журчаньне ў этэры, якое ўрэшце зрабілася падобнае да шэлесту лістоты на ветры. І ў сталовым пакоі пачулася нешта накшталт павеваў сьвежай зелені.

— Івона — добрая дзяўчына...

Яму ўдалося выпусьціць вельмі роўнае колца дыму.

— Яна ня проста добрая, яна цудоўная дзяўчына, — адказаў я.

Ён зь цікаўнасьцю паглядзеў мне проста ў вочы, як быццам я сказаў нешта надзвычай важнае.

— А ці не прайсьціся нам? — запрапанаваў ён. — У мяне ўжо ногі здубянелі.

Ён устаў і адчыніў шкляныя дзьверы.

— Вы не баіцеся?

Ён паказаў на ангар, абрысы якога патаналі ў цемры. У рэгулярных прамежках цьмяна пабліскваліі маленькія лямпачкі.

— Заадно пабачыце і мой гараж...

Як толькі я ступіў у тое цёмнае разьлеглае памяшканьне, адразу пачуў пах бэнзыну, які я заўсёды любіў, хоць сам дакладна ня ведаў чаму — як і салодкі пах этэру або пах срэбнай абгорткі шакаляду. Ён узяў мяне пад руку, і мы рушылі ў зону гусьцейшага змроку.

— Так... Івона — дзіўная дзяўчына...

Яму карцела мне нешта сказаць. Ён круціўся вакол тэмы, якая ляжала ў яго на сэрцы і да якой ён, пэўна, мог падступіцца ня з кожным. Магчыма, ён падступаўся да яе ўпершыню.

— Дзіўная, але надзвычай чароўная, — сказаў я.

Намагаючыся вымавіць гэтую фразу разборліва, я перайшоў амаль на піск, на фальцэт зь нечуванай манернасьцю.

— Бачыце... — ён завагаўся апошні раз перад тым, як аблегчыць сваё сэрца, і схапіў мяне за руку. — Яна шмат у чым пайшла ў бацьку... А мой брат меў гарачую галаву...

Мы йшлі проста наперад. Я паступова прызвычайваўся да цемры, у якой кожныя дваццаць мэтраў пабліскваліа лямпачка.

— Івона задала мне клопату ў свой час...

Ён запаліў цыгарэту. Ён пусьціў маю руку, і я, амаль ня бачачы яго ў цемры, арыентаваўся на жар ягонай цыгарэты. Ён прысьпешыў крок, і я спалохаўся, што зусім яго згублю.

— Я кажу вам гэта, таму што вы мне падаліся добра выхаваным чалавекам...

Я закашляў, ня ведаючы, што яму адказаць.

— Вы паходзіце з добрай сям'і, вы...

— Ды не... — сказаў я.

Ён крочыў паперадзе, і мой позірк не адрываўся ад чырвонага агеньчыка ягонай цыгарэты. Паблізу ніводнай лямпачкі. Я выцягнуў рукі, каб не напароцца на сьцяну.

— Івона ўпершыню сустрэла маладога чалавека з добрай сям'і...

Кароткі сьмяшок. А потым глухі голас:

— Што, братка?

Ён моцна схапіў мяне за руку, на ўзроўні біцэпса. Павярнуўся тварам да мяне. Я адшукаў агеньчык ягонай цыгарэты. Мы колькі часу пастаялі бяз руху.

— Яна ўжо нарабіла столькі глупстваў, — уздыхнуў ён. — А цяпер яшчэ гэтая гісторыя з кіно...

Я яго ня бачыў, але наўрад ці раней адчуваў у кім-небудзь такую зморанасьць і пакорлівасьць.

— Ёй ужо мазгоў ня ўставіш... Усё роўна што ейнаму бацьку, Альбэру...

Ён пацягнуў мяне за руку, і мы зноў рушылі. Ён штораз мацней сьціскаў мяне за біцэпс.

— Я вам распавядаю гэта, таму што вы сымпатычны чалавек... і добра выхаваны...

Рэха нашых крокаў разьлягалася па ўсёй прасторы. Я ня мог зразумець, як яму ўдаецца знаходзіць дарогу ў гэтых поцемках. Калі я адстану, дык заблукаю тут назаўжды.

— Можа, вернемся?

— Бачыце, Івоне заўсёды хацелася жыць звыш сваіх сродкаў... Гэта небясьпечна... вельмі небясьпечна...

Ён пусьціў мой мускул, і, каб не згубіцца, я ўхапіўся за крысо ягонага пінжака. Ён гэтаму не працівіўся.

— У шаснаццаць гадоў яна ўжо купляла касмэтыку мяхамі...

Ён прысьпешыў крок, але я не пусьціў крысо ягонага пінжака.

— Да суседзяў яна не хадзіла... Яе больш цягнула да гасьцей „Спортынгу"... Як і ейнага бацьку...

Тры лямпачкі, адна ля аднае проста над нашымі галовамі, асьляпілі мяне. Ён збочыў кудысьці ўлева і пачаў мацаць пальцамі сьцяну. Пстрычка выключальніка. Зыркае сьвятло вакол нас: пражэктары пад дахам асьвятлілі ўвесь ангар. Асьветлены, ён выдаваўся яшчэ больш разьлеглы.

— Выбачаюся, братка, але яны ўключаюцца толькі тут...

Мы былі ў самым дальнім закутку гаражу. Некалькі амэрыканскіх машын стаялі адна ля адной, побач стары аўтобус „шасон" на абселых шынах. Па левы бок я ўгледзеў зашклёную майстэрню, падобную да аранжэрэі — збоку чатырохкутнікам стаялі кадушкі зь зялёнымі расьлінамі. У гэтым месцы падлога была высыпаная жвірам, а па сьцяне поўз плюшч. Тут нават была альтанка з столікам і крэсламі.

— Што скажаце пра мой закутак, братка?

Мы падсунулі крэслы і селі адзін насупраць аднаго. Ён абаперся лакцямі на стол і паклаў падбародак на далоні. Выгляд у яго быў стомлены.

— Тут я адпачываю, калі мне абрыдне бавіцца з маторамі... Гэта мой садочак...

Ён паказаў узад, на амэрыканскія машыны і „шасон".

— Бачыце гэтае ламачча?

Ён шырока махнуў рукою, як быццам праганяючы муху.

— Страшна, калі твая работа табе ўжо абрыдла...

Я скрывіўся ў недаверлівай усьмешцы.

— Але...

— А вам яшчэ не абрыдла ваша работа?

— Не, — адказаў я, не зусім разумеючы, пра якую работу йдзецца.

— У вашых гадох за ўсё бярэсься з энтузіязмам...

Мяне крануў ягоны чульлівы пагляд пры гэтых словах.

— З энтузіязмам, — паўтарыў ён напаўголасу.

Мы сядзелі за альтаначным столікам, такія дробныя ў гэтым гіганцкім ангары. Кадушкі з расьлінамі, плюшч і жвір утваралі тут нечаканы аазіс. Ён нас ахоўваў ад навакольнай запушчанасьці: групы аўтамашын, што чакалі наладкі (у аднае зь іх не хапала крыла), і зусім растрэсенага аўтобуса. Сьвятло пражэктараў было халоднае, але ня жоўтае, як на сходах і ў калідоры, дзе мы хадзілі зь Івонай. Не. Гэтае сьвятло было нейкае срэбна-сіняе. Ледавіта срэбна-сіняе.

— Хочаце мятнай настойкі з вадою? Нічога іншага тут ня маю...

Ён схадзіў у зашклёную майстэрню і прынёс два кілішкі, бутэльку мятнай настойкі і графін з вадою. Мы чокнуліся.

— Бываюць дні, калі я сябе пытаюся, што я раблю ў гэтым гаражы...

Бясспрэчна, гэтым вечарам яму хацелася адкрыць душу перад кім-небудзь.

— Ён завялікі для мяне аднаго.

Ён разьвёў рукамі на ўвесь прасьцяг гаражу.

— Спачатку пайшоў Альбэр... Потым мая жонка... А цяпер Івона...

— Але ж яна часта прыходзіць пабачыцца з вамі, — запярэчыў я.

— Нячаста. Панна стала здымацца ў кіно... Яна ўздумала сябе Мартынай Кароль...

— Але ж яна стане новай Мартынай Кароль, — цьвёрда сказаў я.

— Кіньце... Не гаварэце абы-чаго... Яна занадта лянівая.

Мятная з вадою трапіла яму ня ў тое горла, і ён папярхнуўся. І закашляўся. Кашляў доўга, ажно расчырванеўся. Яшчэ, чаго добрага, задушыцца. Я ляпаў яго па сьпіне, пакуль кашаль не суняўся. Ён дабразычліва паглядзеў на мяне.

— Хопіць бедаваць... га, братка?

Ягоны голас стаў зусім сіпатым. Я не разумеў паловы зь ягоных словаў, але неяк ухопліваў агульны сэнс...

— Вы добры хлапец, братка... І ветлі...

Нехта зь ляскам зачыніў дзьверы. Далёкі ляск рэхам пракаціўся па гаражы. Зачыніліся дзьверы сталовага пакою, мэтраў за сто ад нас. Я згледзеў Івоніны абрысы, ейныя рыжыя валасы, што сягалі ёй да пояса, калі яна іх распускала. З нашага месца яна выглядала драбнюсенькай, як ліліпутка. Сабака сягаў ёй амаль да грудзей. Я запомніў назаўсёды гэты вобраз маленькай дзяўчынкі з агромністым сабачыскам, якія набліжаліся да нас і паступова набіралі свае сапраўдныя прапорцыі.

— А вось і яна, — сказаў дзядзька. — Не перадавайце ёй, што я вам тут сказаў. Гэта павінна застацца між намі.

— Зразумела...

Мы ня зводзілі вачэй зь яе, пакуль яна набліжалася. Сабака йшоў паперадзе, паказваючы ёй дарогу.

— Якая яна маленькая, — заўважыў я.

— Ага, зусім маленькая, — пагадзіўся дзядзька. — Гэта яшчэ дзіця... клапотнае дзіця...

Убачыўшы нас, яна памахала рукою. Закрычала: „Віктор! Віктор!", і маё несапраўднае імя адбівалася рэхам ад сьценаў гаража. Яна села за стол паміж мной і дзядзькам. Крыху засопшыся.

— Вельмі міла з твайго боку, што ты прыйшла падтрымаць нам кампанію, — сказаў дзядзька. — Хочаш мятнай з вадою? З халоднай вадою ці лёдам?

Ён зноў наліў нам кілішкі. Івона ўсьміхалася мне і, як заўсёды, у мяне зьлёгку закружылася галава.

— Пра што вы ўдвух гаварылі?

— Пра жыцьцё, — адказаў дзядзька.

Ён запаліў руаяля, і я ўжо ведаў, што ён будзе трымаць яго ў куточку рота, ажно пакуль недапалак не апячэ яму вуснаў.

— Граф — мілы чалавек... І вельмі добра выхаваны.

— О так, — сказала Івона. — Віктор — выдатны хлапец.

— Яшчэ раз, — папрасіў дзядзька.

— Віктор — выдатны хлапец.

— Вы сапраўды так думаеце? — пытаўся я, зьвяртаючыся то да яе, то да яго. Выгляд у мяне мусіў быць дурнаваты, бо Івона ушчыкнула мяне за шчоку і сказала, як быццам хочучы мяне канчаткова запэўніць:

— Але ж так, ты — выдатны.

А дзядзька стараўся са свайго боку:

— Выдатны, братка, выдатны... Вы сапраўды выдатны...

— Ну, калі так...

Я змоўк, але да гэтай пары памятаю, што тады хацеў сказаць: „Калі так, дык дазвольце мне прасіць рукі вашай пляменьніцы". Я й сёньня яшчэ лічу, што гэта быў ідэальны момант папрасіць яе рукі. Так. Я не дагаварыў гэтай фразы. А дзядзька паўтараў усё больш хрыпатым голасам:

— Выдатны, братка, выдатны... выдатны... выдатны...

Сабака, прасунуўшы морду праз зялёныя расьліны, глядзеў на нас. У гэтую ноч мы маглі б пачаць новае жыцьцё. І ніколі не расставацца. Мне было так добра сядзець зь імі за сталом у альтанцы таго вялізарнага гаража, якога, хутчэй за ўсё, ужо няма.

XI

Час агарнуў усе гэтыя падзеі смугой зьменлівых колераў: то бледназялёнай, то сіне-ружовай. Смугой? Не, хутчэй гуканепранікальнай заслонай, якую немагчыма сарваць і за якой я бачу Івону з Мэйнтам, але ўжо ня чую іхных галасоў. Баюся, што іхныя постаці будуць рабіцца ўсё больш размытымі, і каб захаваць у іх яшчэ крыху рэальнасьці, мне давядзецца...

Хоць Мэйнт быў на некалькі гадоў старэйшы за Івону, яны пазнаёміліся вельмі рана. Зьвялі іх нудотнае жыцьцё ў гэтым мястэчку і іхныя праекты на будучыню. Яны разьлічвалі пры першай нагодзе зьехаць з гэтай „глушы" (адно з Мэйнтавых слоўцаў), якая ажыўлялася толькі летам, падчас „сэзону". Мэйнту пашанцавала зьвязацца з бэльгійскім баронам-мільярдэрам, які жыў у „Гранд-Гатэлі" ў Мантоне. Барон закахаўся ў яго бяз памяці, чаму я не дзіўлюся, бо ў свае дваццаць гадоў Мэйнт быў даволі павабны з выгляду і меў пачуцьцё гумару. Бэльгіец проста ня мог безь яго абыйсьціся. Мэйнт прадставіў яму Івону як сваю „сястрычку".

Гэта барон выцягнуў іх зь іхнае „глушы", і яны заўсёды распавядалі мне пра яго з чульлівасьцю, амаль як пра бацьку. У яго была вялізная віла на мысе Фэра, і ён заўсёды наймаў нумар у гатэлі „Пале" ў Біярыцы і ў „Бо-Рываж" у Жэнэве. Пры ім круціўся прыдворны гурт прыхлебнікаў абодвух полаў, які цягаўся за ім паўсюдна.

Мэйнт часта перадражніваў перада мною ягоную хаду. Барон быў ростам пад два мэтры і хадзіў вельмі хутка, моцна згорбіўшыся. У яго былі дзівосныя звычкі: летам ён не выходзіў на сонца і цэлымі днямі праседжваў у сваім нумары у гатэлі „Пале" або ў гасьцёўні вілы на мысе Фэра. Акаціцы былі пазачыньваныя, фіранкі пазацягваныя, сьвятло запаленае, а пры ім абавязкова некалькі маладых эфэбаў. У зацемненых пакоях яны непазьбежна трацілі свой бронзавы загар.

У яго часта мяняўся настрой, і ён не любіў, калі яму пярэчылі. То раптам быў рэзкі, то ў наступную хвіліну вельмі чульлівы. Мэйнту ён казаў з уздыхам: „У глыбіні душы я — бэльгійская каралева Альжбета... бедная, БЕДНАЯ каралева Альжбета, ты ведаеш... Я думаю, ты разумееш гэтую трагедыю..." Ад яго Мэйнт даведаўся імёны ўсіх членаў бэльгійскай каралеўскай сям'і і мог умомант накрэсьліць іхнае генэалягічнае дрэва на кутку папяровай сурвэткі. Ён колькі разоў рабіў гэта перада мною, каб мяне пазабавіць.

З таго часу паходзіў ягоны культ каралевы Астрыд.

Барону тады было гадоў пяцьдзясят. Ён шмат падарожнічаў і ведаў мноства цікавых і рафінаваных людзей. Ён часта наведваў свайго суседа на мысе Фэра, ангельскага пісьменьніка Сомэрсэта Моэма, які быў ягоным блізкім сябрам. Мэйнт успамінаў, што аднойчы абедаў за адным сталом з Моэмам, ня ведаючы, хто ён.

Іншыя асобы, ня так знакамітыя, але „забаўныя", верна наведвалі барона дзеля ягоных

раскошных капрызаў. Сабралася „хеўра", якая ператварыла сваё жыцьцё ў бясконцыя вакацыі. У тую эпоху зь вілы на мысе Фэра выяжджала па пяць-шэсьць адкрытых аўтамабіляў. Езьдзілі на танцы у Жан-ле-Пэн або на *Toros de Fuego* у Сэнт-Жан-дэ-Лю.

Івона з Мэйнтам былі наймаладзейшыя. Ёй толькі што споўнілася шаснаццаць, а яму было васямнаццаць. Усе іх любілі. Я прасіў іх паказаць мне здымкі, але ні адзін, ні другая нібыта іх не захавалі. Ды ўвогуле гаварылі яны пра той пэрыяд неахвотна.

Барон памёр пры нейкіх таямнічых абставінах. Самагубства? Аўтамабільная катастрофа? Мэйнт наняў кватэру ў Жэнэве. Івона пасялілася разам зь ім. Пазьней яна пачала працаваць манэкеншчыцай у мілянскім доме моды, але больш дэталяў ад яе я не даведаўся. А ў міжчасе Мэйнт, магчыма, займаўся на мэдычным факультэце. Ён мне часта гаварыў, што ў яго „мэдыцынская практыка ў Жэнэве", а мне кожны раз карцела запытацца: у якой галіне? Івона круцілася паміж Рымам, Мілянам і Швэйцарыяй. Яна была, як той казаў, лётная манэкеншчыца. Гэта збольшага ўсё, што яна мне паведаміла. Спаткала яна Мадэю ўжо ў Рыме ці ў Міляне, ці ў баронавай „хеўры"? Калі я пытаўся ў яе пра гэта і пра тое, як ёй удалося атрымаць ролю ў *Liebesbriefe auf dem Berg*, яна ўхілялася ад адказу.

Ні яна, ні Мэйнт ніколі не распавядалі пра сваё жыцьцё нічога канкрэтнага, а толькі рабілі няясныя й супярэчлівыя намёкі.

Бэльгійскага барона, які забраў іх з правінцыі і звазіў на Лязурны бераг і ў Біярыц, я ўрэшце ідэнтыфікаваў. (Самі яны адмаўляліся назваць ягонае імя. Саромеліся? Хацелі замесьці сьляды?) Калі-небудзь я адшукаю ўсіх, хто быў у ягонай „хеўры" і, магчыма, хтонебудзь зь іх успомніць Івону... Зьежджу ў Жэнэву, Мілян... Ці змагу я адшукаць адсутныя кавалачкі галаваломкі, якую яны мне пакінулі?

Я сустрэўся зь імі, калі яны праводзілі ў родным мястэчку першае лета пасьля даволі доўгага перапынку. Пасьля ўсіх тых гадоў адсутнасьці, калі яны сюды наведваліся толькі накоратка, яны адчувалі сябе тут як чужынцы. Івона мне прызналася, што ніколі не паверыла б, калі б у шаснаццаць гадоў хто-небудзь ёй сказаў, што яна будзе жыць у местачковым „Эрмітажы", нібыта ў зусім чужым курортным горадзе. Спачатку такі падыход мяне абураў. Я заўсёды марыў нарадзіцца ў правінцыйным мястэчку і не разумеў, як можна адрачыся ад мясьціны свайго дзяцінства, ад вуліц, пляцаў і дамоў, якія былі табе роднай старонкай. Як можна вярнуцца і не адчуць, што сэрца ў цябе б'ецца жывей? Я сур'ёзна выклаў Івоне мой выгнаньніцкі пункт гледжаньня. Яна мяне нават ня слухала. Ляжала расьцягнуўшыся на ложку ў сваім шаўковым падраным халаце і курыла цыгарэты „Мюраці" (яна курыла іх дзеля іх назвы, якая падалася ёй вельмі шыкоўнай, незвычайнай і таямнічай; на мяне ж гэтая італьянска-эгіпэцкая назва наганяла нуду, таму што нагадвала маё выдуманае прозьвішча). Я ёй гаварыў пра шашу нумар 201, касьцёл Сьвятога Хрыстафора, дзядзькаў гараж. А кінатэатар *Splendid*? А вуліца Руаяль, на якой у свае шаснаццаць гадоў яна запынялася перад кожнай вітрынай? А мноства іншых месцаў, якіх я ня ведаў, але якія, напэўна, запалі ёй у сэрца? Напрыклад, вакзал, або сады вакол Казіно. Яна паціскала плячамі. Не. Нічога з гэтага яе ўжо не кранала.

Тым ня менш яна некалькі разоў звадзіла мяне ў нешта накшталт вялікай кавярні. Мы прыходзілі туды пад дзьве гадзіны, калі адпачыньнікі сядзелі на пляжы або драмалі пасьля абеду. Трэба было прайсьці пад аркадамі да „Тавэрны", перайсьці вуліцу і зноў праставаць пад аркадамі. Яны фактычна акружалі два вялікія кварталы дамоў з тае самае эпохі, што і Казіно, якія нагадвалі будынкі трыццатых гадоў на ўскраіне сямнаццатай акругі Парыжу, на бульвары Гувіён-Сэн-Сір, ды ў Дыксмюдзе, Ізэры і Соме. Месца называлася „Рэгана", і аркады засланялі яго ад сонца. Тэрасы тут, у адрозьненьне ад „Тавэрны", не было. Адчувалася, што гэтая ўстанова была некалі вельмі папулярная, але „Тавэрна" адабрала ў яе гасьцей. Мы сядалі за столік у глыбіні залі. Дзяўчына пры касе, коратка стрыжаная брунэтка Клёд, была Івонінай сяброўкай. Яна прысаджвалася да нас. Івона распытвала яе пра людзей, пра якіх я ўжо чуў у ейных размовах з Мэйнтам. Так, Росі успадкаваў па бацьку гатэль у Ля-Клюза, а Паўлё Эрвіё працуе ў антыкварыяце. Пэмпэн Ляварэль, як і раней, ганяе на машыне, як шалёны. Ён нядаўна купіў „ягуар". Клёд Брун жыве ў Альжыры. „Е-е" кудысьці прапала...

— А як там табе ў Жэнэве? — пыталася Клёд.

— Ведаеш, няблага... зусім няблага, — адказвала Івона, думаючы пра нешта іншае.

— Ты затрымалася ў сваіх?

— Не, у „Эрмітажы".

— У „Эрмітажы"?

Клёд іранічна ўсьміхнулася.

— Ты павінна прыйсьці пабачыць наш пакой, — запрапанавала Івона, — табе будзе забаўна.

— Добра, я ахвотна загляну... Калі-небудзь вечарам...

Яна выпівала з намі келіх віна. Вялізарная заля „Рэганы" пуставала. Сонца высьвечвала на сьцяне крацясты ўзор. На сьцяне за драўлянай стойкай былі намаляваныя возера й горны хрыбет Араві.

— Сюды ўжо ніхто не заходзіць, — сьвярджала Івона.

— Толькі старыя, — казала Клёд, зьбянтэжана сьмеючыся.

— Ня тое, што раней, га?

Івона таксама намагалася засьмяяцца. Потым абедзьве маўчалі. Клёд разглядала свае коратка падрэзаныя пазногці, пацягнутыя аранжавым лякам. Больш ім не было пра што гаманіць. А мне хацелася ў іх папытацца: Хто такі Росі? І Паўлё Эрвіё? Як доўга яны абедзьве знаёмыя? Якая была Івона ў шаснаццаць гадоў? І якая раней была „Рэгана"? Але ні адну, ні другую гэта ў сапраўднасьці ўжо не цікавіла. Я быў адзіны, каго займала мінулае гэтых дзьвюх францускіх прынцэсаў.

Клёд правяла нас да калаўротных дзьвярэй, і Івона абняла яе. Яна яшчэ раз яе запрасіла:

— Заходзь у „Эрмітаж", калі захочаш... Паглядзіш наш пакой...

— Добра, калі-небудзь вечарам...

Але так ніколі і не прыйшла.

Падобна было на тое, што апрача Клёд і дзядзькі, у Івоны нікога ў мястэчку не засталося, і я зьдзіўляўся, як хутка чалавек можа пазбавіцца сваіх каранёў, нават калі яны ў яго, на шчасьце, ёсьць.

*

Пакоі ў „палацах" у першыя дні робяць уражаньне, але неўзабаве іх сьцены і панурая мэбля навяваюць такую самую маркоту, што й звычайныя начулішчы. Безгустоўны люксус, саладжавы пах у калідорах. Я ня ведаю дакладна, чым так пахне, але я думаю, што гэта пах неспакою, неўладкаванасьці, выгнаньня і штучнасьці. Пах, які ніколі мяне не пакідае. Вэстыбюлі гатэляў, дзе мой бацька прызначаў мне спатканьні, зь іх вітрынамі, люстрамі і мармурам былі мне ўсяго чакальнымі залямі. Чаго я там чакаў, на самай справе? Пах пашпартоў асобаў без грамадзянства.

Але мы не заўсёды начавалі ў гатэлі. Дваты разы на тыдзень Мэйнт прасіў нас пераначаваць у яго. У тыя ночы ён кудысьці выбываў і прасіў мяне прымаць тэлефоны, запісваць, хто званіў і чаго хацеў. Ён мяне адразу папярэдзіў, што могуць пазваніць у любую пару ночы, але не адкрыў, кім будуць ягоныя таямнічыя размоўцы.

Ён жыў у доме, які застаўся яму па бацьках, у жылым квартале недалёка ад бульвару Карабасэль. Туды можна дайсьці алеяй Альбіні, першы паварот налева за прэфэктурай. Ціхі квартал, вуліцы пад скляпеньнем лістоты разгалістых дрэваў паабапал. Вілы мясцовых багатыроў, рознага памеру і стылю, але адпаведныя заможнасьці іх уладальнікаў. Віла Мэйнта стаяла на скрыжаваньні алеі Жана Шарко і вуліцы Марліё і выглядала досыць сьціпла ў параўнаньні зь іншымі. Яна была шэра-сіняя, мела ганак з боку алеі Жана Шарко і эркер ад вуліцы Марліё. Два паверхі, другі накшталт мансарды. Сад з жвіраванай дарожкай. Занядбаны жываплот. А на выпетранай браме зь белага дрэва Мэйнт (ён сам мне прызнаўся) вымаляваў крывы чорны надпіс: ВІЛА ЖУРБА.

Агульна кажучы, выгляд гэтай вілы не выклікаў радасьці. Ніяк. Аднак спачатку мне падалося, што назва „Журба" ёй не пасуе. Але пасьля да мяне дайшло, што Мэйнт мог мець рацыю, калі з журчаньня гэтага слова ўзяць ягоны мякчэйшы, далікатнейшы складнік. Калі чалавек пераступаў парог гэтай вілы, яго апаноўвала ясная мэлянхолія. Ён трапляў у зону спакою й цішыні. Паветра там было лягчэйшае. У ім хацелася лётаць. Мэбля была, відаць, распрададзеная. Засталася толькі цяжкая скураная канапа, на валіках якой я заўважыў сьляды кіпцюроў, і зьлева ад яе зашклёная кніжная шафа. Калі сесьці на канапу, дык насупраць, пяць-шэсьць мэтраў ад яе, былі дзьверы на ганак. Паркет быў сьветлы, але недагледжаны. Фаянсавая лямпа з жоўтым абажурам, якая асьвятляла гэты вялікі пакой, стаяла проста на падлозе. Тэлефон быў у суседнім пакоі, уваход у які быў з калідору. Там таксама не было мэблі. Чырвоная заслона на вакне. Сьцены колеру вохры, як і ў гасьцёўні. Ля сьцяны па правы бок раскладны ложак. На супрацьлеглай сьцяне, на ўзроўні вачэй, была прышпіленая мапа францускай Заходняй Афрыкі і вялізны здымак Дакару з птушынага палёту, асаджаны ў тонкай рамцы. Як быццам з рэклямы турыстычнага бюро. І пажоўклая

фатаграфія, пэўна, дваццацігадовай даўнасьці. Мэйнт сказаў мне, што ягоны бацька некалі працаваў „у калёніях". Тэлефон стаяў у нагах ложка. Са столі зьвісала малая жырандоля зь лямпачкамі ў выглядзе сьвечак і шкляными падвескамі. Я думаю, што Мэйнт спаў якраз у гэтым пакоі.

Мы адчынялі зашклёныя дзьверы на ганак і лягалі на канапу. Яе скура выдзяляла вельмі асаблівы пах, як два фатэлі ў бюро майго бацькі на вуліцы Лорда Байрана. Гэта было ў эпоху ягоных падарожжаў у Бразавіль, у часы таямнічай і эфэмэрнай Афрыканскай Суполкі Прадпрымальнікаў, якую ён заснаваў і пра якую мне амаль нічога не вядома. Пах канапы, мапа Францускай Афрыкі і паветраны здымак Дакару — гэта была нізка зьбегаў акалічнасьці. У маім уяўленьні дом Мэйнта непарыўна зьвязаны з „Афрыканскай Суполкай Прадпрымальнікаў", трыма словамі, якія люлялі маё дзяцінства. Я зноў апынуўся ў атмасфэры бюро на вуліцы Лорда Байрана, таго паху скуры, паўзмроку, бясконцых нарадаў майго бацькі з элегантнымі сіваватымі нэграмі... Мабыць, якраз і таму, калі мы зь Івонай ляжалі ў гасьцёўні, я быў упэўнены, што час сапраўды спыніўся?

Мы луналі. Нашы жэсты былі такія млявыя, нашы перамяшчэньні такія павольныя. Прыпаўзкам. Любы рэзкі рух мог парушыць чары. Мы размаўлялі шэптам. Вечар пранікаў у пакой праз ганак, і я бачыў, як у паветры застываюць пылінкі. Калі праяжджаў раварыст, бразганьне ровару было чуваць некалькі хвілінаў. Ён таксама перамяшчаўся павольна. Лунаў. Усё вакол нас лунала. Мы нават не запальвалі сьвятла, калі цямнела. Найбліжэйшая ліхтарня на вуліцы Жана Шарко расьсейвала сьвятло падобнае да сьняжынак. Ніколі не пакідаць гэтае вілы. Ніколі не пакідаць гэтага пакою. Ляжаць на канапе або на падлозе, на якую мы лягалі штораз часьцей. Я быў зьдзіўлены Івонінай здольнасьцю адключацца ад рэчаіснасьці. У мяне гэтая здольнасьць была абумоўленая страхам перад актыўнасьцю, неспакоем ад усяго, што варушылася, праходзіла, зьмянялася, жаданьнем перастаць ісьці па рухомых пяскох, неяк запыніцца, нават застыць. А ў яе? Я думаю, што яна была папросту лянівая. Нібы нейкая водарасьць.

Здаралася, мы нават расьцягваліся ў калідоры і заставаліся там на ўсю ноч. Аднойчы вечарам мы залезьлі ў глыбіню барахольні пад сходамі на другі паверх і завязьлі там у кучы нейкіх няясных прадметаў, як мне падалося, плеценых кашолак. Не, я ня трызьню: мы перамяшчаліся прыпаўзкам. Вырушалі з супрацьлеглых канцоў дому і паўзьлі насустрач адно аднаму ў цемры. Трэба было рухацца як мага цішэй і павальней, каб захапіць другога зьнянацку.

Аднойчы Мэйнт вярнуўся толькі на другі дзень надвячоркам. Мы не пакідалі вілы да самага ягонага прыходу. Ляжалі на паркеце перад парогам ганку. Сабака спаў пасярэдзіне канапы. Гэта быў ціхі і сонечны надвячорак. Лістота на дрэвах лёгка пагойдвалася. Здалёк даносілася вайсковая музыка. Час ад часу па вуліцы са сьвістам пралятаў раварыст. Але хутка мы перасталі чуць увесь шум. Як быццам вушы нам заклалі мяккай ватай. Я думаю, што калі б не вярнуўся Мэйнт, мы праляжалі б там немаведама колькі дзён і хутчэй памерлі б ад голаду і смагі, чым выйшлі б з гэтае вілы. Ніколі пасьля я не перажыў такой паўнаты і такой млявасьці часу. Кажуць, такі стан вытварае опіюм. Ды я сумняюся.

Тэлефон адзываўся заўсёды па поўначы, дрынкаў, як колішнія апараты. Далікатнае вызвоньваньне, сіплаватае. Але і гэтага хапала, каб зарадзіць паветра трывогай і сарваць заслону паміж намі і сьветам. Івона не хацела, каб я адказваў. „Ня йдзі", — шаптала. Я поўз калідорам навобмацак, не знаходзіў дзьвярэй пакою, ударауся галавой аб сьцяну. Нават пралезшы празь дзьверы, я яшчэ павінен быў намацаць апарат у густой цемені. Перад тым, як падняць слухаўку, я правальваўся ў паніку. Той голас з тэлефона, — заўсёды той самы, — жахаў мяне сваім цьвёрдым, крыху прыглушаным тонам. Прыглушаным адлегласьцю? Часам? (Бывала, голас нагадваў стары магнітафонны запіс.) Пачыналася заўсёды аднолькава:

— Алё, тут Анры Кюстыкер... Вы мяне чуеце?

Я адказваў: „Так".

Паўза.

— Скажэце доктару, што мы чакаем яго заўтра ў дваццаць адну гадзіну ў „Бэльвю" ў Жэнэве. Запомнілі?...

Я выціскаў зь сябе „так" яшчэ цішэй, чым першы раз. Ён клаў слухаўку. Калі ён не назначваў спатканьня, дык перадаваў празь мяне паведамленьні:

— Алё, тут Анры Кюстыкер... (паўза)... Скажэце доктару, што прыбылі маёр Макс і Герэн. Мы прыйдзем да яго заўтра вечарам... заўтра вечарам...

Мне не хапала сьмеласьці яму адказваць. Ён клаў трубку, не чакаючы адказу. Мэйнт пра-

моўчваў кожны раз, калі мы пыталіся, хто такі „Анры Кюстыкер" — таму мы ўяўлялі сабе яго як страшнага тыпа, які, як нам думалася, ходзіць ноччу вакол вілы. Мы яго ні разу ня бачылі, і таму ён штораз болей даваўся нам у знакі. Мяне забаўляла страшыць ім Івону: аддаліўшыся ад яе, я паўтараў у цемры замагільным голасам:

— Тут Анры Кюстыкер... Тут Анры Кюстыкер...

Яна пачынала вішчаць. Ейны страх перадаваўся і мне. З бухканьнем сэрцаў мы чакалі, калі зноў пачуем дрынканьне тэлефону. Схаваўшыся пад раскладным ложкам. Аднае ночы ён пазваніў, а я ня мог падняць трубку цягам некалькіх хвілін, усё роўна як у кашмарным сьне, калі цела наліваецца сьвінцом і ты ня ў змозе паварушыцца.

— Алё, тут Анры Кюстыкер...

Я ня мог вымавіць ні паўслова.

— Алё... вы мяне чуеце?... Вы мяне чуеце?...

Мы затаілі дыханьне.

— Тут Анры Кюстыкер, вы мяне чуеце?...

Голас гучаў штораз слабей.

— Кюстыкер... Анры Кюстыкер... Вы мяне чуеце?...

Хто ён быў? Адкуль тэлефанаваў? Яшчэ ціхі шэпт:

— Тыкер... чуеце...

Потым нічога. Апошняя нітка, якая зьвязвала нас з вонкавым сьветам, абарвалася. Мы зноў сыйшлі ў глыбіні, дзе, як я спадзяваўся, ужо ніхто ня мог нас патрывожыць.

XII

Гэта ўжо трэці ягоны „сьветлы партвэйн". Ён ня зводзіць вачэй зь вялізнага здымка Анрыкса пад шэрагамі бутэлек. Анрыкс зьняты ў часы свае найвялікшае славы, гадоў за дваццаць да таго лета, калі мяне ўгнявіў ягоны танец зь Івонай пасьля Кубка Хулігантнасьці. Анрыкс на здымку малады, хударлявы і рамантычны — мяшанка Мэрмоза і герцага Райхштадзкага. Гэтую старую фатаграфію аднойчы паказала мне дзяўчына-буфэтчыца ў „Спортынгу", калі я распытваў яе пра майго „суперніка". З таго часу ён ладна распаўнеў.

Я думаю, што Мэйнт, разглядаючы гэты гістарычны дакумэнт, усьміхнуўся той сваёй нечаканай усьмешкай, якая ніколі не выяўляла весялосьці, а была нейкай нэрвовай сутаргай. Ці падумалася яму пра той вечар у „Сэнт-Розе", дзе мы сядзелі ўтраіх пасьля Кубка? Ён, мабыць, лічыў гады: пяць, дзесяць, дванаццаць... У яго была манія лічыць гады і дні. „Праз год і трыццаць тры дні мне будзе дваццаць сем... Мы знаёмыя зь Івонай ужо сем гадоў і пяць дзён..."

Другі наведнік рушыў хісткім крокам да выхаду — ён расплаціўся за „сухое", але адмовіўся дакінуць за тэлефанаваньне, сьцьвярджаючы, што ніколі не заказваў „нумару 233 у Шамбэры". Паколькі спрэчка магла працягнуцца да сьвітанку, Мэйнт запэўніў яго, што сам заплаціць за тэлефон. І што гэта ён, Мэйнт, заказваў 233 у Шамберы. Ён, ніхто іншы.

Неўзабаве поўнач. Акінуўшы апошнім позіркам здымак Анрыкса, Мэйнт таксама скіраваўся да выхаду з бару „Сэнтра". У дзьвярах зь ім сутыкнуліся два мужчыны, якія адпіхнулі яго і не папрасілі прабачэньня. Потым увайшлі яшчэ трое. Потым пяцёра. Іх было штораз больш, прыбывалі ўсё новыя. У кожнага на адвароце плашча быў маленькі прастакутнік з надпісам „Інтэр-Турынг". Яны гучна размаўлялі, рагаталі, размашыста ляпалі адзін аднаго па сьпіне. Удзельнікі „кангрэсу", пра які нядаўна згадвала бармэнка. Адзін зь іх, абступлены гусьцей за іншых, пыхкаў люлькай. Яны віравалі вакол яго, паўтараючы: „Прэзыдэнт... прэзыдэнт... прэзыдэнт..." Мэйнт дарэмна спрабуе прабіцца праз натоўп. Яны адціснулі яго да самай стойкі. Паставалі шчыльнымі групамі. Мэйнт стараецца іх абыйсьці, шукае прагаліны, каб праціснуцца, але яны напіраюць на яго зноў, і ён здаецца. Умакрэўшы. Адзін зь іх кладзе яму далонь на плячо, прыняўшы яго няйначай за аднаго з „калегаў", і Мэйнт адразу далучаецца да аднае з групаў — „прэзыдэнцкае". Сьціжма робіцца такая, як на станцыі мэтро „Шасэ д'Антэн" у гадзіну пік. Нізенькі прэзыдэнт засланяе сваю люльку даланёй. Урэшце Мэйнту ўдаецца выцерабіцца з гэтае цісканіны, і ён, працуючы плячмі і локцямі, прарываецца да дзьвярэй. Прачыніўшы іх, высьлізгвае на вуліцу. Нехта выходзіць за ім і пытаецца:

— Куды вы? Вы зь Інтэр-Турынгу?

Мэйнт не адказвае.

— Вы павінны застацца. Прэзыдэнт ставіць дрынкі... Давайце назад...

Мэйнт прысьпешвае крок. Той працягвае ўпрошваць:

— Давайце назад...

Мэйнт наддае яшчэ. Той крычыць яму наўздагон:

— Прэзыдэнт заўважыць, што аднаго чалавека зь Інтэр-Турынгу няма! Застаньцеся! Застаньцеся!

Ягоны голас звонка раздаецца на пустой вуліцы.

Цяпер Мэйнт стаіць ля фантана перад Казіно. Зімою вада не мяняе колеру і б'е значна ніжэй, чым у „сэзон". Ён глядзіць на яе нейкі час, а потым пераходзіць на левы бок алеі д'Альбіні. Ідзе паволі, зьлёгку пахіствaючыся. Як быццам сноўдаецца бяз мэты. Час ад часу лёгка паляпвае па кары плятана. Мінае прэфэктуру. Вядома, паверне ў першую вуліцу налева, яна называецца, калі добра помню, Мак-Кроскі. Дванаццаць гадоў таму гэтых новых дамоў не было. Раней тут быў запушчаны парк, пасярэдзіне якога стаяў вялізны пакінуты дом у англа-нармандзкім стылі. Ён падыходзіць да скрыжаваньня з вуліцай Пэліё. Мы зь Івонай часта праседжвалі там на лаўцы. Паварочвае направа, на алею П'ера Фарсана. Па гэтай дарозе я мог бы прайсьці з заплюшчанымі вачыма. Квартал асабліва не зьмяніўся. Дзеля нейкіх незразумелых прычынаў яго не перабудавалі. Ранейшыя вілы, аточаныя садочкамі і жываплотамі. Тыя самыя дрэвы абапал алеі, адно што цяпер на іх няма лісьця. Зімою ўсё гэта тхне спустошанасьцю.

Нарэшце мы на вуліцы Марліё. Віла стаіць на рагу, ніжэй, па левы бок. Я яе бачу. Я бачу, як ты ўсё спавольваеш крок і штурхаеш плячом драўляную браму. Ты сядаеш на канапе ў гасьцёўні, не запаліўшы сьвятла. Ад ліхтарні на вуліцы сееца бледны бляск.

*

8 сьнежня... Лекар з А., мэсьё Рэнэ Мэйнт, трыццаць сем гадоў, пакончыў з сабой у ноч зь пятніцы на суботу ў сваім доме. Нешчасьлівец атруціў сябе газам.

Я прачытаў гэтыя радкі ў вечаровай газэце, калі йшоў — сам ня ведаючы куды — пад аркадамі вуліцы Кастыльёнэ. *Le Dauphiné*, рэгіянальная штодзёнка, паведаміла больш дэталяў. Мэйнта ўганаравалі радком „Самагубства лекара з А." на першай старонцы, які адсылаў чытача да мясцовых навінаў на старонцы шостай:

8 сьнежня. Доктар Рэнэ Мэйнт скончыў жыцьцё самагубствам апошняе ночы ў сваёй віле на алеі Жана Шарко, 5. Мадмуазэль Б., ягоная прыслуга, прыйшоўшы як заўсёды раніцай, адразу пачула пах газу. Але было ўжо запозна. Доктар Мэйнт пакінуў перадсьмяротную запіску.

Мінулага вечару яго бачылі на вакзале, калі туды прыбыў парыскі экспрэс. Паводле аднаго сьведкі, ён потым зайшоў на нейкі час у бар „Сэнтра" на вуліцы Самэ, 23.

Доктар Рэнэ Мэйнт, які раней меў мэдыцынскую практыку ў Жэнэве, пяць гадоў таму вярнуўся ў А., у сваё сямейнае гняздо. Ён займаўся астэапатыяй. Хадзілі чуткі, што ў яго былі цяжкасьці прафэсійнага характару. Магчыма, яны і тлумачаць ягоны адчайны крок.

Яму было трыццаць сем гадоў. Ён быў сынам доктара Анры Мэйнта, аднаго з пакутніцкіх герояў Супраціву, імя якога носіць вуліца нашага гораду.

*

Я пайшоў куды вочы глядзяць і апынуўся на пляцы Карусэль. Перайшоўшы яго, уступіў на адзін са сквэрыкаў, якія атачаюць Люўрскі палац, той перад Кур Карэ. Зімовае сонца прыгравала, і дзеці гулялі на пахілым лапіку газону перад помнікам генэралу Ляфаету. Сьмерць Мэйнта назаўсёды наклала пячатку таямніцы на некаторыя рэчы. Я ўжо ніколі не даведаюся, кім быў Анры Кюстыкер. Я стаў паўтараць уголас: „Кю-сты-кер, Кю-сты-кер..." — імя, якое ня мела значэньня ні для кога апрача мяне. І апрача Івоны. Што зь ёю сталася? Мы адчуваем чыёсьці зьнікненьне асабліва тады, калі вымаўляем словы, якія калісьці мелі значэньне для гэтай асобы і для нас і раптам сталіся непатрэбнымі і пустымі.

Кюстыкер... У той час я рабіў тысячы здагадак, кожная наступная была больш неверагоднай за папярэднюю, але адчуваю, што праўда таксама мусіла быць дзікаватая. І трывожная. Мэйнт некалькі разоў запрашаў нас у вілу на гарбату. Аднойчы каля пятай папаўдні мы сядзелі ў гасьцёўні і слухалі ўлюбёную мэлёдыю Рэнэ, *The Café Mozart Waltz*, які ён раз-пораз запускаў на грамафоне. Пазванілі ў дзьверы. Ён паспрабаваў стрымаць нэрвовы цік. Я ўбачыў — ды Івона таксама — што за парогам стаялі два мужчыны, якія падтрымоўвалі трэцяга з тварам, залітым крывёй. Яны хутка прайшлі калідорам у пакой Мэйнта. Я пачуў, як адзін зь іх сказаў:

— Укалі яму камфару, бо інакш гэты падла спруцянее на нашых руках...

Так. Івона чула тое самае. Рэнэ выйшаў да нас і папрасіў нас неадкладна пайсьці. Суха сказаў: „Я потым вытлумачу..."

Ён нічога нам ня вытлумачыў, але мне хапіла ўбачыць гэтых двух мужчын толькі на момант, каб зразумець, што яны або самі „паліцыянты", або маюць нейкае дачыненьне да паліцыйных спраў. Аналіз некаторых даручэньняў Кюстыкера замацаваў маю ўпэўненасьць у гэтым. Гэта быў час вайны з Альжырам, і ў Жэнэве, куды Мэйнт езьдзіў на спатканьні, крыжаваліся шматлікія шляхі. Агенты ўсялякае масьці. Сакрэтная паліцыя. Падпольныя сеткі. Я ніколі ў гэтым не разьбіраў-

ся. Якую ролю выконваў Рэнэ ў нечым такім? Некалькі разоў мне здавалася, што ён мог бы даверыцца мне, калі б ня думаў, што я замалады. Або ад шчырасьці паўстрымоўвала яго папросту вялізная ўморанасьць, і ён лічыў за лепшае захоўваць усё ў сакрэце.

Аднаго вечару, аднак, калі я забаўляўся тым, што безупынна турзаў Мэйнта пытаньнем, хто такі той „Анры Кюстыкер", а Івона дапякала яму, паўтараючы рытуальную фразу: „Алё, тут Анры Кюстыкер", ён быў у больш напружаным стане, чымсьці звычайна, і глуха сказаў: „Калі б вы толькі ведалі, што я мушу рабіць дзеля гэтых падлаў..." І дадаў адрывіста: „Я ўжо сыты па горла іхнымі альжырскімі гісторыямі..." Але праз хвіліну да яго вярнулася ягоная бестурботнасьць і добры настрой, і ён запрапанаваў нам паехаць у Сэнт-Роз.

Праз дванаццаць гадоў я ўсьвядоміў сабе, што ведаю зусім мала пра Рэнэ Мэйнта, і пашкадаваў, што амаль не цікавіўся ім у часіну, калі сустракаўся зь ім кожны дзень. З тае пары Мэйнтава постаць — як і Івоніна — моцна размылася і бачыцца мне нібыта праз матавае шкло.

Тут, у сквэры, сеўшы на лаўку і паклаўшы побач газэту з паведамленьнем аб сьмерці Рэнэ, я зноў убачыў некаторыя эпізоды з таго прамінулага сэзону, хоць і расплывіста, як заўсёды. Напрыклад, адзін суботні вечар, калі мы, Мэйнт, Івона і я, вячэралі ў таннай кнайпе над возерам. Каля поўначы група нейкіх хуліганаў абступіла наш столік і пачала шукаць звады. Мэйнт зь незвычайным спакоем схапіў бутэльку, разьбіў яе аб ускрай стала і, узмахнуўшы ашчэранымі шклянымі клыкамі, сказаў:

— Першаму, хто падыдзе, я абсталюю морду...

Ён вымавіў гэтую фразу з такой злоснай бадзёрасьцю, што я ўздрыгнуў. Ды іншыя таксама. Яны кінуліся наўцёкі. Па дарозе дадому Рэнэ прашаптаў:

— Падумаць толькі, яны зьлякаліся каралевы Астрыд...

Ён асабліва паважаў гэтую каралеву і заўсёды насіў пры сабе ейную фатаграфію. Ён дайшоў да таго, што пераканаў сябе, быццам у папярэднім жыцьці ён сам быў маладой, прыгожай і нешчасьлівай каралевай Астрыд. Разам з фатаграфіяй Астрыд ён насіў здымак, на якім былі мы трое ў дзень уручэньня Кубка. У мяне ёсьць яшчэ адзін, на якім Івона стаіць са мною пад ручку. Сабака зь вельмі важнай мінай сядзіць побач. Можна сказаць, што гэта фатаграфія нарачоных. Да таго я яшчэ маю значна даўнейшы здымак, які дала мне Івона. Ён паходзіць з часу, калі яшчэ жыў барон. На ім яны з Мэйнтам сядзяць на залітай сонцам тэрасе бару „Баск" у Сэн-Жан-дэ-Лю.

Гэта адзіныя іхныя выразныя адлюстраваньні. Усё астатняе агорнутае імглою. Хол і пакой „Эрмітажу". Сады „Віндзору" і гатэлю „Альгамбра". Віла Журба. „Сэнт-Роз". „Спортынг". Казіно. Кубак Хулігантнасьці. Прывіды Кюстыкера (хто ж ён быў?), Івоны Жакэ і нейкага графа Хмары.

XIII

Гэта было амаль у той самы час, калі пайшла ад нас Мэрылін Манро. Я шмат чытаў пра яе ў часопісах і ставіў яе ў прыклад Івоне. Яна таксама, калі захоча, можа зрабіць выдатную кар'еру ў кіно. Праўду сказаўшы, яна ня менш чароўная за Мэрылін Манро. Ёй не хапае толькі ўпартасьці Мэрылін.

Яна слухала мяне моўчкі, лежачы на ложку. Я ёй гаварыў пра цяжкія пачаткі Мэрылін Манро, першыя здымкі для календароў, першыя малыя ролі, прыступкі, якія яна брала адна за адной. Яна, Івона Жакэ, не павінна запыняцца ў дарозе. „Лётная манэкеншчыца". Потым першая роля ў фільме *Liebesbriefe auf dem Berg* Рольфа Мадэі. І перамога ў Кубку Хулігантнасьці. Кожны этап па-свойму важны. Трэба думаць пра будычыню. Браць крыху вышэйшую прыступку. Потым наступную.

Яна мяне не перапыняла, калі я выкладаў ёй свае ідэі наконт ейнай „кар'еры". Але ці сапраўды яна мяне слухала? Спачатку яе напэўна зьдзівіла такая зацікаўленасьць ейным лёсам і падлесьціла ёй мая гарачая ўпэўненасьць у ейнай вялікай будучыні. Магчыма, я натхняў яе сваім энтузіязмам і яна час ад часу таксама аддавалася марам. Але, як я думаю, ненадоўга. Яна была старэйшая за мяне. Чым больш я пра яе думаю, тым больш пераконваюся, што для яе тады наступіў той момант маладосьці, калі здаецца, што неўзабаве ўсё абрынецца або што ўжо на ўсё запозна. Карабель яшчэ ля прычалу, яшчэ застаецца некалькі хвілін да адыходу, хопіць усяго прайсьці па трапе... Але вас ахапіла нейкае здранцьвеньне.

Часам мае разважаньні яе сьмяшылі. Калі я сказаў ёй, што прадусэры несумненна адзначаць яе дэбют у *Liebesbriefe auf dem Berg*, яна толькі сьцепанула плячыма. Не, яна ў гэта ня верыла. У яе не было таго сьвятога агеньчыка. Але і ў Мэрылін Манро спачатку таксама не было. Гэта прыходзіць з часам.

Я часта задаюся пытаньнем, у які момант яна здалася. Цяпер яна напэўна выглядае інакш, і мне не застаецца нічога іншага як глядзець на фатаграфіі, каб узнаўляць у памяці ейны твар з таго прамінулага часу. Я шмат гадоў марна стараюся адшукаць *Liebesbriefe auf dem Berg*. Усе тыя, каго я распытваў, заяўлялі, што такога фільму не існуе. Нават імя Рольфа Мадэі няшмат ім гаварыла. Шкада. У кіно я зноў пачуў бы яе голас, убачыў бы яе жэсты і позіркі, якія я некалі ведаў. І кахаў.

Але дзе б яна ні была — а яна вельмі далёка, як мяркую — ці ўзгадаюцца ёй, хоць бы імгліста, мае пляны і мары, якія я выкладаў ёй у пакоі „Эрмітажу", калі мы гатавалі ежу для сабакі? Ці ўзгадае яна пра Амэрыку?

*

Хоць мы і праводзілі дні і ночы ў салодкай бестурботнасьці, я ўсё-ткі думаў пра нашу будучыню і уяўляў сабе яе ў штораз выразьнейшых фарбах.

Я сур'ёзна раздумваў над сужонствам Мэрылін Манро з Артурам Мілерам, сужонствам сапраўднай амэрыканкі з глыбокай правінцыі з жыдам. Наш лёс, Івонін і мой, быў крыху падобны да іхнага. Івона, француская правінцыялачка, праз некалькі гадоў будзе зоркай кіно. А я стану жыдоўскім пісьменьнікам, які будзе насіць вялізныя акуляры ў раговай аправе.

Але Францыя раптам падалася мне зацеснай, каб разгарнуць свае сапраўдныя здольнасьці. На што я магу разьлічваць у гэтай малой краіне? Адчыню антыкварную краму? Стану пасярэднікам у кніжным гандлі? Зраблю кар'еру балбатлівага і абачлівага пісакі? Ніводзін з гэтых заняткаў не выклікаў у мяне энтузіязму. Нам зь Івонай трэба было зьехаць.

Мне не прыйшлося б тут нічога пакідаць, таму што ў мяне не было ніякіх сувязяў, але й Івона парвала са сваімі. Мы пачалі б новае жыцьцё.

Ці ня прыклад Мэрылін Манро і Артура Мілера падштурхнуў мяне да гэтай думкі? Я тут жа пачаў думаць пра Амэрыку. Там Івона прысьвеціць сябе кіно. А я сябе — літаратуры. Мы павянчаемся ў вялізнай сынагозе ў Брукліне. На нашым шляху будзе шмат перашкодаў. Магчыма, яны нас даканаюць, але калі нам удасца іх адужаць, нашыя мары стануцца сапраўднасьцю. Артур і Мэрылін. Івона і Віктор.

Я плянаваў, што праз шмат гадоў мы вернемся ў Эўропу. Схаваемся ў нейкім горным рэгіёне — Тэсэне або Энгандыне. Паселімся ў вялізным шалé, аточаным паркам. На паліцах будуць стаяць Івоніны „Оскары" і мае ганаровыя дактараты Мэксыканскага і Ейлскага ўнівэрсытэтаў. Мы будзем гадаваць з тузін нямецкіх догаў, гатовых пашкуматаць кожнага няпрошанага госьця, і ня будзем нікога прыймаць. Цэлымі днямі будзем валяцца ў сваім пакоі, як у часіну „Эрмітажу" або Вілы Журбы.

Інсьпірацыяй для гэтага другога пэрыяду нашага жыцьця мне сталася жыцьцёвая дарога Палеты Гадар і Эрыха-Марыі Рэмарка.

Або застанемся ў Амэрыцы. Знойдзем вялізны дом на вёсцы. Мяне вельмі ўразіў загаловак аднае з кніжак, што валяліся ў гасьцёўні ў Мэйнта — „Зялёная трава Ваёмінгу". Я яе ніколі не прачытаў, але хопіць мне толькі вымавіць „Зялёная трава Ваёмінгу" — і маё сэрца пачынае шчымець. Фактычна, якраз у гэтай няіснай краіне, пасярод высокай травы і далікатнай зелені, мне хацелася б жыць зь Івонай.

*

Я раздумваў над ідэяй выезду ў Амэрыку некалькі дзён, перш чым сказаць аб ёй Івоне. Яна магла не прыняць яе ўсур'ёз. Да таго трэба было абдумаць дэталі, зьвязаныя з практычным бокам падарожжа. Ніякай імправізацыі. Я назьбіраю грошай на дарогу. Ад васьмісот тысяч франкаў, якія я зарабіў на махінацыі з жэнэўскім букіністам, у мяне засталася прыблізна палова, але я разьлічваў здабыць грошы іншым спосабам: ужо некалькі месяцаў я насіў у валізе малую шкляную скрыначку з надзвычай рэдкім матыльком. Адзін спэцыяліст запэўніваў мяне, што матылёк варты „прынамсі" чатырыста тысяч франкаў. Значыць, ён мог каштаваць і ўдвая больш, і я мог бы ўзяць нават утрая больш, калі б удалося прадаць яго калекцыянэру. Вось я й куплю білеты на параход Генэральнай Трансатлянтычнай Кампаніі, і мы затрымаемся ў гатэлі „Алганкін" у Нью-Ёрку.

Далей я разьлічваў, што мая сваячка Бэла Дарві, якая зрабіла кар'еру ў Амэрыцы, увядзе нас у фільмовыя колы. Такі быў, у агульных рысах, мой плян.

*

Я палічыў да трох і сеў на прыступках парадных сходаў. Праз балюстраду я ўбачыў нанізе рэцэпцыю і парцье, які размаўляў зь нейкім лысым тыпам у смокінгу. Яна зьдзіўлена адвярнулася. На ёй была зялёная мусьлінавая сукенка і шалік такога самага колеру.

— А чаму б нам ня выехаць у Амэрыку?

Я выкрыкнуў гэтую фразу, пабаяўшыся, што яна або ўвогуле завязьне ў маім горле, або ператворыцца ў нейкі гыркат. Я набраў паветра і паўтарыў так жа моцна:

— А чаму б нам ня выехаць у Амэрыку?

Яна села побач са мною на сходах і ўзяла мяне за руку.

— У цябе нешта здарылася? — запытала яна.

— Ды нічога. Гэта вельмі проста... Гэта вельмі-вельмі проста... Мы едзем у Амэрыку...

Яна агледзела абцасы сваіх пантофляў, пацалавала мяне ў шчаку і папрасіла, каб я ёй усё растлумачыў пазьней. Мінула ўжо дзявятая, і Мэйнт чакаў нас у „Будане" ў Вэйр'е-дзю-Ляк.

*

Месца нагадвала гасподы на беразе Марны. Столікі былі расстаўленыя на вялізным пантоне і аточаныя драўлянымі загародкамі, кадкамі зь зялёнымі расьлінамі й кусьцікамі. Вячэралі пры сьвечках. Рэнэ выбраў столік ля самай вады.

Ён меў на сабе гарнітур з бэжавага шантунгу і памахаў нам рукою ад століка. Ён быў разам з маладым чалавекам, якога ён нам прадставіў, але я забыўся ягонае імя. Мы селі тварам да вады.

— Тут вельмі міла, — сказаў я, каб пачаць размову.

— Так, нічога сабе, — сказаў Рэнэ. — Гэты гатэль — месца сустрэч закаханых...

— Зь якога часу? — спыталася Івона.

— Зь незапомнага, мая дарагая.

Яна глянула на мяне і зноў расьсмяялася:

— Ведаеш, што мне прапануе Віктор? Ён хоча забраць мяне ў Амэрыку.

— У Амэрыку?

Было відаць, што гэта яму няўцям.

— Сьмешная ідэя.

— Так, — сказаў я. — У Амэрыку.

Ён недаверліва ўсьміхнуўся. Для яго гэта былі пустыя словы. Ён павярнуўся да свайго сябра:

— Усё добра?

Той кіўнуў.

— Цяпер трэба паесьці.

Ён размаўляў зь ім, як зь дзіцём, хоць гэты хлапец выглядаў на крыху старэйшага за мяне. У яго былі коратка стрыжаныя сьветлыя валасы, твар анёльскае прыгажосьці і целасклад атлета.

Рэнэ нам растлумачыў, што ягоны сябар удзельнічаў у конкурсе „Найпрыгажэйшы атлет Францыі". Спаборніцтва праходзіла ў Казіно. Ён атрымаў усяго трэцяе месца сярод юніёраў. Той правёў рукой па валасох і сказаў, зьвяртаючыся да мяне:

— У мяне не было шанцаў, каб...

Я ўпершыню пачуў ягоны голас і заўважыў, таксама ўпершыню, што ў яго блакітна-лявандавыя вочы. Яшчэ й сёньня мне помніцца ягоны позірк з выразам дзіцячае крыўды. Мэйнт наклаў яму на талерку сырой гародніны. А той усё зьвяртаўся да мяне зь Івонай. Ён пранікся даверам да нас.

— Ну й гады тыя судзьдзі... я павінен быў атрымаць найвышэйшую ацэнку за выступ у вольных позах...

— Замоўкні і еш, — сказаў Мэйнт чульлівым тонам.

*

Ад нашага століка былі відаць агні далёкага гораду, а калі крыху павярнуць галаву, на другім беразе ўвагу прыцягвала зіхоткае сьвятло „Сэнт-Роз". У гэтую ноч фасады Казіно і „Спортынгу" патаналі ў пражэктарным сьвятле, промні якога даходзілі ажно да берагоў возера. У вадзе адбіваліся чырвоныя і зялёныя агні. Да нас даносіўся голас, празьмерна ўзмоцнены дынамікамі, але мы былі задалёка, каб разабраць словы. Гэты быў спэктакль „Гук і сьвятло". Я дазнаўся зь мясцовай газэты, што з гэтае нагоды актор Францускай Камэдыі, здаецца, Марша, прачытае „Возера" Альфонса Лямартэна. Гэта напэўна і быў ягоны голас, рэха якога далятала да нас.

— Нам трэба было застацца ў горадзе і паглядзець, — сказаў Мэйнт. — Я страх як люблю „Гук і сьвятло". А ты? — ён зьвярнуўся да свайго сябра.

— Ня ведаю, — адказаў той. Позірк у яго выяўляў яшчэ большую роспач чым хвіліну раней.

— Дык давайце зараз паедзем туды, — запрапанавала Івона з усьмешкай.

— Не, — сказаў Мэйнт. — Сёньня ноччу я павінен быць у Жэнэве.

Навошта яму туды трэба? Каго ён мае спаткаць у „Бэльвю" і ў „Павільёне Ароса", у месцах, якія перадаў праз мяне Анры Кюстыкер па тэлефоне? Калі-небудзь ён адтуль ня вернецца жывы. Жэнэва, на выгляд такая стэрыльная, была гнілым горадам. Здрадлівым горадам. Прахадным дваром.

— Я там прабаўлю тры-чатыры дні, — сказаў Мэйнт. — Патэлефаную вам, калі вярнуся.

— Але ж мы зь Вікторам зараз зьяжджаем у Амэрыку, — заявіла Івона.

І засьмяялася. Я не разумеў, чаму яна ставіцца да майго пляну з насьмешкай. Я адчуў, як ува мне ўздымаецца глухая ятра.

— Я ўжо сыты па горла гэтай Францыяй, — сказаў я тонам, які не дапускаў пярэчаньняў.

— Я таксама, — сказаў Мэйнтаў сябар з рэзкасьцю, якая так ня ладзілася зь ягонай папярэдняй ціхмянасьцю і маркотай.

І гэтая заўвага разрадзіла атмасфэру.

*

Мэйнт заказаў алькаголю. Мы засталіся самі на пантоне. З далёкіх гукаўзмацняльнікаў абрыўкамі даносілася музыка.

— Вось і ён, — сказаў Мэйнт, — гарадзкі духавы аркестар. Будзе йграць цягам усяе імпрэзы. — Ён павярнуўся да нас: — А вы што зьбіраецеся рабіць сёньня вечарам?

— Пазьбіраем валізы перад ад'ездам у Амэрыку, — суха адказаў я.

Івона зноў зь неспакоем глянула на мяне.

— А ён усё пра сваю Амэрыку, — сказаў Мэйнт. — Значыць, вы мяне тут пакінеце аднаго?

— Ды не, — сказаў я.

Мы ўсе чацьвёра чокнуліся проста так, бяз дай прычыны, адно таму, што Мэйнт запрапанаваў. Мэйнтаў сябар бледна ўсьміхнуўся, і ў ягоных блакітных вачох мільганула радасьць. Івона ўзяла мяне за руку. Афіцыянты ўжо пачалі зносіць столікі.

Вось столькі я і помню пра нашу апошнюю вячэру.

*

Яна выслухала мяне з захмараным чалом, але ўважліва. Яна ляжала на канапе ў старым халаціку ў чырвоныя гарошынкі. Я ёй выклаў свой плян: пра Генэральную Трансатлянтычную Кампанію, гатэль „Алганкін", маю сваячку Бэлу Дарві, пра Амэрыку, куды мы адчалім праз некалькі дзён, пра Абяцаную Зямлю, якая, па меры таго як я гаварыў, здавалася штораз бліжэйшай, амаль што на дасяг рукі. Ці гэта ня ейныя агні віднеліся там у далечы, па другі бок возера?

Яна перапыняла мяне некалькі разоў пытаньнямі: „А што мы будзем рабіць у Амэрыцы?" — „Як мы дастанем візы?" — „Адкуль возьмем грошы на жыцьцё?" Я так захапіўся сваім расповедам, што не адразу заўважыў, што ейны голас ставаўся штораз больш млявы. Вочы ў яе былі прымружаныя або й зусім заплюшчаныя, але часам яны раптоўна расплюшчваліся і разглядалі мяне з жахам. Не, мы не застанемся ў Францыі, у гэтай малой задушлівай краіне, пасярод чырванашчокіх „смакавальнікаў віна", велагоншчыкаў і гастраномных адмыслоўцаў, якія разьбіраліся ў смаку некалькіх гатункаў ігруш. Мяне душыла злосьць. Мы не застанемся ні хвіліны даўжэй у краіне, дзе нас цкуюць. Канец. Досыць ужо. Валізы. Неадкладна.

Яна заснула. Яе галава зьвешвалася з ложка. Зь лёгка надзьмутымі шчокамі і ледзь бачнай усьмешкай у сьне яна выглядала сама больш на пяцігадовае дзіця. Яна засынала і тады, калі я чытаў ёй „Гісторыю Англіі", але гэтым разам яна адключылася яшчэ хутчэй, чым пад Маруа.

Я глядзеў на яе, седзячы на падваконьні. За вакном пускалі нейкі фэервэрк.

*

Я ўзяўся пакаваць багажы. Пагасіў сьвятло ў пакоі, каб яе не збудзіць, пакінуўшы толькі лямпачку на начным століку. Потым пачаў выграбаць ейныя і свае рэчы з шафаў, як трапляла пад руку.

Пустыя валізы я параскладваў на падлозе ў гасьцёўні. У яе было шэсьць валізаў розных памераў. З маімі іхны лік сягаў адзінаццаці, а яшчэ быў мой куфар. Я ўклаў свае старыя часопісы і вопратку, але зь ейнымі рэчамі было складаней — кожны раз, калі мне здавалася, што я ўжо закончыў, мне траплялася яшчэ адна сукенка, фляконачык з парфумай або стос шалікаў. Сабака, які сядзеў на канапе, уважлівым позіркам сачыў за маімі стараньнямі.

У мяне ўжо не хапіла сілы пазачыняць тыя валізы, і я зьняможана апусьціўся на крэсла. Сабака паклаў морду на валік канапы і глядзеў на мяне адтуль спадылба. Мы доўгі час глядзелі адзін аднаму проста ў вочы.

Пачало сьвітаць, і на мяне найшоў цьмяны ўспамін. Калі ж гэта я ўжо перажываў нешта падобнае? Мне ўбачыліся кватэры ў шаснаццатай або сямнаццатай акрузе, — на вуліцы Палкоўніка Моля, пляцы Вілярэ-дэ-Жуаёз, праспэкце Генэрала Бальфур'е, — у якіх сьцены былі павыклейваныя такімі самымі шпалерамі, што і ў „Эрмітажы", а крэслы і ложкі даймалі сэрца пачуцьцём беспрытульнасьці. Задрыпаныя памяшканьні, ненадзейныя прыстанішчы, якія трэба было заўсёды пакідаць перад прыходам немцаў і ў якіх не заставалася па вас ні сьледу.

*

Яна мяне разбудзіла. З прыадкрытым ротам яна разглядала напакаваныя валізы.

— Чаму ты гэта зрабіў?

Яна ўселася на самую вялізную, гранатовую скураную валізу. Выгляд у яе быў змораны, быццам яна цэлую ноч дапамагала мне ўкладваць багажы. Яе пляжны халат быў расхінуты на грудзях.

Дык я зноў, прыглушаным голасам, стаў ёй выкладаць пра Амэрыку. Я спахапіўся, што расьцягваю некаторыя фразы, нібыта ў дэклямацыі.

Вычарпаўшы ўсе аргумэнты, я ёй паведаміў, што сам Маруа, пісьменьнік, якім яна захапляецца, выехаў у саракавым годзе ў Амэрыку. Маруа.

Маруа.

Яна ківала галавою і ласкава ўсьміхалася. Яна была згодная. Мы выяжджаем неадкладна. Яна ня супраць. Толькі я павінен адпачыць. Яна паклала руку мне на лоб.

Але ж мне яшчэ трэба было дагледзець столькі дробязяў. Напрыклад, узяць візу для сабакі.

Яна слухала мяне з усьмешкай, не варушачыся. Я гаварыў некалькі гадзін, паўтараючы тыя самыя словы: „Алганкін", Бруклін, Генэральная Трансатлянтычная Кампанія, Цукар, Голдуін, Уорнэр Брос, Бэла Дарві... А яна была цярплівая.

— Ты павінен крыху паспаць, — паўтарала яна час ад часу.

*

Я чакаў. Што яна там магла рабіць? Абяцала быць на вакзале за паўгадзіны перад адыходам экспрэсу ў Парыж. Мы так дамовіліся, каб не спазьніцца. Але ён ужо ад'яжджае. Я стаю, а вагоны, пагрукваючы, мінаюць мяне адзін за адным. За мною, паўколам каля аднае з лавак, стаялі валізы і куфар, перакулены старчма. Зыркае сьвятло з вагонаў вымалёўвала цені на пэроне. Я адчуваў пустку і тупасьць, якія ў мяне заўсёды выклікае праезд цягніка.

Праўду кажучы, я такога й чакаў. Ня верылася, што справы могуць пайсьці інакш. Я зноў паглядзеў на багажы. Трыста або чатырыста кіляграмаў, якія я заўсёды цягаю за сабою. Навошта? Я горка расьсьмяяўся ад гэтай думкі.

Наступны цягнік меўся быць шэсьць хвілін па поўначы. У мяне яшчэ было больш за гадзіну, і я пайшоў з вакзалу, пакідаючы валізы на пэроне. Яны ні для кога не ўяўляюць ніякай цікавасьці. Да таго ж, яны зацяжкія, каб іх красьці.

Я заглянуў у кавярню-ратонду каля гатэлю „Вэрдэн". Як яна называлася — „Цыфэрбляты" ці „Будучыня"? На дальніх століках гулялі ў шахматы. Брунатныя драўляныя дзьверы вялі ў більярдную залю. Кавярня была асьветленая ружовымі мігатлівымі нэонамі. Час ад часу ляскалі більярдныя шары і чуваць было няспыннае шыпеньне ў нэонавых трубках. Больш нічога. Ні слова. Ні шэпту. Я паціху заказаў ліпава-мятнае гарбаты.

Раптам Амэрыка падалася мне такой далёкай. Ці прыходзіў сюды пагуляць у більярд Альбэр, Івонін бацька? Цікава было б дазнацца. Найшла на мяне санлівасьць — у гэтай кавярні я адчуў сябе так жа спакойна, як і ў пансіянаце „Пад Ліпамі" ў мадам Бюфа. Нешта ў мяне перамянілася ў мазгох або мяне ахапіла іншая манія, бо адна мроя замяніла другую: я ўжо не ўяўляў сябе зь Івонай у Амэрыцы, а бачыў нас у малым правінцыйным мястэчку, якое было надзіва падобнае на Баён. Як быццам мы жывем на вуліцы Т'ера і летнімі вечарамі шпацыруем пад аркадамі тэатру або па алеі Буфле. Я бяру Івону за руку і мы слухаем стукат тэнісных мячыкаў. Нядзельным надвячоркам, нахадзіўшыся ўздоўж старых муроў, мы сядаем на лаўцы ў парку каля бюста Леона Банна. Баён, горад спакою і ўлагоджанасьці пасьля гэтулькіх гадоў трывогі. Магчыма, яшчэ не было запозна. Баён...

*

Я шукаў яе паўсюль. Выгледжваў яе паміж застольнікамі і танцорамі ў „Сэнт-Роз". Здаецца, гэта была ноч, якая ў сьвяткавальнай праграме сэзону значылася як „Зіхатлівая ноч". Ага, зіхатлівая. Раптоўнымі сьнегападамі сыпалася на галовы і плечы гасьцей канфэці.

За тым самым столікам, за якім мы адзначалі Кубак, я распазнаў Фасар'е, Ралян-Мішэляў, брунэтку, прэзыдэнта гульцоў у гольф і дзьвюх загарэлых да бронзы бляндынак. Як быццам яны і не пакідалі таго месца цэлы месяц. Толькі фрызура Фасар'е памянялася. Адна набрыльянтыненая хваля ўздымалася дыядэмай над ягоным лобам. За ёю — упадзіна. Другая вельмі магутная хваля прабягала ззаду галавы і ападала каскадамі на патыліцу. Не, мне гэта не прысьнілася. Яны ўстаюць і йдуць на пляцоўку для танцаў. Аркестар іграе пасадобль. Яны зьнікаюць сярод іншых танцораў пад сьнегападам канфэці. І ўсё гэта кружыцца, вірує і ўецца, і рассыпаецца ў маіх успамінах. На пыл.

Рука на маім плячы. Гаспадар гэтага балагану, раней спамянуты Пульлі.

— Вы кагосьці шукаеце, мэсьё Хмара? — ён шэпча мне ў вуха.

— Мадмуазэль Жакэ... Івону Жакэ...

Я вымаўляю гэтае імя без асаблівай надзеі. Ён і так ня памятае. Столькі твараў... Госьці зьмяняюцца кожны вечар. Калі б я яму паказаў здымак, ён бы напэўна ўспомніў. Заўсёды трэба насіць з сабой здымак каханай асобы.

— Мадмуазэль Жакэ? Яна толькі што ад'ехала ў суправаджэньні мэсьё Даніэля Анрыкса...

— Сапраўды?

Я мусіў зрабіць у той момант дурнаватую міну і надзьмуць шчокі як дзіця, якое зьбіраецца заплакаць, бо ён узяў мяне пад руку.

— Але ж так. У суправаджэньні мэсьё Даніэля Анрыкса.

Ён не сказаў „з", але „ў суправаджэньні", і я распазнаў абыходлівасьць, зь якой гаварылі на абавязковай францускай мове ў сьвецкіх колах Каіру і Александрыі.

— Ці ня выпіць нам па кілішку?

— Не, я павінен пасьпець на цягнік у шэсьць хвілін па поўначы.

— Тады я вас правяду на вакзал, Хмара.

Ён трымае мяне за рукаво. Ён са мной фамільярны, але таксама і пачцівы. Мы працісканемся паміж танцорамі. Усё той ж пасадобль. Канфэці цяпер падаюць безупынным ліўнем і засьцяць мне вочы. Вакол мяне сьмех і шмат мітусьні. Я налятаю на Фасар'е. Адна з бронзавых бляндынак, тая самая Мэг Дэвілье, вісьне ў мяне на шыі:

— Ах, гэта вы... вы... вы...

Яна ня хоча мяне выпусьціць. Я валаку яе за сабою два-тры мэтры. Урэшце мне ўдаецца вышчаміцца. Мы з Пульлі знаходзім адзін аднаго на лесьвіцы. Нашы валасы і пінжакі ўсыпаныя канфэці.

— Гэта Зіхатлівая ноч, Хмара.

Ён пацепвае плячыма.

Ягоная машына стаіць насупроць „Сэнт-Роз", на ўзбочыне дарогі над возерам. „Сімка Шамборд", дзьверцы якой ён цырымонна адчыняе перада мною.

— Калі ласка ў маю ламачыну.

Машына заводзіцца не адразу.

— У мяне быў аўтамабіль з адкрытым верхам у Каіры.

І раптам пытаецца:

— А вашы валізы, Хмара?

— Яны на вакзале.

Колькі хвілін едзем моўчкі, потым ён пытаецца:

— А ў якім кірунку вы едзеце?

Я не адказаў. Ён прытармазіў. Мы едзем не хутчэй чым трыццаць кілямэтраў у гадзіну. Ён паварочваецца да мяне:

— Падарожжы...

Змаўкае. Я таксама нічога не кажу.

— Але недзе ж трэба ўрэшце асесьці, — заключае ён. — На жаль...

Мы едзем уздоўж возера. Я апошні раз гляджу на агні Вэйр'е перад намі і цёмныя дамы ўздоўж Карабасэлю на далягляцдзе над намі. Прымружыўшы вочы, спрабую згледзець фунікулёр, але марна. Мы задалёка ад'ехалі.

— Вы калі-небудзь вернецеся сюды, Хмара?

— Ня ведаю.

— Вам пашэнціла, вы зьяжджаеце. Ах, гэтыя горы...

Ён паказвае ў далеч, на хрыбет Араві, асьветлены месячным бляскам.

— Здаецца, што ён вось-вось зваліцца на вас. Я задыхаюся, Хмара.

Гэта прызнаньне ад шчырага сэрца. Яно мяне кранае, але я не знаходжу сілы, каб яго суцешыць. Усё ж ён значна старэйшы за мяне.

Мы ўехалі ў горад па алеі Маршала Леклерка. Непадалёку ад роднага дома Івоны. Пульлі небясьпечна цягнула да левага боку, усё роўна што англічаніна, але, на шчасьце, ніякай іншай машыны на дарозе не было.

— Мы прыехалі зарана, Хмара.

Ён запыніў машыну на Вакзальным пляцы, перад гатэлем „Вэрдэн".

Мы прайшлі пустой вакзальнай заляй. Пульлі нават ня мусіў купляць пэроннага білету. Мае багажы стаялі на сваім месцы.

Мы селі на лаўку. Акрамя нас на пэроне не было нікога. Цішыня, цёплае паветра, асьвятленьне наводзілі на думку нешта трапічнае.

— Сьмешна, — прызнаўся Пульлі, — але мне гэтае месца нагадвае вакзальчык у Рамлеху...

Ён працягнуў мне цыгарэту. Мы паважна курылі, не адзываючыся ні словам. Здаецца, мне нават удалося пусьціць некалькі колцаў дыму.

— Ці мадмуазэль Івона Жакэ сапраўды выехала з мэсьё Даніэлем Анрыксам? — спакойна спытаўся я.

— Так. А што?

Ён прыгладзіў свае чорныя вусы. Я падазраваў, што ён хоча сказаць мне некалькі суцяшальных словаў у падтрымку, але гэтага ня здарылася. Лоб у яго зморшчыўся. На скронях заблішчалі ручаіны поту. Ён глянуў на гадзіньнік. Дзьве хвіліны па поўначы. Ён вымавіў з натугай:

— Я мог бы быць вашым бацькам, Хмара... Паслухайце мяне... Перад вамі цэлае жыцьцё... Будзьце мужным...

Ён паглядзеў налева й направа, ці ня едзе цягнік.

— Нават я ў свае гады... не азіраюся ў мінулае... стараюся забыць Эгіпэт...

Цягнік уяжджаў на вакзал. Пульлі глядзеў на яго, як загіпнатызаваны.

Ён узяўся дапамагаць мне з валізамі. Падаваў мне іх як папала, а я ставіў іх у тамбур. Адна. Дзьве. Тры.

Мы нашчыраваліся, пакуль уцягнулі куфар. Ён, напэўна, надарваў сабе руку, калі падняў яго і ўпіхнуў да мяне ў вагон зь нейкай разьюшанасьцю.

Праваднік зачыніў дзьверы. Я апусьціў шыбіну і высунуўся навонкі. Пульлі ўсьміхнуўся мне.

— Не забывайце пра Эгіпэт, і шчасьліва вам, *old sport*...

Я зьдзівіўся, пачуўшы ад яго гэтыя два ангельскія словы. Ён пачаў махаць рукою. Цягнік рушыў. Раптам Пульлі спахапіўся, што мы забылі адну круглую валізу каля лаўкі. Ён схапіў яе і кінуўся даганяць цягнік. Але ўрэшце спыніўся, засопшыся, і бездапаможна разьвёў рукамі. Ён не выпускаў валізы з рукі і стаяў выпрастаны пад сьвятлом пэронных ліхтарняў. Можна было падумаць, што гэта вартаўнік, які усё зьмяншаўся і зьмяншаўся. Да памераў алавянага жаўнерыка.

Пераклаў з французкай мовы
Ян МАКСІМЮК

Эган Бонды

Дзявочы дзёньнік

* * *

Сёлетнім летам я ўрэшце выйшла свабодна
зараз за местам скінула ўсе апранахі
і хаджу цяпер па палёх наўкола Прагі голая
толькі празь вёскі нацягваю мех зь дзіркай для галавы й рук

* * *

Калі я так сабе выйшла
дык зусім ня думала што нехта будзе мяне непакоіць
in puncto сэксу
дый сама ўвогуле ня мела намеру нікога непакоіць
Але ўжо на другі дзень пераканалася
што мая бестурботнасьць не была ўшанаваная
Было гэта на Точне
там дзе лётаюць аэрапляны

* * *

На другі дзень я сабе сказала
што мушу міжволі лічыцца з паўтараньнем
і каб ня зьбіцца зь ліку
пачала за кожнага хто мне ўставіў
наколваць голкай абмакнутай у тушы
малую рысачку на плячы
Гэта было як нашыўкі сяржанта Пэпэра
адно што потым было іх больш

* * *

Я чула што Бонды таксама ходзіць зусім голы па ваколіцы
і носіць з сабою піва
Хацела б я зь ім сустрэцца!

Зрэшты якраз гэтым краем
любіў блукаць голы і сьвяты Ладзіслаў Кліма
і наколькі нам вядома
асабліва зімою
Я выпіла ў халупіцкай гасподзе шмат кухляў з ромам
сцала на пісуары ў казіным хляўку дзе сцалі Кліма й Бонды
але таго халупіцкага схілу не знайшла
ці то забудавалі яго летнікамі
ці то забралі яго анёлы

* * *

Надосьвітку між роснай канюшыны
мне забялела дупачка дзяўчыны
То трахаўся калгасьнік зь сінявокай
калі я іх мінала левым бокам

* * *

Калі я выйшла зь лесу было позна й вечарэла
Я апынулася на толькі што зжатым полі
Дзе толькі хлапец зь дзеўкай за пару крокаў ад мяне
ставілі апошнія снапы ў бабкі
Я ўжо звыклася што калі людзі бачаць мяне дык дзівуюцца
і хацела далей пайсьці сваёй дарогай
Але хлапец мне яе пераступіў і зашмат не пытаўся
Шчыраваў на мне так што калі я ўстала
была падзертая пожняй да крыві

Дзеўка ўвесь час стаяла над намі з рукамі ў бокі
і маўчала

* * *

Жанчыны на летніках
зь вельмі добра ўкормленымі цыцкамі й клубамі
беглі за мною калі я ім паказалася
і клікалі мяне да свае машыны свае хаты
сваіх транзыстараў ля сажалкі
да тых сваіх люкс турэмных каморак
казіных катухоў
і парасятнікаў
абяцаючы мне што вышлюць мужа ў Прагу
(дзеці й так былі ў бабулі)
і пойдуць са мною як толькі
возьмуць грошы з ашчаднай касы
або што хоць дадуць мне плаўкі

* * *

Поле як скінуць вокам
камбайнамі сажнуць як бач
зазьзяюць новыя стагі саломы
і ў кожным калгасе стукач

* * *

Ад адной трыццаціпяцігадовай я не адкруцілася
За лукой дарогі ў лагчыне стаяла хата
а ля весьніц яна ў старых парудзелых і падраных плаўках
пудовыя цыцкі зусім не абвіслае вымя
(пазьней яны ладна натапырыліся)
церліся аб плот

Паклікала мяне адразу як толькі ачомалася ад подзіву
але я праставала далей і адно мімаходзь памахала ёй і павіталася
а яна шарахам разарвала свой стары нацыцнік
і стала ў адчыненых весьніцах так
што я папросту не магла прайсьці міма

Добра што яна шмат не гаварыла мабыць зусім нічога
зацягнула мяне на тапчан
і там пакрыла як навальнічная хмара
Мая галава была між яе сьцёгнамі
яна была распараная сонцам
срака ў яе пахла сракай
потка ў яе пахла поткай
— урэшце так яно й мае быць —
што было рабіць
я не магла ня вылізаць адно й другое

Пасьля вечарам я ня ведала
ці паставіць за яе рысачку паміж іншымі
ці можа на другім плячы
Але потым пабаялася што было б крыху сьмешна
калі б на адной руцэ мела столькі, а на другой толькі адну
— не прыйшло мне на думку што гэта была дачасная боязь —
дык паставіла рыску пад тымі астатнімі дадаўшы малую кропачку

* * *

Калгасьніцы сьмяяліся задзіралі на палёх спадніцы
і паказвалі дасьпелыя поткі
ды здатныя задніцы
якія стрываюць не абы-якую навалу
для іх мая потачка з заднічкай
ня йшлі ні ў якую канкурэнцыю

а таму яны толькі рагаталі й ляпалі адна адной па сьпінах
і ад рогату хапаліся ў абдымкі

* * *

Дагэтуль я ня ведала што ў нас у Чэхаславаччыне
23 кілямэтры і 300 мэтраў аўтастрадаў
відаць даўно не чытала газэтаў
Але калі ўжо пра гэта дазналася
хутка дайшло да мяне якія ў іх перавагі
Я стала на ўзбочыне дзе нікому
нават таварышу генэральнаму сакратару нельга спыніцца
і за чвэрць гадзіны амаль прычынілася да сьмерці некалькіх дзясяткаў кіроўцаў

Потым схавалася ў сажалцы
калі з выцьцём налятаў нарад дзяржаўнай аўтаінспэкцыі

* * *

Мужык які стрэўся мне ў лагчыне
сказаў што ў вясковай гасподзе няма начлегу
але што я магу пераспаць у яго

У пакоі я хацела змыць зь сябе дзённы пыл
але так як стаяла я брудная й ліпкая ад поту
ён зваліў мяне на падлогу
каб не запэцкацца яшчэ больш
я зрабіла яму масток
Мабыць такога ён яшчэ ня ведаў і страшэнна распаліўся
калі на яго наставілася мая дзірка
Якраз калі пахіляўся каб ёю пакарыстацца
я ўбачыла на сьцяне насупраць усю сцэну ў люстры
Калі раптам убачыла той вузкі пасак цела запалы жывот і вытырчасты таз
увесь той тонкі стан над якім узвышаліся толькі грудзі
працяў мяне нечаканы жах
куды ж памесьціцца той ягоны ворган
А калі ўбачыла як уваходзіць
і хаваецца ўва мне цалкам
не магла ўцяміць куды ён зьнікае
а потым бачыла як выныраe
і зноў акунаецца туды
куды паводле адбіцьця ў люстры нат палова не магла ўвайсьці
і так мяне жахнуў і ўразіў той трохвілінны тэатар
што спачатку зусім забылася што прыймаю яго ў сябе
і толькі пад канец у шалёнай радасьці ад так дзівоснага й паўзбуднага відовішча
пачала крычаць каб засадзіў яшчэ далей
а калі ён спускаў
я ўпершыню сапраўды адчула тыя порцыі каханьня ажно пад сэрцам

* * *

Мужчыны што мяне сустрэлі
і тыя што мяне трахнулі
пагамоняць аб гэтым з тыдзень у гасподзе за півам
але для тых жанчын на летніках
я застануся непазбыўным цернем успаміну
на ўсё жыцьцё
пры кожным уставаньні на працу
пры кожных закупах па працы
пры кожным флірце на працы

* * *

Я сёньня ў полі раптам стрэла трактарыста
Здалёк ад вёскі разгубілася начыста

Быў поўдзень трыццаць пяць па Цэльсію у ценю
калі я бездарожжам клыпала ў зацьменьні
Калгасьнік кінуў працу зырыцца на дзіва
а я яго ня бачу — толькі мора піва

Пайшла далей і ён жа тут пайшоў за мною
зрэдчас за сраку браўся мацануць рукою
аднак увагі я яму не надавала
бо смага штораз большая мяне даймала

Ідзу ды йду паўсюды жудасная ціша
а ён за цыцкі лапае і хутка дыша
і той яму ўстае як наагул бывае
ды я адно гасподу зь півам выглядаю

Ўжо першая Ў жары зьвяры і людзі чахнуць
а я й ня думаю ці на хаду ён зможа трахнуць
бо чым цьвярдзей яму стаіць ягоны шворан
тым больш мне кружыць галаву піўное мора

* * *

Калі рабіла тое каля плоту
згубіла ў разварушанасьці боты
І толькі крапіва там цалавала
бо мужыччо мяне адно піхала
Пасьля я доўга поўзала пад плотам
за правым і за левым ботам

* * *

Найперш піхаў туды дзе трэба
— проста неба!

Пасьля між цыцак умасьціў івана
— нечувана!

Урэшце ў рот — усё яму замала
— цьфу — стрывала!

Адно ў маёй маленькай дупкі
ніяк не атрымаў саступкі

* * *

Ня думайце што некалі я буду дзеці гадаваць
наступнае пакаленьне рабоў
або на аўта зарабляць
дзеля большага дабрабыту і ўдойнасьці кароў

Ня думайце што некалі я буду нечым іншым чым свабодай якая
вас дражніць і якую як вядзьмарку хочаце зганобіць і спаліць
ніводную з вашых бытавых радасьцяў я ніколі ня буду з вамі сьвяткаваць
у вашым „шчасьці" я заўсёды буду прысутная сваёй непрысутнасьцю
няхай вас гэта давядзе да вар'яцтва да адчаю або да злосьці
таму ня толькі *ніколі* мае словы ня будуць афіцыйныя
таму таксама *заўсёды* буду для *ўсіх* непапулярная
апроч Эгана Бонды відаць
які таксама любіць працаваць

* * *

Ужо ўзяўся добры прыцемак
Тая вёска што ўзьнікла перада мною
калі я ўрэшце ўвайшла на ўзгорак
магла быць — паводле мапы — Суліцамі
На ўскрай вёскі стаяў сацыялістычны кароўнік
насупраць дому культуры
у якім зрабілі пастаянны склад
Сельсавет будзе ніжэй у вёсцы
насупраць гасподы дзе чатыры разы на дзень спыняецца аўтобус

У ваконцах кароўніка сьвяцілася
я паднялася на пальчыкі каб пабачыць
ці змагу там пераначаваць
Але ў пустым стойле
акурат наўпрост мяне
даярка якраз бралася спраўляць вечаровы туалет

Зьняла блюзу і дбайна павесіла яе на жэрдцы
а потым расшпіліла станік
зь якога вываліліся
вялізарныя цыцкі белыя як дзьве поўні
на тле дачарна загарэлых плячэй і стану
Калі выцірала пот цыцкі хваляваліся як мора
І тады неспадзеўкі ўвайшоў гультаіна
хлапец акурат у прызыўным узросьце
і хапіў яе
Гэта значыць — бо яе цыцка не зьмясьцілася б і ў дзьвюх даланях —
ён хапіў найперш за адну
і толькі пасьля за другую

Маці вучняў і вучаніцаў у старэйшых клясах
пачала зьлёгку павіскваць
але ёй ня трэба было скідаць спадніцу
Нічога пад ёй ня мела і хлапец яе толькі задзёр
і на яго разявіўся Вэнэрын узгорак
ды паглынуў як Тангойзэра
Такім чынам
як яны абапершыся аб жэрдку рухаліся разам
і стаўбур час-часом выныраў цэлы і патанаў нанава
выглядала (калі толькі зьлёгку прымружыць вочы)
быццам чорнагаловае цялё смокча каровіна вымя
хоць тут
сэксуальныя ролі былі адваротныя
Я глядзела на іх зь цікавасьцю
увесь час пакуль ня скончылі
што сталася на жаль
— як яно ўжо на вёсцы бывае — дужа захутка
Раззлаваная калгасьніца мігам выгнала таго гламазду
а потым зноў паволі і дбайна
зьняла злажыла й павесіла спадніцу на жэрдцы
выгладзіла на ёй усе складкі
і абтрэсла яе ззаду ад саломы
Прысела сабе на пальчыках
сьпінаю да вакна
паказваючы мне выдатную стокіляграмную задніцу
і прыціскаючы рукі да жывата
выпусьціла тое што толькі прыняла
і прытым як багіня высрала
там у кутку пад вакном
проста пад маім носам
таўшчэзнае тлустае доўгае і тугое лайно
якое спакваля выходзіла спаміж сьнежнабелых паўзадкаў
як забыты карычневы чэлес цыганчыка які толькі што адыйшоў
а магчыма
— бо што на гэтым сьвеце немагчыма? — так яно сапраўды й было

Я не адступіла ад вакна пакуль яна не пераадзелася ў кашулю
і выгодна не паклалася спаць
бо мела відаць таго дня начное дзяжурства ў кароўніку

Мне давялося пераначаваць навонкі
з боязі ад празьмернай блізкасьці багіні
якая зьявіўшыся гэтым летам тут
ідзе як я
без упыну
па ўсім сьвеце
некранальная й некранутая
вечная дзева вечная маці
сьвятая карова й магутная чараўніца
даверaная й мілажальная ахоўніца нашых колішніх продкаў
сёньня ў Суліцах

Ранкам яе ўжо там не было

* * *

А пайшоў ён у сраку
увесь ананізм
самавыратавальнага самаёбства
славутага ўсёпераможнага ўсёперамагаючага жыцьця
а пайшло яно ў сраку
усё тое гнюснае крывадушнае трухло
мацярынскага шчасьця і дзіцячае любові
красы прыроды ласкі пачуцьця
а потым ужо толькі аб'ёбства абжорства сраньне і спаньне
выжыльваньне і вымазгоўваньне
каб мы маглі сказаць што гэта ўсё нічога — мы гэтага ня ведаем
а пайшоў ён у сраку
увесь той засраны опіюм
разьвіцьця чалавецтва поступу рэвалюцыі дзеля поступу
    саюзьнічаньня дзеля прагрэсу прагрэсу дзеля гуманізму
    гуманізму дзеля камунізму камунізму дзеля разьвіцьця
    разьвіцьця дзеля дабрабыту дабрабыту дзеля грамадзтва
    грамадзтва дзеля гаўна гаўна дзеля чалавека
    чалавека на луку луку на муку
а пайшла яна ў сраку
тая вырыгнутая жвачка здохлае кабылы
якая называецца жыцьцём
і падыхаючы брыкаецца вакол сябе
тая вырыгнутая жвачка здохлае кабылы
якой нас корміць дзьве з паловай тысячы гадоў
наша ўласная культура
г.зн.
наша ўласная дурнота

і наша ўласнае сьвінства
а пайшоў ён у сраку той усёпадман
якім дурым самі сябе
добра гэта ўсьведамляючы
і забіваючы кожнага хто наважыцца нам гэта сказаць
а пайшло яно ў сраку тое жыцьцё
насраць на яго як на кожную іншую ўстанову
якая забараняе пасцаць дзе чалавеку хочацца
яно так нікчэмнае
тое ваша жыцьцё
і так дрыготкае
што хопіць толькі дакрануцца пальцам
а ўсё што прыліпла да жыцьця як гаўно да кашулі
пачынае дрыжаць разам зь ім
як посны кісель
насраць на яго
вымесьці яго жалезнай мятлою
адусюль
лепш задурыцца гераінам
павесіцца запіцца
спаліцца заябацца
чымся аддаць гадзіну
чымся пабыць хоць гадзіну
ў абладзе тае злачыннае дурноты
калі б я працавала
або купляла машыну
або зарабляла на тэлевізар
і жывіла тым дзесяць тысяч звыродлівых падлюгаў
якія хочуць каб мы заставаліся жывыя
як найдаўжэй жывыя
каб проста было каго зжэрці
паводле ўсіх законаў і прынцыпаў Жыцьця
вы дурні
дзесяць тысяч звыродлівых падлюгаў
ад гаўнюкоў з гаркаму ажно да гаўнюка-прэзыдэнта
госпадабога не выключаючы

Дык пайшла яна ў сраку
праўдзівая аснова рэчаў
чымся бегаць як усраўшыся
з рэцэптамі ўдасканаленьня грамадзтва

* * *

Пачынаецца восень
Будзе зь месяц як хаджу кругом
А каб тую потку смальнуў гром!
Каб пазбавіў дакукі

І абсмаліў рукі
якія абдымалі
самі яго бралі
— чаму я лепш ня брала бром

Пачынаецца восень
пасьля дажынак
вярнуся ў Прагу
Бярэцца пад зазімак

Пераклаў з чэскай мовы
Ян МАКСІМЮК



ЭГАН БОНДЫ (EGON BONDY) — нарадзіўся як Збынек Фішэр у Празе 20 студзеня 1930. Рэальнай гімназіі яму не ўдалося закончыць, і ў 1947-57 гг. ён перабіваўся без афіцыйнага працаўладкаваньня. Вершы стаў пісаць у дзяцінстве, у 1947 далучыўся да тагачаснай чэхаславацкай Сюррэалістычнай Групы. У 1950-тых адыйшоў ад сюррэалізму, прыняў творчы псэўданім Эган Бонды і пачаў пісаць у стылі, які назваў *татальным рэалізмам*. Разам зь сябрам Івам Водсэдзялкам заснаваў машынапісны самвыдат *Půlnoc*, у якім выйшла каля 50 іхных паэтычных, празаічных і перакладных зборнікаў. У 1951 Бонды пазнаёміўся з Багумілам Грабалам і мастаком Уладзімірам Боўднікам, зь якімі шмат гадоў дзяліўся сваімі эстэтычнымі тэорыямі. Дзякуючы Грабалу Бонды стаўся некім накшталт „легенды чэскага падпольля" (чытачы папярэдняга нумару „Правінцыі" могуць прыгадаць постаць паэта Бонды з Грабалавых *Танцавальных гадзінаў для старэйшых і спрактыкаваных*). У 1957 Бонды завочна паступіў на філязафічнае аддзяленьне Карлавага Ўнівэрстытэту, якое закончыў у 1961 дыплёмнай працай *Příspěvek k problematice marxistické ontologie*. Гэтая праца сталася пунктам выйсьця для ягонага найбольш вядомага філязафічнага твору пад назвай *Útěcha z ontologie* (кніжнае выданьне ў 1967). Арыентацыя Бонды на ультралевы, антысавецкі марксізм і камунізм прывяла яго да трацкізму і да мааізму, які ён энтузіястычна прапагандаваў у 1960-х. У 1967 псыхіятры прызналі Бонды поўным разумовым інвалідам і выправілі яго на пэнсію. Пэнсія дала яму магчымасьць больш інтэнсіўна займацца паэтычнай і філязафічнай творчасьцю. У 1970-х Бонды стаўся культавай постацьцю чэскага андэрграўнду. Шмат ягоных вершаў паклаў на музыку славуты андэрграўндавы рок-гурт *Plastic People of the Universe*. Літаратурная творчасьць Бонды заставалася ў рукапісах або выходзіла ў чэскіх самвыдатах за мяжою ажно да 1989. У 1980-тых Бонды выкладаў на так званых кватэрных унівэрсытэтах і працаваў як рэдактар у самвыдаце *Vokno*. Пасьля ўпадку таталітарызму актыўна падключыўся да грамадзкага жыцьця, але неўзабаве пачаў ад яго бочыцца і ў 1994 пасяліўся ў сталіцы Славаччыны Братыславе. У 1990-х выйшла друкам ўся непадцэнзурная творчасьць Бонды з папярэдняга пэрыяду: паэзія (9 тамоў, 1991-93), філязафічныя эсэ (4 тамы, 1993-99), камэнтары да гісторыі філязофіі (6 тамоў, 1991-97), а таксама *3 x Egon Bondy* (1990), *Dvě leta* (1991), *Cesta Českem našich otců* (1992), *Nepovidka* (1994), *Hatto* (1995), *Leden na vsi* (1995), *Cybercomics* (1997), *Týden v tichém městě* (1998), *Bezejmenná* (2001). Шмат ягоных твораў было перакладзена на замежныя мовы; адну кніжку, апублікаваную ў Славаччыне, Бонды напісаў па-славацку.

Дзявочы дзёньнік (Deník dívky která hleda Egona Bondyho) выйшаў у 2001 у славацкім выдавецтве *Albert Marenčin Vydavateľstvo PT Bratislava*. Вершы, датаваныя жніўнем 1971, адлюстроўваюць рэакцыю аўтара на наступствы савецкай акупацыі Чэхаславаччыны. Сам Бонды сказаў пра гэтыя вершы так: *70-тыя гады ў Празе пачаліся ў прыгнечаным настроі. Пачуцьцё бездапаможнасьці асабліва пашыралася сярод маладых, якія ня помнілі ні 1938, ні 1948, але даняло і ўсіх нас астатніх. Я сам зусім перастаў пісаць — думаючы, што ўжо не змагу прыйсьці да сябе (хоць для мяне 21 жніўня 1968 не было ні неспадзеўкай, ні шокам). Літаральна як маланка чахнуў мяне ў леце 1971 невытлумачальны* экстатычны стан. *Як быццам згубіўшы розум, кожнай раніцы я ехаў на канцавы прыпынак трамваю, распранаўся дагала і пускаўся бегма зусім бяз мэты. У галаве пачыналі вірыць вершы. Вечарам мне ўдавалася запісаць ня больш за дзясятак, — але прытым я ўвогуле не разумеў, што яны значаць. І толькі пазьней, калі я ўзяўся парадкаваць тыя фрагмэнты, дайшло да мяне, што несьвядома я выказаў штосьці, што можна было пайменаваць — крыху ўзьнёсла, але ўсё ж адэкватна* — аўтадэструкцыяй як апошняй абарончай лініяй рэзыстансу. *У 1971 годзе мы ўсе адчувалі, што нас адціснулі на апошнюю абарончую лінію. І неўзабаве для цэлага пакаленьня андэрграўнду, які тады наступіў, тая апошняя лінія абароны — выказаная ў гэтым зборніку як паэтычная мэтафара — сталася пунктам новага выйсьця. Гэты зборнік, аднак, адрозьніваўся ад усяго, што яму папярэднічала. Уласна кажучы, зборнік займае ў маёй творчасьці маргінальнае месца. Але ён адзначыў дасягненьне нулявога пункту і выхад зь яго.*

У „Правінцыі" прадстаўлена недзе каля 40% Бондавага *Дзявочага дзёньніка*.